3 ок. 3
6382

2-3

МАЛАДНЯК

1932

МЕНСК

18544

БЕЛАПП

ЗЬМЕСТ

Стар

Гурскі. Новы горад 3

Самуйлёнак. Цагліна казэмату 33

Баранавых. Два канцы 61

С. Ліхадзіеўскі. Радзіма—краіна саветаў (верш) 79

Бацюшкаў. Мая песьня (верш) 82

Т. Хадкевіч. Загартованы агнём і бурай (верш) 85

Нарысы

Скрыган. Гомсельмаш 87

Крытыка

Б. Каваленка. Платон Галавач 103

Кучар. Пра п'есу Александровіча „Напор" 109

Дакутовіч. За дыялектычна-матэрыялістычны нарыс 123

Тэатр

Вольскі. Асноўныя этапы разьвіцьця дзяржаўных тэатраў БССР 138

Бібліографія

П. Скокаў. Пра „Брыгадзіравы апавяданьні" К. Чорнага 155

Хроніка 158

ПРОЛЕТАРЫ ЎСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

304
63

МАЛАДНЯК

ЛІТАРАТУРНА-МАСТАЦКАЯ І ГРАМАДЗКА-ПОЛІТЫЧНАЯ ЧАСОПІСЬ—ОРГАН БЕЛАРУСКАЙ АСОЦЫЯЦЫІ ПРОЛЕТАРСКІХ ПІСЬМЕНЬНІКАЎ

18544

ПАД РЭДАКЦЫЯЙ
ІЛ. БАРАШКІ, П. ГАЛАВАЧА, А. ЗВОНАКА,
В. КАВАЛЯ, Я. ЛІМАНОЎСКАГА, А. МОРКАЎКІ,
А. СЯНЬКЕВІЧА

ГОД ВЫДАНЬНЯ ДЗЕСЯТЫ

КНІЖКА
ДРУГАЯ-ТРЭЦЯЯ

МЕНСК ■ ДЗЯРЖАЎНАЕ ВЫДАВЕЦТВА БЕЛАРУСІ ■ 1932

Надрукавана ў друкарні
„ПАЛЕСДРУК“, Гомель.
Зак. № 1628—1700 экз.
Уп. Галоўлітбеду № 365.

І. Гурскі

Новы горад

П'еса ў 4-х крыах

Дзейныя асобы

Віхура Арцем—нач. работ на пабудове электрастанцыі, стары бальшавік, каля 55 год.

Беразоўскі Ніл Максімавіч—галоўны інжынэр, 54 гады.

Беразоўская Тацяна—яго жонка, каля 50 год.

Беразоўскі Сяргей—іх сын, белы эмігранг, прыехаў у СССР, як ангельскі інжынэр, пад прозьвішчам Тэйлор Джэк.

Беразоўскі Вадзім—іх сын, студэнт, прыехаў на практыку, 20 год.

Дубовік Тарас—сакратар парткалектыву, каля 35 год.

Альховы Андрэй—манцёр, сакратар камсамольскае ячэйкі, працуе бэтоншчыкам.

Відук—старшыня рабочкому.

Кімаў Арсень—малады інжынэр, камсамолец.

Уэльс Горальд—ангельскі інжынэр.

Скакун Хведзька—бэтоншчык, п'яніца, прагульшчык.

Гануля—яго жонка.

Верас—стары рабочы, кладчык.

Гніда—чорнарабочы, былы бандыт. Сапраўднае прозьвішча Жыгалка.

Хрушч—плотнік, працуечорнарабочым.

Хмара Адам—дзесятнік.

Смык Сымонка—былы бяспрытульнік, працуе бэтоншчыкам.

Марына—студэнтка, практыкантка.

Параска—работніца.

Зьвягіна—загадчыца клюбам.

Размазьня—паштальлён

Лявон—стары дзед, вартаўнік.

Яшка—піонэр.

Цігр, Міцька } —бяспрытульнікі.

Рахункавод.

Машыністка.

Рабочыя, работніцы, камсамольцы.

Круг першы

Кватэра Віхуры. Шафа, этажэрка з кніжкамі. На стале раскіданы чырцяжы, газэты, часопісы. Партрэт Леніна. На канапе сьпіць Віхура.

1. Будзем знаёмы

Смык (*ідзе, крадучыся з фанарыкам, адвярнуўшыся*). Ты Цігр, будзеш на пасьце... а вы братва на апэрацыю. (*Бяспрытульнікі рассыпаліся па пакою, чуцен стук*).

Міцька. Ну ты, зануда!

Цігр (*выбягае з-за дзьвярэй*). Маўчы гад, а то дух вон і кішкі на тэлехвон...

Смык. Ш-ша! (*Чытае*). Капітал.

Міцька. Дзе?

Смык (*паказвае*). Во!

Міцька (*схваціў кніжку*). Карл Маркс. (*Пералістае*). Ніякага капіталу ў наліччы не аказалася...

Смык (*водзіць фанарыкам*). Ну і кніжак, ядзяць це мухі...

Цігр. І болей ні хрэна...

Міцька. Што?

Цігр (*навёў фанарыкам на партрэт Леніна, потым на боты*). Стоп!

Міцька (*хапае боты*). Глянь, якая камбінацыя... (*Паказвае хвілу, праз дзірку ў боце*), з нашае апэрацыі.

Цігр. Бяры.

Смык (*паглядзеў*). Барахло.

Цігр (*са злосьцю кідае*). Ну і апэрацыя!?

Віхура (*ускочыў, запальвае лямпу, Цігр накідваецца на яю*). Шпа-на! (*Вывернуўся, схваціў бот*).

Цігр (*выхватвае фінку*). Коцай!

Віхура. Як коцну!.. (*Замахнуўся ботам*).

Цігр (*кідаецца на Віхуру*). Пад дзевятае...

Віхура. Басота! (*Моцна сьціснуў руку*).

Цігр (*крывіцца*). О-ой! (*Выпускае фінку*).

Смык (*усьміхаючыся*). Якая сіла... ну і сілішча. (*Пауза*). А сіла, сілу паважае.

Віхура (*падняў фінку, кідае*). Вазьмі!

Смык (*хватае*). Што?

Віхура (*усьміхаючыся*). Ня бойся.

Цігр (*узяў фінку, злосна паглядзеў*). Ну, шчасьце тваё, што не раззлаваў мяне. (*Пашоў*).

Віхура (*сьмяецца*). Маё шчасьце?!

Смык. Братва!—а ён нічога стары... Каб даў крыху пашамаць, тады свой у доску...

Віхура (*адзяе боты*). Калі ёсьць што?

Міцька. Адны мышыныя абгрызкі... у наліччы аказаліся. (*Сьмех*).

Смык. То дай закурыць.

Віхура (*дастае махорку*). Гэта можна. (*Усе закурваюць*). А вось паесьці... (*Стукае*). Суседка.

Смык. Ты слыш кінь, бачым ядрона вош, што ад шчыра сэрца гасьцей прымаеш... (*Падыходзіць*). Будзем знаёмы.

Віхура (*усьміхаючыся*). Давай, пазнаёмімся. (*Вітаецца*)

Смык. Смыкам празываюць мяне, ядзяць-це мухі (*паглядзеў на кніі*) з камарамі. (*Пауза*). Па сацыяльнаму... Бацька мой, Сенька Грач блатны.

Віхура. А мяне Віхурай. Сын ткача, сам токар па мэталю.

Смык. Будзем прыяцелямі.

Віхура (*дае кніжку*). У знак нашае дружбы.

Смык (*скрывіўся, неахвотна бярэ*). Дзякую. (*Чытае*). Ленін. „Задачы саюзаў моладзі".

Міцька (*фыркнуў*). Ніштo сабе апэрацыя!?

Смык (*разгляда е чырцяжы*). Гм... Ядзяць-це мухі... Да чаго дадумаліся... На балоце...

Віхура (*у захапленьні*). Хутка каюк, балоту... Праз годзік-два тут будзе новы горад.

Міцька. Новы горад? Навошта? (*Пауза*). Не, не чапай балота!

Віхура (*радасна*). Паднімем цаліну, узварушым чарназём, засьпяваем новыя песьні... Будуй, пралетары! Будуючы новыя гарады, выхоўвай новага чалавека...

Смык (*разглядае*). Тут, значыцца, будзе закладзены новы горад?

Віхура (*паказвае*). Ага. (*Пауза*). А гэта, электрастанцыя... Тут палатно чыгункі...

Смык (*паглядзеў хітра*). Ня выйдзе.

Віхура. Чаму?

Смык. Таму. (*Паказвае на галаву*). Чардак патрэбен... як і ў наш ай справе.

Віхура. А хіба?..

Смык. Тэхніку трэба ведаць...

Міцька. Во-во!

Віхура. Аўладаю.

Міцька. Ботаў людзкіх ня маеш, ня то што інжынэрам быць... (*Фыркнуў*). Ну і апэрацыя!? (*Пашлі сьпяваючы*).

„Памру я, памру я, пахаваюць мяне,
І ніхто не пазнае, дзе магіла мая.
І ніхто не пазнае і ніхто ня прыдзе,
Толькі познаю ночкай, салавей прапяе".

Віхура (*увесь час ходзіць, застанавіўся*). Эх, рэбяткі, рэбяткі...

2. Музыка нашых дзён

На поўным ходзе будаўніцтва электрастанцыі. Працуюць бэтонамяшалкі, пад'ёмнік. Кругом рабочыя, нібы мураўі, абляпілі рыштаваньні.

Віхура (*падымаючыся на рыштаваньні*). Як добра жыць у нашы дні, дні напружанай кіпучае работы!

Дубовік (*радасна*). Вось яна, музыка нашых дзён. Любата!

Альховы (*бадзёра*). Хочацца жыць і тварыць!

Дубовік (*у захапленьні*). Сярод балот, лясоў, імшару, расьце новы горад, горад на балоце.

Віхура. Электрыка, казаў Ільліч, зьяўляецца „адзінай матэрыяльнай асновай сацыялізму". (*Пауза*). У другую пяцігодку пройдзе тут электрычны плуг, цягнік...

Альховы (*працуючы*). Тады, застогне дрыгва, зарунее жыта на полі.

Віхура. Падналяжам, рэбятушкі, ды паднацісьнем!

Смык (*увайшоўшы*). Здарова, малайцы.

Альховы. Здароў.

Смык. Курыць маеш?

Альховы. Няма.

Смык. Ну і будаўнікі... Без табакі, што бяз рук... (*Рабочыя цягнуць на рыштаваньні двухтаўровую балку*).

Галасы. Раз! Два! Возьмем!
Раз! Два! Дружна!
Раз! Два! Яшчэ разок!

Віхура (*дапамагаючы*). Падналяжам, рэбятушкі (*усе*), ды паднацісьнем.

Верас (*з верху*). Цэглы!

Хрушч. Даю! (*Пускае ўверх пад'ёмнік*). Мэрыканізацыя!? Хі-хі-хі.

Смык (*глядзіць уверх*). Іш ты, ядзяць це мухі, да чаго дадумаліся...

Хрушч (*да Смыка*). А як пабудуюць станцыю, тады ўсё будуць рабіць ляктрычнасьцю: араць, малаціць, кароў даіць, куранят выводзіць...

Гніда (*перарывае*). Можа і дзяцей пладзіць... Хе-хе-хе.

Смык. Які хлюст... (*Пауза*). А сам знацца рукі ў брукі і на спацыр...

Хрушч. Ну і язычок, ядзяць це...

Смык (*да Гніды*). Хаця, варта было-б, такіх, як ты ў адстаўку...

Гніда (*абурана*). Чаму?

Смык (*хітра*). А таму, што: іх ня сеюць і ня жнуць, яны самі родзяцца...

Гніда. Гэта значыцца дурні?

Смык. Во-во, яны самыя...

Гніда. Ах ты вашапруд! (*Кінуўся біць, Смык уцякае*).

Верас (*з верху*). Эй, хто там, сьцеражыся!

Гніда (*адскочыў*). Падушыцеся! Тэмпы... ліха матары.

Верас. Цэманту! Гніда, галубе, не затрымлівай.

Гніда (*падае*). Усё адно, як у прорву.

Беразоўскі (*увайшоўшы*). Ну што вы, што вы, нельга-ж гэтак, дарагуша. (*Разглядае*). Пясочку, трэба падсыпаць, а то цэманту навалілі. (*Падсыпае пясок*).

Верас (*з верху*). Таварыш Беразоўскі!

Беразоўскі (*пускае ўверх чарпак з цэментам*). Падналяжам, рэбятушкі, ды паднацісьнем!

Хрушч (*да Беразоўскага*). Калі-ж сілы не хапае. (*Хітра*). Можна сказаць ні хлеба ні табакі...

Беразоўскі. Вам хлеба не хапае?

Хрушч. Хапае. (*Хітра*). Вось толькі табакі...

Беразоўскі. З табакай цяжкавата. (*Дае папяросу*).

Хрушч (*горда*). Сваю махру маю, на сала выменяў.

Смык (*лоўка падвярнуўся, узяў папяросу*). Размерсі, тваю мерсі. (*Зацягнуўся*). Нічога тутунь, ядзяць це мухі...

Беразоўскі (*зьдзіўлена глядзіць*). Вам што, малады чалавек?

Смык (*смакуе*). Крымскі.

Гніда (*хітра да Беразоўскага*). Цягаецца тут розная шваль...

Альховы (*падыходзячы*). Ня шваль, а будучая зьмена рознай швалі.. (*Да Смыка*). Так Сымонка...

Гніда (*да Альховага*). Ня вякай!

Альховы (*Да Гніды*). Ягомасьці, хутка заткнем горла... (*Да Ганулі, жартуючы*). Так Ганулька...

Гануля. Эт, гэты Андрэй... А яшчэ сакратар кэ-сэ-мэ. (*Вырываецца*). Андрэй!—ня дурэй, хвартух падзярэш; мне татулька купіў, каб Хведзюлька любіў...

Альховы. Дзе-ж твой Хведзька сёньня?

Гніда. А ты сачком, ці што?! (*Падыходзіць*). Ты Хведзьку не чапай, (*Пауза*). Ён, можна сказаць, усю рэвалюцыю на сабе вынес...

Галасы (*з верху*). Цэманту! Цэглы!

Гніда. Ма-хор-кі!

Хрушч. Мы-ла!

Відук (*да Хрушча*). Эх і стукнуў-бы я табе ў рыла!

Гніда. Зачыні плевацельніцу, прафсаюз!

Хрушч (*да Відука*). Я-це стукну!

Гніда. Калі грошы будуць?

Відук. У сераду.

Хрушч. У сераду!? (*Пауза*). Я, можна сказаць, дэкаду ня емшы...

Гніда. Дый ў міне, можна сказаць, другі тыдзень нічога ў роце ня было... Хіба толькі вобла. (*Ідзе Віхура*)

Віхура. Зноў буза.

Верас. Ня добра, хлопцы... ой як кепска. (*Пауза*). Рабіць трэба.

Гніда. Буза... Гані махорачку, начбуд! (*Усе бягуць да Віхуры*).

Галасы (*з верху*). Даёш цьвікі!

Голас (*з нізу*). Бяз цьвікоў крый!
Голас (*з верху*). Як-жа!
Голас (*з нізу*). Матам!
Галасы (*з верху*). Цэманту! Цэглы!
Галасы (*з нізу*). Махоркі. Мяса! Ма-хор-кі!
Гніда. Даволі кровушку нашу піць!.. (*Да ўсіх*). Брацішачкі, за што бароліся?! За што кроў пралівалі?!. (*Разрывае кашулю*). За махорку!.. (*Глядзіць, якое зрабіў уражаньне*). Можна сказаць, брацішачкі, тыдзень... болей... месяц махоркі ў вочы ня бачыў. (*Смык лоўка падкрадваецца, выцягвае ў яго з кішэні махорку*) Смага (*хватаецца за горла*) душу разьдзірае...

3. Куры, братва, каб дома ня журыліся

Гніда (*хватае Віхуру*). А ну... тваю маць!
Хрушч. У штаб Духоніна!
Гніда. Давай тэлеграму ў нябесны саўнарком!
Галасы. Душы! Ламі! Крышы!
Гніда (*схваціў кол*) А-амба! (*Гікнуў і кінуўся на Віхуру*). Даві другога, а не цябе!..
Хрушч. Коцай! (*Выхваціў з-за халявы нож*). Пёрышкам яго!
Смык (*юркнуў у сярэдзіну*). Куры, братва, каб дома ня журыліся!
Гніда. Бі старых бальшавікоў!..
Хрушч. Эгы: круцяць, муцяць, мэнчаць, а народ енчыць... можна сказаць.
Смык (*падняўся ўверх*). А ну налятай, у каго совесьці няма. (*Падняў уверх асьмушку махоркі, усе кідаюцца вакурваць. Мітусяніна*).
Верас. Разышлася дзікая арда!
Аўдъховы. Разгулялася!
Дубовік. Разбушавалася!
Хрушч (*засьпяваў*).

„Хлебам кармілі дзяўчонкі меня
Парні, снабжалі ма-а-хор-кай".

Смык. Прарвала! У Гніда!
Гніда. Я.
Смык (*злосьліва*). Не да цябе п'юць...
Гніда. Я, Гніда, чаго ты хочаш ад міне... (*Пауза*). Махорачкі даў... Міне, можна сказаць савецкі дохтур на сухоты прапісаў... (*Ідзе да яго*).
Смык (*сьмела*). Ты ня Гніда... ты сапраўдная вош на савецкуй арганізьмі.
Усе. Ах-ха-ха! Ох-хо-хо!
Галасы. Гніда—вош! Вош на савецкуй арганізьмі!
Гніда (*кідаецца біць*). Ды я табе, сукінаму сыну, нюхаўку раскваШу!.
Смык (*уцякаючы*). Вош—гідра рэвалюцыі.
Дубовік. Да-а. Вош у грамадзянскую дубы валіла.

Гніда (*крычыць*). Братцы!—дык гэта-ж мая махорка. (*Хрушч лезе ў кішэню, дастае махорку, Гніда гэтым часам, адбірае недакурныя цыгаркі, сыпле ў капшук*).

Смык (*выхватвае капшук*). Братва!—дык гэта-ж мае цёткі Насты, баранавае машонкі капшук. Бандыты зарэзалі.

Гніда (*замахнуў кулаком, потым безнадзейна апусціў*). Бяры! куры! На яшчэ. (*Дае махорку*). Бяры шкура!

Хрушч (*замахнуў калом*) Г-ах! (*Смык адскочыў*).

Гніда (*выхваціў кол, кінуў*). Табе-б скрыпку Сымонка... (*Пауза*) Бацка камісарам быў, першую скрыпку граў... (*У бок*). Але музыка гэта казытала, от так (*душыць сябе*), к-кх... к-кх...

Смык (*замірыў вачыма*). Э-эх, каб мне скрыпку...

Хрушч (*у бок*). О, не! Чортава насеньне... скрыпку яму.

Віхура (*спакойна*). Ну пакурылі, пабузілі, цяпер гайда.

Хрушч. Толькі ня хочацца рук смуродзіць...

Віхура. Рукі кароткія.

Гніда. А калі што?

Смык. Паспрабуй: сабаку сабачая сьмерць...

Беразоўскі. І ня брыдка... эх вы, гаспадасы!.. Праз месяц ангельская інжынэрыя машыны прывязе. (*Паглядзеў уверх*). А ў нас работы цьма—цьмушчая...

Дубовік. Хопіць чухацца. Гайда! (*Пашоў, а за ім частка рабочых*).

Гніда. Э-эх і сьвіснуў-бы я па гэтай першуй скрыпцы. (*Перадразьніваючы*). Гайда!?

Смык. Грозен рак, ды ззаду вочы...

Беразоўскі (*да Гніды*). Ня будзь дзіваком, блазан!

Віхура. А хто ня пойдзе, то цацкацца ня станем.

Галасы (*застаўшыхся*). Што пужаць! Мы не кулакі! Мы рабочыя!

Смык. Ты, Гніда, відаць панскага бізуна захацеў?

Гніда (*да Віхуры*). А хто ня пойдзе, то значыцца за вароты?.. і грошы знойдуцца?

Віхура (*цьвёрда*). Значыцца за вароты. Так і грошы знойдуцца.

Гніда. А ў міне, можна сказаць, баляць зубы...

Смык. Трэба разьбіць губы, спусьціць кроў, тады перастануць балець... (*Сьмех*).

Хрушч. Халера, ня быў-бы той Смык, усё на скрыпцы падцінае...

Гніда (*да Смыка*). Кажаш, кроў спусьціць?..

Смык. Эгы: дурную...

Галасы (*з верху*). Цэманту!

Рабочы (*з нізу*) Ёсьць! (*Гніда і Хрушч неахвотна ўзяліся за работу. Засталіся: Віхура, Беразоўскі і Смык*).

4. З кім павядзешся, ад таго і набярэшся

Віхура. Дык вось што, Сымонка, ідучы дарогай ніколі не глядзі ў гару, хоць нічога ня знойдзеш, але нічога і ня згубіш...

Смык (*падумаўшы*). Добра таго біць, хто кажа не баліць...

Віхура (*хітра*). Тым, хто хістаецца, то ўправа, то ўлева, заўсёды па мардасах пападае... таму і баліць.

Смык (*балюча*). Ніколі я ня хістаўся... Крыху...

Віхура (*перарывае*). Зазнаўся... Па крывой дарозе пашоў... А з кім падвядзешся, а таго і набярэшся.

Беразоўскі (*да Віхуры ўсьміхаючыся*). Кажуць, што ў шпаны атаманам быў.

Смык (*нэрвова*). Што-ж тут сьмешнага...

Віхура (*спакойна*). Сьмеху баіцца той, хто нічога не баіцца...

Беразоўскі (*падыходзячы*). Ты краў?

Смык (*кусае губу*). Краў.

Віхура. Да мяне на апэрацыю прыходзілі.

Беразоўскі. Ноччу?

Смык (*холадна*). Раніцаю. Там і пазнаёміліся. (*Пауза*). Даведаўся, што Віхура свой ў доску.

Беразоўскі. Добрае знаёмства!?

Віхура. Дык як, будзем будаваць, ці разбураць?

Смык. Як гэта разбураць!

Віхура (*рад*). Правільна! Пабудуем новы горад, магутны такі, прыгожы... (*Пауза*). Утром нос Пілсудчыкам, Пуанкарэ, Брыанам...

Смык (*перарывае*). Слыш! Арцем! І Кауцкаму з другога інтэрнацыяналу па зубох...

Беразоўскі. Кауцкаму?

Смык (*паказвае на Віхуру*). У яго, слыш, зьлямзіў, прачытаў... (*Пауза*). Бяззубы, стары, а шамкае... (*Да Беразоўскага*). Чаго ты зьдзівіўся? Мы з ім (*паказвае на Віхуру*), больш года знаёмы... Вось ключы (*дастае зьвязку*), а гэта ад яго кватэры... (*Дае Віхуру*). Усё перачытаў, вядома, гадзічны стаж... (*Сьмяецца*). Часты госьць, у рэшце гаспадарыць... (*Закасвае рукавы*).

Віхура (*вельмі рад*). Выдайце яму спэцадзежу і гайда.

Беразоўскі (*сьмяецца*). Яшчэ зьлямзіць ды да Кауцкага?!

Смык (*да Беразоўскага*). Слыш ты, што-ж ядрона вош... жартуеш. Кауцкі за гэты час на Марксе выспаўся...

Беразоўскі (*раючы*). І Маркса чытаў?

Смык. Што Маркс. На Маркса надзейся, ды Леніна чытай. (*Пауза*). Чытаў, усе слыш яго кнігі, зубы паламаў чытаўшы і ні хрэна не разабраўся... Мудры стары! (*Пауза*). Прышоў да выніку, што трэба ісьці працаваць, бо калі папрацуеш, дык і Маркса і Леніна адчуеш, а з імі, ды з Вісарыонавічам у бой ісьці куды лягчэй.

Беразоўскі. З кім?
Смык. Сталіным.
Беразоўскі. Ага. Тады, гайда.
Смык (*ідучы*). Гайда! (*Ідучы*). Будуй пралетары! Будуючы новыя гарады, выхоўвай новага чалавека... Сказаў сын ткача, токар па мэталю.
Віхура (*падышоў да тэлефону*). Дайце кантору. Кантора? Хмара прыехаў? Не-е. (*Вешае трубку*). Гм... Пашлі дурнога, а за ім другога...

5. Нешта цэнтра піша

Размазьня (*ідзе наперад, ногі цягнуць назад*). Гэй, Арцем!—нешта цэнтра піша. (*Дае тэлеграму*).
Віхура (*чытае*). Пятнаццатага нарада ВЭ-ЭС-ЭН-ХА будаўніцтве. Тчк.
Размазьня. Нарада... Зноў камандыровачка, зноў авансікі. Э-эх, плачуць народныя грошыкі... (*Пауза*). Па нашым паштовым ведамсьцьве, ніякіх табе авансікаў, ніякае табе камандыровачкі... (*Пауза*). Сыцылзм не пабудуеш на нарадах ды паседжаньнях... не-е. Хе-хе-хе!
Віхура (*нібы між іншым*). А лёкайская група, да сацыялізму тупа...
Размазьня Тупа, тупа, як бабін пуп...
Віхура. Што?
Размазьня (*дробненька сьмяецца*). Ды так нічога. Хі-хі-хі.
Віхура (*разважаючы*). Пятнаццатага, а сёньня дваццаць другое...
Размазьня (*хітра*). Шкодніцтва!?
Віхура. Дзе?
Размазьня (*трусьліва*). У вашым ВЕ-СЕ-ЕН-ХА.
Віхура. Чаму?
Размазьня. А таму, што трэба было напісаць урадавая, ці пасеўная; такія значыцца, наша ведамства не затрымлівае, патаму, ўне ўсякае чаргі... і то, іншы раз бывае, значыцца, спозьніцца дні на два-тры, але-ж усё такі, значыцца, не на столькі...
Віхура. Значыцца, значыцца, а калі-ж ацеліцца... ваша ведамства.
Размазьня. Наша ведамства, самае акуратнае...
Віхура. (*перарывае*). Акуратнае?!
Размазьня. (*жартуючы*). Эгы. Значыцца мог-бы зусім ня прыносіць і што-б ты мне зрабіў. Падумаеш, начальства! Многа вас, значыцца, разьвялося. (*Пашоў, насустрэч ямў ідзе Хмара*).

6. Хто з нас бальшавік

Хмара (*чуць трымаецца на нагах, сьпявае*). „Не-е для мяне прышла вясна"...
Віхура (*сьмяецца*). Не для цябе вясна, то для каго?
Хмара (*ікае*). Для каго? (*Пауза*). Для розных там камісараў... (*Крычыць*). А для меня, кажучы па беларуску: ванючая, сьмярдзючая восень... (*Пауза*). Аплявалі Рассю... (*Адрыжка*). Прыедзеш

у Беларусію—беларусізуйся, у Украіну—украінізуйся, у Арменію... (*Падцягвае штаны*). Ой жывот... растройства. (*ікае*). Усё ад гэтай воблы... ці, як там па вашаму, тараноў, ці што.

Віхура. Што ты чаўпеш?

Хмара. Хачу гаварыць на том языке, на яком гаворыл Ленін... (*Падымае ўверх галаву, аглядаецца*). А-а, гэта ты, чалавек у футляры.. Хіба ты бальшавік?—не. Ты фанатык... Ты чыноўнік ад камунізму... О, ты далёка пойдзеш!

Віхура. Ну, а ты хто?

Хмара. Жывы чалавек. (*Сьпявае*). Колькі лет, кароўкі нет
Маслам адрыгаецца...

Віхура (*усьміхаецца*). Відаць.

Хмара. Што ты бачыш?

Віхура. Адрыжку...

Хмара. Дурань ты! Адрыжка... Ты мае падэшвы (*паднімае бот*) якая стапталася, ня стоіш... Я цябе куплю і прадам... (*Падыходзіць Беразоўскі*). Рразумееш, у рэканструкцыйны пэрыяд, патрэбны жывыя людзі... (*Да Беразоўскага*). Правільна?

Беразоўскі. Гледзячы што?

Хмара. Патрэбны жывыя людзі?

Беразоўскі. Патрэбны.

Хмара. Вось бачыш, што кажа адукаваны чалавек.

Віхура. Усё-ж, з чым ты прыехаў?

Хмара. Хіба ты бальшавік?.. (*Сьпявае*).

Чым ты, мілы, задаешся
Ты-ж ні к чорту не гадзішся...

Віхура. Пытаю, што прывёз?

Хмара (*зусім ня слухаючы, да Беразоўскага*). Хто з нас бальшавік?

Беразоўскі (*нэрвуецца*). Па мойму вы... вы не бальшавік.

Хмара (*абурана*). У белая сволач!

Беразоўскі (*памкнуўся*). Мяне?..

Хмара. Так, так. (*Дастае кандыдацкую картку*). Глядзі прахвост, гадзічны кандыдацкі стаж.... (*Падыходзіць Дубовік*).

Дубовік. Дай картку.

Хмара. А-а, гэнсэк. (*Пауза*) Ня ты даў, ня ты і возьмеш.

Дубовік. Тады Калніну аддасі

Хмара. Не-е, ня ніжэй Яраслаўскага...

Дубовік (*да Хмары*). Зойдзеш на бюро.

Хмара. У адну дудку. (*Паказвае на Віхуру і Дубовіка*). Дурань-дурня пазнаў і на піва пазваў... (*Ікае*). Памылачка правага характару, дый загіб з заскокам, у вас гэнсэк з начбудам... (*Пауза*). Слухайце вы, хадзячыя цыркуляры, а ці можна слухаць кандыдату з гадзічным стажам факстрот ці чарльстон... (*Дастае пласьцінкі*) У Менску на барахолке дастаў...

Дубовік. Слухай сабе чорльстон, факстрот, калі табе люба...

Хмара. Э-эх вы, дрындушкі... (*Пауза*). Ну, я... я люблю гэтую музыку, я жывы чалавек.

Віхура (*цьвёрда*). Досыць у дурні гуляць. Скажы, прывёз што, ці не?

Хмара (*холадна*). Вагон воблы.

Хрушч (*падыходзячы*). А грошы?

Хмара. Няма грошай, ня далі і мусіць доўга не дадуць. ((*Ікае*). Заўсёды вобла выплывае, калі крута прыходзіцца...

Віхура. Прыдзецца вам ехаць. (*Глядзіць на гадзіньнік*). Яшчэ пасьпееце.

Беразоўскі. Есьць. (*Да Віхуры*). Арцеме!—цэмант цяпер на фунт золата... Пясочку, дарагуша, толькі ў меру... (*Пашоў*).

Віхура. Добра. (*Да Хмары*). Усё ходарам ходзіць, а ён п'янстваваць. (*Пашоў з Дубовікам да бэтонамяшалкі*).

7. Абвяшчаю італьлянку

Хрушч (*крычыць*). Кішкі марш граюць... За народныя грошыкі п'янстваваць... Кідай работу! Давай італьлянку!

Скакун (*уваходзячы*). Хочаш італьлянку, магім даць... (*Паказвае на гармонік*). Дзесятнік тут?

Хрушч. Пашоў.

Скакун. Разьвязло?

Хрушч. У дрызінушку.

Скакун. Ну і хрэн з ім. (*Пауза*). А дзе-ж гэта мая сьцерва?.. Мой кракадзіл у спадніцы?..

Гануля. Я тутацькі, Хведзька.

Скакун. А-а, вунь яна, мая даўгагрывая вужака...

Гануля. Хведзька, мілы, дарагі, ідзі дадому...

Скакун. Была ў сабакі хата... (*Пауза*). А ну шкура зацягвай!

Гануля. Хведзька...

Скакун (*замахнуў кулаком*). Каму кажу. (*Заіграў на гармоніку, сьпявае*). Пашоў Хведзька скачучы.

Гануля (*праз сьлёзы*). А Ганулька плачучы...

Скакун (*да Лявона*) Глядзі стары, як вымуштраваў гэтую двуногую малпу.

Лявон (*нясьмела*). Ды яно-ж так: дзе мужык жонку за касу водзіць, там жыта родзіць...

Скакун (*горда*). То-то! (*Сьпявае*).

Ой ты Хведзька, ты Хведзюнька,
Разудала галава,
Калі мне яе ня зьнімуць
Сем галоў зьніму да я.

Віхура. Зноў арудуеце?..

Скакун. Што?

Віхура. Нельга сваяволіць, вось што.

Скакун. Калі-ж сэрца баліць... (*Пауза*).На таранах выяжджае це... (*Сьпявае*).

Ёлкі-палкі лес густы
Ходзіць Хведзька халасты,
Дзе-ж Ганулька дзеніцца
Калі Хведзька жэніцца.

Віхура. Кінь бузіць.

Скакун (*сьпявае*).

Пашоў Хведзька скачучы,
А басота плачучы.

Гануля. Хведзька, галубе, сокале...

Скакун (*да Віхуры*). Ну і люблю-ж я цябе.

Віхура (*паказвае на Ганулю*). Лепей яе.

Скакун. Ну і яе, кракадзіла гэтага, ды яна сволач... учора ў клюбе другому падмігнула. (*Схапіў за валасы*). Падмігнула?—кажы.

Гануля (*праз сьлёзы ўсьміхаючыся*). Хто каго любіць, той таго чубіць, ці ня так Хведзька...

Скакун. Эх, красуня ты мая ненаглядная. (*Абнімае*). Абкружыла гадаўка мяне, абваражыла, але покуль у стос не ўзяла.

Віхура. Хведзька, Хведзька, залатыя рукі, ды чортаў характар... Ну ідзі прасьпіся, а ўвечары паталкуем.

Скакун. Чаму-ж не паталкаваць з разумным чалавекам... (*Пауза*) Кажуць-жа, што лепей з разумным згубіць, чымся з дурнем знайсьці...

Хмара (*ідзе*). Хведзька!

Скакун. Га?

Хмара. Грай, а не грошы аддай!

Скакун (*зацягнуў на гармоніку*).

Ой ты Хведзька, ты Хведзюнька
Разудала галава.
Усюды ўлезеш, усюды скажаш
Неразумныя слава...

Віхура. Ня ўмеем мы яго да рук прыбраць.

Скакун (*лезе цалавацца*). Арцёме!—з табою паміраць гатоў... ды яшчэ вось з гэтаю зазнобаю.

Хмара. Хведзька!

Скакун. Га-а?

Хмара. Грай на ўсе басы. Грай... тваю маць.

Скакун. З дурнем зьвяжашся... (*Заграў*). У апошні раз... (*Хмара танцуе, да яго далучаюцца Хрушч і Гніда. Частка рабочых сходзіць уніз, акружаюць танцуючых*).

Гніда. Досьць зьдзекавацца з нас пролетарыяту!.. Хопіць цярпець!. Досыць!.. Амба!

Хрушч. Хопіць!.. (*крычыць*). Абвяшчаю італьлянку.

Гніда. Нашы патрабаваньні...

Хрушч. Акуратна выплачваць грошы...

Гніда. Даваць мыла...

1 Рабочы. А то вошы завяліся... (*Сьмех*).

Гніда. Братцы!—брыгада Дубовіка працуе... (*Пабег. Гудок. Перапынак*).

Віхура. Таварышы!—вы што жартуеце, ці сапраўды сабраліся ў італьлянку гуляць...

Галасы. Якія жарты! Даёш грошы! Ня жрамшы!

Віхура. А што яшчэ, калі ня жарты?

Рабочы. Дазнайся ў сьвіньні чаго яна хоча... Вечна: рох-рох і ні-бэ, ні, мэ ні, кукарэку...

Дубовік (*сходзіць уніз*). Гэтая гульня мне не падабаецца...

Хмара (*да Віхуры*). Ну ты, энтузыясты, схэма, чалавек з білетам, паслухай: жывот іх есьці просіць... Разумееш: быцьцё вызначае сьвядомасьць.

Хрушч (*сьмяецца*). Біцьцё вызначае сьвядомасьць... Лоўка... Ха-ха-ха.

Віхура. Гм... Гульня ў італьлянку... Дык гэта-ж здрада...

Хмара (*перарывае*). Паехаў, паехаў, агітацель. Скрыўляеш лінію партыі, мілой...

Віхура. Кажу проста: будаўніцтва станцыі, якая зьменіць эканоміку ўсяго краю, чыя ідэя?—Леніна—ленінскае партыі; чыя справа?—справа рабочае клясы. (*Пауза*). Хто так ці інакш, сьвядома ці несьвядома, тармазіць будаўніцтва, той вораг рэвалюцыі.

Галасы. Ого, крута гне! Куды ўзяў! Правільна! Па бальшавіцку! (*На рыштаваньнях грукат. крык*).

Галасы. Го-о-ра-а-ча! Па доктара! Не патрэбен ён!

(*Усе кінуліся на месца аварыі, адтуль нясуць акрываўленага рабочага, камунара*).

9. Што пасееш, тое і пажнеш

Хрушч. От парадачкі! (*Пауза*). Забілі чалавека...

Дубовік. Камунара.

Верас. А якога камунара, лепшага з лепшых ударніка, рабочага, кладчыка.

Дубовік (*зьнімае шапку*). Хвілін пяць таму назад цешыліся з яго работы. Гэта-ж адзін з тых, які пабіў сусьветны рэкорд: у паўгадзіны 1924 цагліны ў падмурак...

Гніда (*падыходзячы да Віхуры*). Парадачкі!?

Смык (*да Гніды*). Што пасееш тое і пажнеш...

Віхура (*падыходзіць зачынле вочы*). Шапкі зьняць... італьлянцы.

Альховы. Хто вінаваты?

Дубовік. Мы, камунары, камсамольцы, старыя рабочыя, усе тыя, хто аддана працуе на будаўніцтве...

Смык. Правільна!

Рабочы. Як-жа так? Я стары бэтоншчык, гляджу за сваёй работай...

Смык. А так, глядзі ў корань, ядзяць це мухі. (*Пауза*). Зьнішчажай гніду на целе пралетарскім, а то вошы разьвядуцца...

Віхура (*балюча*). Вось то-то і яно. (*Хвалюецца*). Ідзе гастрэйшая барацьба не на жыцьцё, а на сьмерць... А мы, нібы тыя квахтухі,—ходзім, апусьціўшы крыльлі... (*Паднімае галаву*). Хіба мы перасталі быць бальшавікамі!

Дубовік. Сьмерць камунара заставіць многіх задумацца на чый млын льлюць воду „італьлянцы"...

Альховы. Вось ён сапраўдны гэрой. Мы ніколі не забудзем чорнарабочага вялікай будоўлі.

Віхура (*устрахнуў сівымі валасамі*). Эй, хто там плача! (*Пауза*). Не плакаць над трупамі паўшых барацьбітоў! (*У залю*). Замест яго тысячы зьявяцца! (*Пауза*). Галоўнае фундамэнт, а ён закладзены. (*Выносяць камунара. Гудок*).

10. Маланка

Размазьня. Вечна ходзіш, вечна бродзіш, вечная на сьвеце суталака... кажуць сыцылісты, нібы гэта дыялектычны рух. (*Дастае тэлеграму*). Маланка. Глядзі якая, значыцца, акуратнасьць у нашым паштовым ведамстве... Заўсёды трэба даваць маланкаю...

Віхура (*бегла чытае, рад*). Будаўнічыя матар'ялы зпт грошы зпт прадукты зпт атрыманы тчк Беразоўскі. (*Пауза*). Маладзец Размазьня!

Размазьня (*задаволены*). Го-го-го. Трывожныя магу зусім ня прыносіць... (*ідучы*). Ну і народ пашоў, адна драбната ды ўсе такія нервенныя... (*Выходзячы*). Толькі наша ведамства...

Смык. Ды ўжо-ж, ваша ведамства, ядзяць-це мухі... На чарапаху яго, ва ўсесаюзным маштабе...

11. На поўны ход

Беразоўскі (*хутка ідзе*). Ну' як Арцеме?

Віхура. Толькі што атрымаў.

Беразоўскі. А я-ж маланкаю...

Віхура (*дабрадушна сьмяецца*). А трэба было, пасеўную...

Беразоўскі.На поўны ход!—дарагушы.

Віхура. На рыштаваньні!—таварышы.

Смык. Толькі праца можа згладзіць пляму.

Альховы (*працуе*) Дружна возьмем! Раз за разам, шчэ разок!

Дубовік. Падналяжым, ды паднацісьнем, мой дружок!

Альховы. З працай і памяраць весялей...

Смык. Навошта памяраць? (*Пауза*). Працаваць па новаму, ядзяць це мухі, сказаў Сталін, каб аж поджылкі затрэсьліся... у Кауцкага.

Віхура. Падналяжым рэбятушкі, ды паднацісьнем!

Дубовік. Дрыжы капіталізм, ядзяць це мухі, сказаў Смык. (*Сьмех*). (*Усе дружна працуюць, толькі Гніда ходзіць туляючыся*).

Смык. Гайда таварышы! (*да Гніды*). Гайда, сказаў Арцем Віхура, шпана ты армавірская...

Верас. Будзем біцца як чэрці, але запоўнім прарыў!

Альховы (*сьпявае*). Мы працы палацы збудуем
у горадзе новым труда.

Галасы. Цэманту! Цэглы!

Віхура. (*да Гніды*). А вы туляецеся? (*Панура*). Пойдзем, памажэце пакойнічка прыбраць... Ня можаце, скрабе. Тады гайда на рыштаваньні... Зноў ня хэнціць... (*Голасна*). Тады (*паказвае на ваготы*) гайда на сьметнік гісторыі.

Гніда (*хмура*). Ой глядзі!.. (*Пауза*). Можа дорага каштаваць!...

Віхура (*рашуча*). Колькі-б не каштавала!

Гніда (*паплёўся да выхаду*).

Галасы. Правільна! Адным трутнем менш!

Віхура (*да Беразоўскага*). Вы тут Ніл Максімыч, а я да Мітрыча... (*Пашоў*).

12. Думкі ў слух

Беразоўскі (*выпраміўся*). Дарагуша, мілы чалавек. Камунар. Таварыш. (*Голасна*). Таварышы!—з вамі хачу працаваць, гарэць на працы, з вамі і памяраць гатоў.

Віхура (*вярнуўшыся*). Руку.

Беразоўскі (*павесялеў*). Арцеме!—стары многа чаго бачыў на сваім вяку: быў сьведкаю і сам рабіў, каб пашкодзіць... І шкодзіў. Усюды шкодзіў: на франтох, у тылу, дзе толькі можна было. (*Паўза*). Прышоў да гэтага не адразу, доўга выношваў, як той поэт, каб заявіць свае думкі ў слух: я быў сьвядомым шкоднікам, заядлым ворагам савецкае ўлады. (*Паўза*). Што я цалкам ваш, пастараюся на справе даказаць.

Віхура. Добра. Пажывем далей, убачым болей... Мажлівасьці для вашае работы складзены. Рабочая кляса ніколі не забудзе прадстаўнікоў тэхнікі, якія шчыра працуюць.

Беразоўскі. Шчыра, шчыра, дарагуша.

Віхура. Вельмі добра! Вельмі рад! Будзем чорнарабочымі вялікай будоўлі. Так? (*Моцна ціскне руку*).

Беразоўскі (*радасна*). Так.

Віхура. Тады... (*Зьбіраецца выходзіць*).

Беразоўскі. Ідзі і будзь спакойны...

13 Сустрэча

Лявон. Ніл Максімыч!

Беразоўскі. Што? Хто?

Лявон. Нейкі студэнт, а можа і ня студэнт, ці мала хто цяпер цягаецца па сьвеце, настойліва патрабуе вас.

Беразоўскі. Прапусьцеце. (*Ідзе, насустрач яму Вадзім*).

Вадзім (*бяжыць*). А-а, тата. (*Ставіць чамадан*). Добры дзень!

Беразоўскі. Сынку, Вадзім! Добры дзень! (*Цалуюцца*). Малайчына, падрос.

Вадзім. Вы стомлены?

Беразоўскі. Ды не, так работа...

Вадзім. А ў вас тут такая строгасьць.

Беразоўскі. Жыцьцё суровае, суровыя і законы.

Вадзім. А як мама?

Беразоўскі. Здарова.

Вадзім. Ну, а Сяргею пішаце?

Беразоўскі (*цяжка ўздыхнуў*). Усё скончана. (*Пауза*). У нас з ім дарогі розныя.

Вадзім (*рад*). Правільна!

Беразоўскі (*паглядзеў кругом*). Ну, а мне, старому цяжка... Свая кроў.

Лявон (*падыходзячы*). Ніл Максімыч!—чаго гэта Гніда, нібы бандыт, туляецца...

Беразоўскі (*устрапянуўся*). Патурылі яго: „на сьметнік гісторыі...“

Лявон (*выходзячы*). От гэта добра: паршывую авечку з стада вон...

Марына. Вадзім!—глядзі якая тут прыгожасьць... (*Пауза*). Зайдрошчу вашаму бацьку, ён такі шчасьлівы.

Лявон (*бяжыць*). Слухайце, слухайце, вы таксама студэнтка.

Марына. Так.

Лявон. З ім? (*Паказвае на Вадзіма*).

Марына (*усьміхаючыся*). З ім.

Лявон (*махнуў рукою*). Цяпер усе пастухі студэнтамі сталі...

Марына. Ха-ха-ха! Правільна стары...

Вадзім (*да Марыны*). Будзьце знаёмы.

Марына (*вітаючыся*). А мы да вас, на практыку.

Беразоўскі. Вітаю, вітаю маладых будаўнікоў!

Марына (*цяпне Вадзіма*). Пойдзем, чаго раскіс... (*Паднімаюцца на рыштаваньні, засьпявалі*).

Альховы (*падыходзячы*). Відаць свойскія... (*Да Вадзіма*). Камсамольцы?

Вадзім. Кандыдат.

Альховы (*да Марыны*). А ты?

Марына. Не.

Альховы. Чаго-ж ты засаромілася? (*Пауза*). Зварганім нагрузку, а потым... Ёсьць!

Марына. Даёш!

Альховы (*подумаўшы*). У мопраўскую.

Марына. Згодна.

Альховы. Руку.

Марына. Маеш.

Лявон (*падыходзячы*). Іш ты: рыбак-рыбака, бачыць з далека...

Альховы (*крычыць*). То прыходзьце вечарам у клюб!

Вадзім. Прыдзем!

Марына. Абавязкова!

Лявон. Чаму-ж ня прыйсьці, Альховы хлопец хвацкі, усіх нагрузіць. (*Пашоў*).

14. Хто старае забудзе, таму нюхаўку на патыліцу

Гніда. Спацыруеце?!

Беразоўскі. Што? (*Пауза*) Убірайцеся адсюль!..

Гніда. Хіба, разам з вамі... Памятаеце... па вашаму загаду...

Беразоўскі (*нэрвова*). Зараз-жа, каб і духу вашага ня было!

Гніда. Памятайце, палкоўнік.

Беразоўскі (*крычыць*). Хто старое ўспомніць...

Гніда. Хто старое забудзе, таму нюхаўку напатыліцу. (*Пауза*). Разумееце, палкоўнік Беразоўскі, зубы вон і смаркалку ў сьмятку.

Беразоўскі. Разумею, разумею... Ох-хо-хо. (*Адсоўваецца. На сцэне цёмна, яму мярэшчыцца, як Гніда пад яю каманду катуе рабочаіа*).

Гніда. Палкоўнік...

Беразоўскі (*махае рукамі*). Лезе, як сьвіньня, заплюшчыўшы вочы... Унь рыла... сьвінячае.

(*Трывожныя гудкі, чуваць рытмы пахавальнаіа маршу, песьня: „Не плачьте над трупами павтих борцов". Сьвет.*

15. Перастаў біцца пульс лепшага з лепшых ударніка

Віхура (*ідзе, на рыштаваньнях застанавіўся, панура*). Ня верыцца мой дружа, што цябе ня стала. Перастаў біцца пульс, лепшага з лепшых ударніка, кладчыка, камунара. (*Пауза*). Зусім нялепы выпадак, вырваў цябе з нашых радоў. (*Выцірае сьлёзы*). Цябе ня стала. (*Пауза*). О, не, не! Ты будзеш заўсёды з намі, на баявым пасту. *Пауза*). Таварышы!—Мітрыч, адзін з тых, які першы палажыў цагліну ў падмурак, адзін з тых, які быў прыкладам для ўсіх нас, таму так цяжка расставацца з ім. (*Пауза*). Хто заменіць яго?..

Галасы (*разам*). Мы!

Дубовік (*знад'емам*). Таварышы! мы—заменім яго. (*Пауза*). Хаця (*трымае партбілет*), затрымка, ня стала-ж чалавека... (*Чытае з партбілету*). Нумар дзевяцьсот пятнаццаць восемсот тры-ы... Калі ўступіў у партыю? Тысяча дзевяцьсот семнаццаты. (*Пауза*). Але-ж, затрымкі ня можа быць. Будуй пралетары—затрымкі ня будзе.

Верас. Мы з Мітрычам разам гадаваліся, разам і працавалі... Адна ў нас з ім прафэсія. Розьніца тая, што ён камунарам быў, пры чым камунарам, які, не шкадуючы жыцьця, аддаваў усяго сябе.

Голас. Прычына сьмерці?

Верас (*выцірае сьлезы*). Нялепы выпадак: калі „італьлянцы" разбушаваліся да іх ішоў, разнэрваваўся... пахіснуўся... (*Пауза*) Але не, затрымкі ня можа быць. (*Дае заяву Дубовіку*).

Дубовік (*чытае*). Прашу прыняць мяне ў сябры Камуністычнае Партыі (бальшавікоў) Беларусі. Вытворчы стаж сорак год. Прафэсія кладчык. Верас.

Віхура (*рад*). Дружышча!

Верас. Хоць і стары я, але думаю, што буду карысным для партыі.

Альховы. Стары конь баразды не сапсуе...

Верас. Так, дзеткі: вось толькі клячу трактар выпірае. (*Пауза*). Усё-ж, яшчэ пацягну годзікаў пяць... (*Гудок*).

Альховы (*зацянуў, усе падхваціл*і). Мы працы палацы збудуем
У горадзе новым труда.

(*Праца. Музыка*).

Верас (*на кладцы*). Не, не, стары конь баразды не сапсуе... і кляча патрэбна.

Заслона.

Круг другі

Клюб рабочых. Падыходзяць камсамольцы, спрачаюцца, сьмяюцца.

1. Дзе шляецеся, хуліганьё?

1-ы Камсамолец. Я рабята, з вывадамі, пра нашу камуну, дый наогул пра ТРАМ' ядро, ня згодзен. (*Стукае ў дзьверы*).

2-гі Камсамолец. Хіба, гэта вывады?

1-я Камсамолка. Ну, а што-ж?

2-я Камсамолка. Недарэчнасьць нейкая...

1-ы Камсамолец (*мацней стукае*). Вось вам і недарэчнасьць, а ў камуну ня зойдзеш...

Зьвягіна (*з-за дзьвярэй*). Хто там?

2-гі Камсамолец. Адчыняй. Камуна.

Зьвягіна. Ды ну вас.

1-ы Камсамолец. (*моцна стукае*). Адчыняй!

Зьвягіна. Дзе шляецеся, хуліганьё?

1-я Камсамолка. Ня шляліся, а былі на рэпэтыцыі.

Зьвягіна. Рэпэтыравалі, як разлагацца, га?! Ня пушчу!

2-я Камсамолка. Таварыш Зьвягіна, даражэнькая, пусьці...

1-я Камсамолка. (*злаcьліва*). Мы больш ня будзем разлагацца, толькі пусьці.

Зьвягіна (*з-за дзьвярэй*). На хітрыкі... О, не!

1-ы Камсамолец. Рабята, давайце наладзім канцэрт...

Галасы. Давайце! Шумавы! Кашачы! Ха-ха-ха!

2-гі Камсамолец (*у дзьверы*). А ты, апартуністка, ідзі дрыхай!

Зьвягіна. Вось за гэта самае, ня пушчу! (*Сьмех*). Цьфу на вас! (*Плюе ў скважыну замка, усе адскокваюць*).

1-ы Камсамолец. Ну зацягнем рэбята! (*Заіраў на бутэльках „Па марам, па марам...“ Падыходзіць Смык*).

Смык. А—а, у нашым палку прыбыла... (*Пауза*). Вы што-ж, ядрона вош, гуляеце ў бяспрытульных...

1-ы Камсамолец. Ды не. Зьвягіна ня пускае...

Смык Э-эх вы, а яшчэ ядраўцы...

1-я Камсамолка. Не ядраўцы, а трам'ядраўцы...

Смык. (*лезе па трубе, там завязвае рушнікі, апускае ўніз*). Лаві! Эх,— вы! (*Трам'ядраўцы адзін за другім лезуць уверх. Выбягае Зьвяліна*).

Зьвягіна (*крычыць*). Караул! Хуліганы! Камуна разлагаецца!

Смык (*лезе ўніз*). Ціха ты! (*Пауза*). Ніхто не разлагаецца!

Зьвягіна. А—а, гэта ты! Ды я цябе... каб на цябе... Хуліган!..

1-я Камсамолка. Сымонка, ідзі да нас.

Зьвягіна (*узялася ў бакі*). А бадай на цябе немач, сама прасілася а цяпер ката заве... (*Узрыў сьмеху*). Вось-жа ня пушчу! (*Зачыняе дзьверы. Чуваць мурлыканьне на ўсе лады. Сьмех*).

2. Каму верыць?

Дубовік (*вядзе паседжаньне бюро парткалектыву*). Дык ты сьцвяржджаеш, што ніколі не рабіў рэвізіі лініі партыі ў нацыянальным пытаньні...

Хмара. Я заўсёды за генэральную лінію трымаюся... (*Пауза*). А ўсё тое, што тут гаварыў Віхура адносна: беларусізацыі, украінізацыі ды арменізацыі, усё гэта хлусьня...

Віхура. Хлусьня?

Хмара. Так. (*Пауза*). Я заўсёды за генэральную лінію абедзьвюма рукамі...

Віхура (*да усіх*). Вось яго словы: „А для мяне, кажучы па-беларуску, ванючая, сьмярдзючая восень... Аплявалі Расею...“

Хмара (*не дае гаварыць*). Ілжэ, як сівы мэрын... Ніколі я гэтага не казаў...

Дубовік. Ну, а тое, што з гэтаю групаю гарлапанаў заадно?
Хмара. Эй, ты ўжо крыху дабаўляеш, што заадно...
Зьвягіна. Каму верыць? Адзін камуніст і другі...
Відук. Ну другі не камуніст... (*Пауза*). Мы Віхуру ведаем, як бальшавіка, а вось Хмару...
Хмара. З цябе Томскі...
Відук (*перарывае*). Я ня Томскі, а Відук...
Хмара. Тым горш...
Відук. Я падтрымоўваю прапанову таварыша Віхуры аб выключэньні яго з партыі і зьняцьці з пасады дзесятніка.
Хмара. Яўная памылка. Я, можна сказаць, заўсёды з генэральнай лініяй у дружбе... вось толькі з Віхурай.
Зьвягіна (*перарывае*). Можа Хмара нам па бальшавіцку прызнае сваю памылку.
Хмара. Дзякую за ласку! З гразьзю зьмяшалі, зрабілі вялікадзяржаўным шавіністам, дый яшчэ прызнавай памылку. Дудкі! Што з таго, што я п'ю... Мала хто п'е! (*Пауза*). А што да працы, дык я можна сказаць усім целам...
Альховы (*перарывае*). А трэба ўсёй душой...
Хмара. А ты, Андрэй, памаўчаў-бы... Ведаем, як ты праводзіў калектывізацыю... (*Пауза*). Кося, кося, покуль у аглоблі, а як запрог, дык—но, дый калом па баку... Загібшчык!..
Альховы. Выбачай. Партыя ніколі не ацэньвала маю работу, як загібшчыка. (*Да Віхуры*). Таварыш Віхура!
Хмара. Ты і Віхура гэта адно, а партыя другое. Ды ну вас усіх!.. (*Уваходзіць Смык пераадзеўшыся*).
Дубовік. У нас бюро.
Смык. Ведаю. Мне толькі адну фактычную даведку.
Хмара (*устае*). Тут парцейнае бюро, а ня зборышча бяспрытульнае шпаны.
Дубовік (*да Смыка*). Калі ласка.
Смык. Братва! Хмара Адам ня мае ніякага права быць у партыі. Гэта двурушнік. Ён якшаецца з Гнідаю, а хто Гніда?
Хмара (*ускочыў*). Ну хто?
Смык. Гніда—гэта воўк у авечай шкуры—былы бандыт.
Дубовік. Бандыт?
Хмара. Ах ты вашапруд паршывы! Браткі, нехта збрахаў. А скажы курыцы, дык яна па ўсёй вуліцы.
Зьвягіна. Ну але: кума-куме, дый пашло па ўсім сяле.
Смык. Ну ты, ядзяць-це мухі, парткума, заткніся. (*Пауза*). Сапраўднае прозьвішча Гніды—Жыгалка.
Відук. Жыгалка? Той самы, што ў Тоўстым лесе арудаваў?
Смык. Той самы. (*Павярнуўся і пашоў*).
Віхура. Ого! добрая птушка.

Дубовік. Пытаньне яснае. Я веру Віхуру. Галасую. (*Пауза*). Хто за выключэньне? (*Падлічвае*). Сем. Супроць? Няма. Пытаньне вырашана.

Зьвягіна. (*Перарывае*). Для мяне ня зусім ясна. Я ўстрымалася, і нікога не баюся.

Хмара. Каб ты свае цені баялася! Гэткая помач—горш немачы.

Дубовік. Пытаньне вырашана. Пастанову бюро можна абскардзіць.

Хмара. Абскардзіць?.. І там такія сядзяць... (*Пауза*). Эх вы, падумайце толькі. Увялі спаборніцтва, ударніцтва. Ну і працуем, але смаку ня чуем... (*Хітра*). За мазалі, за сваю крывавую працу што атрымоўваем?—хунт масла. Чаго маўчыце, хадзячыя цыркуляры... (*Пашоў*).

Дубовік. Вось табе і жывы чалавек, раскусіш яго, дык за паўкілёмэтра нясе... Д-да. (*Пауза*). Ну, пераходзім да наступнага пытаньня. Слова мае таварыш Віхура. (*Да Віхуры*). Калі ласка.

Віхура (*устае*). Таварышы! факты апошніх дзён шмат аб чым гавораць. „Італьлянка", гэта—не выпадковае зьявішча. На будаўніцтве ня ўсё ў парадку. Відаць, чыясьці рука лоўка арудуе. (*Цьвёрда*). Партыя нас паслала на адказьнейшы вучастак работы. Мы павінны жыцьцё палажыць, а выканаць заданьне. Партыйны, камсамольскі калектывы, рабачком, насьценная газэта, усе павінны біць у адно: сваячасовы пуск электрастанцыі. Вось і ўсё.

Дубовік. Усё ясна. Трэба рынуцца ў бой. Заўтра правядзем партсход, пасьлязаўтра агульны сход рабочых. Насьценгазэта павінна выйсьці праз два дні. Хто супроць? Няма. (*Да сакратара*). Запішы. (*Пауза*). Ну?

Віхура. А прыём у партыю?

Дубовік. Правільна. Ёсьць заява ад таварыша Вераса. Саракагадовы рабочы стаж.

Галасы. Прыняць.

Дубовік. Вераса ўсе добра ведаюць. Галасую. Хто супроць? Няма. Паседжаньне бюро лічу зачыненым. (*Усе разыходзяцца*).

3. У здаровым целе—здаровы дух

Альховы (*усьміхаючыся*). Фізкультура—здароўе чалавеку.

Смык (*па-цыркавому некалькі раз перакуліўся*). А як-жа: у здаровым целе—здаровы дух, сказаў Сямашка...

Марына (*съмяецца*). Які Сямашка?..

Смык. Наш інструктар.

(*Сьвісток. Робяць некалькі фізкультурных нумароў. Убягае Зьвягіна*).

Зьвягіна (*выцірае пот*). Я не магу... я не магу... куды ні зойдзеш усюды камсамольцы. А бадай на вас немач! (*Да Марыны*). Ну, а ты чаго стаіш, ахмістрыня!

Марына. Я...

Зьвягіна. Няма чаго, калі прышла дык спражняйся, разам з хлопцамі... (*Сьмех*).

Марына. Да мне што, калі спражняцца дык спражняцца... (*Узрыў сьмеху*).

Зьвягіна. Чаго вы ржэце, асталопы!... (*Марына разапранаецца, лоўка робіць некалькі фізкультурных нумароў*). От, гадаўка, паясьніцу пераломіш, дзяцей ня будзе каму раджаць...

Марына (*жартуючы*). Нічога, па гэтым дзеці будуць, толькі дробненькія!?

4. За аднаго бітага дзесяць нябітых даюць, дый то не бяруць

1-ы Рабочы (*чытае па складох*). У краіне Саветаў не павінна быць няпісьменных.

2-гі Рабочы. А як-жа за аднаго бітага, дзесяць нябітых даюць, дый то не бяруць.

Вадзім. Таварыш Хрушч! чытайце.

Хрушч (*аж падскочыў*). Мяне, можна сказаць, мама нарадзіла малапісьменным, хачу ім і памерці. (*Сьмех*).

Вадзім. Чытайце, чытайце.

Хрушч (*неахвотна бярэ кніжку, чытае*). Імпэрыялісты рыхтуюць новую вайну супроць Саветаў. Задача пралетарыяту капіталістычных краін ператварыць вайну імпэрыялістычную ў грамадзянскую.

2-гі Рабочы (*да Вадзіма*). Гэта значыцца такую, як у нас была?

Вадзім. Так.

1-ы Рабочы. Імпэрыялістычную ды ў грамадзянскую. (*Пауза*). Але-ж, трэба нашу Чырвоную армію ўмацоўваць!

Галасы. Ясна трэба! Мэханізаваць яе, на машыну пасадзіць! Дый самім трэба моцна вінтоўку трымаць!

Вадзім (*да Гніды*). Таварыш Гніда!—ідзеце да дошкі.

Гніда (*неахвотна паднімаецца*). Мо' каго другога?

Вадзім (*зусім не зьвяртае на яго ўвагі*). Скажэце, колькі будзе двойчы два?

Гніда (*падумаўты*). Пяць. (*Сьмех*).

Вадзім. Як гэта пяць?

Гніда (*вызываюча сябе трымае*). На понт брацьі Старога вераб'я на мякіне не правядзеш! Па бацьку, барын, пашоў...

Вадзім. Што?

Гніда. Двойчы два будзе пяць... (*Узрыў сьмеху*).

Вадзім (*чуць устрымліваецца*). Ну, а калі мы возьмем два (*бярэ два пальцы*), ды яшчэ раз два, то колькі будзе?

Гніда. Чатыры.

Вадзім. Вось бачыце, чатыры.

Гніда (*да Вадзіма*). А ўсё-ж, Сяргей, куды лаўчэй быў... (*Ціха*). На гарэлку даваў...

5. П'яніца прасьпіцца, а дурань ніколі

Скакун (*ідзе граючы, прыпявае*).

Ой ты Хведзька, ты Хвядзюнька,
Разудала галава.

Параска (*засьпявала пад гармонік*).

Мой мілёнак, што цялёнак,
Кудрысенькі, што баран,
Ён прасіў маё калечка,
Я бажылася ня дам.

Скакун. Ух, ты! (*Схваціў Параску*). Сьцерва, уся ў мяне! (*Пауза*). Вось толькі ў касьцёл ходзіш.

Параска. Хіба нельга?

Альховы. Ясна, што нельга: „рэлігія—опіум для народу".

Параска. Хаджу, бо там весела: як удараць, брат, у арганы, дык хоць полечку скачы...

Скакун (*заіраў*). Скачы тут у клюбе...

Параска. Дзе ты бачыў, тут усё сур'ёзныя, паседжаньне за паседжаньнем... (*Пауза*). А там, са сьмеху, з дураты хоць папарвеш жываты...

Альховы. Парасачка, прыходзь лепей на камсамольскі, чымся ў касьцёл... (*Пашоў*).

Гніда. Паглядзела-б ты, Парасачка, як ён каля скубэнткі Марыны ўвіхаецца... з Смыкам на перабой... нагружаюць... Ха-ха-ха!

Параска. Эт і ты ня лепшы, кожны з нас сам да сябе, мякішам вернець. (*Сьпявае*).

Як пайду я на вакзал
Лягу пад машыну,
Дакажу сваё каханьне
Сукінаму сыну.

Скакун (*да ўвайшоўшае Ганулі*). Чаго ныеш? (*Абнімае*). Кінь ты мілачка гардзіцца, кінь ты губы надзімаць...

Гануля. Хведзька!—мне нешта нядобра.

Параска. Ха-ха-ха! Ад чаго-ж табе стала, ці ад круп, ці ад сала..

Гануля. Хведзька, любы, дарагі, ці пойдзеш-жа ты на работу?

Скакун (*падумаўшы*). Заўтра вазьмуся абераруч.

Гануля. А піць?

Скакун. Піць... Ну і піць паспрабую... па крысе. (*Паўза*). Вось толькі, прыкра, Ганулька, што памром мы дый бяз нас будуць піць...

Хмара (*ідзе выпіўшы*). Хведзька! Грай! (*Сьпявае*).

Ажаніўся, весяліўся,
Цяпер буду панаваць,
Жонка будзе сьвіней пасьвіць
А я буду падпяваць.

Параска. Хо-хо! З сьвінячым ухілам, ды толькі ўласьніцкім... (*Стукнула па жыватy*). Што гэта ў вас?

Хмара (*самадавольна*). Сацыялістычнае накапленьне!? (*Абнімае Параску*) Ад тараноў!?

Скакун. Э-эх! Ганулька! (*Зайграў на гармоніку*).

Гануля. Хведзька!—мне нешта нядобра.

Скакун (*зусім не зьвяртае ўвагі*). Чаго маўчыш?—сука.

Гануля (*сьпявае праз сьлёзы*).

Ці я табе не казала
Ці не гаварыла,
Не кладзіся каля мяне
Бо будзе Гаўрыла...

Скакун (*прыслухоўваецца*). Ты што сьпяваеш?

Гануля. Тое, што ты чуеш! (*Зноў засьпявала*).

А ты-ж мяне не паслухаў
Каля боку клаўся.
Цяпер мяне мамка б'е
Скуль Гаўрыла ўзяўся.

Скакун (*схапіў за руку*). Яшчэ-ж няма.

Гануля. То будзе.

Скакун (*крычыць*). Нагуляла! (*Пашлі*)

Хмара. Хо-хо-хо! І ўсё над тваю бірку. (*Ідзе Віхура*).

Віруха. Хведзька!—ты зноў п'яны.

Хведзька. Калі-ж прывычка, а прывычка, другая натура.

Віхура. Ня добра.

Скакун (*заграў, засьпяваў*). Пашоў Хведзька скачучы...

Гануля. А Ганулька плачучы...

Віхура (*рашуча*). Пачакай! (*Падыходзіць да яго*). Хіба так можна бацьку сям'і...

Параська. Бацька... Ха-ха-ха!

Гніда. Ну і бацька, нечага сказаць...

Скакун (*зусім ня слухае, да Ганулі*). Каб-жа сына...

Гануля (*радасна*). А што калі сын, Маем назавем...

Гніда. Трактарам...

Віхура. Бачыш, да чаго ты дайшоў, Гніда і той сьмяецца...

Скакун (*да Гніды*). Чаго ты рагочаш, вош! (*Паўза*) Што я п'яніца?.. П'яніца прасьпіцца, а дурань ніколі... (*Паўза*). Захачу і ня буду піць... І на работу прыду...

Віхура. Прыдзеш?

Скакун. А як-жа! Трэба сына гадаваць! Трэба зрабіць каб пацанам лепей жылося. (*Да Ганулі*). Праўда, Ганулька!

Гануля. Праўда! (*Пашлі*).

6. Хто хуліган

Альховы (*вядзе камсамольскі сход*). Наступнае пытаньне: прыём у камсамол. Ёсьць заява ад Смыка. (*Шум*).

Зьвягіна (*паднімае руку*). Позна. У мяне кіно, я пабегла... (*застанавілася*). Стоп. У мяне запытаньніца... (*Калупае ў носе*). Не, такі вялікае пытаньнішча...

Альховы. Калі ласка.

Зьвяніга (*да Смыка*). Ці даўно, ты, перастаў хуліганіць.

Галасы. От рэжа! Ня ў броў, а ў вока!

Зьвягіна (*задаволена, садзіцца*). Праўду рэжу, праўду...

Альховы (*да Смыка*). Калі ласка адказвай.

Смык (*нялоўка сяде адчувае*). Як быў сярод хуліганаў тады сапраўды хуліганіў. (*Усе напружана слухаюць*).

Зьвягіна. А цяпер?

Смык. Цяпер?

Зьвяніга. Але.

Смык. Хуліганства бывае розпае. (*Паўза*). Пытаньне ставіцца, як я разумею, таварыш Зьвягіна, хто хуліган, я, ці ты? (*Шум*). Раскажу папарадку: аднойчы ня было дзе начаваць і я вымушаны быў бяз ордэру заняць жылплошчу калідору. І што-ж вы думаеце, яна выгнала мяне і зачыніла калідор. (*Паўза*). Між іншым, да таго, калідор ніколі не зачыняўся. (*Паўза*). Я такі крыху супраціўляўся... (*Паўза*). То хто хуліган, ядрона вош!

Зьвягіна (*ускочыла*). Ты хуліган, бацька твой хуліган, дзед твой хуліган, усе вы хуліганы! (*Паўза*). Я ад прыёма ўстрымоўваюся.

Смык. Калі дазволіць сход, раскажу, хто мой бацька, хто мой дзед, бабушка і маць яе (*выбух сьмеху*) і маці яе, значыцца прабабушку, па словах бацькі ведаю.

Галасы. А як-жа!
Абавязкова!
Просім!

Смык. Мой бацька... ды ў мяне, фактычна іх тры. (*Сьмех*).

Зьвягіна. Мржа і болей, адкуль ты ведаеш!..

Смык (*не зьвяртае на яе ўвагі*). Першы бацька быў старшынёю рэўкому, у дваццатым бандыты забілі яго. (*Панура*). Вырэзалі ўсю сям'ю. Я з меншым брацікам Фэлікам уцёк. (*Чуць устрымліваецца*). Акрываўленага брацішку, Фэліка, яму тады было тры гады, з вярсту пёр на руках і... сканаў. Мне тады было дзевяць год. (*Паўза*). Помню хавалі ў аднэй магіле. Труна з труной поруч, адна каля другой, аж сем... Хацелася, ой як хацелася, каб і восьмая была... Ды не, Сымонка Скрыпка застаўся жыць... (*Паўза*). І жыцьцё было пуцёвае ў дзіцячым доме Скрыпку, дык не—уцёк, стаў валацугаю, Смыкам зрабіўся... Гэта ўжо было

пры блатным бацьку. Празывалі яго Сенька Грач. Каля пяці год быў у яго групе, калі аперыўся—быў раскол, адышоў... стаў на чале малодшых. Вандравалі па сьвеце; зімою часта галадалі, лета кожнае, праз тры гады, жылі на курорце. Апошні год, пры трэцім бацьку, працую на пабудове.

Камсамолец. Хто-ж твой трэці бацька?

Зьвягіна (*ускочыла*). Уй, мне ў кіно...

Камсамолец. Ідзі сабе ў кіно.

Зьвягіна. Што? От-жа не пайду... (*Садзіцца*).

Смык. Трэці бацька—Арцём Віхура. (*Усе зьдзіўлена глядзяць*). Так (*Паўза*). Хацелі было коцку даць, адчулі сілу, рука не паднялася). Сіла сілу паважае. (*Пауза*). Заела, за нутро ўзяло, што ён кніжкі чытае, будуе. Стаў і я чытаць, другіх вучыць... Так. Добрых дзесятак хлапцоў прыстроіў, каго куды... Два-тры хлапцы засталіся, ні за што ня хочуць стаць пуцёвымі... (*Уваходзяць два бяспритульнікі*). Вось яны малойчыкі...

Міцька. Здароў Смык!

Смык. Здарова! (*Да Цігра*). Цігру маё!

Цігр (*вітаючыся*). Даёш курыць.

Смык. Ня дам. (*Да ўсіх*). Ім байкот аб'яўлен... (*Сьмех*).

Міцька (*да Віхуры*). Дзядзячка, дай закурыць... Дай, ну што табе стоіць... Ну дай... Не даеш?... Пачакай-жа, гад ты печаны!..

Цігр. Арцем!—так і не дасі.

Віхура (*цьвёрда*). Ня дам. (*Уваходзяць: Хмара, Гніда, Хрушч*).

Міцька. Дык яны дадуць. (*Падбягае да Хмары*).

Хмара (*дае закурыць*). Калі ласка.

Міцька (*закурыўшы*). У каго табачок, у таго і празднічак. (*Скача*).

Гніда. Куры Цігр. (*Дае папяроску.*) І выпіць можна калі на тое пашло...

Цігр. Даёш. (*Да Смыка*). Сьцеражыся! (*Да ўсіх*). А вы, малецеся камсамольскаму богу, за раба божага Смыка. Ха-ха-ха! Круціць ён, наварачвае, але... ня выкруціцца з лап Цігра.

Смык. Ты што?

Цігр (*трусьліва*). Ды не, я так... (*Заграў гармонік, бяспрытульнікі выбягаюць скачучы. Сьмех. За імі выходзяць: Хмара, Гніда, Хрушч*).

Смык. А Міцька, яшчэ нічога... Такі вырву з лап Цігра. (*Пауза*). А Цігра (*ківае галавою*), цяжка, тры забойствы мае... (*Пауза*). Дык вось заела, за нутро ўзяло, што ён—бацька трэці, кніжкі чытае, будуе. (*Пауза*). Стаў і я чытаць, будаваць. (*Пауза*). А цяпер калі прыміце, будзе чацьвёрты бацька—камсамол.

Галасы. Нельга!

Рана!

Прыняць!

Зьвягіна (*ускочыла*). Рана, рана, нельга, нельга! Я ўстрымоўваюся... (*Сьмех*). Чаго сьмяяцца... Ён не расказаў аб другім факту хуліганства... Тут-та ён яўны хуліган...

Смык. Ня ведаю, хто хуліган... Справа вось у чым: Зьвягіна, выцурыўшы мяне з калідору, не хацела пусьціць у пакой камуну ТРАМ'ядра, якая тут жыве... (*Сьмех*).

Галасы. Правільна!

Быў такі факт!

Смык. Тады трам'ядраўцы, па канаце (*паднімае ўверх галаву*), палезьлі на другі паверх... (*Пауза*). Праўда, канат гэты я з рушнікоў зьвязаў, але што з гэтага, не на вуліцы-ж ім начаваць... (*Пауза*). Ну, то хто тут хуліган? (*Сьмех*).

Галасы. Прыняць!

Нельга!

Прыняць!

Віхура (*устае*). Прашу слова.

Альховы. Слова мае таварыш Віхура.

Віхура. Смык Сымонка, сапраўднае прозьвішча яго Скрыпка, прайшоў суровую жыцьцёвую школу і ўсё тое, што ён казаў, гэта праўда. Будаўніцтва электрычнае станцыі ўзбудзіла ў ім творчую энэргію, прызвала яго да жыцьця. Скрыпка Сымон, па майму глыбокаму перакананьню, падрыхтаваны для ўступленьня ў камсамол. Я прапаную прыняць яго. (*Аплёдысмэнты*).

Альховы. Галасую. Хто за? Абсалютная большасьць. Супроць? Трое. (*Пауза*). Пытаньняў больш няма? (*Аглядаецца*). Сход закрыты.

Зьвягіна (*махае рукамі*). Таварыш Альховы! Слухай! Запішы, што я ўстрымалася (*Сьмех*).

Альховы (*усьміхаючыся*). Можна. (*Разыходзяцца*).

7. Бяру афіцэра

Беразоўскі (*сядзіць у куце, перастаўляе шахматы*).

Хмара (*уваходзіць, садзіцца*). Бяру афіцэра.

Беразоўскі (*не зьвяртае ўвагі*). Шах каралю.

Хмара. Шах і мат. (*Піхнуў рукавом шахматы*).

Беразоўскі (*ускочыў*). Я...

Хмара (*устаў, спакойна*). Як былінка, адзін...

Беразоўскі (*нэрвуецца*). Я... мы...

Хмара (*усьміхаючыся*). Кароткае замыканьне... (*Пауза*). Каранасты, у самога сябе ўрос...

Беразоўскі (*многазначна*). Сыграем яшчэ!?

Хмара (*махнуў рукою*). Прайграна да-ра-гуша! Нішто сабе ягадка!? У падхалімы да Віхуры...

Беразоўскі. Што?

Гніда (*уваходзіць, паднімае шахматы*). З строю выбіты... (*Глядзіць на Беразоўскага*). Калі што бяру афіцэра... (*Пад нагамі хруснула*).

Беразоўскі (*усхвалявана*). Як?

Гніда. Афіцэрышка ў маіх руках... (*Паказвае*).

Беразоўскі (*нэрвуецца*). Ды ну вас! (*Памкнуўся ісьці*).

Гніда (*злосна*). Эй, гаспадзін, ня рызыкуй!.. (*Мячэй*). Дай на паўлітроўку...

Беразоўскі. Няма.

Гніда. Знойдзеш!

Беразоўскі (*шукае ў кішэнях*). Такі няма.

Гніда (*хітра*). Барахлішка маеш...

Беразоўскі. Брыдота!

Гніда. Но, но, ціхэй на павароце... (*Пауза*). „На сьметнік гісторыі...“ Ха-ха-ха! Гэты сьметнік яшчэ...

Беразоўскі (*перарывае*). Ваняе...

Гніда. І здорава. (*Падносіць кулак*). Ох, як ваняе, сьмярдзіць!..

Беразоўскі (*адштурхнуў ад сябе*). Балота!

Хмара. Балота!?

Гніда. Ой, не чапай балота... (*Пауза*). Навошта парушаць спакой у краі, дзе балота зьяўляецца адзінаю ўцехаю... Колькі казак, легенд, песень, розных мэлёдый з балотам зьвязана...

Вадзім (*увайшоўшы, чуе апошнія словы*). Асушым балоты, зьявяцца новыя песьні, мэлёдыі, легенды...

Беразоўскі (*рад*). Правільна! (*Пауза*). Сынку, дарагуша...

Гніда (*зласьліва*). Няхай сынку пасьсе сьвінку...

Хмара (*да Вадзіма*). З маладых, а раньні...

Вадзім. Ба-ло-та!

Віхура (*увайшоўшы*). Трэба асушваць...

Гніда. Што?

Віхура. Балота. (*Пауза*). І ў балоце золата бывае...

Беразоўскі. Трэба, дарагуша, ой як трэба... Буланы да балота прывыкшы і той заграз...

Гніда. Туды яму і дарога!...

Хмара. Папхнуць, дый калом па галаве!...

Віхура. О, не! (*Пауза*). Выцягнулі мы яго, падкармілі, пабег стары падскакваючы...

Хмара. Кляча!..

Віхура. У добрай гаспадарцы і кляча патрэбна... (*Глядзіць на раскіданыя шахматы*). Давай стары, сыграем...

Гніда (*паказвае*). Афіцэрышка ў маіх руках...

Віхура (*усьміхаючыся*). Нічога, пешкамі заменім... (*Садзіцца за шахматы*).

Гніда. Эх... у афіцэра... маць. (*Кідае фігуру*).

Віхура (*усьміхаючыся, паднімае*). Бяру афіцэра.

Гніда (*нэрвова*). Ня людзішкі, а... сволачы! (*Хутка выходзіць, за ім Хмара*).

Вадзім (*паглядзеў*). Жыцьцё, гэта шахматная ігра!?

Віхура. Шах каралю!

Беразоўскі. Мат каралю!

Віхура. Шах і мат!

8. Ту кіін эй фарм із ноат ту вьюў эй баскет

Скрыпка (*чытае пра сябе*). Соў ор аддзервайс дзі вор эмауд дзі кэпіталістык уорд энд Юніон Соўвет Соўшыэлістык рэпаблік із апэвойдэбл. (*Да Марыны*). Марынка, ўсё-ж, калі яна пачнецца?

Марына. Што?

Скрыпка. Вайна.

Марына. Якая табе вайна?

Скрыпка. А такая, ядрона хны, што: ту кіін эй фарм із ноат ту вьюў эй баскет... (*Пауза*) А па нашаму, па беларуску, бяз усякіх: гаспадарку весьці не кашалі плесьці... (*Чытае*). Дзі эканомікал крайзыс гэд окюпай олл дзі кэпіталістык каўнтрыс. Юроўп із гэаспінг ін дзі клэатчэс оф дзі эканомікал крайзыс.

Камсамолка (*чытае*). Уэльс вооз стронглы экшыоус эт мітынг эй лэйдзі. Сноў увайт фэйс...

Скрыпка (*прыслухоўваецца*). Лахудра.

Камсамолка. Хто?

Скрыпка. Твая лэйдзі. (*Схапіў камсамолку*). То-лі нашы дзеўкі калгасныя: ядроныя, румяныя, дзябёлыя... Адным словам кроў з малаком.

Камсамолка (*вырвалася, чытае*). Сноў увайт фэйс...

Скрыпка. Фэйс... шмэйс...

Марына (*да Скрыпкі*). Кінь бузіць, іначай...

Скрыпка (*перарывае*). Іначай... Хай гэту чытае. (*Дае кніжку*).

9. Кракадзіл гарохавы на чарапасе верхам.

Вадзім (*канчае афармляць насьценную газэту*). А лоўка ты яго схапіў. (*Разглядае карыкатуру*). Гніда, гідра рэвалюцыі... сказаў Сымонка Смык, а цяпер ангелец Скрыпка...

Альховы. Ангелец?

Вадзім. Ага. Крукам сядзіць над ангельскаю моваю...

Альховы (*разглядае карыкатуру*). Можа, хіба крыху вусы падправіць?

Камсамолец. Кінь мусоліць і так добра. (*Пауза*). Каб Хмару яшчэ...

Альховы. На чарапаху яго, ці што?

Камсамолец. Лоўка! Кракадзіл гарохавы на чарапасе верхам...

Альховы. Вырашана аднагалосна. (*Пауза*). Толькі Зьвягіна ўстрымоўваецца... (*Паказвае карыкатуру. Сьмех*).

Зьвягіна (*увайшоўшы*). Чаго вы рагочаце? (*Падыходзіць, разглядае*) Іш ты, машыністы...

Камсамолец. На ўсіх парах нясецца ўперад...

Зьвягіна. Устрымоўваюся ад аналізу.

Альховы. Чаму?

Зьвягіна. Гэроям дня ня можа быць адзін Віхура... Дзе масы?

Вадзім. На будоўлі, разам з ім. Глядзі... (*Паказвае*).

Зьвягіна. А элемэнты культработы ў агульнай сыстэме. Дзе я, загадчыца клюбу? Верхаглядзтва, яўная недаацэнка, загібы, апартунізм...

Камсамолец. Чаго ныеш? (*Паказвае карыкатуру*). Паглядзі, мой сьвет, падзівіся, кім ты есьць...

Зьвягіна. А-ах! (*Узрыў сьмеха*). Я ўстрымоўваюся... О, не! Я супярэчу! Я не дазволю!.. Я забараняю вывешваць гэту паршывую газэтку... Я... я...

Камсамолец. Паглядзі, мой сьвет, падзівіся, кім ты сьць... наша культработа.

Зьвягіна. Разьвяліся розныя калегіі, камісіі, падкамісіі, гурткі, шмурткі... а хіба гэта дапамагае рабоце?.. (*Пауза*). О не, культработа разгорнута...

Камсамолец. Калі што і робіцца, дык толькі дзякуючы парткалектыву... (*Уваходзяць рабочыя, разглядаюць газэту, сьмех*).

1-ы рабочы. Хо-хо-хо!

2-гі рабочы. Здорава!

Хмара (*злосна*). Што? Мяне... Ідры тваю з такою самакрытыкаю. (*Хапае газэту*).

Камсамолец. Но, но, но!

1-ы рабочы. Ня дурачся... (*Вырваў газэту*).

Камсамолец. Ха-ха-ха! Але-ж трэба так схапіць...

Відук (*чытае*). Кракадзіл гароҳавы на чарапасе верхам... Ха-ха-ха! Ха-ха-ха!

10. Хопіць таўчы ў ступе ваду

Інструктар (*дае сьвісток*).

Галасы. Лявоніху!

Юрачку!

Таўкачыкі!

Зьвягіна (*убягае*). Але, але, таўкачыкі!...

Галасы. Хопіць таўчы ў ступе ваду!

Даёш!

Наш!

Новы!

Будаўнічы!

Інструктар. Танец будаўнікоў. (*Сьвісток. Музыка. Танцуюць вытворчы танец*).

Заслона

(*Канец будзе*).

Эдуард Самуйлёнак

Цагліна казэмату

Апавядальне

... Глухая ноч. Лютуе вецер. Шуміць дождж і енчыць дрот правадоў. Недзе глыбока ў прадоньні цемры гаснуць нясьмелыя агні. Неспакойным сном, пад сьвіст і гул непагоды засыпае горад.

І толькі ён, вартавы цэнтральнага паста застаецца адзін перад тварам звар'яцелай стыхіі. Цэнтральны пост, гэта пляцоўка на вышыні чацьвёртага паверху, на самым падзеле даху турмы. Гэта чатырохкутны ліст чыгуну, абгароджаны пераплётам паручняў, прыціснуты падобным да грыба прыдашкам. Па гэтым гулкім лісьце чыгуну, крочыць узад і ўперад, крочыць навокал слупа, што трымае прыдашак, чалавек у шэрай шынэлі.

Стыгнуць пальцы, што сьціскаюць вінтоўку. Твар ледзянее пад ударамі ветру. Знобкія струменьні дажджу спаўзаюць за каўнер і ўядаюцца ў цела.

Крочыць чалавек у шэрай шынэлі. Беспарадна шукае прытулку ад ветру і дажджу. Гэтага прытулку няма.

Сьвятло дугавых ліхтароў на дварэ турмы—не сьвятло, а каламута. Калышуцца ліхтары, і плешча нясьмелымі адценьнямі на дах турмы гэтая агідная бурая каламута. Яна адстаялся ў чатырохкутніку сьцен агароды нібы вада ў іржавым вядры і, нячыстая, лягла на брудны асфальт двара.

Суровыя інструкцыі турмы: вартавы цэнтральнага паста павінен бачыць двор і сьцены агароды і трымаць сувязь з вартавымі, сьцен і ўнутранага патрулю—зьведзены на нішто. Нічога ня ўчуць, нічога ня ўбачыць.

Узьнесены высока над горадам у чорную і дзікую ноч, бездапаможна кідаецца чалавек. Сьціскае ў руках непатрэбную вінтоўку крочыць з кута ў кут і навокал слупа.

Навокал пляцоўкі глухая ноч. Лютуе вецер. Шуміць дождж. Плача дрот правадоў. Душаць хвалі цемры сьвятло дугавых ліхтароў.

Вартавы падбягае да ўскраю пляцоўкі, перахіляецца цераз паручні і крычыць у роспачы, сабраўшы апошнія сілы:

— Ка-ра-ул! Слухай!—

Адказу няма. Вецер і ноч паглынулі крык. Маўчаць пасты. Маўчыць турма. Трывожны сон пануе пад сховамі казэматаў.

І зноў крычыць вартавы. Крычыць распачліва і з страхам у голасе:

— Слу-хай!—

І зноў паглынае ноч гэты працяглы крык...

Вартавы зноў крочыць па гулкім мэталю. Знобкім холадам апальвае рукі вінтоўка. Ён забываецца на інструкцыі і закідвае за плячо рамень стрэльбы. Ён хавае рукі ў рукавы і апіраецца плячыма аб слуп, што трымае прыдашак.

Больш ня будзе хадзіць па пляцоўцы вартавы цэнтральнага паста. Будуць праходзіць дні і ночы, будзе гудзець вецер і дождж, будзе бушаваць мяцеліца, будуць галасіць правады, будзе сьмяротным маўчаньнем маўчаць турма.

Будуць крочыць падкаваныя салдацкія боты, і будзе мерна званіць пад нагой вартавога чыгун пляцоўкі цэнтральнага паста. Але гэты вартавы, больш ня ступіць нагой на звонкую пляцоўку.

Бо ён згубіў прытомнасьць, што зусім непрадугледжана інструкцыямі для варты. Бо ў гэты час гаснуць ліхтары і цераз паўтарасажнёвую сьцяну агароды на турэмны двор саскакваюць адна за аднэй бяззычныя і рухавыя постаці. Разьлягаюцца стрэлы і ўжо няма ніводнага з вартавых усходняй сьцяны і ўнутранага патрулю. І бадай, што не застанецца ў жывых і сам вартавы цэнтральнага паста, бо ён нарушыў інструкцыі і ў патрэбны час ня выкарыстаў гузік электрычнага званка.

* * *

Чыгунныя пліты сьцёрліся пад бязьліччу крокаў вартавых, што прайшлі на працягу дзесяткаў гадоў па звонкім чыгуну. Засталася іржавая сьцежка навокал слупа. А ў пустых казэматах, у вільгацыі сьцен, пад цьвілымі скляпеньнямі камэр, у гулкіх калідорах, на іржавых спляценьнях ваконных кратаў у смуродным, гнілым нутры турмы, зусім нічога не засталося ад тых, чыё жыцьцё загасла ў гэтым каменным мяшку...

І Сьцяпанавіч адвёў вочы ад іржавае паверхні чыгуннай пліты пляцоўкі. Ніць думак, чарга пасьлядоўных вобразаў перажытага, парвалася.

Сьцяпанавіч убачыў унізе, пад сабой руды хрыбет даху, чатырохкутнік двара, а навокал, пярэстую блытаніну гарадзкіх дахаў, пасечаную каляінамі вуліц.

Сонца ўзьнмалася з-за сініх, далёкіх лясоў. Раніца над горадамі была спавіта вэлюмам дыму фабрычных комінаў. Горад абуджаўся. Вуліцы зьвінелі. Ішлі рабочыя дзённых зьмен.

Сьцяпанавіч з вышыні пляцоўкі адрозьніваў у плыні пешаходаў работніц тэкстыльнай фабрыкі імя Лібкнэхта ад работніц фабрык

Швэйпрому, рабочых мэханічнага заводу, ад рабочых сталяліцейнага. Яны ішлі суцэльнай паводкай, тэкстыльшчыкі, ліцейшчыкі, друкары, рабочыя электрстанцыі, дэпо, лесапілак, цагельняў. Яны сыпяшаліся пасьпець да тае пары, пакуль ускрыкнуць рознагалосымі гудкамі тыя, што пакуль яшчэ маўкліва выкідваюць у ранішнюю сінь хмары сьветла-шэрага дыму.

Час ад часу, ад пешаходаў адлучаліся рабочыя ў жоўтых, брэзэнтавых блюзах. Гэта былі будаўнікі. Яны праходзілі цераз вароты і зьяўляліся на вузкім турэмным дварэ. Да Сьцяпанавіча далятаў гоман. Рабочыя расьсядаліся паўз сьцен агароды, стаялі гурткамі, праходжваліся па дварэ. Чакалі пачатку работ.

Сьцяпанавіч пасунуў шапку на патыліцу, так, як гэта ён рабіў у дні маладосьці. Шугануў вецер, крануў жорсткія, з срэбрам сівізны, валасы. Сьцяпанавіч з нязвыклаю выразнасьцю адчуў тое, што лягло на плечы грузам цяжэйшым ад шасьці дзесяткаў гадоў, беззваротна зьнікла ў сіні перажытага і больш не зьвярнуцца яму назад. Шафранавы твар Сьцяпанавіча, стары, суровы, пасечаны змаршчакамі твар, кранула маладая і спакойная ўсьмешка.

Прысадзістая, напоўразбураная абстрэлам у часы грамадзянскай вайны турма, што цэлых дзесяць гадоў глядзела сьляпымі вачыма пустых казэматаў на росквіт новых дзён, будзе разбурана. Вялізныя дваццаціфунтовыя цагліны, паражаюць сталёвыя сківіцы камнядрабілак і створаць матар'ял для бэтоннай масы. Замест распоўзлай турмы, ад сьцен агароды якой агідліва адсунуліся акуратныя і чыстыя пабудовы вакзалу і спуджана разьбегліся вуліцы і завулкі, вырасьце на вакзальным пляцы пабудова рабочага клюбу.

Пругкі, ільсьняны асфальт зальле тое месца, дзе прыгнятала зямлю цяжарам тысяч тон цэглы, жалеза і цэмэнту турмы.

І ён, брыгадзір Сьцяпанавіч, на чале атраду будаўнікоў, прыйшоў камандаваць разгромам гэтага каменнага мяшка. Ён стаяў на пляцоўцы паста, як на капітанскім памосьце. Перад ім расьцілаўся, атулены ў зеляніну сквэраў і садоў, горад, шматпаверхія дамы, коміны фабрык і заводаў якога засланялі краявід, аценены празрыстымі напластаваньнямі дыму.

Гэта быў горад, у якім некалькі дзесяткаў год пражыў Сьцяпанавіч. Барацьба Сьцяпанавіча, аплаціла кожны камень у гэтым горадзе. Ёй аддаў Сьцяпанавіч усё, што мае чалавек у жыцьці. Зараз гэты горад быў уласнасьцю тых, што ішлі на покліч заводаў звонкім, ранішнімі вуліцамі. Значыць, уласьнасьцю Сэцяпанавіча быў гэты горад і гэтыя імкнёныя дні з іх рытмам працы, падпарадкаванай адзінаму пляну, адзінай волі партыі. Ніколі барацьба Сьцяпанавіча ня была па-за калектывам, і гэты магутны калектыў атрымаў перамогу значыць атрымаў перамогу і Сьцяпанавіч.

Такім чынам, мае права ён, Сьцяпанавіч, стары пралетары стаяць на капітанскім памосьце і гаспадарчым вокам пазіраць на жыцьцё і работу роднага гораду, на каменьнях якога была кроў і пот яго і яго братоў па клясе.

А калі так, гэтым аплочана барацьба.

І яшчэ раз усьміхнуўся гораду, раніцы і сонцу брыгадзір Сьцяпанавіч.

* * *

Гучным басам гудзеў гудок дэпо. Абкураныя корпусы цэхаў вагонных майстэрняў чадзілі чорным дымам кароткіх сваіх дымароў. Перад вачыма будаўнікоў, як на далоні была работа вялізнага і складанага мэханізму чыгуначнага вузла. Ад самага вакзалу, што, выгінаючы круты хрыбет защклёнага даху, паглынаў у сябе безьлічшляхоў, рухаліся даўжэзныя ланцугі вагонаў, праносіліся, вымахваючы струменьні пары, клапатлівыя манэўравыя паравозы, перабягалі постаці людзей. Лязгалі буфэры, пяялі дудкі сыгналістаў, грымелі жалезам майстэрні дэпо, і над усім гэтым панаваў голас галоўнага гудка, што настойліва вёў нізкую басавую ноту. Прыходзіла на работу дзённая зьмена.

— Гэта вось, дык работа,—стукнуў ломам у склёпку на карнізе муляр Апенка.

— Паглядзець, дык для вока прыемна!

— А чым наша горш?—спытаў яго камсамолец Рубінчык.— Будаўнікі—ганаровая прафэсія.—

Апенка аглядзеў шэрагі рабочых, якіх расстаўлялі па даху тэхнік і Сьцяпанавіч, паглядзеў сабе пад ногі і зноў стукнуў ломам. З карнізу пасыпаўся парашок іржаўкі.

— Ганаровая. Гэтай падле скуру лупіць,—матнуў рудым чубам Апенка.

Рубінчык усьміхнуўся:

— Праўда, да мерцьвячыны падобна.

— Паскудзтва.—Са злосьцю сказаў Апенка.—Труна, чорт.—

Ён раптам, моцным ударам прабіў ліст даху і пакінуў у ім лом старчмя.

— Непарадкі, Рубінчык. Наскрозь непарадкі.

— У чым ты бачыш непарадкі, таварыш Апенка?

— Вось у чым.

Апенка пасунуўся бліжэй да Рубінчыка.

— Дарэмна разбураюць гэтую хатку. Ці мала ў нас прыяцеляў? Мала такіх, што ня толькі пасадзіць, расстраляць трэба? Дык вось, у гэтую кватэру, калі ласка, і сядайце. Яна якраз прыстасавана. А то ў нас у спраўдом. Чырвоны куток ім, сукіным сынам, раз у дэкаду лазьню! Я-б ім паказаў лазьню, больш не засьвярбела-б!—

Апенка паказаў магутны кулак.

— Во! Бачыў фідуцыю?

Чорныя вочы Рубінчыка заіскрыліся сьмехам. Ён аглядзеў вялізную постаць Апенкі з галавы да ног. Той канчаткова зазлаваў, і палымнеючы яго чуб бурна лез з-пад шапкі.

— Я-б ім, гадам,—крычаў Апенка, вымахваючы кулакамі.—Я-б ім паказаў раз у дэкаду лазьню!—

— Апенка, не звaліся!—крыкнуў нехта з рабочых.—Костак не пабярэш.

— Апенка праўду кажа,—заўважыў маленькі і спакойны рабочы, што заўсёды і ўсюды, трымаўся ззаду.—Варта паслухаць.

І ён, па звычцы, зайшоў і прыстроіўся за шырокім хрыбтом Апенкі, што патрасаючы кулакамі напіраў на Рубінчыка.

— Ты толькі слухай, што Апенка табе набаіць,—падштурхнуў нехта з рабочых маленькага.

Рабочыя зьбіліся цесным гуртком навокал Рубінчыка і Апенкі. Тыя, што знаходзіліся далей, прыслалі даведацца ў чым справа.

Нарэшце, Рубінчыку ўдалося злавіць Апенку за рукаў блюзы.

— Пачакай Апенка,—сказаў Рубінчык спакойна.—Тут-жа зусім простая справа.

— Цішэй, таварышы!

Нарэшце, гоман сьціх і ўсе ўчулі словы Рубінчыка.

— Савецкая ўлада,—сказаў Рубінчык,—за ўвесь час яшчэ ні разу ня ўключыла ў пляны будаўніцтва, пабудову турмаў. Гэта нам непатрэбна. А гэтая-ж турма, патрабуе такіх сродкаў для рамонту, што на іх можна пабудаваць цалкам новую пабудову. Такім чынам, што нам з ёй рабіць?—Мы яе разбураем і выкарыстаем яе будаўнічы матар'ял. Вось і ўсё.

— Усё?—кпліва спытаў Апенка.

— Ёсьць і другі бок. Ворагаў рэвалюцыі пралетарыят карае бязьлітасна. Але мы ня гноім сваіх ворагаў у каменных мяшкох. Дармовая патрата сродкаў і ніякага выхаваўчага эфэкту. Мы альбо зьнішчаем ворага фізычна, альбо пакідаем жыць, але ў такіх умовах, каб ён ня гніў зажыва, а здолеў выправіць сваю віну перад пралетарскай рэвалюцыяй. Бязумоўна, гэта кажацца ў адносінах тых, хто не заслугоўвае на кару сьмерцю. А такія турмы, як гэта, для нашых мэтаў, таварыш Апенка, не падыходзяць. І нават, каб яна была зусім цэлай, наўрад ці была-б яна выкарыстана як турма. Вось зараз, усё-

— Правільна,—сказаў нехта з грамады рабочых.

— Твой гнеў справядлівы, таварыш Апенка,—закончыў Рубінчык.—Але ворагаў ня трэба караць іх-жа мэтадамі.

— Зусім правільна!

— Можа яно і правільна,—пакруціў галавой Апенка.—Але, каб на маю руку, я-б з імі разабраўся.

І зноў вялізны кулак Апенкі пагразіў яго клясаваму ворагу. У гэты момант, сьціх гудок дэпо. Адзін за другім выходзілі са строю галасы фабрык,

— Хлопцы, рыхтуйся!—крычаў памочнік брыгадзіра, камсамолец Бэкман.—Разьбівайся на групы па шэсьць чалавек.

Пад ботамі рабочых угіналася жалеза, грымеў і дрыжэў дах, і здавалася, што нутраным, цяжкім стогнам енчыць старая пабудова

Прабягаючы міма, тэхнік скінуў куртку і абцёр рукавом пот на ілбу.

— Пагрэеце ручкі, хлапцы,—сказаў ён.—Скрозь цэмэнт, кладка ў пяць цаглін і толькі дзьве ўнутраных сьцяны з гідраўлічнае вапны. Ліха яе матары.

Ён пабег далей, і пад яго нагамі, праржавелыя, гнуткія лісты загаварылі надломаным, скрыпучым голасам.

— Закачвайце жалеза ў скруткі. Лістам ня пушчайце,—даваў указаньні Бэкман.

— У Амэрыку заляціць.

— Ня лезьце на карніз,—папярэджваў Сьцяпанавіч: наскрозь іржавы!

Нарэшце ўсё была гатова. Сьцяпанавіч узьняў руку і па вайсковаму, выразна скамандаваў:

— Па-чы-най!

І разам—узьняліся і ўдарылі ламы. Прарэзьліва рыпнула жалеза. Яшчэ і яшчэ раз дружныя ўдары. Задрыжэў і загуў дах. Вецер праляцеў і зьмёў парашок іржаўкі.

Ламы разьбівалі швы склёпкі лістоў, ірвалі і камячылі жалеза, прабівалі лісты, закручваючы іх у скруткі. Людзі пасоўваліся бліжэй да карнізу даху, пакідаючы за сабой голыя рэбры крокваў.

Нарэшце, перакаціўся цераз карніз першы вялізны скруток і з лёскатам, перакручваючыся ў паветры, раскідваючы шмацьцё склёпак, паляцеў уніз. Удар жалеза аб камень даплыў здалёк, нібы рэха дальніх грымотаў. Затым пераваліўся цераз карніз яшчэ адзін скруток, потым яшчэ і яшчэ. Неадступна, напорам, закачвалі ламы заструпелую, іржавую скуру мёртвай пабудовы.

Сьцяпанавіч прабраўся па аголеных крокваx да коміну, абапёрся на яго плячыма і задумаўся. Проста перад ім, недалёка ад агароды турмы, прасьціліліся паблёскваючы стальлю, рэйкі. На дварэ паравозарамонтнай майстэрні нізкай і абкуранай пабудовы, рэек была густа, і яны здаваліся спляценьнем павуціньня. Там, на дварэ, сярод гэтага сталёвага спляценьня, на заваротнай пляцоўцы, перад самым варотамі майстэрні, павольна рухаўся вялізны паравоз. Навокал яго завіхаліся падобныя да рухавых жучкоў, рабочыя. Паравоз паслухмяна і спакойна заварачваўся намерваючы сваім востраносым катлом у правал дзьвярэй майстэрні.

Адсопваючыся вынырнуў з-за шэрагаў таварнага паражняку манэўравы паравоз, прагрукаў на стрэлках, зручна выпісаў паўкола і апынуўся пад самым тэндэрам волата.

У вароты павольна прайшоў даўгі кацёл, бліснула арматура ў будцы машыніста і праз момант манэўравы адкаціўся назад з пляцоўкі. Дзьверы майстэрні, шырачэзныя і чорныя, жарлочна разьзяўляліся.

Манэўравы заклапочана сьвіснуў, загрукаў на стрэлках і памкнуў, перасякаючы сталёвую блытаніну, некуды ў глыб вузла наводзіць парадак у запоўненых паражняком тупікох.

— Запарылі чыгуначнікі добрую машыну,—сказаў малады голас за плячыма Сьцяпанавіча,—абязьлічка ў іх, відаць, яшчэ ня здохла.

Сьцяпанавіч азірнуўся. Ззаду стаяў тэхнік.

— Дзе абязьлічка?—спытаў Сьцяпанавіч.

— Ды там, у дэпо. Паравоз угробілі. Хіба ты ня бачыў? А яшчэ гаспадаром цябе ў-ва ўсім горадзе лічаць. Ай-яй-яй... І ў газэце партрэт давалі. А ён зьнівечаны паравоз праглядзеў.

Тэхнік жартаваў, і малады твар яго расплываўся ў поўназубай усьмешцы. Сьцяпанавіч паклаў яму на плячо руку.

— Я думаў аб чыгунцы, Сымон,—сказаў ён аб чыгунцы і аб гэтай турме. І паравоз хаця заўважыў, але аб абязьлічцы не падумаў. Бязумоўна, дыхае яна яшчэ.

Сьцяпанавіч памаўчаў і потым, нібы наважыўшыся ў думках, хутка сказаў:

— Я табе калі-небудзь раскажу гісторыю аб чыгунцы, і аб гэтай турме. Гэта для цябе будзе проста як палітграмата.

Сьцяпанавіч сьціснуў бровы, і твар яго стаў панурым.

— Гэта цяжкая гісторыя, Сымон.

— А зараз нельга?—нясьмела спытаў тэхнік.

— Зараз нельга—адказаў Сьцяпанавіч.—Вось ты лепш схадзі на той канец даху і паглядзі, каб сэзонныя надта ня крышылі жалеза. Шкода.

Тэхнік паслухмяна завярнуўся і пайшоў туды, дзе навесіўся над карнізам агромністы скрутак жалеза. Сьцяпанавіч праводзіў поглядам высокую і стройную постаць тэхніка і ўздыхнуў. Ён быў моцны і спрытны.

...Гэткім быў некалі Пятро.

. . . . . .

Рабочыя працавалі дружна. З кожнай хвілінай перавальваліся цераз карніз важкія рулоны жалеза. Угінаўся пад ударамі ламоў дах. Адвальваліся пласты штукатуркі сьцен і рудое воблака іржаўкі спавівала дах і цягнула па ветру над вакзальным пляцам.

На пляцы застанаўліваліся людзі, зьбіваліся ў гурткі і наглядалі за тым, як лятуць, перакручваючыся ў паветры, скруткі жалеза, нібы з хрыплым карканьнем падаюць на зямлю падстрэленыя драпежныя птушкі.

* * *

На другі дзень дах быў зьняты і кучай іржавага ламачча ляжаў на дварэ. Разьбіралі сталяваньне трэцяга паверху. У вільготныя ямы казэматаў, упяршыню за даўгія гады, глянула сонца. Забраныя ў краты вокны прасьвечвалі цьмяна, нібы налітыя вадой.

У воблаках атрутнага пылу вапны і цэмэнту, працавалі брыгады рабочых. Цэглу спушчалі ўніз па жалабох, сьмецьце папросту выкідвалі за сьцяну. Для бэтоннай масы патрэбна чыстая цэгла. Гэтак-жа скідвалі на спэцыяльна адгарожаны вучастак двара жалеза сьцен і сталяваньня. Унізе, рабочыя-сэзоньнікі складалі цэглу ў штабэлі.

Званіла, грымела жалеза, шоркала па жалабох цэгла, час ад часу з грукатам адвальваліся на падлогу камлыгі сталяваньня. Па гнуткіх масткох прабягалі рабочыя і гналі перад сабой нагружаныя цэглай тачкі.

Работа ішла бесьперабойна і хутка. Брыгада Сьцяпанавіча была на чале. Людзі працавалі з запалам і, нават, неахвотны Апенка падцягнуўся і перавыканаў норму. Астатнія сто чалавек, што былі разьбіты на чатыры брыгады, раўняліся ў рабоце на брыгаду Сьцяпанавіча.

Да сканчэньня работы, палова сталяваньня была зьнята. Сьцяпанавіч запісаў на дошцы ў карлідоры лічбы выпрацоўкі брыгад і сказаў тэхніку:

— Дзённая выпрацоўка перавыканана на пяць процантаў.

— Раскідаем турму, як вароньняе гняздо,—адказаў тэхнік,—пабаявому працуюць хлопцы.

Ад гэтага ў Сьцяпанавіча быў добры настрой. Да дому ён ішоў наўмысьля больш доўгім шляхам, каб зірнуць на пабудову маста на рацэ. Стоячы на ўзьбярэжжы, Сьцяпанавіч доўга аглядаў рыштаваньні. маста дзе ва ўпартай рабоце завіхаліся людзі. Адобрыў работу паравога крану, які, выцягваючы шыю, насіў часткі фэрмаў, будуючага маста і з захаванай сілай, асьцярожна, клаў на пасьціл агромністыя кавалкі мэталю, а потым, не сьпяшаючыся, з развагай, зноў нахіляў сваю даўгую шыю над крутабокай лайбай.

Слухаў музыку будоўлі. Раскатамі, у рознабой, пасьцілаючы над ракой гонкае грэха, працавалі малаткі клёпшчыкаў. Зьвінелі пілы, грукаталі молаты і сякеры, цяжка бухалі капры на пабудове дамбы. Па берагох снавалі аўтамабілі, што падвозілі матар'ялы. На гэтай

пабудове работа ішла поўныя суткі. Над першай аркай фэрм маста, шырокім ветразем напяўся пад ветрам чырвоны транспарант:

УДАРНАЯ ПАБУДОВА

Павінна быць скончана да 7-га лістапада.

— Добра—сказаў Сьцяпанавіч сам сабе,—слаўна працуюць. Выглядае на чалавечую працу. Мы таксама павінны скончыць клюб да Кастрычніка.

Не сьпяшаючыся пайшоў па ўзьбярэжжы, намерваючыся выйсьці наўкольнай дарогай на сваю вуліцу. Але раптам вырашыў.

— Насьця, мусіць, толькі што прыйшла. Няхай спраўляецца. Зайду ў партком.

І завярнуў назад.

Партком знаходзіўся на другім паверху клюбу будаўнікоў. У каліdоры яшчэ Сьцяпанавіч учуў, што ў парткоме спрачаюцца. Два галасы перабівалі адзін аднаго. Чмялём гуў бас і нешта выкрыкваў слабаваты тэнарок.

— Куніцкі і Бэйліпсон — усьміхнуўся Сьцяпанавіч, намацваючы руку дзьвярэй.

У пакоі ўскалыхнулася воблака дыму.

— Сьцяпанавіч!—загрымеў бас—лёгкі на паміне.

Куніцкі ўстаў з-за стала і, паціскаючы руку Сьцяпанавіча, другой вольнай, пасунуў крэсла. Маленькі Бэйліпсон, што сядзеў на падваконьніку, ветліва кіўнуў Сьцяпанавічу і пачаў корпацца ў партфэлі.

— Аб чым ход?—спытаў Сьцяпанавіч,—чаго вас разносіць?

— Гутарым наконт вас,—адказаў Куніцкі,—хацелі аж на дом па цябе пасылаць, але, вось добра, ты сам зайшоў.

Куніцкі сядзеў, нахіліўшы над маленькім столікам вялізную камлыгу свайго тулава і, здавалася, ціснуў на гэты касабокі столік нявымоўна цяжкім грузамвялікага свайго цела. Ён прыплюшчваў стомленыя вочы, твар быў шэры, і таксама стомлены. У зарасьлях чорных вусаў Куніцкага, пахрыпвала загаслая люлька. Бэйліпсон, які неадрыўна пісаў нешта ў блёкноце, таксама меў стомлены выгляд. Выгалены твар прасьвечваў жаўцізнай, і на западлых віскох віліся срэбныя ніці.

У пакой напаўзалі цені зьмярканьня, аднекуль з-за сьцяны наплываў гул галасоў. У суседнім пакоі відаць адбывалася нейкае пасяджэньне. Было душна і накурана. Сьцяпанавіч аглядзеў сьцены, прабег поглядам па дыяграме выкананьня работ па аб'ектах будаўніцтва.

— Запарыліся, бядакі,—падумаў Сьцяпанавіч,—самая гарачая пара.

— Патрэбны тэмпы,—сказаў Куніцкі. Тэмпы давай, старая галёша

— Якія тэмпы?

— Такія, бальшавіцкія.

— Хіба ў нас дрэнныя тэмпы?

— Я гэта таксама казаў,—азваўся Бэйлінсон,—лепшых тэмпаў. цяжка і чакаць. Куніцкі пастукаў люлькай аб пазногаць.

— Апартуністы,—кпліва сказаў ён,—ныцікі, сукіны сыны.

Бэйлінсон саскочыў з падваконьніку і схапіў абераруч свой таўшчэразны брэзэнтавы партфэль.

— Я пайшоў,—кінуў ён прабягаючы да дзьвярэй. Можна спазьніцца. Дагаварвайцеся без мяне.

— Здольнае дзіцянё,—сказаў Куніцкі, калі зачыніліся дзьверы, слаўны хлапчук.

Сьцяпанавіч усьміхнуўся. Партарганізатару Бэйлінсону, была ад роду больш за пяцьдзесят гадоў. Гэта быў адзін з старых муляроў, таварышоў Сьцяпанавіча.

Куніцкі адкінуўся да сьцяны.

— Мала, Сьцяпанавіч. На два мэтры выбралі толькі ў трох. Мы справімся з задачай толькі тагды, калі індывідуальная выпрацоўка дасьць у дзень два з паловай мэтры. Інакш, мы зблытаем пляны.

— Дайце больш людзей.

— Нельга. Няма вольнай рабочай сілы. Калі пачнецца будаўніцтва, будуць і зямлякопы, і муляры, і каменшчыкі і бэтоншчыкі, а зараз разабраць пабудову ваша задача. А для таго, каб разабраць яе ў тэрмін, патрэбна, каб кожны рабочы выпрацаваў у дзень два з паловай кубамэтры разбору.

Сьцяпанавіч устаў і прайшоў да вакна. Ён убачыў раку і на ёй будаўніцтва маста. Там ясна гарэлі агні. Вячэрні змрок ахутваў гарадзкія вуліцы. Сьцяпанавіч глядзеў на раку, на агні, а ззаду, з паўцёмнага кута пакою, прыглушана рыкаў голас Куніцкага.

— Калі гарсавет вынес пастанову разабраць турму, я адразу вырашыў, што на чале работ павінна быць твая брыгада. Гэта самыя надзейныя хлапцы. Да таго яшчэ як прыступіць да будаўніцтва клюбу, перад намі шмат работы. Скрыначку патрэбна разабраць, выкапаць катлаваны, перапрацаваць цэглу, на драбілках работы шмат. Галоўнае тут, у тэрмін скончыць разбор. І гэта, ваша задача. Твая-ж задача ўзьняць выпрацоўку, стаць на чале сацспаборніцтва. Памятай! Калі ў дзень ня будзе двух з паловай мэтраў выпрацоўкі, мы правалім будаўніцтва ў тэрмін.

Куніцкі змоўк.

— Два з паловай кубамэтры,—прашаптаў Сьцяпанавіч. Кладка ў пяць цаглін і цэмант.

Ён ведаў, што гэта азначае. Для таго, каб разабраць на працягу рабочага дню два з паловай кубамэтры таўшчэразнай турэмнай сьцяны, ачысьціць кожную цагліну, патрэбна будзе працаваць так, каб ня было адрыву ні на адну хвіліну, каб быў чоткім і ўпраўным кожны рух. Брыгада на гэта можа не згадзіцца.

Перад вачыма Сьцяпанавіча паўстаў твар бузацёра—Апенкі. За ім вынікла яшчэ некалькі тых, якія заўсёды спрачаліся з адміністрацыяй наконт расцэнак, зрывалі нават зьдзельшчыну...

Але зараз-жа суровым поглядам глянуў камсамолец Бэкман, насьмешліва ўсьміхнуліся гарэзьлівыя вочы Рубінчыка, зьявіўся кучаравы Зьмітрок і сур'ёзны Андрэй, і Сьцяпанавіч аднаго за другім пералічыў ударнікаў сваёй брыгады. Гэта былі адданыя моцныя рабочыя.

Сьцяпанавіч думаў. Ён сам, з самага пачатку работ, вопытным вокам спрактыкаванага будаўніка бачыў, што разбор пабудовы, калі ня будзе дададзена рабочай сілы, зацягнецца. Сьцяпанавіч спадзяваўся менавіта на тое, што прыдуць новыя сілы. І яны былі неабходнымі, хаця брыгады муляроў і сэзонныя рабочыя працавалі напорна і ўпарта. Зараз стала відавочным, што гэтых новых сіл няма. Патрэбна ўзьняць тэмпыда такой ступені, аб якой нават сам Сьцяпанавіч думаў як аб нявыканальным.

— Ці вытрымаюць?—пытаў сам сябе Сьцяпанавіч.—І як іх падняць на гэтую справу?

Куніцкі не абзываўся. У пакоі было ціха. Зрэдку з-за сьцяны наплываў гоман. За вакном успыхнулі агні вуліц, і ў пакой пацякло малочна-белае паўсьвятло. Сьцяпанавіч напруджана ўтаропіўся ў вакно.

— Сам вазьмуся за работу,—думаў Сьцяпанавіч.—І дакажу, што ўсё-ткі два з паловай выпрацаваць можна.—

І зьяўлялася асьцярожная думка:

— А ці вытрымаю я? Шэсьцьдзесят гадоў!

Куніцкі ў кутку асьцярожна, нібы не жадаючы трывожыць Сьцяпанавіча, кашлянуў. І Сьцяпанавіч хутка адвярнуўся ад вакна і падышоў да стала.

— Вось што, Рыгор,—сказаў ён,—ты, бязумоўна, ведаеш, што азначае два з паловай. Але мы гэта зробім, Хлапцы прымуць. Я сам стану на чале ўдарнікаў і пакажу, як умеюць працаваць старыя будаўнікі. Інакшага няма ў нас выхаду.—

— Руку!—загрымеў у адказ Куніцкі.—Мазольную руку тваю, старая мясарубка!—

І Сьцяпанавіча сухая рука патанула ў магутнай далоні Куніцкага.

. . . . . .

Сьцяпанавіч задуменны ішоў вячэрнімі вуліцамі. Яго абганялі чародкі звонкагалосай моладзі, заклапочаныя людзі з партфэлямі,

рабочыя начных зьмен. Абмацваючы брук, асьляпляючы сьвятлом фар праляталі аўто. Заліваліся сыпкім звонам, грукалі на стрэлках ясна асьветленыя, падобныя знадворку да ліхтароў, трамваі. Вітрыны магазынаў, рэклямы кіно струменілі белае сьвятло электрычнасьці.

Сьцяпанавіч ішоў і думаў аб тым, што і ў бязладзьдзі на першы погляд вулічнага руху, ёсьць суровая плянавасьць жыцьця, Сьцяпанавіч думаў аб тым, як чотка і плянава працуе вялізны мэханізм будаўніцтва, што падпарадкаваны адзінай камандзірскай волі партыі. Сьцяпанавіч думаў аб тым, што і ён сам, ёсьць маленькая, але надзейная частка гэтага мэханізму. Яго шэсьцьдзесят гадоў абточваў, разцамі дзён барацьбы і працы, такарны варштат жыцьця і шчыльна, раз назаўсёды, прыгнаў на прызначанае месца ў магутным калектыве.

Павольна, задуменны ішоў Сьцяпанавіч вячэрнімі вуліцамі вецер лагодны і моцны павяваў у твар і шалясьцеў абшмальцованым брэзэнтам рабочай блюзы.

* * *

Першым па ўсходах ішоў Бэкман. За ім Андрэй і Зьмітрок Апошнім Сьцяпанавіч. Унізе, грукалі па чыгунных прыступках і перагаварваліся астатнія камсамольцы і двое ўдарнікаў, што прынялі выклік Сьцяпанавіча. Астатнія з брыгады Сьцяпанавіча засталіся на дварэ. Яны, і рабочыя іншых брыгад, ня прынялі выкліку і перад тым як прыступіць да працы спрачаліся і зацягвалі пачатак работ.

На апошняй пляцоўцы, дзе праз правал разабранага сталяваньня ў паўзмрок казэматаў прарвалася сьвятло дню, Бэкман спыніўся і прытрымаў Сьцяпанавіча за рукаў.

— Я ўпэўнены, што мы выканаем два з паловай,—сказаў ён.— Патрэбна толькі поўная мабілізацыя ўсіх сваіх унутраных сродкаў. Ніводнага лішняга руху.

— Ты, Бэкман, кажаш шмат лішніх слоў,—сурова адказаў Сьцяпанавіч.—Маблізацыя ўнутраных... Гэта ненадзейныя словы. Інтэлігэнцкія. Па-просту, па-рабочаму, цісьні, колькі ўлезе.

— Націсьнем,—азваўся Андрэй. Шкада толькі, мала нас. Здрэйфілі, нягоднікі.—

— І Міхась. А яшчэ камсамолец!—

— Нічога разгуляюцца.—

Сьцяпанавіч і камсамольцы з самага пачатку адчулі, што на іх устанавілася нясупынная ўвага ўсяго калектыву. Аб гэтым сьведчылі кароткія погляды ў іх бок, частыя перашэптваньні. Рабочыя знарок праходзілі каля іх, а тыя, што падвозілі цэглу да жалабоў, кожную хвіліну паведамлялі аб тэмпах работы груп Сьцяпанавіча, рабочых астатніх брыгад, якія працавалі ў правым крыле пабудовы.

Група Сьцяпанавіча была на воку ўсяго калектыву. Аб кожным дзесятку цаглін, які перавышаў звычачныя тэмпы, ведалі ўсе, пачынаючы

ад муляроў, што разьбіралі сьцены, да сэзоньнікаў, якія складалі штабэлі на дварэ і падрыхтоўвалі пляцоўку для камнядрабілак.

І таму, самі па сабе ўзьнімаліся тэмпы работы. Перад абедзенным перапынкам кудлаты Апенка зьмерыў мэтрам выбраную ім плошчу і зьдзіўлена пакруціў галавой.

— У чым справа?—спытаў яго сусед.

— Блізка мэтр з чвэрцю нагнаў,—сказаў Апенка, зьбянтэжана аглядаючыся па бакох.—Цьфу, чорт яе...

— Дык што, табе крыўдна?—

— А ты што, мо' пацешыць думаеш?—агрызнуўся Апенка.

Сусед змоўк, а Апенка пачаў разважаць аб тым, што дарэмна ён ня прыняў выкліку групы Сьцяпанавіча, і аб тым, што ў спаборніцтве чалавек працуе з запалам і заражае гэтым запалам іншых.

— Мэтр з чвэрцю да паўдня не нагнаў, бо галаганіў на бакі,— думаў Апенка.

— Але калі ўзяўся-б як належыць, дык нагнаў-бы. А калі яшчэ столькі сама з паўдня, дык як раз да вечара і было-б два з паловай мэтры і нават з пагонам. Чаго-ж мяне дзёрла, дурня...—

Апенка паглядзеў на работу суседа, а потым зазірнуў у другую каморку казэмату. Як у суседа, так і ў іншых рабочых, на вока, было каля мэтру.

— Крыху адсталі,—зазначыў Апенка.

Ён хвіліну пастаяў, а потым, асьцярожна ступаючы, пайшоў калідорам да групы Сьцяпанавіча. Першым ён убачыў брыгадзіра. Сьцяпанавіч разьбіраў прасьценак вакна. Мэханічнымі рухамі, бяз промаху, кірка выбівала цагліны з іх цэмантовых гнёздаў. Сьцяпанавіч падхопліваў цагліну левай рукой і, не азіраючыся, адкідваў ад сябе на сярэдзіну каморкі. Кожны рух быў разьлічаны. Зрываў і замяшаньня ня было. Сьцяпанавіч працаваў так, як працуе зладжаная, выверэная машына.

Камсамольцы працавалі без кашуль. Абкураныя пылам, які прыстаў да потных цел, яны білі кіркамі з напорыстасьцю і запалам. Глуха стукалі кіркі. Абсыпалася вапна штукатуркі і цэмэнт гнёздаў. Мерна грукала цэгла, падаючы на асфальт падлогі.

Апенка прыкінуў на вока выпрацоўку Сьцяпанавіча і пачухаў патыліцу.

— Паўтара кубамэтры!

Тое самае было і ў камсамольцаў. Нават у Андрэя з Бэкманам магадвала на мэтр і тры чвэрці. Апенка завярнуўся назад, але ў гэты час Сьцяпанавіч, які, здавалася, не прыкмячаў навокал нічога, спытаў:

— Ты што-ж, таварыш Апенка. Зусім ужо забаставаў?

Апенка ад нечаканасьці паткнуўся на пракладку для тачак.

— Я забаставаў?—пераспытаў ён. Гэта я забаставаў?

Сьцяпанавіч не адказаў. Ён працягваў работу.

Апенка хацеў сказаць, што яго выпрацоўка не на многа адстала ад выпрацоўкі ўдарнай групы, але ўспомніў, што ён сёньня першым выступіў супроць Сьцяпанавіча і ўстрымаўся. Ён зьвярнуўся і пайшоў, з сілай расьціскаючы абцасамі хрусткія кавалкі цэмэнту і цэглы.

Рука звычна схапіла абшмальцованую ручку кіркі. Апенка скінуў у кут шапку і ўпорыста расставіў ногі.

— Ну, зараз я вам пакажу забастоўку,—сказаў ён. І нашы ня горш за вашых.—

І з усяго размаху садануў кіркай.

Апенка ірваў з усіх сіл. Ён ня бачыў, як за яго сьпіной, у калідоры, спыніліся двое рабочых, паглядзелі на яго работу, пераглянуліся і зьніклі. Ён не надаў увагі і таму, што часьцей загрукатала кірка суседа. Апенка адвальваў цэлыя камлыгі сьцяны, крышыў пліткі цэмэнту, разрозьніваў цагліны і так, як і Сьцяпанавіч, мэханічна адкідваў іх левай рукою назад. Апенка даўно ўжо скінуў кашулю, і па яго шырокай сьпіне, паміж буграмі мускулаў, сьцякалі клейкія струменьні поту.

А брыгады ў гэты час неафіцыйна ўступілі ў сацспаборніцтва з групай Сьцяпанавіча. Гарачка тэмпаў перакінулася ў правае крыло пабудовы, падвоіўся лік выбранай цэглы. Сэзоньнікі ўнізе спачатку блыталіся, не спраўляліся з паводкай цаглін, і ўсхапіліся толькі тады, калі з гары сыйшоў адзін з тачачнікаў і крыкнуў бліжэйшым:

— Хлапцы, не разьвешвайце вушы! Там, на гары, так садзяць, што дух вон. Не адставайце, бо сорамна будзе.—

І двор закіпеў клапатлівым муравейнікам.

Калі забразгала чыгунная дошка, абвяшчаючы абедзенны перапынак, толькі рэдкія адзінкі рабочых зьявіліся на дварэ. Большасьць засталася на сьценах. І калі зноў азваўся чыгун, новы струмень цаглін з шолахам рушыў па жалабох, зрушылася з месца машына сацыялістычнага спаборніцтва і пайшла, з кожнай хвілінай набіраючы хуткасьць.

За поўгадзіны да сканчэньня работы, тэхнік прайшоў па ўсіх куткох і адзначыў у блёкноце, што выпрацоўка вырасла ледзь ня ў два разы.

* * *

Сьцяпанавіч заканчваў прасьценак. Да адведзенай вугалём лініі заставаўся пласт у дзьве цагліны. Лінія азначала тры кубамэтры. Норма на якую выклікаў Сьцяпанавіч будаўнікоў, была ўжо выканана. Але патрэбна было закончыць тую рэкордную норму, якую вызначыў Сьцяпанавіч сабе.

Праходзілі апошнія хвіліны работы. Сьцяпанавіч кідаў зукосу погляды на камсамольцаў. Андрэй, Бэкман і Зьмітрок заканчвалі ўжо

трэці кубамэтр. Іх рукі былі ўпэўненымі і спакойнымі. Іншыя сьпяшаліся, але Сьцяпанавіч бачыў, што і яны да канца работы закончаць гэтую звыш-ударную норму.

У Сьцяпанавіча работа падавалася марудна. Страшэнная ўтома ахоплівала цела, несьцярпімы боль азываўся ўва ўсіх суставах. Пальцы ня згіналіся, і, калі Сьцяпанавіч адбіваў цэглу з вонкавага боку сьцяны, адна цагліна выкруцілася з адранцьвелых рук і паляцела ўніз, напалохаўшы рабочых, якія працавалі пад сьцяной. У другі раз ледзь ня высьлізнула з рук кірка.

— Стары стаў,—з тугой падумаў Сьцяпанавіч.

Але неадрыўна, пабуджаемыя штуршкамі волі, рукі наносілі ўдар за ўдарам у магутную сьцяну казэмату. Пабліжалася лінія, акрэсьленая вугалём.

Сьцяпанавіч выламаў першую цагліну апошняга пласту. Заставалася зьняць некалькі дзесяткаў цаглін для таго, каб выняць апошнюю, з якой адпала штукатурка, і яна бурай плямай засталася на тле шэрай сьцяны, на ўзроўні з умураваным у сьцяну столікам.

Ззаду разьлегліся галасы камсамольцаў.

— Скончылі хлапцы,—падумаў Сьцяпанавіч. Зараз ужо ўдараць у дошку.

І ліхаманкава пачаў біць кіркай. Яна памылялася, пападала міма пазоў, крышыла цэглу, чаго ніколі не дапушчаў Сьцяпанавіч. Ахапіла нястрымнае жаданьне хаця на момант абаперціся плячом да сьцяны, хаця хвіліну адпачыць. Але тады Сьцяпанавіч ня здолее больш узяцца за работу. Перад вачыма паўставаў насьмешлівы твар Апенкі.

Ззаду па жарстве зарыпелі крокі.

— Заканчвай работу, Сьцяпанавіч. Роўна палова на пятую.

Зазьвінела пакінутая кірка.

Сьцяпанавіч зьняможана прысланіўся да сьцяны і падаў тэхніку акуратна ачышчаную цагліну. Тую, што хвіліну таму назад бурай плямаю маячыла ў куту прасьценку.

— Апошняя!

Сьцяпанавіч усёй сваёй постацьцю паказваў нечалавечае зьнемажэньне.

— Гэта трэба звар'яцець,—сказаў тэхнік.—Тры мэтры.—Ты герой Сьцяпанавіч.—

У дзьвярох камэры стаўпіліся камсамольцы.

— Селі мае акумулятары, хлапцы,—сказаў ім Сьцяпанавіч з крыўдай у голасе. Канчаткова селі.

Бэкман падыйшоў і паклаў яму руку на плячо.

— Гэткія старыя як ты, Сьцяпанавіч,—сказаў ён,—больш варты за маладых, такіх, як наш Міхась.

— З мяне ў яго гады,—сказаў кучаравы Зьмітрок,—больш за кубамэтр пяску высыпецца.

У грамадцы ўспыхнуў сьмех.

Тэхнік, падгушкваючы на руках алошнюю цагліну Сьцяпанавіча, сказаў:

— Апенка выгнаў ледзь ня тры кубамэтры. Уся брыгада выпрацавала ня ніжэй як два з паловай на брата. Па ўсіх брыгадах наогул выпрацоўка перакрочыла за два кубамэтры. Гэта нябачаныя тэмпы.

Унізе, на дварэ, у другі раз забразгала дошка. Шмат хто з рабочых не пакінуў яшчэ работу, выганяючы рэкордную норму. У калідоры стала цесна. Рабочыя, што скончылі работу, прыйшлі паглядзець на выпрацоўку ўдарнай групы. Яны аглядалі выемкі і перагаварваліся.

— Гэта, брат, вылупілі!

— Аж ня верыцца.

— А галоўнае, Сьцяпанавіч!

— Заядлы, сваё даказаў!

— Ён, брат, табе не раўня. Стары муляр, з добрага матар'ялу зьлеплены. Факт!

Рабочыя адзін за адным уціскаліся ў заваленую цэглаю каморку. Сьцяпанавіч слухаў іх гутаркі і разумеў, што тут няма і цені лісьлівасьці. У грудзёх расло хвіліну таму назад страчанае пачуцьцё ўпэўненасьці і сілы.

Апенка, які стаяў на самым парозе, першым крыкнуў:

— Качаць Сьцяпанавіча!

З калідору дружна падтрымалі:

— Правільна!—

— Качаць брыгадзіра!

Сьцяпанавіч адмахнуўся і, мінаючы дзесяткі рук, што выцягнуліся да яго, уціснуўся ў кут.

— Пакіньце, хлапцы. Косьці парасьцярушыце.

Камсамольцы наступалі, але ў гэты час ім загарадзіў дарогу тэхнік. Ён паказаў усім цагліну, якую дагэтуль трымаў ў руках.

— Глядзеце. На цагліне прозьвішча Сьцяпанавіча,—са зьдзіўленьнем у голасе сказаў ён.

— Што?—выдыхнуў Сьцяпанавіч.—Што ты кажаш?

— Вось.

Тэхнік падаў Сьцяпанавічу важкую цагліну. Сьцяпанавіч ня ўбачыў на ёй нічога акрамя нявыразных рысак на яе шурпатай паверхні і перадаў цагліну Бэкману.

— Чытай!—сказаў ён коратка.

Голас яго дрыгнуў. Сьцяпанавіч прагна схапіў у сябе паветра.

Адразу стала ціха. Людзі зразумелі, што адбылося нешта нязвыклае. У гэтай цішы выразна разьлегліся словы Бэкмана:

— Тут напісана: „Наперад, таварышы! Пятро Бычкоў".

Бэкман зазірнуў ува ўсхваляваны твар Сьцяпанавіча.

— І яшчэ лічбы!

— Лічбы?—рэхам азваўся Сьцяпанавіч.

— Шостага, адзінаццатага, дзевяцьсот сёмага. Ледзь можна разабраць.—

Сьцяпанавіч правёў рукавом па ілбу, нібы абцёр пот.

— Пятро...—прашаптаў ён,—Пятро... сынок. Пятро Бычкоў.

Яшчэ больш глыбокая цішыня прыціснула людзей. Бэкман беспарадна трымаў у руках цагліну. Рабочыя моўчкі паглядалі на брыгадзіра, а Сьцяпанавіч задумана прымжыў вочы, нібы стараўся нешта ўспомніць,

І першым парушыў маўчаньне сам-жа Сьцяпанавіч. Ён падышоў да Бэкмана і асьцярожна ўзяў з яго рук цагліну. Гэтак-жа асьцярожна, ён абвінуў яе ў крысо сваёй брэзэнтавай курткі і накіраваўся да дзьвярэй. Людзі моўчкі расступіліся.

Сьцяпанавіч хісткім, няпэўным крокам прайшоў па калідоры і зьнік на завароце.

* * *

Ламіў суставы тупы боль, у грудзёх квола перакатвалася сэрца, штуршкамі прыліваў да галавы млявы цяжар, і, час ад часу, дрыжыкі прабягалі па целе. Сьцяпанавіч павярнуўся на ложку і абапёрся на локаць.

— Захварэў,—падумаў ён з тугой.

Ён ляжаў, прымжыўшы вочы, і прыслухоўваўся да мяккай спакойнай цішы. Зараз ува ўсім горадзе, акрамя фабрык на ўскраіне, таксама панавала ціш адпачынку. У пакоі Сьцяпанавіча было цёпла і ўтульна, і гэта зусім не дапасоўвалася да яго думак і адчуваньняў. На рагу стала, паміж вазонаў кветак, якія старэнна вырашчвае дачка, чарнеў у сьвятле газьнічкі чатырохкутнік цагліны і гнаў з пакою мяккую ціш адпачынку. Ад цагліны пазіхала вільгацьцю і холадам казэмату, гэта быў згустак перадсьмяротнай тугі чалавека.

Сьцяпанавічу здавалася абразай тое, што ў пакоі ціш і цяпло і ўзгадаваная жаночай рукою ўтульнасьць.

Думкі Сьцяпанавіча імкнулі назад, у прошласьць. Бунтавала хворае сэрца, і толькі сілаю волі глушыў Сьцяпанавіч боль. Прыходзілі кароткія хвіліны сну, на момант ахутвалі разгарачаны мозг вэлюмам кволага спакою, а потым зноў заставаўся Сьцяпанавіч адзін на адзін перад тварам глыбокага спакою ночы і стагнаў і кідаўся ў хвалях душнай цішы, пад цяжарам думак, ад якіх спыняла сваю работу сэрца.

Чорны чатырохкутнік цагліны, злавесна вырысоўваўся ў сьвятле газьнічкі.

Так праходзілі даўгія гадзіны ночы.

Раніцой, калі рознагалоса крычалі гудкі, прышоў доктар. Ён быў малады, кучаравы, з дзівоснымі акулярамі на кірпатым носе. Ён у момант распрануўся, у вокамгненьне накінуў на сябе сьнежнабелы халат, і ў пакоі Сьцяпанавіча расплыўся церпкі пах лекаў.

Доктар падышоў да ложка і зьвінціў стэтоскоп.

— Ня варта хварэць, Даніла Сьцяпанавіч,—сурова сказаў ён.

Гэты доктар быў сынам старога сябры Сьцяпанавіча, і ён памятае доктара яшчэ з тых часоў, калі той мурзатым хлапчуком бегаў у аднэй кашулі па завулках ускраіны.

— Паслухай сэрца,—сказаў Сьцяпанавіч.—Няма ніякога цярпеньня.

Доктар доўга ціскаў трубкай стэтоскопу грудзі Сьцяпанавіча Нарэшце выпрастаўся, зьняў акуляры і працёр іх берагам свайго халату.

— Я вам скажу, Сьцяпанавіч. Нікудышнае сэрца. Калі будзеце працаваць фізычна, да восені не дажывеце. Я пакіну рэцэпт. Прымайце лекі. Паправі́цеся. Але памятайце,—ніякай работы!

Апранаючы паліто, доктар паглядзеў на цагліну на стале ідакончыў:

— А то ў вас і на стале цэгла і пад сталом і мабыць яшчэ пад падушкай. Досыць вам працы.

І асьцярожна прычыніў за сабой дзьверы.

— Глупства,—ўчуў Сьцяпанавіч,—крыху падгуляў стары з сэрцам. Няма чаго непакоіцца. Паправі́цца. Але фізычна працаваць яму нельга. Канец.

Сьцяпанавіч зразумеў, што дачка ўвесь час стаяла пад дзьвярыма, і, узрушаны, паклікаў:

— Насьця!

Яна ўвайшла і наблізілася да ложка.

— У цябе сёньня выхадны?

— Выхадны.

— Дык вось што, Насьця,—сказаў Сьцяпанавіч,—схадзі, калі ласка, на пабудову і даведайся ад тэхніка, як ідзе работа. Я баюся, каб з-за мяне не сарвалася выпрацоўка.

Насьця пайшла, а Сьцяпанавіч зноў занурыўся ў неспакойныя думкі. Ён уяўляў сабе, як сёньня раніцой, даведаўшыся аб яго хваробе, Апенка, па сваёй натуры гультаяваты і аматар усялякіх канфліктаў з адміністрацыяй, наўмысьля, для таго, каб назоліць тэхніку, скажа:

— Што мы коні, альбо не? Ці гэта чалавечая работа? Вунь Сьцяпанавіч, стары рабочы, і то захварэў.

Яго падтрымаюць іншыя, менш сьвядомыя, пачне спадаць сацспаборніцтва, не замацаваўшыся яшчэ на дасягнутых паказальніках

Камсамольцы, зразумела, не здадуць, але сваёй ударнай работай не направяць справу. Разбор зацягнецца і зблытае пляны будаўніцтва.

— Не, ня можа гэтага быць...—шапнаў Сьцяпанавіч, з нецярпеньнем чакаючы крокаў Насьці.—Ня можа быць і ня будзе гэтага.

Але моцнай упэўненасьці ня было.

Насьця прыйшла хутка. Сьцяпанавіч нецярпліва схапіў лісток са знаёмага блёкноту.

„Сацспаборніцтвам ахоплены ўсе брыгады. На чале—камсамольская група. Апенка „вызначыў сустрэчную норму. Выпрацоўка ўчорашняга дню, будзе перавыканана". Так пісаў тэхнік.

Сьцяпанавіч паклаў лісток пад падушку і заспакоена прымжыў вочы.

Надвечар прышоў Куніцкі. Ён аглєдзеў Сьцяпанавіча і паківаў галавой.

— Надарвалася старая кабылка?—спытаў ён, прысаджваючыся на бераг ложка.

Сьцяпанавіч ня здолеў адказаць, як расчыніліся дзьверы і ў пакой адзін за адным асьцярожна ўвайшлі Рубінчык, Андрэй, Бэкман, Зьмітрок, тэхнік, а за імі, дасягаючы галавой сталяваньня і крыху зьбянтэжаны сваім нязвыклым ростам, Апенка.

Будаўнікі прывіталіся з Куніцкім і паціху прымасьціліся ў пакоі хто дзе мог. Першы загаварыў Бэкмач.

— Заражаеш акумулятары, Сьцяпанавіч?—спытаў ён.

— Памаленьку,—адказаў за Сьцяпанавіча Куніцкі.—А што ў вас чуваць?

— А мы разгортваем тэмпы!

— Усе брыгады далі два з паловай,—зазначыў тэхнік, а камсамольская група—тры.

— Гэта добрая выпрацоўка,—заўважў Куніцкі.—Гэта па ўдарнаму.

— А колькі зрабіў Апенка?—спытаў Сьцяпанавіч.

— Тры з паловай.

— Выпрацаваў?

— А чаму-ж не...—прысаджваючыся на крэсла, адказаў Апенка.—Бязумоўна. Толькі вось, яны адселі ад маёй нормы. Цыкорыя ім папёрла.—

— Трэба будзе мне з табой падужацца, Апенка,—зазначыў Куніцкі.—Цікава, хто каго абярнуў-бы.

— Пойдзеш на тры з паловай?—спытаў Апенка.

— Я цябе на чатыры выклікаю—адказаў Куніцкі.

— У Куніцкага,—заўважыў Зьмітрок,—паўтары конскія сілы. Ня лезь Апенка.

Усе засьмяяліся.

У гэты час Бэкман падышоў да стала і нахіліўся над цаглінай. Ён уважліва агледзеў яе шурпатую паверхню і няроўныя радкі літараў і лічбаў. У рысках іх залягла зялёная цьвіль.

У пакоі зараз-жа стала ціха. Усе сачылі за Бэкманам. Той агледзеў цагліну з другога боку і асьцярожна паклаў на месца.

— Сьцяпанавіч, што гэта за цагліна?

Гэта было пытаньнем усіх, і нават Куніцкі зьдзіўлена і спытваюча глянуў на Сьцяпанавіча.

Сьцяпанавіч стомлена прымжыў вочы.

— Га? Сьцяпанавіч,—пераспытаў Бэкман.

— Гэта ня цагліна, таварышы, — адказаў Сьцяпанавіч. — Гэта, браткі, камлыга крыві.

* * *

... Пад самай стольлю, у невялічкім паглыбленьні сьцяны, апляценая калючым дротам, слаба сьвяціла электрычная лямпка. Сьвятло яе гублялася ў іржавым спляценьні дроту, і казэмат быў наліты жаўтавай каламутай, у якой праступалі толькі плямы вільгаці на сьценах і спадах скляпеньня. І яшчэ, якраз насупроць лямпкі, выразаўся чатырохкутнік вакна, забранага ў падвойныя краты з крутым адхонам падваконьніка.

Тупая ціш была ў казэмаце.

Пяць сьмяротнікаў маўклівым гуртком сядзелі на нарах. Праходзілі апошнія хвіліны цішы. Людзі чакалі таго моманту, калі гулка застогне чыгун усходаў і з грукатам прыкладаў канвою да дзьвярэй падыдзе няўхільная і бязьлітасная сьмерць.

Цяклі хвіліны. Набліжаўся канец.

Семнаццацігадовы Пятро Бычкоў быў самым малодшым з асуджаных. Ён усёй сваёй істотай протэставаў супроць пагібелі ў глыбокай і душнай цішы са зьвязанымі назад рукамі. Але ён ня ведаў, што сказаць таварышом, што зрабіць, каб зруйнаваць ціш, якая паралізавала цела, і сустрэць сьмерць з сьмелым і гордым тварам Чаканьне спазмай сьціскала горла і душыла думкі.

І Пятро саскочыў з нараў і пайшоў да дзьвярэй.

Ён ішоў так, нібы гэтыя акованыя жалезам, зьвінчаныя і скляпаныя безьліччу вінтоў і склёпак, спаяныя і прашытыя, цяжкія дзьверы павінны былі расчыніцца. Але выцягнутыя рукі сустрэлі зімны мэталь. Пятро абмацаў швы склёпак і спыніўся. Рукі нэрвова пачалі абмацваць дзьверы. Пятро скрабаў пазногцямі галоўкі балтоў, пальцы коўзаліся па гладка абточаным мэталі. Дзьверы былі недаступнымі. Яны адгарадзілі ад Пятро і іншых чатырох волю, жыцьцё і заўтрашні дзень.

Пятро размахнуўся і ўдарыў кулаком. Дзьверы азваліся глухім, ледзь чутным звонам.

— Пустыя ўнутры, сволачы,—падумаў Пятро з тугліваю нянавісьцю і яшчэ раз з усяе сілы ўдарыў у дзьверы. І зноў заглушаны звон.

Пятро схапіў абедзьвума рукамі каўнер халату і моцна тузгануў. Па падлозе пакаціўся гузік.

— Даволі маўчаць!—крыкнуў Пятро.—Даволі!

Голас задушыла ціш. На нарах ніхто не крануўся. Пятро аглушаны ўласным выкрыкам, хвіліну стаяў бездапаможна, а потым нахіліўся і адшукаў на падлозе гузік. Гэта быў гузік з салдацкай шынелі. Пальцы абмацалі абрысы крыльляў арла.

Пятро аглянуў камэру і застанавіўся поглядам на адным з найбольш асьветленых кутоў пад вакном. Ён знайшоў сродак зьнішчыць заклятую ціш.

Аднастайнае, рэзкае шорканьне данеслася з куту. Цэгла ўступала націску мэталю. Бераг гузіку пакідаў пад сабою сьляды.

Работа Пятро ценькім струменьнем руху бязупынна разварушвала засталую ціш казэмату, і паступова прыходзілі ў сябе адранцьвелыя ў чаканьні сьмерці людзі на нарах.

— Што ты там робіш, Пятро?—спытаў адзін з іх.

— Помнік будую,—адказаў Пятро.

Бераг гузіка зрабіўся вострым. Пятро абмацаў рыскі і ўпэўніўся, што першая літара глыбока ўгрызлася ў цагліну. Пройдуць дзесяткі гадоў, перш чымся вытравяцца бегам часу гэтыя шрамы на целе турэмнай сьцяны. Да тае пары косьці пяцярых сатлеюць у зямлі, а цагліна казэмату ўсё яшчэ будзе крычаць бура-крывавымі літарамі, крычаць так, як крыкнуў некалі з-пад шыбініцы семнаццацігадовы дружыньнік Пятро Бычкоў:

„Наперад, таварышы!"

Цагліна, што ўпітала ў сябе сьмяротную тугу чалавека, будзе крывавай плямаю выглядаць са сьцяны да тае пары, покуль будзе стаяць турма.

Рыпела цагліна, пахрупвала зьлёгку, нібы-та грызлася ў падпольлі мыш.

З нараў зноў спыталі.

— Які помнік, Пятро?

— Помнік тым, што сьпіхнулі з рэек карны эшалён,—адказаў Пятро.

— Гэта значыць нам?

Пятро, не адказаў. Яго раптам апаліла думка, што ён можа не пасьпець. З падвоенай сілай, да крыві праціраючы скуру, ён узяўся за работу. З нараў устаў чалавек, прайшоў у кут дзе працаваў Пятро, і бяззычнай ценьню стаў за яго плячыма. Сьледам за ім прыйшоў другі. Потым узьняліся яшчэ двое.

Людзі маўчалі, але жудаснай цішы адранцьвелага чаканьня ўжо ня было.

Скрогат мэталю бязупынна падточваў камлыгу цішы, якая прыціснула людзей тут, у засені пятлі, і кожны зык чалавечага голасу ператварала ў напамінак аб пагібелі, ператварала ў грознае рэха крокаў сьмерці.

Аднастайны скрогат і хруст цагліны гаварыў змучаным людзям аб барацьбе, аб няўміручай волі і сіле братоў па клясе. І пяць асуджаных з захапленьнем прыслухоўваліся да хрусткага шолаху, як да велічнай сымфоніі змаганьня, якая пазбавіла іх страху перад шыбеніцай. Бо калі загіне слабы чалавечы голас, не загіне сіла і рух, не загіне барацьба і жыцьцё калектыву.

Пятро спыніў работу, абцёр пот рукавом і сказаў:

— Падрыхтуйце яшчэ адзін гузік. Гэты сьціраецца.

Адзін з асуджаных спытаў:

— Ты і нашы прозьвішчы выпішаш, Пятро?

— Бязумоўна... Калі ўпраўлюся...

— У мяне гузікаў няма,—адказаў бліжэйшы да Пятра.—Завязкі.

— У мяне гэтак сама.

— І ў мяне—сказаў чацьвёрты.—Што рабіць?

— У мяне ёсьць. Дапамажэце вырваць.

І чацьвёра асуджаных накінуліся на пятага. Камячылі халат, у ліхаманкавай пасьпяховасьці вырвалі гузікі з мясам.

І раптам адзін спуджана выдухнуў:

— Дзераўныя!

Пятро сьціснуўшы зубы, упаўголаса вылаяўся. Прабег пальцамі па пазасталых гузіках і ўпэўніўся, што яны таксама дзераўныя. Тая драбінка мэталю што ён трымаў у руках, была адзінай, якую маглі выкарыстаць асуджаныя з усяго награмаджэньня мэталю навокал.

Некалькі хвілін у казэмаце стаяла ціш. Яна зноў пачынала наступ на чалавечыя нэрвы.

Пятро сказаў:

— Я напісаў толькі сваё прозьвішча. Гузіка хопіць толькі для таго, каб напісаць дату.

— Дык пішы, Пятро,—падштурхнуў яго адзін.

— Мы ўжо хай застанемся.

І зноў разьлёгся хрусткі шолах. І так праходзіў час.

А потым...

Унізе выразна рыпнулі дзьверы. Данёсься заглушаны гоман.

— Ідуць!!!

— Нічога, я скончыў,—сказаў Пятро, устаючы.—Гатова.

Усходы гулі пад дзесяткамі ног. Зьвінелі чыгунныя прыступкі. Па калідоры нехта прабег...

Гэта надыходзіла сьмерць.

А ў казэмаце, гатовыя яе сустрэць, стаялі ў куту шчыльным гуртком, з сьмела ўзьнятымі галовамі, пяць асуджаных членаў баявой дружыны РСДРП.

У ноч, калі павінны былі павесіць пецярых, страшэнна лютавала непагода. Вецер выў, скавытаў, з нясутрымнасьцю вар'ята налятаў на горад. Імчалі нізка над зямлёй грузныя хмары. Ледзяны дождж прашываў ноч.

Маўчаў горад. Былі выключаны рубільнікі электростанцый, загасілі вулічныя ліхтары, вітрыны магазінаў, агні рэстаранаў і тэатраў. Горад застыў у жудаснай цемры. Маўчалі яго заводы і фабрыкі. Маўчалі меднагалосныя паравозы. Спыніўся рух па артэрыях чугуначнага вузлу. Ліхтары стрэлак, сэмафораў, сеці асьвятленьня былі загашаны. Ноч шчыльна прылягла на рэйкі, і ў яе абнімках зьніклі бясконцавыя склады вагонаў і астыглых паравозаў. Забастоўка замкнула стрэлкі, загасіла топкі, выключыла моторы.

Маўчаў горад. Толькі вецер выў, ды грымеў дождж. Адзіным сьвятлом былі нясьмелыя агоньчыкі ў рэдкіх вокнах, адзіным рухам цоканьне капыт конных патрулёў паліцыі і казакаў.

А поўначы пад сьцяной паравозарамонтнай майстэрні цесным гуртком зьбіліся людзі. Тут былі навалены горы мэталялому і было зацішна.

Дваццаць чалавек стаялі ціха. Яны нечага чакалі і насьцярожна ўглядаліся ў ноч, туды, дзе на астыглых шляхох гуляў вецер. Цягнуліся хвіліны і складаліся ў гадзіны. Вырасталі гадзіны і адыходзілі прэч. Людзі стаялі цесным гуртком, і ні адзіным словам не абазваўся ніводны з іх.

Проста супроць іх, у адлегласьці сотні сажняў, паўставалі чорныя сьцены турэмнай агароды, а з-за іх узьнімалася белая, асьветленая дугавымі ліхтарамі пабудова турмы. Яна мела ўласнае асьвятленьне. Забастоўка ня здолела загасіць агні яе ліхтароў, і панурый абрыс яе чотка выразаўся на чорным тле ночы. Гэта было адзіным, што бачылі людзі.

Горад схаваўся ў ноч. Цемра акрыла ўсё навокал, і толькі распоўзлы корпус турмы быў асьветлены.

І людзі ўпарта глядзелі на турму і насьцярожна абмацвалі вачыма цемру навокал.

Цяклі хвіліны. Вырасталі гадзіны і адыходзілі прэч. Буяніў вецер. Шумеў дождж. Над самай зямлёй праносіліся грузнабрухія хмары.

— Ідуць,—прашаптаў нехта.—Слухайце!

Людзі прыслухаліся. Нічога ня было чутна. Толькі стагнаў вецер. Толькі шумеў дождж.

— Падрыхтаваць зброю,—коратка загадаў першы.

І зараз-жа ў голас спытаў:

— Хто ідзе?

Недзе бразгануў ліст жалеза, і прыглушаны голас адказаў:

— Рэвалюцыя.

— Бура,—адказаў першы.

На гары ламачча зьявіліся дзьве постаці і бяззычна пасунуліся да ашчэранага аружжам гуртку.

— Свае.

— Ну?

Адзін з тых, што прыйшлі, адказаў коратка:

— Павесіць. Зацьверджана.

— Так!

І людзі хвіліну маўчалі. Потым адзін з тых, што прыйшлі, загаварыў хутка ўпаўголаса.

— Зараз атрымана тэлеграма. Прысуд прывесьці ў выкананьне. Іх павесяць сёньня досьвіткамі. На літасьць катаў ня было чаго і спадзявацца. Мы павінны самі выратаваць членаў нашай дружыны.

Ён памаўчаў, нешта абмяркоўваючы.

— Драбінкі ёсьць?

— Ёсьць!

— Аружжа гатова?

— Так!

Ён прытуліўся да сьцяны.

— Слухайце.

Людзі яшчэ больш шчыльна зьбіліся пад сьцяной, і кожнае слова начальніка дружыны сустрэла глыбокая ўвага.

— Вось плян. Турма стаіць адным бокам да пляцу, другім да нас. На рагох яе сьцен чатыры вежы. Дзьве да пляцу, дзьве да нас. На даху, цэнтральны пост. Вартавога добра відаць, калі падыйсьці бліжэй да сьцен. Патрэбна рабіць так. У трох ідуць да галоўных варот, што выходзяць у завулак, і зьнімаюць вартавога у варотах тым спосабам, які будзе ім растлумачаны. Разам з гэтым яны пераразаюць правады на шчыце над варотамі, у двох застаюцца на месцы, а адзін паведамляе мяне. Роўна а першай гадзіне, асуджаных выводзяць на двор. Да гэтага часу павінна быць пакончана з вартавым у варотах, і ізаляваны тэлефоны турмы. Гэтак сама, павінны быць прыстаўлены да сьцен драбінкі. Роўна а першай гадзіне і аднэй хвіліне, я даю стрэл. Мой стрэл—сыгнал для нападу на вартавых вежаў. На кожную вежу ідуць па двое. Страляць проста з зямлі. Вартавы цэнтральнага паста для нас не стаўляе небясьпекі. Ён сьпіць. Сьцяпананавіч!

— Я.

— На вакзальным пляцы, перад турмой, стаіць гарадавы. Калі хлопцы пачнуць страляць па вартавых, што на вежах ад пляцу, ты пакладзі гарадавога. Ён нас, выклікаўшы трывогу, можа загубіць. Гэта тваё заданьне.

— Так.

Начальнік працягваў:

— Цераз сьцены лезьці тады, калі загаснуць тры ліхтары на турэмным двары. Адзін з наглядчыкаў—наш. Ён выключыць часткі асьвятленьня турмы, як сыгнал для нас што асуджаныя на двары. Тады, дружна на сьцяну, галоўны ўдар на канвой, і нашы таварышы будуць вольнымі. На трэцім шляху, супроць вадакачкі стаіць паравоз пад парамі. Яшчэ адна заўвага. На сьцянах каля драбін застаецца па адным чалавеку. Іх задача: ісьці апошнімі і зараз-жа перацягнуць драбіны і спусьціць іх на двор. Гэта адзіны выхад. Таму трэба трымаць драбіны ўвесь час на ўвазе і, як толькі той, што будзе на сьцяне, выдзе са строю, патрэбна неадкладна замяніць яго. Усё.

Начальнік памаўчаў.

— У нас яшчэ паўгадзіны. Прыступаем да справы. Плян усім зразумелы?

— Так! адказаў дружны шопат.

— Хто ідзе да галоўных варот, даткніся мне да пляча.

Начальнік адчуў тры моцных штуршкі.

— Так. Адыдзеце ў бок. Кто на правую і левую вежы?

Зноў чатыры дотыкі.

— На вежы да пляцу?

Моцна штурхнулі ў плячо.

— Адыдзеце ў бок. Хто да драбін?

Гурток пачаў раставаць. Людзі адыходзілі ў бок.

— Сьцяпанавіч!

— Я.

— Выдайце яму вінтоўку.

Ёсьць.

— Да галоўных варот. Па выкананьні заданьня паведаміць мне пад правую вежу.

Ёсьць!

— Да галоўных варот. Падрыхтуйцеся.

— Так.

— Сьцяпанавіч, ідзі. Каб ня было промаху.

— Ня будзе промаху,—адказаў Сьцяпанавіч і паціснуў руку начальніка.

— Да вежаў з боку пляцу.

— Слухаем!

— Падрыхтавацца!

Сьцяпанавіч пайшоў, асьцярожна ступаючы ў блытаніне рэек, а цераз некалькі хвілін нячутнымі крокамі ў розных кірунках рушылі да турмы групы дружыньнікаў.

Хутка прайші хвіліны. Слаба трэснуў стрэл. Яму адказалі кароткія нэрвовыя пачкі стрэлаў.

— Па пастох,—недзе далёка мільгнула думка.—Пара!

Шырокаплечы гарадавы недаўменна затаптаўся на месцы і замахаў рукамі. Сьцяпанавіч з зімным спакоем прыцэліўся і нават ня ўчуў стрэлу. Толькі моцным штуршком аддала ў плячо вінтоўка.

Гарадавы пахіснуўся і павольна асеў на зямлю. У гэты момант загасілі ўсе да аднога ліхтары турмы, ноч затапіла пляц. А стрэлы застукалі ўзмоцнена, рассыпаліся дробнымі адзінкамі, грукалі залпамі, рваліся пачкамі...

Сьцяпанавіч, сьціскаючы вінтоўку, рынуўся ўперад да завулку, што меў яго вывесьці пад сьцены турэмнай агароды. І зараз-жа адкінуўся да сьцяны пакгаузу. На пляц ад вакзалу, з грукатам капыт, з крыкам і выцьцём выляцеў конны атрад...

— Прапала!—апаліла мозг Сьцяпанавіча страшная думка.

Ён кінуўся ў завулак, каб хутчэй далучыцца да дружыны, але праз некалькі крокаў яго сустрэў хрыплы воклік.

— Хто! Стой!

Сьцяпанавіч пазнаў аднаго з дружыньнікаў і той пазнаў яго.

— Уцякай Сьцяпанавіч,—хрыпла кінуў ён.—Начальнік загадаў адступаць. Бяжы да вакзалу. Дружыну разьбілі... На дварэ рота жандараў і прымчалі казакі... Я бягу ў дэпо...

Дружыньнік зьнік у цемры.

Сьцяпанавіч, трымаючыся сьцяны пакгаузу, павольна пасунуўся да вакзалу. Страляніна сьціхла. Дзікая ноч сьціскала зямлю, равеў вецер і біў у твар дажджом.

І толькі дайшоўшы да вадакачкі, Сьцяпанавіч зразумеў выразна, што ўсё прапала, што разам з правалам адчайна-сьмелага пляну загінуў Пятро, загінулі лепшыя пралетары-дружыньнікі. Асьцярожна прыставіў Сьцяпанавіч да сьцяны непатрэбную вінтоўку і стаўшы на калені прыціснуў да мокрай і зімнай зямлі свой разгарачаны твар.

І ў гэты момант на яго наваліўся цяжкі груз. Недзе ўдушліва лаяліся, сапалі, тупы боль прайшоўся па целе, і нехта здалёку сказаў:

— Вяжы рукі.

— Канец!—было апошняй думкай Сьцяпанавіча.

. . . . . .

... Пятро і яго таварышоў павесілі ў наступную ноч,—дакончыў Сьцяпанавіч.—Дваццаць дружыньнікаў, і ў тым ліку начальнік, былі забіты на месцы. Трох павесілі, а астатніх адправілі на катаргу, разам з імі і мяне. Я сядзеў у гэтай-жа турме два гады, і мне апавядалі... Ты памятаеш, Куніцкі, старога Айбіндэра?

Куніцкі кіўнуў галавой.

— Дык, вось, стары Айбіндэр апавядаў мне, што ў казэмаце сьмяротнікаў ёсьць цагліна з надпісам майго сына. Я яе шукаў, калі разбурылі турму, і не знайшоў.

Сьцяпанавіч памаўчаў.

— І вось зараз яна сама мне трапіла ў рукі.

Хвіліну было маўчаньне. Потым Змітрок спытаў:

— А што з тым, які бег да дэпо.

— Гэта быў правакатар,—адказаў Сьцяпанавіч. Ён прадаў дружыну. Яго, цераз некалькі месяцаў потым забілі рабочыя дэпо. Забілі гайкамі, як сабаку.

Сьцяпанавіч зьняможаны адкінуў галаву на падушку.

Куніцкі сядзеў, панурыўшы галаву.

І ў гэты час уста́ў Апенка.

— Дык іх у спраўдом?—загрымеў ён грукаючы кулаком па стале. Ім чырвоны куток? Таварыш Рубінчык! Ім раз у дэкаду лазьню, маць іх у сем разоў?!

Апенка задыхнуўся, у два крокі дасягнуў дзьвярэй і моцна грукануў імі.

— Гарачы хлапец!—усьміхнуўся Куніцкі.

Бэкман падыйшоў да ложку Сьцяпанавіча.

— Ты захавай цагліну Сьцяпанавіч—сказаў ён,—альбо аддай у музэй.

Сьцяпанавіч узьняўся на локаць, агледзеў узрушаныя усхваляваныя твары хлапцоў.

... І адмоўна пакруціў галавой.

* * *

Зноў была сонечная раніца. І прызыўна звалі гудкі. Звонкімі ранішнімі вуліцамі ішлі на работу дзённыя зьмены. На далёкім краявідзе ўставала сонца і абмыты яго праменьнямі абуджаўся горад. Глыбела сінь неба. Раставалі ў ёй напластаваньні дыму і ранішніх туманаў. Прызыўна і моцна крычалі гудкі.

У гэтую раніцу быў скончаны разбор турмы. Заданьне было выканана на пяць дзён раней тэрміну. І ў гэтую раніцу прышоў на работу Сьцяпанавіч.

Ён агледзеў шэрагі землякопаў, што працавалі ў равох катлаванў, і па хістскіх масткох, пракладзеных над ямамі для вапны, прайшоў на пляцоўку, дзе грымелі, глынаючы цэглу, камнедрабілкі. Тут ён паклаў у штабэль, з якога паступала цэгла ў драбілку, прынесеную ім цагліну.

Ён ня бачыў, як схапілі цагліну казэмату клыкі драбілкі і размаджылі яе ў шчэбень. Ён глядзеў на чалавечы муравейнік на пляцоўцы будаўніцтва. Ён бачыў акрэсьленыя катлаванамі першародныя формы тэй пабудовы, якая нараджалася на месцы турмы, на

тым месцы, дзе загінуў яго сын, яго таварышы, дзе загінулі лепшыя людзі яго партыі і клясы. Гэта быў кол у магілу мінулага. Ня было турмы, ня было яе агарожы. Нічога не засталося ад каменнага мяшка.

І гэтым былі аплочаны дні працы і барацьбы.

Нараджалася пабудова, якая ў поўнай хорашасьці і выразнасьці сваіх магутных і дасканалых форм узьнімецца над пярэстай блытанінай дахоў ускраіны і зазьзяе шклом шматлікіх вокнаў, будзе ільсьніць бэтонам высокіх і стройных сьцен.

Ён, Сьцяпанавіч, будзе камандаваць будаўніцтвам.

Няма мінулага. Нават цені, ганебнай і страшнай не засталося. Новыя дні ў творчым росквіце паўстаюць перад вачыма Сьцяпанавіча. За гэта змагаўся Пятро, дружыньнікі, за гэта змагалася партыя, кляса. Барацьба аплочана. Глыбела сінь неба. Трапяталі праменьні сонца. Зьвінеў горад. Крычалі гудкі.

І усьміхнуўся вясьне, сонцу і гораду брыгадзір Сьцяпанавіч. Стары, суровы пасечаны змаршчакамі твар расквітнеў маладой і лагоднай усьмешкай.

Сымон Баранавых

Два канцы[1])

Аповесьць

III

Дні Вацікавы, што іх завез у горад, жылі разагрэтаю маладосьцю. Калі зайшоў на завод, да сваіх таварышоў—не спазнаў заводу. Дзьве новыя печы пусьцілі ў ліцейным. З таго цэхавога канца выкінулі перагародку—павялічылі фармовачна-цэхавое поле. У такарскім цэху паставілі тры нітэрныя станкі... у кавальскім—электрычная сіла ўздымае новы малаток-гамар.

А на нарадзе фабрык і заводаў гаварылі:

„... вёска цяперака на перабудове. Вёсцы патрэбна, як мага, болей машын. Вёска паўстала супроць сваіх межаў, якія ціснулі яе ў калючых абдымках быльнягу. Яна руйнуе свае векавечныя межы жыцьця...

І ў праўду:

— Навошта яны, якія сьціскалі так вузка, як труна, чалавечае жыцьцё?.. Хіба-ж яны над чалавекам маюць большае права як над імі сам чалавек? І хто даў ім волю і права?

... Якая несправядлівасьць у чалавечым жыцьці...

На нарадзе фабрык і заводаў гаварылі:

„... беднота сялянская змагаецца з сваім клясавым ворагам—кулаком. Машына—вострая зброя ў змаганьні. Чым больш гаспадарчых машын—хутчэйшая перамога над ворагам, хутчэйшае замацаваньне Кастрычнікаўскіх дзён...

—... вёска з прадвеку была адзета ў мазалі, узгадаваныя ў сваім поце. Насіла на сабе адзетую ў транты, за тыя мазалі, галодную сьмерць. І ўсёроўна празывалася гэта чалавечым жыцьцём. Дык хто-ж меў права так несправядліва разьмяраць каўшом жыцьцё чалавека?

На нарадзе фабрык і заводаў:

---

[1]) Гл. №№—9, 10, 11 12, 1.

„... спаборніцтвам працы, заводы і фабрыкі дадуць вёсцы машыны, дадуць гатовы тавар. Рабочыя брыгады ўдарнікаў першымі пададуць руку братом у барацьбе за сацыялістычнае змаганьне.

—... барацьба вялікая. Трэба толькі каб даведаліся векам пакрыўджаныя, што змарнавалася шмат дзён з іх жыцьця. Як шмат растоптана чалавечых дзён чорнаю прошласьцю!

Толькі от праз усе гарадзкія дні непакоіўся Вацік—карцела яго натура:

— Што цяперака ў Чырвоным?

— Ці разьвезьлі гной з хлявоў па саўгаскім полі?

І яшчэ больш, як надворнае сьвятло праз шчыліны, тышчылася Вацікава думка:

— Што зрабіў раён з Міхасём Кляўковым?

Пасьля, як рабілася ў Міхася вопісь, паехаў Вацік да раённага старшыні Белазёрава (а адтуль—паехаў у горад).

Гаварыў Вацік таварышу Белазёраву, што няправільна прадпісана раёнам, каб Міхася Кляўко высылаць з сельсавету. Пра Харытонаву работу гаварыў... што на Бярчукоўскім сельсавеце жыве яна прыкрым перасолам. Слухаў Ваціка Белазёраў і маленькая ўсьмешка церабіла яго вусны.

А калі Вацік палажыў перад райвыканкомам на стол заяву—адмысовы дакумант на ўсю работу—той сьцёр усьмешку з сваіх вуснаў:

— Каму больш мы павінны верыць,—шаруючы тупым канцом алоўка па зялёна-настольнай паперы, пытаў Белазёраў,—каму больш: ці нашаму калгасьніку, ці аднаасобніку?

Па Вацікавым нутры пачынала рабіць спацыр халодна-драцяная злосьць. Запакаваў яе ў тугую маўклівасьць, а Белазёраў гаварыў:

— Вот...—з жоўтай папкі дастаў доўга сьпісаную заяву.—Ад калгаснага актыву Муравейнікаў... Вот... Чытай...

Не даваў у рукі Ваціку заявы, а сам чытаў падкрэсьленыя радкі калмата-сіняю лініяй:

„... ад Кляўко можна чакаць і падпалу калгасу і ўсялякага забойства. Гэта самы яры кулацка-клясавы вораг.

„... на нашым Муравейнікаўскім сходзе ён выступіў нават супроціў калгасу".

Ды:

— Што ты на гэта скажаш?—дробна моргаючы чорнымі павекамі, глядзеў Белазёраў Ваціку ў вочы.—І сельсавет піша пра тое самае?

Тады крыўда крапівою пякучаю агортвала Вацікаву чуласьць. От ён целае лета пражыў і ведае гэтага чалавека.

На адзін момант была перад Вацікам Міхасёва постаць. Усёроўна як ён стаяў з ім побач.

... падыходзіць Міхась да стала, а яго саматканыя штаны падпяразаны коньскім путам. Старымі крысьсямі суконнай жакеткі закрывае Міхась свае штаны, каб не набрацца перад чужым чалавекам невінаватага сораму.

... сярэдняга росту чалавек... зьдзіркаваная на галаве, Дзімавым шротам, шапка... Маленькія, шарыя вочы... маршчыны ляжаць густым зборам па куткох Кляўковых вачэй. Барада праз цэлы тыдзень няголеная...

Вацік так і ня бачыў Міхася з паголенай барадою. Усёроўна як і не расла яна большаю, і голенаю ніколі ня была.

Бачыць Вацік гэтага чалавека як перад сабою на далоні; такім простым быў яго твар... ня хітрым, ня скрадзеным... Можа, нават, падыходзіў да дзіцяча-невінаватага падабенства.

— А што будзе, таварыш Белазёраў,—перад сталом стоячы, казаў Вацік,—што будзе калі можа напасьць на чалавека з-за сваіх задзірак? Бо Муравейнікаўскі калгас натахторан, як чую я, поблізу жывучы—мо нават і не калгаснымі людзьмі?

І зноў, была, страпалася па старшынёвых вуснах штучна-рассыпаная ўсьмешка. Белазёраў гаварыў роўным, як струна, голасам:

— Можа і ёсьцяка задзірка. Я табе даю веры... канечне. Толькі можа, яно і другое ёсьцяка... так званая, другая задзірка—свая выгада?

— Як ты, гэта, гаворыш?—невінаватае паставіў Вацік пытаньне

А Белазёраў:

— Я нічога... я кажу, што бываюць людзі, якія ратуюць людзей для сваёй карысьці. Гэта, канечна, ня дрэнна: і для чалавека дабро будзе і для сябе—выгодзьдзе... Ты ж ня даў свайго подпісу на складзеным акце па раскулачваньню Кляўко?

— І ня дам...

Вочы, жмурачы тонкім воласам, перапыніў Белазёраў Вацікa:

— Ніхто табе прымусу ня робіць... ня ў гэтым. Можа Кляўко і пе падыходзіць да кулакоў калі ты кажаш... Адным словам мы выедзем на месца дасьледваньня.

Вацік зразумеў Белазёрава: намёк робіць на яго. Як-бы ня даў росьпісу Вацік, каб дапячы Харытону за Міхлю.

„Няўжо Харытон адважыўся язык павярнуць—весьці раёну ўсялякае глупства?"

Крыўда прайшлася мяккімі сьлядамі каля сэрца. Хацеў сказаць Белазёраву, што надарэмна трымае ў сваёй галаве „бабскае" пляткарства. Але як і ня скеміў—не паказаў здагадлівасьці на сваім твары. Тады яшчэ большая падшыхнула крыўда на гэтага, сельсавецкага, чалавека.

„Што Харытону з ёю ад мяне трэба?"

Белазёраў пераняў Вацікаву разгубленасьць:

— Мамчыц, мне піша,—казаў—што Муравейнікі самы найлепшы калгас па сельсавеце. Хоць тамака і быў падзеж з некаторай жывёлы... Гэта не адыгрывае, канечне ролі. На тое-ж гаспадарка... як кажуць: „каля вады ходзячы—памочышся". Так што-о... у Муравейніках, брат, людзі якія ў калгасе—усе калгасныя, нашы... От гэта другое, што ня хоча далучацца гэты канец. І тамака адны, так празваныя, батракі. Па маяму, дрэнную вы праводзіце сярод іх падрыхтоўку.

— А па маяму, таварыш Белазёраў,—раптоўнасьцю падняў Вацік голас,—па маяму—ў Маравейнікаўскім калгасе—кулакі-шкоднікі. І не ў падрыхтоўцы патрэбна шукаць прычыны гэтага канца, а ў калгасным шкодніцтве. Ты кажаш—прапажа жывёлы—патрэбная, неабходная штука ў гаспадарцы, а я кажу—можна абыйсьціся калгасу бяз гэтай патрэбы. І калі ты хочаш,—гэты канец добра робіць, што не далучаецца да Танцулькавага калгасу. Так да Танцулькавага...

Вацік гаварыў і было на яго адчуваньні: гаворыць ён і як невядомы цяжар, пакладзены на плечы, здымаецца вялікімі кавалкамі. Бачыў ён, як у нэрвовай трасяніне пальцаў круціў Белазёраў, з аднаго канта на другі—чырвона-сіні аловак. А потым:

— Ня ўспорвай, таварыш, сваёй гарачкі,—сказаў ізноў роўназахаваным голасам.—Бо хто, калі не Муравейнікаўскі калгас, па ўсім сельсавеце і нават па ўсім, калі хочаш, раёне—адлічыўся прадажаю для дзяржавы збожжа? Ніхто! Ні з аднаасобных, ні з калгасных сэктароў—ніхто ня здаў дзяржаве дзьвесьце процантаў. Мы ведаем, як агітуе кулак супроць хлебанарыхтовак. Як мага клапоціцца ён, дарагі таварыш, каб найменей атрымала дзяржава. Каб дзяржава пайшла на голад. От яго самы галоўны лёзунг. І гэты факт, адзін гэты факт, кажа нам за калгасную сумленнасьць. А гэта-ж яшчэ першы год...

Тады згубіў наведзеную з Белазёравым гаворку. Адыходзячы з райвыканкомаўскай канцэлярыі толькі быў сказаў

— Кляўко не падыходзіць, яшчэ кажу, пад кулакоў. Я за яго буду несьці адказ. Дай сельсавету прадпісаньне, каб і ня важыўся нават выкідаць парожніх яго кадоўбчыкаў, бочачак. Ды напішы Мамчыцу, каб гармонік вярнуў назад, што забраў сваім адумам у Кляўковага дзіцяці.

І от праз усе гарадзкія дні насіў у сваіх думках Вацік муравейнікаўскую хлебную прадажу. Адчуваў незразумелую няпраўду, а ня мог узяць яе цьвёрдаю рукою. Што сказаў Белазёраву пра гэты канец—радавала Ваціка.

„Добра што сказаў... Хай ведае... У раёне седзячы, ён забыўся на людзей. Далёка не адышоў ён ад Харытона".

У Яся Рымашэвіча на кватэры, дзе застанавіўся Вацік з Манечкаю, гаварыў да Манечкі:

— Прыедзем у Чырвонае... Зьбяром з камсамольцамі ў гэтым муравейнікаўскім канцы сход. Хай выказваюць пра ўсё, што ведаюць. Як нейкую гэты муравейнікаўскі канец трымае баязьлівасьць на сабе. Зьцішка вядуць гаворку, а на сходзе—колькі разоў—маўчаць. І гэтым сабе толькі наводзяць шкоду.

Манечка гаварыла:

— У гэтым канцы вельмі добрадушныя людзі. Яны і маўчаць. От каб гэткія былі, як гарадзкія, на заводзе...

А Манечка пабывала з Вацікам гэтымі днямі на заводзе, хадзіла па гарадзкіх вуліцах...

Першым разам была ў горадзе. Пад'яжджалі цягніком да горада—думалася дзяўчынцы—прыедуць яны ў вялікае сяло. Хаты будуць усе, як у Луцішчы, накрыты гонтамі. Ваканіцы будуць пафарбаваны ў рознакаляровую фарбу. Самі вуліцы вялікага сяла, што празываецца горадам, будуць ісьці побач адна каля другой. Зірнеш з канца і ўбачыш наскрозь увесь горад з яго людзьмі.

Калі зыходзіла з цягніка—вялікая станцыённая будыніна загарадзіла была перад вачмі ўвесь горад. Пытала ў Ваціка, хто жыве ў такой вялікай будыніне. Ня то за неващта шкода Ваціку было гэтай дзяўчынкі, ня то сьпела радасьць, што ўзяў яе з сабою ў горад.

І от пакажа ёй новы невядомы сьвет, новых для яе людзей...

Ішлі горадам. Манечка дзіву давалася: шмат, вельмі, стаяла такіх і яшчэ большых нават будынін. Вуліцы ўсе адзеты ў каменьне...

— Дзе людзі маглі набраць гэтулькі каменьня?—трымала ў сваіх думках.—Нідзе няма месца, каб ня было каменьня. А колькі людзей!

Саромелася пытаць у Ваціка, а ў думках:

— Якое сягоньня сьвята, што так шмат людзей ходзіць разадзетых па вуліцы?

На заводзе спаткалі Ваціка знаёмыя завадзкія рабочыя. Убачы яго з Манечкаю стары ліцейнік Уронскі—жартам сустрэў:

— Ці не з маладою жонкаю, таварыш Вечаславе?

А Дзясьніцкі Стэфан—малады токар:

— Калі ласка... пажалуста, пазнаём, Вечаславе, з сваёй знаёмай. От паглядзеце, як сыплюцца з-пад тэбля стружкі.

Ударнік з ліцейнай брыгады, камсамолец, праходзіў каля Манечкі—хацеў каб убачыла на зашмальцаванай жакетцы асоавіяхэмаўскі значок: выпучваў шырокія грудзі—незнарокам атрасаў завадзкі пыл.

Здавалася Манечцы, што ўсе для яе даўно знаёмыя. Ня ведала толькі паасобку кожнага з іх. Усёроўна як была даўно знаёмая з людзьмі, ды забылася дзе мела з імі сустрэчу.

Хадзіла з Вацікам па завадзкіх цахох, бачыла вялікую сям'ю людзей на дружнай рабоце. Хацелася тады, каб такія цахі былі ў іх, у Чырвоным, у Муравейніках.

От ундзе каля разагрэтай, доўга-круглай печы той самы стары жартаўнік... Увесь твар праняты перамешаным потам з сажай. Бачыла, як прабіваў ён у печы задратаваную аддушыну. Мільёны іскрыстых агней, як з пачапанага жару, сыпаліся з печы. А скрозь лупаючыя агні лілося растопленае сьметаністае жалеза. Два рабочых трымалі жалезнае вядро, каб налівалася жалезная сьмятана аж да самых краёў. Тады несьлі тыя двох і вылівалі ў насыпаны туга загладжаны пясок. Вацік гаварыў Манечцы, што адлівалася ў тым пяску, стальное для сячкарні колца.

Сьціплым зіркам пільнавалі рабочыя ў такарскім цэху станкі. Калі ішла з Вацікам, бачыла каля станка шчупленькага ўзросту рабочага. Вокам не маргнуў, як праходзілі—пільнаваў наканечнік сьвідравальнага тэбля. Тоненькім цурочкам цякла па тэблі вада, а Манечка да Ваціка:

— Чаму вада без перастанку льлецца?

Вацік казаў:

— Каб не загарэлася жалеза ад церазьмернай гарачыні.

Вялікае граміла-машына то ўперад то назад шоргала па кавалку жалеза: стругала жалезны брус.

Тады ў дзяўчынкі страпалася думка:

„Як шмат трэба... на такі маленькі брус ды такая вялікая машына".

Над галавою, было, прашумела па дроце жывое страшыдла. Прабегла яно пад шкляною страхою аж у канец доўгага цэху.

— Ваганэтка,—казаў Вацік.—Яна падвозіць вугаль, падае матэрыял...

Разьбегам рассыпаўся зірк па людзях, па машынах. Падшыхала іскрыстая ахвота на гэту, дружным пераплётам сатканую, работу.

... кожны бачыць адзін другога на відавоку... робіць кожны для другога, пакуль аж ня зробяць гуртам цэлую, новую, машыну. Нараджае машына для чалавека машыну... каб лягчэй для яго было пражываць на сьвеце.

Манечка шнапарылася ў думках:

— Якія, мусіць, добрыя рабочыя людзі: яны выраблюць плугі, малатарні, арфы... Яны, мусіць, вельмі шкадуюць нашых саўгасных ды калгасных... Яны гэтакія ўсе, як Вацік.

І гэтак праз усе дні...

А ўчора, перад тэатральнаю заляю з дэлегатамі, занавесам зачынілася фабрычна-заводзкая нарада.

Потым глядзела Манечка з Вацікам, як ізноў быў адчыніўся занавес, а там:

стаіць каля хаты (каля такой як у Булгака на Малінаўках—з павыразанымі цацкамі на закоце)—стаіць прыробленая лавачка. На лавачцы воліспалкомаўскі старшыня. Вельмі-ж разадзеты і нават ляворвар збоку. Тады падыходзіць дачка з гэтай хаты.

„Якая яна сарамяжлівая"—думала Манечка. У яе руках—дзьве шклянкі з гарбатаю. „Пеце, калі ласка,—кажа хатняя дачка. І ўсё адсоўваецца ад воліспалкомаўскага чалавека. А ён—усё бліжэй прысоўваецца... Каб трошкі, дык скінуў-бы з лавачкі шклянку, што паставіла ад сарамяжлівасьці на край. І от гэтак доўга кахаюцца яны паміж сабою.

Тады Вацік быў усьпёрся на парэнчу тэатральнага балькону. Раскудзеленаю пасмаю зьвісьлі над брывёю яго валасы. Тлумачэньне даваў Манічцы пра старшыню-здрадніка для савецкай улады.

А Манечка:

пасма Вацікавых валасоў дакранулася да яе шчакі. Макавым цьветам заірдзеўся ўвесь яе твар. Вельмі-ж была на твары шчакатлівая прыемнасьць: „Хай-бы гэтак праз увесь час..." Хацела незнарок прытуліцца бліжэй да Ваціка, але руплівасьцю мяшала перагародка тэатральнага крэсла. У думцы гаварыла як праз сон: „Навошта нарабіў тэатр гэтых перагародак..."

Потым бачыла:

старшыня жэніцца з хатняю дачкою. Музыкі іграюць падзікатар... Гэтак як у Малінаўках, калі жаніўся Дзіма Булгачок:—усе гуляюць, адыхтар, як у Дзімы. І музыка, таксама іграе... Тады было ў Манечцы на думцы: „Адкуль яны ведаюць, гарадзкія, гуляць і іграць па нашаму?"

Але от патухла сьвятло, і Манечка нейдзе далёка чула той-самы падзікатар. Перад вачыма цяпер было: каморка сьціснутая трапятліва-халодным змрокам. Рызьзё на падлозе, а на рызманох—служанка гэтай хаты, што з павыразанымі цацкамі на закоце. У яе нарадзілася цяперака дзіцянё ад воліспалкомаўскага старшыні. Чуць чуваць падзікатр за сьцяною—чуцен тахт грукату пад яго гарамонікавы гукі.

Жэніцца старшыня.

І Манечка жмурыць вочы, калі гаспадыня, беднай парадзіхі цісьне пальцамі маленькае дзіцячае горла.

Хацела крыкнуць Манечка на ўвесь голас: „Людаед... Зьвер... што ты робіш..." Але ізноў, нейдзе далёка, той самы падзікатар...

Ішла з Вацікам на кватэру да Яся Рымашэвіча і ня зводзіла з думак:

— Якая кулачыха нягодніца... Дачку замуж аддала, а дзіця служанчына задушыла. Добра толькі, што мала яны пакрасаваліся. Маладзец служанка: не паглядзела, што ён валасным іспалкомам—арыштавала. Трэба было беднай дзяўчыны не падманьваць.

Ды:

—... ён, гэты Вацік... колькі ў яго шмат дабраты...

... Вацік прышоў з гораду, на кватэру Яся Рымашэвіча. Быў у сваіх таварышоў, у завадзкіх рабочых. Хадзіў наўмысьля, каб разьвітацца перад ад'ездам у Чырвонае.

Ліцейны цэх гаварыў на разьвітаньне:

— Прыедзем да цябе цэлаю брыгадаю.

— Пішы, Ваця!

А стары Ўронскі:

— Трымай ў руках нашу лінію...

Трамбоўшчык Рыбскі—камсамолскі цэхавы сакратар, перапыніў:

— І во, як трымай... паказаў туга зацісьнутыя два кулакі,—каб ня было, брат, ні правага, ні левага... Мы тут, а вы—там. І каб яно было адным.

— А калі падшукаеш сабе бабу,—казаў Уронскі,—пішы: купім табе, падарункі.

Лёгкім узмахам, мазалямі пакрэмзанай далоні стукаў па Вацікавым плячуку, гаварыў:

— Пара, браток, пара... Я ў тваіх гадох як быў—адно на калені лезе, другое павалілася, гуз на лбе. Цэлы вэрхал у хаце. І неяк ня дрэнна. Здаецца, каб ня было вэрхалу—было-б вельмі сумна.

Калі зайшоў у пакойчык дзядзькі Яся, не застаў нікога з яго сям'і. Скідаў з плеч ватовую капоту, вешаў яе на адмысловую вешалку, а ў адчуваньнях:

Дні гэтыя зялёнаю сьвежасьцю пакрапілі Вацікава нутро. І сіла была на дубальтовым прыбытку. Хацелася во як разамнуць на ўсе бакі вірліва-узбуджаную сілу!

Горад, гэта як вар у гаршку. Вечна ён гатуецца буйнымі бурбалкамі. Жыцьцё ўзьнята на дыбы... Нямашака тут сном апавітага спакою. На тое-ж яно і мае права празывацца жыцьцём.

— Праўду кажа стары Уронскі...—Чамаданчык даставаў Вацік з-пад Ясявага ложка—зборы рабіў да вячэрняга выезду з паштовым цягніком.—Трэба... і нават пара... жыцьцё чалавека не пачакае.

У поўнай выразнасьці паўстаў перад Вацікам учарашні вечар як ішлі яны з тэатру. Тады хацелася, каб да канца не даводзіць свайго адчуваньня. Пакаваў чамаданчык—пачуў за Ясявым вакном фабрычны гудок. Сам сабе памысьліў у паўголаса:

— Гудок пасьля полудню... Цяперака на фабрыцы зноў пачалася работа...

Бачыў, як на кіно здымку (і ўсё каб заглушыць той учарашні вечар): звучаным рухам прыхінуў Ясь Рымашэвіч лапкі медзянога рубільніка. Перш ціхім шоргатам, а потым моцным тахтам разьвёў гутарку сырамятны шырокі пас з махавым колам.

рра-з--два...

Чамусьці праказаў думкаю:

— Манечка таксама недзе сярод гудкоў...

Зараз павінна была прыйсьці яна з цёткаю Палінаю. Зранку—на першую зьмену да друкарскай машыны—пашла Ясява жонка. Манечка цікавасьцю заімлела: „Як гэта тамака друкуе машына, такія маленькія літары?“

Скрозь фабрычна-пасавы говар цяпер гаварыла Вацікава сэрца: „Можа і лепей што яшчэ ня прышла... Хай“...

Хацелася Ваціку, каб даўжэйшым было чаканьне, каб задаволілася нечым пачуцьцё.

З таго часу, як заняткі былі пра ангельскіх рабочых, востраю зайздрасьцю шчымела нутро Манечкі. Прынес Ахрэмаў Арцём парашком складзеную пісульку ад Міхлі, як прынес для яе парашок атрутнага зельля. Вельмі-ж карцела:

„На што пайшоў Вацік тады да Міхлі?“

І ідучы ўчора з тэатру, абмінаючы электрычны ліхтар, што раскідае сьвятло на ўвесь тэатральны квартал, Манечка ні з сяго, ні з таго:

— Што вам пісала Міхля?:... Гэта як па палітыцы гаварылі мы пра ангельскіх шахцёраў?

Не чакаў ад гэтай дзяўчынкі адвагаю пераплеценага пытаньня.

Увесь час быў у Чырвоным—кожны дзень была Манечка на відавоку. Часамі варушылася думка ў Ваціка:

„Яна такая вяртлявая, спрытная... Яна і пакойчык у мяне прыбярэ... Прыдзеш да дому, а там усё на сваім месцы. І што дзень ходзіць яна з радасьцю. У яе ніколі ня бывае гэтакай кіслай нуды, як у Міхлі...“

Не цяміў і сам, чаму побач з ёю ставіў Міхлю. Ці то перакору шукаў над лупнуўшым да Міхлі каханьнем, ці мо‘ і на праўду—дабрата Манечкі бяз спросу тышчылася ў глыбіню яго маладосьці. На запытаньне Манечкі, як ішлі ўчора, казаў цеплатою ласкі:

— Яна пісала, каб я прышоў па пільнай справе...

— Чаго-ж гэта?—запыталася была.

Ня ведаў што адказаць, а толькі зразумеў: „Яна мусіць ня ведае гаворак, якія хадзілі ходырам па ваколіцы... што нібыта жаніцца зьбіраюся з Міхляю. Добра што ня ведае“.

Гаварыў да Манечкі:

— Пайшоў, а выйшлася, што яна так сабе пісала. Шкадаваў што і пайшоў.

— І вы цяперака, я ведаю, ня ходзіце. Яна—ваўкаватая.

Вельмі-ж трапнае сказала слова—„ваўкаватая“. Вацік даўно шукаў гэтага слова.

Усёроўна як ён хацеў, каб сябе перад некім апраўдаць.

Тады прамінулі электрычны фанар з растрэсеным сьвятлом, і Ваціку лепш было, што схавала яго твар нажмурыстая посьніца ночы. Так і ішлі аж да Ясявай кватэры—не гаварылі больш пра Міхлю.

— Ці цеперся гэта было, а якая яна ўражлівая,—праз цэлы дзень ня зводзіў Вацік сёньня з сваіх думак,—яна вельмі добры чалавек... Чуласьці ў яе шмат.

Той самы чамаданчык быў перад Вацікавымі рукамі, з блішчучымі канцікамі. Канцікі ня блішчэлі як тады, пад сонца, калі Вацік ехаў з Данілам. Бо ня было сонца гэтым днём у Ясявай хаце. Разаспаны быў дзень—хмарнымі брывямі насуплены.

Тупым шоргатам напільніка рупіла Ваціку, каб Манечка хутчэй прышла з гораду. Хацелася гаварыць... Шмат гаварыць, хоць пра што. На ўспамінак вярзьліся заняткі з бягучай палітыкі. Шукаў яе сярод чырвонаўскіх камсамольцаў сваім уяўленьнем:

„Якою яна была, калі беглым зіркам чытаў Міхліну тую пісульку?“ Не акрэсьленую віну адчуваў—ня то перад ёю, ня то перад сам сабою. Гаварыў схованым голасам:

„Ах, як добра, што я і знаць і ведаць не хачу пра Міхлю... Так што Харытону—уся вольная дарога“.

І от, калі ўсьпёршыся быў над чамаданчыкам, пачуў у сенцах вольныя крокі.

— Яны...—быстрая міжвольнасьць ўзьняла Ваціка на ногі.

— Маня з цёткаю Палінаю...

Але адчыніліся дзьверы і ў хату зайшоў лістаносец.

Апала напружанае чаканьне. Глядзеў, як тасаваў лістаносец стус невядомых канвэртаў а потым:

— Ліст...

Узяў у рукі і бачыў на канвэрце нязграбныя літары. Радасьцю заімжэла нутро да знаёмага почарку.

„Добры, дзедушка...—чамусьці праказаў, разрываючы канвэрт з жоўтай паперы.

От што прачытаў у лісьце:

„Мой сынок!

Прыежджайце. Тутака на вас цэлая напасьць. Кажуць, што вы калгасы рабілі з хітрыкамі. І гэты канец Муравейнікаў проста аж ня верыць, што вы былі такім чалавекам. Усё гэта, як быў у пятніцу сход у Муравейніках, на сходзе і ўскрылася. І я адразу і пішу. Вас, нават казаў раён (раён праводзіў сход), будуць арыштоўваць. Мне аж скура шэрхне: я ня веру, каб вы былі такім чалавекам. І вот пішу вам, каб вы барзджэй прыяжджалі.

Напісаў—Нічыпар“.

Вацік праціраў кулакамі вочы: а можа ён як ня так прачытаў? І ізноў чытаў ліст аж да канца. Правільна прачытаў. Хоць і разбэрсан Нічыпараў почарк, а разборчыва напісана было ў лісьце.

IV

Меўся ехаць Вацік паштовым цягніком, а выехаў на чатыры гадзіны раней—транзітам. Ліст старога Нічыпара непакоем запаў у Вацікава нутро. Сядзеў каля вагоннага вакна з Манечкаю ды:

„Што магло здарыцца?—шукаў адказу і ня мог знайсьці.—Завошта-ж арыштоўваць"—думкамі лазіў па заканурках сваёй работы.

Манечцы пра ліст не сказаў. І сам ня ведаў, чаму не сказаў ёй. Ці то не хацеў трывогу наносіць маладому сэрцу, ці то хацелася, каб усё было дазнаным муравейнікаўскае здарэньне.

„Хай будзе ведаць усё за адзін раз, аж да канца".

Вагонныя калёсы выбівалі тахт разагнаным сваім махам. Сунуліся адзін за другім тэлеграфна-вартавыя слупы. Глядзеў праз вакно Вацік, затакаваным зіркам, а не бачыў, ня чуў цягніковага ходу.

Цэлым стусам блыталіся думкі ў галаве—шукаў сярод іх сваёй невядомай віны. Былі найшлі на ўспамінак гады Вацікавага дзяцінства—ператрасаў іх як старое рызьзё.

Бывала, малым як быў, насіў бацьку полудзень. Гудок загудзе, а маці загадзя прырыхтуе ў збаночак варанага з агуркамі квасу. Укіне бывае мяса кавалачак у квас, зьверху на збанок паложыць дзьве лусты хлеба... абвяжа белаю фацінкаю і дасьць Вацiку:

— Нясі... Асьцярожна-ж... Глядзі не спатыкніся, не разьлі...

Вельмі-ж смачны быў хлеб каля бацькавага станка. Бацька возьме адзін раз, Вацік возьме адзін раз...

Пасьля полудню любіў пахадзіць Вацік паміж станкамі. Цэлымі шарамі стаялі адзін каля другога, як на варце, стальныя станкі. А каля іх—папырастаныя людзі: усё рабілі нешта для некага. Пасы: як тыя гадзюкі, з шоргатам шугалі ўгору, угору... Думалася Вацiку:

„Адкуль бяруцца пасы? Яны такія-ж доўгія?

Часамі падыходзіў да яго чалавек з доўгімі, аж за калена, халявамі. Тоўсты чалавек, а на верхняй брыве—бародаўка. Вельмі-ж нянавісьць была ў дзіцяці да чалавека з бародаўкаю. Абы ўбачыў Вацiка, гаварыў чалавек тлуста-праплямленым голасам:

— А ці падмёў ты сёньня маю каморку-дзяжурку? Я так і ведаў, што ты, хлапчо, разбазыраны. Дрэнныя будуць з цябе людзі. Бацька, нябось, табе гаварыў? га-а?

Вельмі-ж Вацiка гарчыцаю пякло самае „хлапчо", і яго гэта „га-а". Прыціснута—нутраным голасам выплёўваў:

— Гадкі...

А бацька казаў да сына:

— Гэта наш цэхавы майстар... сынок.

У сваім дзяцінстве дазнаўся Вацік і пра зямлю, што ня ўся яна пад горадам. Як ня быў за горадам думаў—увесь сьвет—цэлы горад. Колькі ні ідзі, а ўсё будзе горад.

Неяк ня ручыўся год у Кірылавым жыцьці. Маці Ваціка дзецьмі абнядужала, а да бацькі—прыкараскалася слотная трасца. Колькі ні прапіў дакторскіх парашкоў—не адлягала хвароба. Раілі зьесьці на дзёгці сьпечанае яйцо—еў і яно не памагло. Сама, неяк пад восень, нацешылася хвароба—пакінула Кірылу ў спакоі.

Дык у той год аддаў быў Кірыла Ваціка да пана Стэцкага гусей пасьвіць. З таго часу і ўзяў на свой розум хлапец, што ня ўся зямля занята пад горад.

Ваціку прамінула тады сем год. Малаваты, але гусі потым баяліся яго. Перш яны былі на яго гогалі. І нават стары гусак шчыпаўся за лыткі. Вацік бараніўся плачам, праклёны пасылаў, каб папухлі ў Стэцкага гусей усе дзюбы. Старая Стэцкага сьвінарка Хрыста нараіла Ваціку:

— Ты іх дубцом... Ня трэба толькі біць па галаве. У іх вельмі кволая галава. Па плячох сьцёбай. Ды глядзі, нябож,—казала Хрыста,—сьцёбай, каб ня бачыў панскі аконам.

І добра было...

Толькі неяк пасьпелі былі Стэцкага сьлівы. Як цяперака, на памяць Ваціку прышоў той выпадак: ён зьбіраў сьлівы-ападкі. А панскі аконам падкраўся ды: „ня ты садзіў гэтыя сьлівы“,—казаў аконам, сморгаючы Вацікавы вушы.

І не такая ўжо была боль, як запала аж у сярэдзіну крыўда. Сьлёзы былі на вачох. Не ад болю, а ад крыўды былі сьлёзы. Ня ведаў тады, чаму так востра зашчымела яго дзіцячае нутро.

Потым была вайна. Бараніў Полацк... Адарвалася была стальная шчэпка ад белапольскай ярапланнай бомбы. Яна не праляцела якраз паўз Ваціка: яе ўспамінак на яго шчацэ. Цяперака і нічога. Дрэнна толькі, калі цырульнік голіць: брытва часам хапае лязом за зарубцаваную скуру. Ды зубы вельмі баяцца альбо гарачай, альбо халоднай стравы.

... За вакном вагона, шырокімі крыльлямі, садзіўся на зямлю вечар. Калёса гаварылі без уціханку з халоднаю стальлю рэек. Спуджаны холад прабягаў па Вацікавым целе—ліпла слотная думка:

— Зашто арыштоўваць? Няўжо ня пільна трымаў я ў руках партыйную ўстаноўку? Няўжо за Міхася Кляўко?

А пачалося ўсё з Міхлі на муравейнікаўскім сходзе. І бадай што з Старавойціхі на муравейнікаўскай вуліцы.

Белазёраў прыехаў у Бярчукі з пададзенай заяваю, трэцім пасьля Ваціка днём, хадзіў з Харытонам у Муравейнікі—праглядалі з калгасным праўленьнем калгасныя парадкі. І ўсё было пад мяккаразасланым спакоем... Апрача скотнай прапажы. Ды яшчэ скаргу падносіў член праўленьня Ахрэм, што сена збуцьвела ў стагох.

— „Якраз пад дождж складалася ў стагі, гаварыў Ахрэм,—так што—недахват будзе харчы.

А Харытон:

— Ды нехта на тым тыдні,—казаў Харытон,—(мы склалі акт)—падпаліў іхныя, на балоце, два стагі... Кулакова работа, канечне.

Ахрэм пасьведчыў Харытонаву думку:

— Дык вот-жа...

Тады Белазёраў праводзіў успамінкам Вацікаву з ім у канцыляры спрэчку:

„Ня будуць-жа самі калгасьнікі паліць сваё сена. Ён ня ведае, як шкадуе селянін кожнае каліва. Трэба ведаць сялянское нутро...“

— Саўгас Чырвонае... Я дам распараджэньне,—гаварыў Харытону Ахрэму—дам распараджэньне, і яны адгрузяць сена, саломы Харчы будуць.

Гаварыў, і хацелася Белазёраву, каб Вацік чуў яго словы. Браў на ўспамінак, што Вацік хутка прыедзе—будзе ведаць пра водпуск саўгасных харчоў, ды:

„Добра што будзе ведаць...“

І ўжо ішлі з таго канца, каб праводзіць сход на гэтым канцы Муравейнікаў. Саймікаваліся ідучы, як трэба рабіць падыход да людзей, каб на шармак не прайшоў сход.

— Каб два-тры чалавекі далучыліся да таго калгаснага канца, казаў Харытон,—і ўсе ўвайшлі-б... Вельмі-ж тутака людзі жывуць з вялікім процівам. Добра, ах як добра, што вы, таварыш Белазёраў, прыехалі да нас! Вас, можа, лепей паслухаюць.

І от на сустрэчу ішла вуліцаю старая Старавойціха. У руках несла ладны, такі, хлебны акраец. Харытон хацеў паказаць перад раёнам, што ўсе ведаюць яго, што ён жыве з усімі за панібрата.

— Дзіндобры, цётка,—казаў да яе за некалькі крокаў.

А яна:

— Можа і ня зусім добры?

— Чаму-ж гэта, цётка?

— Калі хлеб ад гэтай пары пачнеш пазычаць—ня будзе добрага дню.

— Хіба-ж вам калгас не даваў хлеба?

— Ці-ж хіба-ж ты ня ведаеш?

Да Харытона рынулася колкая злосьць:

„На што яна перад раёнам завяла гэтакую гаворку“.

Але стрымаў нутраны злосны разгон ды:

— Жартаўніца, цётка...

Гаварыў да Белазёрава:

— Молатага няма, дык па яе—саўсім няма.

Старавойціха ўчула Харытонаву гаворку, казала з раптоўнаю для Харытона нечаканасьцю:

— Каб і цябе ня было... самога.

І пайшла.

— Пачакай!—хацеў спагнаць перад Белазёравым свой верх.— Што ты мяне, цётка, лаеш? Пачакай!

Тады вярнулася Старавойціха некалькімі крокамі назад. Харытон хацеў падыйсьці да яе, а яна—

важка замахнула рукою з хлебам. З усяго размаху шпурнула яго пад Харытонавы ногі. На дробныя крошкі разьбіўся аб мёрзлую зямлю акраец сьвежага хлеба.

— Еж...—праказала адзічала-хрыплым голасам.—... т... м...

І пайшла.

Харытон праказаў перад Белазёравым:

— Вар'ятка... ня ўсе, у яе, дома...

... Пакуль зьбіраліся на сход, у Петрыкаву хату, ведалі ўсе Муравейнікі пра старавойцішыну сустрэчу з Харытонам. Гаварылі некаторыя паміж сабою:—„Добра зрабіла Старавойціха, што швырганула ў вочы". Другія казалі—дрэнна: „Навошта было раскідваць, той, божы дар".

Ніколі ня было, каб на сход прышлі ўсе Муравейнікі, а то—як выгнаў іх нехта жывасілам. А-ж Белазёраў адчуваў на сабе ад гэтага сходу патаемнае хваляваньне.

Харытон адчыняў сход. Як прытаіўся да нечага сход, слухаў, з чаго будзе пачын. А як узяў у рукі Белазёраў дазвол на слова, як загаварыў пра далучэньне гэтага канца да таго, гулам узарваліся галасы.

— Ня хочам...

— Мы маем права на свой калгас...

— Ціха-а...—крычаў Харытон,—дык і гэта-ж будзе ваш калгас!

— Гэта, крывасмокава калгас, а не наш...

— Жывадзёрава, а ня наш...

Лаўрэн Жур да стала праціснуўся:

— Дайце мне,—зьвярнуўся да Харытона,—я хочу сказаць...

Нехта пасылаў некаму моцную лаянку.

Нехта каля парогу з некім разьвёў праклённую сварку.

Нехта крычаў цераз галовы сходу—прасіў слова.

Харытон асіліў узьняты гармідар, перакрыў крыкам растрэсены гоман. І да Лаўрэна:

— Кажы...

— Я от што...—праціраючы шчыкалаткамі вочы, гаварыў Лаўрэн,—я хочу, каб ведаў наш раён, што ў нас ёсьцяка вялікая несправядлівасьць...

Сход ізноў прытаіўся. Белазёраў пазіраў з вострым дакорам на Харытона. Стаяў за сталом. з няскончана-прырыхтаваным словам, чакаў, што скажа гэты стары.

А Лаўрэн:

— Мы пісалі самому Калініну пра сельсавецкую несправядлівасьць. Мы ўвесь час чакалі, што хто-небудзь ды ўбачыць, што на нас няма ніякага ўніманьня.

— А чаму вы раёну не напісалі?—перапыніў Белазёраў.—У чым вы знаходзіце гэту сельсавецкую несправядлівасьць?

— А ты ня ўнось ў Лаўрэнава слова перашкоды,—падаў нехта голас з натоўпу.

Лаўрэн як і ня чуў Белазёрава:

— І мы ня губляем спадзеўку, што патом Калінін разьбярэ і скажа ў рэзалюцыі: ці мае правы быць гаспадаром наш Ахрэм, ці ня мае.

— Пры чым-ж тутака Ахрэм?—Харытон згубіў нецярпліваасьць

— Самі вы, калі на тое пайшло—вінаваты.

Петрык стаў на дыбкі—галаву ўзьняў над сходам, крыкнуў да Харытона:

— Трэба было табе больш любові тачыць з Міхляю!

Слова Петрыкава аж устрасянула Харытона. Твар яго на момант пакарабаціўся цёмнымі плямамі. Белазёраў кінуў Харытону сьмехам апырсканы зірк.

— Ці-ых-ха!...—праразьліва-хрыплым голасам сказаў Харытон.

— Хто, табе, даваў слова?

Сход стрымаўся ад разагнанага ўздыму, і бачылі муравейнікаўцы: праціскаючыся скрозь натоўп, да стала падышла Міхля. Твар яе быў зблажнелы. Яе вочы гарэлі запалена-электрычнымі дроцікамі. Па выразу яе твару ня было відаць ні адной усхвалёванай кроплі. Здавалася: была гэта дзяўчына ні прычым, а толькі хацела сказаць сходу нейкую шчырую праўду.

— Таварышы калгасьнікі і аднаасобнікі,—з заспакоена-мяккім голасам зьвярнулася Міхля да ўсяго сходу.—Дарагія таварышы... Партыя і наш ўрад савецкі жадаюць нам дабра.

Ніколі ніхто з муравейнікаўцаў ня чуў Міхліных слоў на сходзе. Калі выступіла яна—напружыў увесь сход свой слух.

— Усім вядома нам, якая вялікая карысьць ад калгасаў,—гаварыла тым самым голасам.—Вы ўсе ведаеце гэта, і я ня буду вам даказваць. Я от хачу, самае галоўнае, гэта, спыніцца на тых людзях, якія праводзяць у жыцьцё пастановы нашай савецкай улады і нашай партыі...

Белазёраў пазіраў на гэту жанчыну, і радасьць падымалася зялёным узростам, што ў Муравейніках ёсьць такія разважна-кемлівая жанчыны.

А яна гаварыла:

— ... мне здаецца, віна тутака не Харытонава і не наша калгасная, як зараз гаварылі. Мяне нават бярэ зьдзіўленьне, чаму маўчаць Муравейнікі пра работу гарадзкога, так званага рабочага, Такарскага?

Харытон аж прыўзьняўся з-за стала. Вачыма праразаў Міхлін стан, з тахтам яе слова, лавіў вольна-важныя рухі рук.

А яна:

— ... горад прыслаў на саўгасную ды калгасную работу не таго, каго трэба. Таварыш Мамчыц ня можа ўсюды адзін дагледзець, а так званы таварыш Такарскі...

Яна на момант спынілася—праглынула сухую гарачыню ў роце, ды:

— ... грамадзянін Такарскі,—гэта быўшы афіцэр. Так што-о, хай ведае,—зьвярнулася да Белазёрава,—хай ведае таварыш райвыканком, якая магла праводзіцца гэтым чалавекам калгасная работа. Чаму гэты канец Муравейнікаў ня хоча іці ў калгас?

І калі-б ведаў муравейнікаўскі сход, што здарыцца праз дзень—рухнула-б ад шуму-гоману тады Петрыкава хата. Узламаў-бы чалавечы гоман столь, ды разьліўся-б па ўсёй ваколіцы ўстрывожаным крыкам:

... дарагія таварышы—на варту! Моцна схапіліся паміж сабою і не на жыцьцё барукаюцца—два канцы чалавечага сьвету! Апошняя зброя пушчана ў ход старым сьветам. Чым бліжэй бачыць ён сваю пагібель—большая, у апошняй схватцы, асьцярвянелая адвага.

На варту—дарагія таварышы!

Але—

як дынамітным узрывам аглушаны—маўчаў сход. Толькі прарваўся з натоўпу суха-дрыжачы нейчы голас:

— Як-жа гэта...

Ніхто не пачуў устрывожанага голасу. Вочы ўсяго сходу былі на твары гэтай дзяўчыны.

А Міхля:

павольнымі рухамі дастала з паліта пацёрта-сівы конвэрт. Палахлівымі пальцамі выняла з конвэрта сьпісаны ліст.

— Вот...—палажыла на стол перад вачмі Белазёрава.—Прачытайце.

Харытон падхапіў ліст з стала і перад усім сходам:

„... вайна, гэта кракавяк. Гарматы іграюць кракавяк, а людзі танцуюць“...

— Не,—перапыніла Міхля.—Ня гэта...

Падыйшла да Харытона—пальцамі паказала падкрэсьленыя радкі:

— Вот...

І Харытон ізноў:

„... я і афіцэру дакажу. Ён кажа на мяне, што я нібыта трус—баюся штыхавой атакі. А я як сустрэнуся з ім, так і скажу: пане Такарскі, камандуйце на штыхавую. Як загадаеце, пане Вячаславе Такарскі: па адным чалавеку на штых ці па два?“

— А возьдзека яго фотакартка,—у рукі падала райвыканкому.

— Ён падарыў гэту картку маёй знаёмай... а я папрасіла, і яна мне гэтымі днямі прыслала.

Белазёраў разглядаў картку, а Харытон:

— Та-ак... да яго твару вельмі падыходзіць гэты афіцэрскі фрэнч.

. . . . . .

— ... Вацік з Манечкаю вышлі на шаснаццатым разьезьдзе.

Праз усю чыгуначную дарогу бачыла Манечка неспакойную муту на Вацікавым твары. А-ж у яе пала хэньць, што едзе з гораду ён гэткім сумным.

„Шкадуе вельмі гораду,—трымала думку на сваёй здагадлівасьці А запытаць—не находзіла адвагі.

На разьезьдзе драмала з дзесяць санных фурманак. Сустракаюць кожны прыход цягніка тутэйшыя вяскоўцы ды местачкоўцы. І ня так дорага бяруць за праезд:—у іх ёсьцяка свая выйгранка. Трапляюцца спадарожныя людзі—пяцярых рассадзіць фурман на адным палукашку. І—у, як—„на ўсіх капылах" адымчыць!

— Садзецеся,—і не заўважыў Вацік, адкуль вырас перад імі луціцкі Гіршык.—Як кажу—будзеце ў самым Чырвоным.

Ваціку спадабалася, што ведае гэты чалавек адкуль яны. І ён:

— А дзе-ж—каторыя, вашы, сані?

— Возьдзека,—адказаў Гіршык.

Калі селі на сані, выехалі з паўстаначнага дзядзінца—за лейцы каня сморгаючы, кідаючы на Вацікa позірк, Гіршык запытаў:

— Дзе-ж гэта вас бог насіў?—ці не лавілі вы ўцекача?

Вацік адразу даўся кемлівасьці:

— Якога ўцекача?

— Муравейнікаўскага Ахрэма...

Манечка за жарт спанатрыла Гіршыкавы словы:

— А навошта яго лавіць: што хіба ён птушка?

— Горш як тая жар-птушка.

Ды:

— А хіба вы ня чулі?

Бачыў на Вацікавым твары скрэмзанае зьдзіўленьне—сам даваў адказ на сваё пытаньне:

— У пятніцу ў Муравейніках быў сход, пра далучэньне гэтага канца да таго, а на другую раніцу, якраз праз цэлыя суткі...

— Нно-о!—каня пагнаў з узгорку, ды расказаў Ваціку з Манечкай, што—

на другую раніцу пасьля сходу нікога не застазі ў Ахрэмавай хаце. І нямаведама куды дзелася ўся, разам з Ахрэмам, з яго швачкаю—Ахрэмава сям'я.

Гіршык гаварыў Ваціку, што стары чалавек, саўгасаўскі конюх бачыў, як ехалі яны цераз чырвонаўскую гару. (Ён пазнаў іх па конях). Ахрэм ехаў на сваім жарабцы, што здаў быў у калгас, а за ім ехаў чалавек з Малінавак—Шчупак.

Гіршык паказаў рукою:

— Дык яны так і паехалі, казаў чырвонаўскі конюх—у той бок. Ён перш быў думаў, што гэта едзе два вазы цыганоў... Цяперака, от ужо рад гэты Муравейнікаўскі ганец...

Манечка ўстрывожаным голасам запытала:

— І Шчупак уцёк?

— Не-э...—адказаў Гіршык. Шчупака заарыштавалі. Але ён кажа, што нікуды ня езьдзіў у тую ноч. Невядома што будзе? Нно!

Вацік трымаў зубамі зацятую маўкліваcьць. Ня мог гаварыць—пытаць, а потым—разарвана-растрэсеным голасам:

— Паганяй! Нно! Паганяй!

Сані паімчаліся выскачкаю, аж на ўхабісты водшып. Сьнег ляцеў з-пад капытоў туга-сьпечанымі камякамі.

— Паг-ганяй!!

Усёроўна як хацеў ён дагнаць той дзень, які забраў з сабою прошласьць—кавалак чалавечага жыцьця. Сонца цяперака зьбіралася толькі на адну ноч пакінуць сьнегам зараўнаваную зямлю. Апошні яго прамяністы бляск растрэскаўся рассыпаўся на дробнаружовую пацяруху—іскрыўся на сьнезе яркім уздымам. Гледзячы паабапал дарогі на вялікі аблог выбелянай зямлі, здавалася:

нехта запаліў зямлю...

гарыць зямля тысячамі, мільёнамі зорак. Новую адзела зямля сарочку. Маладою стала—сабралася ступіць на каберац. Сьнегавыя зоркі—нястрыманаю пацехаю моргаюць... За яе кужэльнае, не акінутае вокам палатно, за яе нанова ўзгадаванае бязьмежнае шчасьце.

Канец.

1931—32 г.

Сьцяпан Ліхадзіеўскі

Радзіма—Краіна Саветаў

З глухім сутарэньнем дружылі яны,
ім сьніліся часта цудоўныя сны:
работа знайшлася—
і хлеб на стале,
і сонца, і песьні вясёлай стае.

І ў момант расьсейваўся сьветлы міраж:
галодныя цені ішлі паміраць
бясьсільнай хадою,
як заўжды, з тугой,—
і сьлед замятаўся ад сну таго.

Адчай нявымоўны разносяць вятры,
а цені блукаюць каля вітрын
і бачаць—
шантаны, рытмічны чарльстон,
застаўлены ежаю пышны стол...
І бачаць багацьце,
пражорства
і шоўк,
бясклопатных фрэйлін цнатлівы сьмяшок,
фарбованы тонка ў агністы кармін,—
Нямеччына-ж іх
ня можа карміць!

Вандруюць на біржу шмат вёсен і зім,
і штэмпэль прыедлівы ставяць ім.
Яны—камуністы,
ня вераць яны
у дзіўны міраж, у цудоўныя сны,
бо знаюць, што сьвет гэты трэба разьбіць
шквалам
клясавай барацьбы!

Галодны паход падрыхтован да бур,
і глебу губляе гнілы Гіндэнбург.
Нямеччыну вабіць чырвоная здань,
і снайпэр Ротфронту
франтоў ня здасьць.
Да нас,
на радзіму,
ў Савецкі саюз
Саксонія шле маладосьць сваю.
Вызвоньваў трамвай... Зіхацелі агні...
Страчалі мы радасна іх цягнік.
І тут прывітаў маладых змагароў
нашых ліцейняў найлепшы гэрой.

Быў вечар сустрэчы...
Казалі яны,
як Вэддынг чырвоны свой сьцяг бараніў,
пра грукат абозаў чарговай вайны,
пра розгалас крыўды жытнёвых ніў.

І нёс дапамогу ў рапарце нам
напорысты рокат
турбін і дынам.
Шумліва шугаў мэлёдычны прыбой
пра пляны супольных вялікіх работ.

Яны ўсе сыны барыкад і крат...
і быў сярод іх соцыял-дэмократ...
„Балюча сумненьні яго абвілі.
Ён вызнаў і голад на роднай зямлі,
і стынь панадворку,
і строму зьняваг,
канца якім,
ліку
і меры няма.
Ён выязьдзіў, бачыў на вочы свае
краіну, дзе працы і сонца стае,
дзе строй новых фабрык і шахт і на іх—
напорнасьць старых і задор маладых,
дзе нівы жывуць у колгаснай сяўбе,—
і ён дакараў, як ніколі, сябе.
Праз холад развагі, пачуцьцяў агонь
паўстала другая радзіма ў яго...

Ён простыя погляды ўсьцяж абмінаў,
ягоныя вочы ўсьцілала віна,
І крыўда нямая,
і ціхі боль—
ён сам нездаволен цяпер сабой,
Узяў і...
прывесіў на пышны бант
значок „Kommunistische v Jugendverband"![1])
І вочы гарэлі і ў іх і ў нас,
як быццам знаёмыя мы здаўна,
і сэрцы дрыжэлі,
і голас ціх,
і твары сьвяціліся ў нас і ў іх,
і мы, разумеючы іх нутром,
крычалі ўзгоднена:
„Рот фронт!"
„Хоць там і выстройваюць жэрлы гармат,
і грузныя танкі выводзяць—
дарма!
На фабрыках іх пабудованы танк
праедзе,
разрэжа
іх кволы стан.
На бой пераможны, крывавы парад
выходзіць сусьветны пролетарыят".
Казалі—
прыкрочаць яны да граніц
Краіну Саветаў сваю бараніць.

Напявалася
само
сабой:
„Блісьне сонейка
над сасоньнікам—
над Саксоніяй
грымне
бой!"

Сьнежань 1931—студзень 1932.

[1]) Камуністычны саюз моладзі.

Мікола Бацюшкоў.

Мая песьня.

Мне толькі—
18!
І рад я,
што
праз рвы
Ідзе маё юнацтва
Пад марш баявы.

Што ў бурах
не прачахла,
У кіпеньні працы—кроў...
Стаў з хлопцамі,
дзяўчатамі
Ў строй камсамольскіх рот.
Ах, радасьць,
радасьць,
радасьць
Агнём у крыві
палай.

Іду
ў бой
з брыгадамі...
За тэмп!
За прамфінплян!
. . . . . .

...Тады зьбіраў знарады
Я пад гарматны дзынк.
І бацька сыпаў радасьць,
Казаў:
ты—добры сын.
Падносіў кулі тату
(Шалеў знарадны сьвіст)...
Цяпер я за варштатам
Ударнік, камуніст.

Ах, радасьць,
цішэй пенься.
Шмат ран—
крывавых плям.
Рэвалюцыя загадвае:
— За тэмп!
За прамфінплян!
Да хлопцаў скокну,
Ў вокны
Загрукаю:
„Ўставай!"...
А вокны сокам мокнуць
У вясеньніх разьлівах,
І коціцца дарогай,
Карчастай да чарцей,
Шырокім
крокам
рокат
Узрушаных
грудзей.
Краіна!
крoў і крык
бяры ты
мой
І маладосьць
ды на́
маю,
Бо сэрца
ў працы
рытмах
Калоціцца дынамаю.

Бо радасна, бо весела
Стругаць
і пець
і знаць,
І знаць,
што нашу песьню
Падцягвае калгас.

Штыхоў варожых навісь!
Да вас
За шлях крыві
Нашу вякоў нянавісьць

У сэрцы
і ў крыві.

Закон змаганьня знаю:
Падбіць варожы крок...
Вінтоўка наразная
Узьведзены курок.
І пад канец на месцы тым,
Дзе быў і жах і спуд,
(Напрыгатове спуск),
Вазьму я човен месяца
Да любай падплыву:
„Ў пырсках сонца
каса мокла
Ад поту,
ад клапот.
За мною,
камсамолка
Кінь зоры,
да работ!"
Краіна!
Кроў і крык
бяры ты
мой
І моладасьць
ды на
маю
Бо знаю:
вершаў
рытмы
Ўскружыліся дынамаю.

Менск, зав. імя Молатава

Загартаваны агнём і бурай...

Загартаваны агнём і бурай,
гулам узварушаных гадзін,
стаў і моўчкі бровы
панахмурыў
эскадронны камандзір.

Бачыў, як зарніцы палыхалі
над сівой разораю лагчын,
як драмалі нізенькія хаты,
апавітыя імглой начы.

Чуў, як дыхалі тады
са скрыпам
грудзі абамлеўшае зямлі,
як глушыў
людзкія стогны—крыкі
вогненны гарматны пераліў.

Удыхаў павевы золкай гары,
піў ваду, зьмяшаную з крывёй,
калі плыў
па сонечных выгарах
закліку трывожны звон.

І ляцеў па полі без дарогі
скрозь туман,
скрозь ноч,
скрозь дым
на чале ліхога эскадрону
эскадронны камандзір.

Конь імчаў галёпам
ашалелым,
разьбіваючы каменьне ўшчэнт...
А на шлёме шэрым палымнела
зрока пяцікутная ярчэй.

Дык чаго прыціхшы,
задумённы
ты глядзіш на дальнія палі,
дзе вясной
пад коўдраю зялёнай
нівы дарагія зацьвілі?

Бачыш, як цудоўным
перавяслам
абнімае даль нямы прасьцяг.
Пад страхою буйнага калгасу
чуцен пульс інакшага жыцьця.

Думаеш пра будучыню часта,
нават заўтра гэта
можа быць:
па абшарах звонка
праімчацца
заклікі трывожнае трубы.

І тады ізноў па перагонах
паляціць
прасьцяг
будзіць
на чале ліхога эскадрону
эскадронны камандзір.

НАРЫСЫ

Янка Скрыган

Гомсельмаш [1])

11. Новы дырэктар.

На заводзе не хапала інжынэрна-тэхнічнае сілы, каб формулямі арганізоўваць чалавечую заўзятасьць. Гэта было важным. Завод—сыстэма і, нават калі рабіць невялікую зьмену, дык трэба пагаджаць з усею сыстэмаю.

Брыгада спэцыялістаў памагла скласьці пляны—арганізавала тэорыю. Тады было здалося, што гэта ўжо—ўсё. От ператворыць завод пляны ў рэальнасьць, і гэта будзе яго перамогаю і ростам на заўтра і ў заўтра. Але гэта было спадманным. Выходзіць, што і яснасьць патрабуе перамогі такое, якую здабываць цяжка. Так, пляны—формулі—ясныя, але трэба яшчэ падаць каманду, каб формулі ператварыліся ў рэальнасьць—арганізаваць яснасьць.

Тады, разыходзячыся з інжынэрна-тэхнічнае нарады, кожны панёс з сабою ўпэўненасьць, што з гэтага дня пачынаецца плянавая перамога. Гэта была невялічкая пераацэнка формуляў у прагнасьці рэлізаваць сваю волю. І назаўтра кожны пачуў, што не хапае яшчэ аднае яснасьці—рашальнае—плянавага арганізатара заўзятае волі—камандзіра. Трэба выразна падаць каманду так, каб кожную чалавечую думку, кожны круток мэханізмаў пагаджаць з усею сыстэмаю. Інакчай—і пляны і формулі пачнуць блытацца. Адсутнасьць апэрацыйна-вытворчага цэнтру затармазіла скачок. Гэта адчувалася ясна, і завод прагна чакаў дырэктара.

Але аднойчы па заводзе—ня голасам, а нейкім нутраным пад'ёмам—пранеслася вестка, што прыехаў дырэктар. Яго яшчэ ня бачылі, але па тым, як ажывілася агульная радасьць—ведалі, што гэта праўда. Па цэхах мелькам бачылі Генкіна. Як і заўсёды, ён праходзіў грузна, убіраючы ў сябе заводзкі дзень. Але і ў ім бачылі зьмену. Сунімаючыся на працэсах ён быў куды весялей і відно было, што ад гэтае весялосьці яму нават хацелася жартаваць.

— Ну як?—нецярпелася кожнаму, каб запытацца.

— Што?

— Ну, дырэктар—праўда, што прыехаў?

— Які?

— А, кінь... Прыехаў?

— А хіба занудзіліся? Чаго-ж Фалкіна адцураліся?

— Ай, назола, яму от жартаваць трэба.

Сазнаючыся, што „праўда", Генкін як бы нехаця ўсьміхаўся і ішоў далей. І не зразумець было—ці то ад яго рабочым перадавалася гэтая ўзбуджанасьць, ці ад рабочых яму.

[1]) Гл. Маладняк № 10, 11, 12—1931; 1—1932

А Генкін напраўдзе ажно прасьвятлеў. Таксама як і рабочыя ён з нецярпліваcьцю чакаў новага дырэктара. А там, у Белмэтальаб'яднаньні, як на злосьць, марудзілі. І ўрэшце—прыехаў. А гэта азначае, што і завод паздаравее, і з Генкіна скінецца гібель клопату. Ато аднаму—хіба разарвешся? А тут, як на злосьць, і ўсё заводакіраўніцтва дало шчыліну. Фалкін астаўся ў тыле—пакінуў завод як непатрэбны замятак. Дырэктар па рабочых прапановах, Лысенка, спужаўся, заблытаўся ў сабе, захлібнуўся напорам чалавечае творчае волі. Фэльдман ашаламіўся. Нядрэнны інжынэр і тэхнічны работнік у габінэце, ён вечна губляўся, пападаючы ў цэхі. Пападаючы на завод, ён адразу траціў арыентоўку, і завод у смазе свае пульсацыі для яго аставаўся цянётамі. А ўсякі спуд, у аб'ектыўнай хадзе рэчаў, нехаця дасьць расколіну. Усялякая маруда, у агульным патоку заводу, нехаця стане тормазам. Якая вялікая сіла, гэтая челавечая воля і заўзятасьць! І Генкіну трэбыло скрозь і ўсюды даразумецца ўсачыць, каб перасьцерагчы гэтыя расколіны. Увесь завод—па ўсіх лініях—насіць у сабе... І от разам з рабочымі ён таксама нецярпліва чакаў дырэктара.

І ўрэшце—дырэктар прыехаў.

Пасьля Генкін разам з нейкім новым чалавекам хадзіў па заводзе. Чалавек уважліва прыглядаўся да ўсяго. На дварэ сунімаўся, знаёмячыся з карпусамі. На дварэ яшчэ багата ўсялякіх матар'ялаў. Трубы, арматура, машыновыя часткі. Па краёх двара—кучамі каменьне на брук. Пасярэдзіне—ямы на фундамант для новага корпуса. Ля саду—слупкамі паскладаная цэгла. Гар вагранак мяшаецца з пахам будучае яшчэ не разгорнутае работы—з пахам будаўнічых матар'ялаў. Завод яшчэ ў працэсе росту і будоўлі. Багата ўпартае неадкладнае работы.

— Гэта зьмены,—гаворыць Генкін, паказваючы на разварушаны земляны дол і на гэтыя завалі матар'ялаў.—Першыя праекты былі не такімі. Невядома для чаго гэты будынак меўся будавацца вунь там. А ваданапорную вежу даводзіцца папраўляць ужо цяпер, калі яна пабудована. Зроблена была так, што на выпадак пажару яна не змагла-б даць ніводнага літра вады ў цэхі. Сьлядок рэстаўрацыйных патугаў.

Новы чалавек, здаецца, мелькам, але ўважліва ўбірае ў сябе і гэтую разварушаную стракатасьць двара і Генкінаву гаворку.

Цэхамі праходзяць паволі. Часта сунімаюцца, каб паглядзець на мэханізмы. Рабочыя заняты на сваіх працэсах, і ўсё-ж такі новага чалавека бачаць. Ён, таксама, як і Генкін, грузны, толькі вышэй і круглей за Генкіна, і ў хадзе рукі чамусьці не пападаюць у такту, а жывуць як бы самі па сабе. Ад гэтага здаецца, што гэты чалавек няўважлівы і ня мае напірыстае волі, такое, якая патрэбна заводу. Але твар—брыты, чырвоны—куды маладзей за хаду. На левым баку грудзіны паблісквае значок ЦВК БССР.

— Камаеў!

Чалавек перарывае гаворку з Генкінам і глядзіць у бок. Абыходзячы машыны, прабіваючыся між патоку зборкі, таропка ідзе змурзаны майстра.

— Піліповіч?

— А як-жа.

І два чалавекі сьціснулі рукі. Генкін усьміхаецца сустрэчы даўных прыяцеляў і, крыху пастаяўшы, ідзе на паток, згубіўшыся між людзей.

— Дырэктарам?—пытаецца Піліповіч, і толькі цяпер угледзіўшы што ён здароваўся чорнаю рукою, выцірае яе аб крысу.

— Ага. А ты-ж тут?..

— Майстрам,—адказвае Піліповіч, наперад разгадваючы запытанне.—Па сячкарнях. І скажу табе, што дрэнь у мяне справа. Нават да палавіны не дацягваем.

— Чаму-ж гэта?—пытаецца Камаеў яшчэ ня прыбраўшы ўсьмешкі ад сустрэчы і сам заўважае, што яны нават не папыталіся яшчэ адзін у аднаго пра гэтыя сем год, выкінутых з іхнае дружбы. Сем год ня бачылі адзін аднаго, а сустрэліся і—неяк дзіўна—зразу пра сёньня. Як заўзята крочыць цяперашні чалавек, калі яму нават няма калі ўспомніць пра ўчарашняе змаганьне. Гэта таксама рысы новае фармацыі. І ўсётакі добра—нават ня пытаючыся пра выкінутыя гады—сустрэцца і адчуваць, што гэтыя гады і аднаму і другому вядомыя, бо ў іх і аднакія мэты і аднакая прагнасьць.

— Не кажы ты,—гаворыць Піліповіч, усё яшчэ па крысе водзячы рукою.—Усё яшчэ малачай нашае маладосьці. Усё яшчэ рост. А на маю долю выпала і дзялянка тугаватая. Сячкарні. Новая канструкцыя—бач, якая грамадзіна. Сіласарэзкі, хоць тузаючыся, але бяруць ужо заданьне, а я от карпею. Ды яно такі да гэтага часу і цяжкавата было раўняць усе франты. Бяром ступамі, як па-вайсковаму гаворыцца.

— Трэбудзе выраўняць.

— От я да таго і кажу, што трэба будзе цяпер налегчы і на маю дзялянку. Нам, галоўнае—гэта, каб удоваль давалі дэталі. Плянавы паток з мэханічнага. А на гэта патрэбна перакідка ўвагі... Спэцыяльна і кажу.

— Ладна, ладна, хітры ты я бачу. Зразу ня ў брыву, а ў вока цаляеш. Перакінам. Зробім... Усё трэба дагнаць да свайго месца... Ну, а цяпер—як ты...

І толькі цяпер паплылі чарадою выкінутыя сем год, у якіх ня было калі ўспамінаць пра сяброў і пра дружбу.

Пачалася тая палоса, калі, па прывычцы, ад адсутнасьці адміністрацыйнага цэнтру, завод апускаў рукі. Няма сыравіны, вышлі патрэбныя асартымэнты—а што ты без матар'ялаў зробіш? Гэта на заводзе было ўжо ня раз, і заўсёды выклікала рэакцыю. Яна дубальтавалася яшчэ і тым, што насіла характар спадчыны. У Фалкіна такія зьявы былі ў норме—няма матар'ялаў, з фактам на ражон не палезай—і заўсёды даводзілася аддавацца ў залежнасьць пабочнае аб'ектыўшчыны. У такія часы звычайна апускаліся рукі. Злосьць. І сіла і энэргія прападаюць на вецер праз нейкую там няўчасную недарэчнасьць.

Вядома, аддзел забесьпячэньня ні ў чым не вінаваты. Міхайлаў паказвае тысячы тэлеграм, што ён клапаціўся, што ён турбаваў, і нават вось апошняя тэлеграма гаворыць, што матар'ялы даўно адгружаны. Значыць яны недзе прапалі ў дарозе. А гэта ўжо не яго віна, калі прамфінплян зрывае чыгунка.

— Даўно вы атрымалі гэту тэлеграму?

— Ды вось тут стаіць дата... тыдняў тры.

— І тры тыдні спакойна чакалі, ведаючы, што на заводзе выходзяць матар'ялы?

У Міхайлава блытаюцца словы і на дапамогу прыходзяць пальцы. Яны скоранька гартаюць справу з перапіскаю. На што яму гаварыць, калі ён пакажа дакумант?

— Вось. Зусім не спакойна чакалі. Гэтую тэлеграму я даваў па лініі ДПУ. Да мяне прыходзіў тады таварыш Генкін, таксама з папярэджаньнем. І я разаслаў гэтую тэлеграму на ўсе станцыі, каб груз адшукалі. Ну, і вось, бачыце, на нас—нуль увагі.

Міхайлаў прыгладжвае валасы,—чорныя са срэбнымі нітачкамі на скронях. Ну, цяпер відно, што ён не вінаваты і што больш тут нічога ня зробіш?

Але Камаеў нават не глядзіць на дакумант. Ён гаворыць нават, што гэта не адгаворка, што за недастаўку матар'ялаў вінаваты „мы", і што зараз-жа трэба камандыраваць спэцыяльнага чалавека на пошукі застралых грузаў.

— Мала, мала глядзіце за сваею работаю, таварыш Міхайлаў,—канчае Камаеў і Міхайлаў пазнае, што гэты далікатны пачатак іхнага знаёмства можа быць жорсткім канцом.

Нечаканы прарыў яшчэ больш дае сябе адчуваць таму, што завод быў ужо паправіўся і браўся, каб выроўніваць усе франты. З цэхаў прыходзілі да дырэктара.

— Таварыш Камаеў, няма круглага жалеза.

— Няма паласавога...

— Няма ліставога...

— Добра. Я зараз буду ў цэхах. Можа што зробім,—і сам выклікае прадстаўнікоў з аддзелаў, каб даznацца—якое-ж, урэшце, жалеза на заводзе ёсьць.

Ёсьць, але іншых асартымэнтаў—круглае і паласавое. Ліставога няма ніяк. Нават, калі зрабіць падмену дэталяй другім жалезам, каб ня спыняць вытворчасьці, дык усёроўна сіласарэзкі астануцца без патрубкаў ды без кажухоў, бо ліставога нічым не падменіш.

— Трэба запытацца на іншых заводах. Можа ў іх ёсьць—пазычыць.

— Я памятаю, што я сам яшчэ і „Пралетару" і „Рухавіку рэвалюцыі" гэтакія асартымэнты запараджваў. У іх павінна быць,—падае голас інжынэр Фіш.

— Вось і добра. Таварыш Міхайлаў—зараз-жа даведацца і зрабіць... На заводзе панікі не падымаць. Матар'ялы павінны быць!—налягаючы на стол гаворыць Камаеў да ўсіх.—Нават тады, калі нам ня ўдасца і пазычыць—работы не памяншаць ні на волас! Будам ужываць іншае жалеза. Цяжэй ці лягчэй на некалькі фунтаў будзе машына?—глупства. Даражэй? Няхай яна нам тыдняў пару абыдзецца даражэй на дваццаць пяць капеек, затое даючы сваячасова машыну ў работу—мы зьберагаем на тысячы і мільёны рублёў корму ў сельскай гаспадарцы. Так. Неадкладна паставіць людзей на выбарку і падборку жалеза. Гэта вам, таварыш Фэльдман. А вы, Абрам Ільліч,—Камаеў зьвяртаецца да інжынэра Фіша,—дайце на кажухі ды на патрубкі. Вы казалі, што ў Віцебску вы матар'ял рабілі з нічога. Выкручваліся з самага цяжкага становішча. Прыдумайце што-небудзь і тут. Каб ні на волас ня зьнізіць тэмпаў. А?

Інжынэру Фішу спадабаўся такі напамінак пра яго работу.

— Папробуем. Можа што і выдзе,—гаворыць ён, папраўляючы на рукаве спонку, і адным краем губ сам сабе ўсьміхаецца, паказваючы чорную дзірку ад вываленага зуба.

На заводзе Камаеву адразу кінуліся ў вочы дзьве акалічнасьці. Першая: завод мае тую сілу, якая дакладна ня можа ўлічвацца нават ніякімі плянамі—сілу энтузіязма. І другая: гэтай сіле не хапае апэрацыйнае арганізованасьці. Гэта нават увайшло ў прывычку. Асабліва гэта ўжылося за час, калі завод быў бяз дырэктара. Заводзкія недахопы відны былі кожнаму, і кожнаму хацелася іх паправіць. Ад гэтага нарадзілася багата начальнікаў, і разнабой каманды даваў разнабой і на вытворчасьці. Загады аднаго начальніка адменьваліся другім. Асабліва гэта кінулася ў вочы Камаеву, калі пры ім-жа загад Санаторскага пра новыя распоркі адмяніўся Фэльдманам. Рабочы ня ведаў—каго-ж слухаць. Сьцьвярджаючы загад Санаторскага, Камаеву давялося нават прыкрыкнуць, бо рабочы ўпіраўся, спасылаючыся на загад начальніка вытворчасьці.

Такім завод застаў Камаеў і гэта трэбыло ламаць сілаю адзінаначальля.

На пачатак Камаеў паклікаў да сябе інжынэраў па вытворчасьці, начальнікаў ды майстроў цэхаў.

— Знаёміцца будам так,—пачаў Камаеў, калі апошнім скрыпам прыглухлі дзьверы габінэту—Я чалавек просты. І люблю, калі і да мяне ставяцца проста, бяз ніякае чыноўніцкае фанабэрыі. Але там дзе трэба—я і жорсткі. Гэта, таксама, кажу наперад. Каб пасьля ня гневаліся. І сёньня наша гаворка будзе такая. Завод ужо мне знаёмы. Малайчына завод! Работы па горла і рабіць ёсьць з кім. І трэба пачаць рабіць. Я кажу пачаць, бо пачаць з новаю сілаю, так, каб аж трашчала. А сілы гэтае—ужга!—рвецца сама. Вы самі гэта бачыце. І вы ня дрэнныя работнікі—я гэтага не кажу—але вы жылі самапасам... Верна гавару?—як бы ва ўсіх пытаецца Камаеў і сам усьміхаецца ад гэтага лірычнага ўступу.

— Бадайтакі верна.

— Само сабою відно.

— Ну, вот,—зноў пачаў Камаеў, перачакаўшы невялікія гаворкі.— Сіла ў нас ёсьць і сіла хорошая. Трэба толькі ўмець яе арганізаваць. На днях-жа, вы самі бачылі, мы ўжо хацелі сесьці макам. Няма матар'ялаў і, здавалася, што тут ужо нічога і ня зробіш. А зрабілі-ж! Плянаў не сарвалі. Нават і патрубкі і кажухі зрабілі. А іх ня было нават чым і падмяніць. Абрэзкі скарысталі, з кавалкаў парабілі—вымудравалі, пасточвалі—і цяпер ужо машыны недзе ў рабоце. Галоўнае—трэба ўмець хацець і не перад чым не пасаваць.

Гаворачы, Камаеў перш глядзеў на людзей, пераводзячы то на аднаго, то на другога прыкрытыя густымі брывамі вочы. Адале вочы ўпалі на стол і зачапіліся за асадку. Тады асадку ўзялі пальцы, пачалі яе варочаць, і вочы на людзей глядзець забыліся.

— Вот,—перадыхнуў Камаеў.— Паводле тае работы, якую вы былі распачалі яшчэ да мяне, відаць, што вы хацець умееце. Я кажу пра выпрацаваныя вамі пляны. Цалкам ажыцьцявіць вы яшчэ іх не змаглі. А ажыцьцявіць трэба. Заўтра я даю загады па іншых цэхах, каб нам пачынаць выпраўляць увесь завод. Па сіласарэзках мы ўжо выконваем усё заданьне. Замацаваўшы яго мы пераключаемся на іншыя машыны, як правільна пра гэта пры першым спаткаьні гаварыў мне таварыш Піліповіч. Выканаць усё тое, чаго вы скрозь самі дамагаліся,—гэта і будзе нашаю перамогаю.

Цяпер захацелася гаварыць усім. Лінія крутая, але таму, што яна ўключыла ў сябе ўсе цэхі—гэта ажывіла цэхавых прадстаўнікоў. І Камаеву добра разгадаць кожнага. Па спрэчках ён бачыць, што папаў у кропку—кожны цэх рад, што набывае раўнапраўе. Ато сіласарэзкі былі забралі ўсю ўвагу, а іншыя машыны па дэталі з мэханічнага стаяць у апошняй чарзе. Пратэкцыянізм дый годзі. Сіласарэзкі былі адціснулі ўсе машыны. Сяк-так яшчэ ліпелі сячкарні. А бульбасартоўкі ды бульбамыйкі зачахлі зусім. А гэта, калі ў нас плянавае забесьпячэньне дэталямі—давай спаборнічаць!

Камаеву не патрэбны больш спрэчкі. Усё ясна і з гэтага. Пальцы кладуць асадку і ён зноў ужо глядзіць на людзей, толькі па-новаму—стражэй.

— Дык вот. Я ўжо сказаў, што я магу быць і жорсткім. За выкананьне ўсіх маіх загадаў ускладаю адказнасьць на начальнікаў цэхаў. За два дні выканаць усе наказы інжынэрна-тэхнічнае нарады з тым, каб дэталямі пачаць забясьпечваць плянава ўсе цэхі. Пятага-ж чысла па ўсіх відах машын заданьні ўжо павінны выконвацца. Пятага-ж чысла ўсе начальнікі цэхаў павінны зьявіцца з рапартам выкананьня сваіх плянаў. Даць рапарты! Вось такая, таварышы, на вас адказ-

насьць,—і Камаеў устаў усьпіраючыся далонямі на стол.

З габінэту выходзілі нехаця. Здавалася, што яшчэ нарада ня кончана і хацелася пагаварыць хоць адзін з адным. Абкружылі дырэктара. Гаворка павялася абы-якая. І было добра, калі, ужо расказваючы пра нейкае здарэньне, Камаеў выпучваўся на крэсьле і раскаціста рагатаў чырванеючы ўсім сваім здаровым мясістым тварам. І рабілася дзіўным, што ў гэтым чалавеку—з жартамі і з панібрацтвам—месьціцца тая жорсткасьць і напірыстасьць, якое рабочие не знаходзілі былі ў першыя дні яго прыезду.

Не адзін раз Камаеў уваходзіць ужо ў гэты цэх. І заўсёды цягне нейкая сіла, як-бы там засталося нешта згубленае і от рупіць, каб яго пайсьці ды пашукаць. Але Камаеў нічога ня шукае. Зойдзе і стаіць, або ходзіць аглядаючы і нешта мяркуючы. Дрэваапрацоўчы цэх. Якая аграмадзіна! Якая шырозная прастора залі! Паўмуроўваны варштаты—самага апошняга слова тэхнікі варштаты. Варштаты панакрываны фанэраю. Ад гэтага здаецца, што яны пападкурчваліся і дрэмлюць. І, здаецца, калі разбудзіць іх, дык у гэтай пустэчы яны пачнуць перагуквацца, як людзі. Ад жудасьці. Бо і папраўдзе жудасна бачыць, як сіла жыве небытам. Цэх сьпіць. І які вялікі крык пратэсту ў гэтай цішыні, у гэтай пакрыўджанай стоенасьці бясправных машын!

І от у гэтую жудасьць ад крыку цішыні Камаева цягне. Небыт машын не дае Камаеву быту. Потайкі шавеліцца думка. Яна разростаецца і ад гэтага яшчэ больш рупіць пра цэх. Такая аграмадзіна! І навошта яна на Сельмашы будавалася? Сельмаш ніколі ня мог-бы скарыстаць яе цалкам нават тады, калі-б у тры разы быў большы за пэрспэктыўныя пляны. На мэталяапрацоўчым заводзе драўляныя работы займаюць зусім невялікую частку. Успамінаецца, што Генкін гаварыў пра рэстаўрацыйныя патугі. Няўжо і ў гэтым была закладзена якая-небудзь шкодніцкая мэта? Але гэта цяпер мінулася. У Камаева перад вачыма стаіць крык цішыні і муляецца разростаючыся мысьль.

— А што, каб зрабіць? А? І машыны запрацавалі-б, і цэх ажыў-бы, і завод на галаву вырас-бы, а? Ато-ж прападаюць. Сіла. Такія варштаты. Такая раскошная будоўля... Трэба расказаць Генкіну.

І, ужо ідучы, каб пашукаць Генкіна, Камаеў сам сабе разгортвае пляны. Цэх трэба скарыстаць. Такія магчымасьці і сродкі ляжаць мёртвым капіталам. Зрабіць камбінат. Дрэваапрацоўчыя вырабы. Ды гэта-ж як запрацуе такая сіла—чаго толькі нельга будзе зрабіць! Урэшце, можна памагчы Бабруйскаму. Узяць хоць-бы выраб стандартных дамоў і вось, калі ласка—і Гомель, і Сельмаш, рабочыя пасёлкі—забудоўваўся.

— А?—як-бы сам сябе пытаецца Камаеў і абыходзіць цень, не заўважаючы, што перад ім стаіць Генкін.

12. Каця Лапянкова

Вот: паглядзець на іх, і якою мэтафізычнасьцю робіцца тэорыя зьнявагі асобы. Ён прыгнуўся каля яе—разам з ею—над апокамі, над люшніцамі, над ланцэткамі—над чорнаю фармовачнаю зямлею. Ён блізка прысеў каля яе і гэта здаецца лірыкаю. У іх мабыць нейкая цёплая інтымная гаворка—дружба. І яму мабыць нялоўка за сваю гэту няўчасную дружбу—узяўшы ад Каці ланцэтку ён водзіць ею па зямлі.

— Ня цяжка?

— Не. Гэта як мне былі далі буйныя дэталі, дык тады цяжкавата было. Зафармуеш, бывала, а апоку ледзьве павернеш. А гэта нічога.

— А з бракам як?

— А з бракам горш,—Каця гаворыць не перарываючы работы.

Яна бярэ ў Белазерскага ланцэтку і згладжвае крайкі зьлежанае зямлі, адкуль толькі што выняла мадэль.— З бракам горш. Я ўжо была дайшла да таго, што не давала бадай нічога, а гэта зноў падымаецца.

— Дык чаму-ж гэта?

— А гэта таму, што ў мяне цяпер вучні. Вось бачыш?—яна паказвае на шар апокаў, што канцамі ўпіраюцца ў сьцяну,—гэта работа прымацованых да мяне вучыяў. Ну, у іх і брак пападаецца. А раз гэта вучні мае—то і брак ідзе на мяне.

Белазерскі на трошкі маўчыць. Ён глядзіць перш на Кацю, адале апускае вочы і, нешта пра сябе думаючы, сунімаецца на Каціных руках. Рукі доўга абхарошваюць земляную мадэль і толькі тады, калі канчаюць яны сваю работу, Белазерскі перарывае думку.

—А як з Мурашоваю?—гаворыць ён зноў, і пальцы шукаюць, каб чым-небудзь заняцца.

—І тут няважна. Я яе выклікала на сорак адну апоку. Ну і зрабіла-б сама лёгка. От глядзі: да двух гадзін я зафармавала трыццаць шэсьць апокаў, а на больш не хапае рам. І гэтыя па ўсім цэсе зьбірала...— Дастаючы памачок Каця прыгнулася так, што ледзь не націснула на апоку. Асьцярожна падымаючыся, каб не зачапіць фармоўкі, яна зьнячэўку пахіснулася на Белазерскага. Белазерскі падтрымаў малюсенькім дотыкам, і можа ад гэтага ёй захацелася паправіць хустку, прыбраўшы са шчакі невялічкую плойку валасоў. На трошкі Белазерскаму відзён быў яе профіль—тонкі, сур'ёзны—і тэю-ж сур'ёзнасьцю астаўся зьнячэўку кінуты ад нялоўкасьці погляд. Але яна зноў нагнулася над работаю і зноў загаварыла, так, як-бы не перарывала гаворкі... —Ад гэтага сёньня і ўмовы ня выканаю. Але от я перайшла на іншыя дэталі: ня там, дык тут, а вазьму. Толькі нядобра, што даводзіцца так раскідацца...

Белазерскі яшчэ доўга астаецца нагнутым каля Каці . Гэта здаецца лірыкаю. Але гэта—самая простая чалавечая чуласьць і цяплынь. Каця—лепшая ўдарніца па фармоўцы ў ліцейным. І ня зайдрасьць, ня кпіны абкружваюць Кацю. Яе абкружвае чалавечая чуласьць. Вось ён, Белазерскі—сакратар парт'ячэйкі—у канторцы ў Аграната ўгледзеў, што ў Кацінай графе падымаецца брак. І нават у часе работы не сьцярпеў каб ня прыйсьці і не даведацца, што ў гэтым прычынаю. Можа што перашкаджае, можа памагчы трэба? Ня лірыка, ня інтымнасьць, а—чуласьць.

І якою мэтафізычнасьцю робіцца тэорыя зьнявагі асобы. Чужая сацыяльная бытнасьць не зьмясьцілася ў рэвалюцыі. Ёй трэбыло выдумаць лёзунг сьмерці культуры. Рэвалюцыя—гэта дзікунскае права скіфаў. Разгром нормы і цывілізацыі. Масавая жорсткасьць і рацыяналістычная праклямацыя ідэй. Чалавек падмяніўся фанатычным танцам абагуленае мысьлі. Чалавека няма—ёсьць маса. Разгром асобы сьціпла завецца самакрытыкаю, каб пад ею хаваць заалёгічную зайздрасьць...

Так думала чужая сацыяльная бытнасьць.

Але да Каці няма зайздрасьці, такое, каб баяцца свайго права на асобу. Яна нават ня ведала, што ёй памагаюць у гэтым праве. Вось ён прыйшоў і нагнуўся над ею каб распытацца, у чым Каці патрэбна пасобіць.

—...Апокі?

—Ну пэўна. Здавалася-б дробязь. А дзе от іх возьмеш? Бегай па ўсім цэсе, шукай. І няма. А тады і спаборніцтва як сьлед ня ўлічыш... Давялося перайсьці на іншыя дэталі.

—Дзівачка. То ты-ж бы прышла дый сказала. Памаглі-б. А то што-ж —аднаму бывае і не асіліш няўпраўкі. Тое самае і з вучнямі. Чый брак, таму трэба і запісваць. Кожны за сваё павінен адказваць. Атошто-ж

—абязьлічка? От бачыш? А ты і ня скажаш... Дзівачка.

Каці добра адчуваць такую харошую беражлівасьць. Ад гэтага хочацца нешта сказаць, але словы ня выходзяць і, ад нялоўкасьці мелькам зірнуўшы на Белазерскага, яна папраўляе на шчаках хустку, як бы там зноў выпалі няпрошаныя плойкі валасоў. Нагнуўшыся зноў, яна ўжо ня бачыць, як, устаючы, Белазерскі сабраў увесь параскіданы ею ў рабоце струмант, і паклаў каля яе напашэве.

На біржы далі пісульку. На заводзе з пісулькаю паслалі ў цэх, сказаўшы да каго зьвярнуцца. У канторцы Каця застала нейкіх людзей. Людзі талкавалі, спрачаліся, пальцамі паказваючы ў сьпісаны аркуш паперы. Каця запомніла, што гаварылі пра чыгун і пра лічбы. І яшчэ запомніла: непадатліва спрачаўся невялікі, з шырокім тварам і губамі чалавек, гаворачы цяжка, як няўмеючы і, то насоўваючы, то назад адкідаючы шапку. Пасьля яна дазналася, што гэта быў начальнік цэху. Калі вышлі мужчыны, Агранат заўважыў яе.

—А ты-ж чаго хочаш, дачушка?

Каця паказала пісульку.

Прачытаўшы, Агранат зірнуў на Кацю і ад таго, што ён рыўком адкінуў шапку, Каці запомнілася белая незагарэлая палоса ілба.

—Ну, і малайчына... Нідзе не працавала да гэтага?—запытаўся Агранат, гаворачы па-свойску, так, як бы ён даўно ведаў Кацю.

—У брылеўскім калгасе.

—Не—на вытворчасьці?

—Я працавала ў пральні... бялізну мыла,—паправілася Каця і, ня ведаючы, ці так адказала, зашчыпала пальцамі стол.

—А так, на заводзе—не?

—Не.

—Ну, нічога, навучымся. Хадземжа я цябе і завяду,—і ён зноўне як па-свойску ўзяў за плячо.

Цэх Каці здаўся страшным. Фармоўка. Ніколі ня бачыла. На ўсю залю—чорная пухкая зямля. Па залі шныпарацца людзі, поўзаюць, набіваюць ею нейкія формы. І можа ад зямлі—і цэх, і формы, і людзі здаліся чорнымі. І над усім—маўклівая глухая работа. Мелькам яна заўважыла, як нізка прыгнуўшыся над формаю нейкі чалавек абхарошваў земляную дэталь. Якая вялікая патрэбна асьцярога ды ўвага! Яна ніколі не навучыцца такой тонкай рабоце. Можа адмовіцца ды пайсьці да хаты?

Але нейкі новы чалавек вядзе ўжо па цэсе.

—Мы вас прымацуем да харошага хлопца... Навучыць, нічога,—як-бы дагадваючыся пра Каціну думку гаворыць новы чалавек.

—Малеў!—абзывае ён яшчэ здалёк.—Вось табе памочніца. Навучай і не давай нудзіцца.

Каця таксама нагінаецца і глядзіць за Малеваю работаю. У чыгуннай раме шчыльна набіта зямля. Малеў здымае з рамы цяжкую накрыўку і ў зямлі відно, як ляжаць мэталёвыя мадэлі. Каця ня ведае навошта і як гэта робіцца. Адкуль тут пачатак? Але Малеў, таксама, як-бы разгадвае Каціны думкі, і тлумачыць.

—Гэта робіцца так... Цяпер трэба асьцярожна павымаць мадэлі і ў зямлі паастаюцца формы. Уся гэта рама з зямлею—апока. Наверх накладзецца такая самая апока з формамі, але так каб кожная палавіна формы супала. З боку вось—вушкі. Наклаўшы, трэба моцна заклінаваць вушкі, чокамі—зачыкаваць. Клінаваць асьцярожна, каб не здрыганулася зямля. Зьверху вось робіцца дзірка—літнік. Яна пападае ў пустое месца—у формы, і праз яе заліваць мецца чыгун. Чыгун у сярэдзіне апокі разьліецца па формах, застыне, а калі яе пасьля разьняць, дык на месцы формаў будзе вось такая-ж дэталь, як гэтая мадэль.

Чутачку пабіваючы, Малеў асьцярожна вінтом дастае мадэль з зямлі. Адну, другую... і ў роўнай раме апокі астаюцца формы. Пасьля беражкі ён папраўляе маленькімі жалезнымі лапатачкамі. І там, дзе беражкі парушылі сваю шчыльнасьць—змочвае вадою.

—От так, вымаючы, бывае, што зямля дзе-небудзь падымецца або расьпіхнецца. Тады яе трэба паправіць одэтаю ланцэткаю ці кручком. А каб зямля была тужэй, дык яна змочваецца памачком, тады яна ня так абсыпаецца.

—А навошта парашок?—пытаецца Каця, гледзячы, як увесь верх апокі пасыпаны белым мучнаватым пылам.

—Гэта лікападзі. Парашок такі—праўда. Ад яго тужэцьме зямля і, калі накласьці верхнюю форму, дык зямля верхняе апокі не прыставацьме да ніжняе. А яшчэ і тое, што калі будзе залівацца чыгун, дык лікападзі выгарацьме, даючы магчымасьць выходзіць чыгуннай пары.

Каці здалося, што яна ніколі не асіліць гэтага. Вырабіць з зямлі дэталь такою, каб у яе пасьля заліваць чыгун? Гладзіць, абрэзваць баючыся, каб не скранулася з месца ніводная драбніца? Ведаць што да чаго? Не, у яе ніколі ня зложацца рукі, каб так сьмела, як воскам валодаць зямлею, адрэзваючы і прыкладаючы яе скібкамі.

Але, праз пару дзён падыходзіць той самы чалавек, што аддаў яе Малеву. І Каця ведае ўжо—гэта брыгадзір Пераплётчык. Ен нагінаецца і глядзіць, як нясьмела ходзяць Каціны рукі. Яны баяцца, каб не разбурылася ад неасьцярожнага дотыку зямля. І струманты неяк ня слухаюцца: выпадаюць, чапляюцца за кожны замятак. Яна ніяк ня можа добра абрэзаць лішняга бугарка, што як накепства аціснуўся ў форму. Пераплётчык памагае і кажа, што вельмі добра. За такі невялікі час і такая складнасьць. Дзе-ж складнасьць, калі яна катора пара як марудзіць над аднэю дэталяю? а ўсё-ж падымаецца ахвота. Каця раптам верыць Пераплётчыку, што можа яна і папраўдзе сама сябе занадта гудзіць. Пераплётчык пайшоў і ў Каці сьмялей захадзіла ланцэтка. Не, праўда—яна такі моцна трымаецца, гэтая зямля!.. А яшчэ праз дзень, Каця сьпяшалася, ледзь ня бегла дахаты—ёй далі самастойную работу і за дзень яна зрабіла шаснаццаць апокаў. Хацелася хутчэй расказаць дома, што яна ўжо сапраўдная фармоўніца. І якою доўгаю зрабілася тады вуліца Сьцяклова—ніяк не дабегчы дахаты.

Аднойчы ў Каці разбалелася галава. З дому яшчэ, ідучы на работу, яна была цяжкаю і шумела, як жорна. У гэты дзень ня спорылася работа. Рукі хадзілі вяла, ападалі і, здавалася, як ніколі ня слухаўся струмант. На перапынку Каця ня вышла, як заўсёды, з дзяўчатамі на двор. Асталася ў цэсе каля свае апокі. Не хацелася, каб бачылі яе непатрэбнае вяласьці.

Суседка па рабоце, Мурашова, заўважыла і падышла.

— Замарылася, мабыць?

— Не, так проста, нездаровіцца.

— Дзіва што. Бо дурная.

— Чаму?

— Так робячы як ты, і ногі выцягнеш.

— А, не—гэта не ад работы. Проста, так сабе.

— Так ды ня так. Што я ня бачу? Я гляджу за табою: вельмі-ж ты ўжо прыткая. Бярэш, як агнём гарыш. А так доўга не працягнеш. Ужо от „нездаровіцца", а што-ж калі гады колькі так?

— Ай, кінь ты,—Каця зашпіліла рукаў і, як бы не пра гэта думаючы, пагладзіла лоб.

— Дурная. Быдта я яе ад чаго адгаворваю. Я толькі кажу, што

няма куды гнацца. Век вялік—напрацуешся яшчэ. А мне, проста, шкода, што ты не шануеш сябе.

— Як-жа гэта шанаваць? Працую як усе, і толькі. І ня думай, што я цягну над сілу.

Каця зноў пагладзіла лоб. Мурашова паглядзела на яе і ўпяршыню заўважыла: каля губ у Каці закруглілася танюсенькая маршчынка.

— Узяла-б бюлетэнь.

— Ды я ня хворая, кінь ты.

Суседка памаўчала. На локаць прылягла і завадзіла пальцам па доле. Адале загаварыла, ужо далоньню згладжваючы ямкі.

— Усёроўна ў нас аднакія дэталі: давай разам рабіцьмам—і табе і мне лягчэй будзе.

— Давай,—згадзілася Каця.

З гэтага дня Мурашова завязала дружбу. На рабоце неўзаметку расказвала пра сябе. На перапынках далёка заводзіла ў сад і, качаючыся ў траве, выцягвалася на сонцы поўнымі грудзьмі.

— Хлопцы любяць цябе?—і не чакаючы адказу сама гаварыла.—Мяне—любяць. А ведаеш, Каця, ты ўсё—адна... Давай увечары паедам на Мельнікаў луг. Любата! Пакупаемся. На лодцы паезьдзім... Будуць хлопцы — далёка ў лес зойдам, знаеш?—туды, на той край. Трава якая—схавацца можна. Глушэча... Давай!

І разам з дружбаю Каця заўважыла, што ў яе пачаў падымацца брак. Яна ня можа даўмецца, адкульжа бярэцца гэты брак, калі з кожным днём яна ўсё больш лоўчыцца? Пераплётчык пытаецца, чаму гэта, але хіба яна ведае?

— Сама ня ведаю. Здаецца раблю так, як і заўсёды. Нават яшчэ больш прыглядаюся, і от...ня ведаю..

Нават брыдка перад іншымі стала ў брыгадзе. Нават дахаты прыходзіла моўчкі, і было нядобра, калі распытвалі, чаго прысьмірэла.

А Бабічаў наважыў арганізаваць жаночую брыгаду. Узяў Кацю. Суседкаю стала Ладыгіна. З новаю дэталяю асвойталася хутка. Ладыгіна не дакучала дружбаю і ўся брыгада ўзялася за рабогу дружна, так, каб не адстаць ад мужчын. Бабічаў падыдзе, пагаворыць, запытаецца.

— Ну, як?

— Не паддаёмся.

— Гэта добра, але за бракам трэба глядзець. Па брыгадзе яшчэ дзевяць процантаў. Гэта многа. Хаця-б да двух зьменшыць, каб даць нават на процант і менш таго, што палагаецца.

Падышоўшы да Каці Бабічаў прысядае і, ведаючы, што Каця засаромяецца, гаворыць так, каб ня чулі другія.

— А ты малайчына. У цябе ўжо толькі каля двух процантаў.

— А чаму-ж з Мураш...—хоча запытацца Каця, але абрываецца і, па нахмураным ілбе відно, што нешта ўспамінае. Так, ёй расказалі. Яна і сама была пра гэта дагадвалася.

— Нічога...

Паводле нормы ТНБ на дзень трэба даць дваццаць восім апокаў. У кожнай апоцы чатыры дэталі. Сто дванаццаць шасьцёрак. Каця даўно перакрочыла норму. Брак дайшоў да нуля. Цяпер Каця ўжо дазналася, што тады Мурашова запісвала свой брак на яе, і выклікала Мурашову на сорак адну апоку

Уночы ішоў дождж, але зраньня ўжо паказвала на добрую пагоду, і цяпер дапякае сонца. Ад гэтага асталася здаровая сьвежасьць. Пыл змыўся, прыбіўся і заводзкі двор выглядае як-бы большым, чысьцейшым, прыбраным. Наводшыбе, вымытым зяленівам, здаецца, нават, памаладзеў сад. Ад саду, ад зяленіва нясе сьвежасьцю, пахам, падмяняючы прывычную мэталёвую сінь ды вагранкавы гар. Сонца падае ў сьвежасьць здаровым прыпёкам, ад зямлі падымаецца сытая вільгаць —і добра ўбіраць у сябе гэтую сытасьць грудзьмі.

На перапынку рабочыя выходзяць на двор.

— Любата! От каб цяпер на Сожды на Мельнікаў луг!

— Ыч, чаго захацеў. А вечар тады дзе дзенеш?

— І вечару даў-бы спосаб. Угга!

— Ды відаць, што ты выцягнуўбы... Дай сесьці.

Галалобы хлапчына, выпучыўшы грудзі, фізкультурным гэстам тузануў разы пару ўгору рукамі і, даючы месца, пасунуўся на дысцы. Насупраць паўрымшчваліся на парожныя тары. Рашпільваючы грудзіну, нехта ўлёгся на дылі. Выходзячы з цэху нейчы голас адчайна рвануў „гоп са смыкам", але сарваўся, і на яго месца лінуўся ахапак дружнага сьмеху. Выпіхаючы сьпявака „гоп са смыкам", выскачылі дзяўчата.

— Ыч, якая рэзвая мая каманда,— сядаючы на спарожненае месца, жартуе Бабічаў—Папробуй, займіся з імі.

— Я бо то, што Бабічаў і сам нешта за апошнія часы падпрастаўся. Аж яны мабыць і яго цугуюць!

— Але, аж памаладзеў, проста сьвеціцца— во што значыць жаночы начальнік.

— Дык ад таго-ж і прамфіплян нешта стаў падгаджваць. Пераплётчык пераганяе,—абзываецца голас з тары.

— Хто гэта? Галубёў? Э, браце, ты хаця мяне дагані,—махаючы рукою і жмурачыся ад сонца гаворыць Бабічаў.—Пераплётчык пераганяе гэта верна. Але-ж ён пераганяе не таму, што я спушчаюся ўніз, а што стаю на месцы, не ўцякаю. А ўцячы думаю, але вось...

— Верна!

— але вось ты чаму так астаўся?

— І я пераганю! Вось укамплікгую як сьлед—брыгаду і пераганю!

— Во! А то хіцёр—забраў ад мяне самых лепшых работнікаў і цяпер сьмяецца. Ну вот: Зайцава ў цябе, Ладыгіна ў цябе, Лапянкова ў цябе—ды я з гэтакімі работнікамі горы варочаў!

— І Галубёў варочае. Насыпле каля сябе кучу, дый варочае ў апоку.

— Ну вот з „гэтакімі работнікамі" і я гавару сьмела. Цяпер пацягаемся, кажу,—не падаецца Галубёў.

— І я пацягаюся—глядзі як добра: у самую грудзіну сонца пячэ,—падцьвельвае голас з дылі.—Ляжу і пацягаюся, во.

— Дальбо шкода,—памаўчаўшы зноў гаворыць Бабічаў.—Аддаў людзей на чужы прарыў, дык цяпер яму добра і жартаваць,—ён чухае патыліцу і сажмураны твар добрадушна ўсьміхаецца.—Але пачакай: вось натранірую новую сваю каманду, тады—усе сьцеражыся! Жанкі, брат, народ заўзяты.

— А памятаеш ты, як з мяне падцьвельваў?—падыходзіць Пераплётчык. Але, павернуўшыся, ён гаворыць да ўсіх.—Заключылі спаборніцтва. У мяне маладая брыгада. Бяром-бяром, налягаем-налягаем, і—хоць-ты зарэжся: ні тпру, ні но. Я і сам бегаю, памагаю, а ён падыходзіць з Агранатам, растапырвае ногі дый рагоча. У мяне ўжо, кажа, за дзевяноста восім. Вот думаю, назола, чым-жа ён хваліцца, калі ўмова на сто з гакам? Дай лапу, кажу! На-а, кажа, і ўсё сьмяецца. Умова, кажу, на сто з гакам? З гакам. Ну дык, кажу, я ручаюся, што і гак вазьму... Ну, от і ўзяў. Сто дваццаць ёсьць.

— Малы гак, малы.

— Разгон ця важны,—жартуюць мужчыны.

— Ну, гэта-ж не канец—возьмам і болей.

Завод адпачывае перапынкам. Сьціхла гамонка жалеза—ажывілася гамонка людзей. Ад мэханічнага цэху чутны нейкія спрэчкі і рогат. Каля ліцейнага сабралася кучка працытаць на дошцы вывешаныя лічбы выкананьняў. Сіняю кашуляю па дварэ прабег інжынэр Фэльдман... Уночы быў дождж. Двор ад пры-

прыбітага пылу здаецца прыбраным. На водшыбе вымытым зяленівам молада шэпчацца сад. Ад саду, ад зяленіва разносяцца сьвежыя пахі. Сонца падае ў сьвежасьць здаровым прыпёкам, і сытую прагнасьць выдыхае зямля.

— Любата!

— Што ты ўсё з любатою! Ня месьцішся?

— Эх, бы на Сож ды на Мельнікаў луг!

— Во ўдарыла хлопца.

— Забрала.

— Ну і сволачы! — умешваецца раптам новы голас.—Што яны робяць з Кітаем?—Седзячы наводшыб, у руках чалавек трымае газэту.— Катора пара як таўкуцца. Ангельцы, японцы—усялякая ненасытная дрэнь. Глядзі от,—ён аддае газэту другому,—зноў пачалі напіраць на чырвоных.

— Але-е. Там заварыла здорава. Ды хто каго возьме?

— Во-озьме. Па-мойму, каб я быў за Сталіна—яй-бо ня ўцерпеў бы, а ўмяшаўся-б.

— Во прыткі.

— Ня думаючы?

— Ня думаючы!

— А каб падумаў, то і разважаў-бы іначай. І памагаць трэба ўмець. На кожны час і свая тактыка і свая дапамога. Думаеш, абавязкова трэба рынуцца са стрэльбаю?

— Ня ўцерпеў-бы, яй-бо,—на сваё напірае хлопец.

Паўз цэх дваром прайшлі дзяўчата. З саду нехта зацягнуў пра душыстую кветку прэрый чутую ў тэатры з „Роз-Мары". Чалавек з дылі падняўся на локаць і углядзіўшы дзяўчат, крычыць.

— Лапянкова! Ладыгіна!

— Чаго ты?—сунімаюцца тыя.

— Чаго вы там швэндаецеся— у нас тут адны мужчыны!

— А нам што?

— Хадзеце сюды—весялей будзе!

— Абыйдзецеся і бяз нас... Няма часу,—і пакінуўшы росплескі сьмеху пабеглі накас двара, хаваючыся за карпусамі.

— Тота-ж—няма часу. Бач куды пабеглі.

— А ты-ж туды хіба ня бегаеш?

— Вось твая і тактыка. Трэ'было проста са стрэльбаю...

— Ыч, чарцянё. Выradак,—круцячы галавою гаворыць Бабічаў. Ён яшчэ глядзеў ім усьлед і ня слухаў хлапечых жартаў.

— Бабічаў улюбіўся ў Лапянкову, дапраўды.

— Не кажы ты, Пераплётчык. Не магу падараваць, што давялося аддаць яе Галубёву. Гэта-ж быў мой гонар. Ты разумееш, да таго дайшла, што ўвесь апошні час—ніводнага процанту браку. Ну, і работа— самі-ж ведаеце—як агнём. Усё ТНБ перавярнула дагары нагамі. Усе, бывала нават што лічыліся і лепшымі, дык гэта, хаця-б да дваццацёх васьмёх дацягнуць—выцягнуць норму. Ато—дваццаць дзьве-дваццаць чатыры. А яна сорак адну апоку шпурнула... Я ўжо яе і выradкам назваў. Выradак, дальбо.

— І ўсё гэта таму, што ў тваёй брыгадзе. Я-ж кажу, што ты камандзір удалы,—не пакідае жартаў нехта.

— Няхай сабе і няўдалы, але я зразу быў падмеціў, што з яе будзе толк. Памятаеш, як разьмяркоўвалі карткі ўдарнікаў? У яе было тады яшчэ восім процантаў браку. Дай, думаю, я і Кацю пастаўлю. Тады-ж мы спрачаліся. Казалі ня варт, не падыходзіць. Але я знаў, што апраўдае—па рабоце бачыў, што возьме. І от глядзеце—разгадаў. Скрозь не здаецца. З таго часу катора пара, і кожны раз стаіць наперадзе. Ды што мне казаць—самі-ж на канфэрэнцыі ліцейнікаў першую прэмію выдавалі.

— Дый самое не пазнаць,—памаўчаўшы зноў гаворыць Бабічаў.— Бывала, як толькі яшчэ прышла яна ў цэх, дык такая пужлівая, баязьлівая—вечна маўчыць. Нават слова ня выцягнеш. А гэта—глядзі ты—камсамолкаю стала, колькі ўся-

лякае грамадзкае работы варочае... Не, дальбо, я шкадую, што аддаць давялося.

Бабічаў дастае закурыць, але гудок на работу, і ён падымаецца з дыскі. У цэх густа шугнулі рабочыя—цесна прайсьці. Даганяючы ззаду, яшчэ раз чуцён той самы голас крычучы „Любата!" З разгону ўдарыўшыся аб некага, Каця аддаецца на Бабічава і, яшчэ не патушыўшы прынесенае аднекуль усьмешкі, пытаецца.

— Ня выцела?

— Ого, яшчэ і як,—і сплюшчыўшы вочы Бабічаў таксама сьмяецца ўсімі маршчынамі свайго безвалосага жаночага твару.

13. Воля

Часта пачалі шугаць грузныя хмары. Неба набракла, навісла ніжэй. Хмары накочваліся густымі камкамі і, пераганяючы адзін аднаго, камкі блыталіся ў размашыстай гонцы.

Пачыналася восень.

На завод апускалася восень хмурнымі днямі, цягучым ветрам, пазьдзіранымі са сьцен афішамі. Патужэўшы, асела зямля даўно пазмываным, прыплесканым пылам. Сад скупа пачаў раскідаць медзякі сваіх першых шчадротаў. Праз сад, за заводам відна была пустка—глухая, далёкая — густа расьцярушваючы сваю валавяную сінь. У сінь прападалі камкамі шугаючы хмары.

Пачыналася восень.

Наводшыбе, яшчэ недакончанымі сьценамі стаў новы заводзкі корпус. Шырокім краем корпус выдаўся ў гала. Па няроўным доле параскіданы будаўнічыя матар'ялы. Густа валяюцца пабітыя кавалкі цэглы. Падзімае вецер. Толькі што пачэсаныя кроквы пахнуць смалою.

Камаеў стаіць на ўзгорку заклаўшы рукі ў кішэні паліто. Вецер крысамі пабівае па галёнках, адтатурчвае крысы, і ад гэтага здаецца, што Ламаеў стаіць наўкос. У настаўлены каўнер нізка наехала шапка і па тым, што аколыш ззаду падняўся ўгору відаць, што Камаеў глядзіць у зямлю.

—... Але, трэба напяцца. Сьвята—экзамэн, і завод у хвасьце быць не павінен...

Камаеў глядзіць у зямлю. Адале шапка павярнулася і над каўняром падняўся казырок. Відзён стаў мясісты буграваты профіль і, крыху затрымаўшыся на будынку, профіль уставіўся ў гала.

Пустка. Далёкая валавяная сінь папрыбіраных палёў.

Камаеў доўга глядзіць у далячынь і здаецца, што ён любуецца на восень. Але па тым, як вочы асталіся ў сабе, відаць, што і думкі ня хочуць раскідацца далей за завод. Так, надыходзіць гадавіна Кастрычніка. Набліжаецца сьвята, а заводам выканана толькі дзевяноста шэсьць процантаў прамфінпляну. А добра-б выйсьці на сьвята ў першай калёне. Эх, каб нагнаць хаця сто...

Пад нагою замулеўся кавалак цагліны. Падмінаючы яго, нага сашчаўкнулася, і можа ад гэтага, перарвалася думка. Сьцепануўшы плячыма, Камаеў спускаецца з бугарка і, яшчэ, раз суняўшыся на рагу будынка, хваецца на заводзкім дварэ...

Заводу ня хочацца выйсьці на сьвята з недавыкананым плянам. І, галоўнае, наладзілася работа. Зрабілі такі харошы скачок. Менш як за месяц нагналі бадай што сорак процантаў. А гэта—насьцігае Кастрычнік і яшчэ не хапае одэтых невялічкіх чатырох лічбінак.

— Хлопцы! Давай націснам! У першай калёне на дэманстрацыі станам!

І б'ючыся за гонар байцоў будоўлі, зноў наляглі на работу цэхі. Сіла заўзятасьці ніколі ня можа ўлічыцца ніякімі плянамі. Гэта страшная сіла сьвядомае волі. І яна ніколі ня можа старэць, бо набіралася вякамі ў барацьбе за сваю маладосьць.

Хлопцы! Давай не падгадзіць!

Сіла сьвядомае волі ня знае загадаў. Завод рвануўся новым пад'ёмам за гонар будоўлі. Генкіну нават ня хочацца выходзіць з цэхаў. Хочацца быць разам з усімі, каб ведаць што гэтая смага і заўзятасьць і воля—кавалак яго. І добра—якім прыемным адчуваньнем ускідваецца кожная дэталь на вагу прамфінпляну.

Праходзіць Камаеў і Генкіну нават няма калі пагаварыць з ім, бо ён заняты з Дрыцам над апэрацыйным заданьнем. Але, трэба за лік конусных перакінуць на такарныя пятнаццацёх зубоўкі. На карусельны зараз-жа паставіць шківы. Каб забясьпечыць усю партыю машын, што далёка забегліза дзённыя пляны.

Піліповіча Камаеў застае на выпрабавальнай. Трэба самому глядзець за машынамі, бо калі якая няспраўка то самаму скарэй і паправіць.

— Ну? —пытаецца Камаеў, і Піліповіч гэтае „ну" разумее.

— Знаеш? Ня пойдам.

— Куды?

— З работы. Ня пойдам, пакуль ня кончым, — гаворыць Піліповіч, і мацаючы рукою, чутачку адпускае падшыпнік.—Гэта воля нашае брыгады. Мы па сячкарнях—дамо сто.

Камаеў глядзіць у нагнутую Піліповічаву патыліцу і ведае, што Піліповіч сказаў ужо ўсё. Вось так-жа скупа гаворачы, ён некалі ішоў на франтох—у сьмерць. Нешта замулелася падступаючы да горла. На вочы набегла нявялічкая цяплынь. Камаеў павярнуўся каб ісьці. І ўжо ідучы, глыбей насунуў шапку, каб воч не паказаць нікому.

Самым напружаным астаўся апошні дзень. Гэты дзень павінен вырашыць лёс гонару. Ці будуць на сьвята выкананы заводзкія пляны? Ці ня брыдка будзе паказацца на дэманстрацыі стаўшы ў хвасьце калёны — тылавікамі сацыялістычнае будоўлі. Ці можа льга будзе заняць першае месца—стаць пераможцамі?

Самым напружаным астаўся апошні дзень.

І чым болей блізіцца дзень да канца, тым больш ён робіцца гарачым. І ня хоча адстаць ніводзін цэх. І ня хоча падацца ніводная брыгада. Якая страшная сіла заўзятае волі!..

Але вось маторы выпрабавальнае станцыі пачынаюць сьціхаць і гэтым здаецца, што дзень адсякаецца. З цэху нехта бяжыць наўскасяк цераз двор. Праскочыўшы праз праходную будку, ён шумна ўрываецца ў парткалектыў.

— Звані!.. Круглая!..

— То чаго-ж ты крычыш?—Генкін усьміхаецца і па гэтым сьмесе відаць, што ён усё-ж такі рад Купрыянчыкаваму крыку. — Надзень хоць шапку,—жартуе ён,—я-ж усё роўна нічога ня ўкіну, што ты яе перада мною трымаеш.

Находзяць рабочыя і Купрыянчык надзіе шапку, ужо выціраючы з ілба невялікі пот.

— А што, брат, узялі!

— Што называецца адгрохалі!

— Але-ж і хапіла!

— Не званіў яшчэ?

— Цікава—а як-жа другія?

— А от і даведаемся,—і Генкін наодліў дастае трубку.—Алё. Дайце гарком... Гарком? З Сельмаша. Сто процантаў. Але. Круглых сто процантаў... Што? Пятнаццаць?.. Пяць і пятнаццаць?.. Во абармоты...

— Ну?

— Малавата,—памаўчаўшы гаворыць Генкін.

— Што малавата?

— Трэцяе месца. „Ланцуцкі" з „Пралетарам"—пабілі. „Ланцуцкі" узяў сто пятнаццаць.

На трошкі зрабілася цішыня. Думалася, што можа Генкін жартуе—мо хлусіць? Адале цішыня замулялася і нейчы голас абарваў яе, здавалася шопатам.

— Што-ж—будам біцца яшчэ.

І здавалася, кожны ўжо ведаў, што гэтым пачынаецца заўтрашні дзень.

Завод вырас нядаўна. Два гады таму назад людзі ваявалі з паплавам, з пусткамі, з жвірам, з традыцыйнаю павольнасьцю, з наплюйствамі, з нядбайствам, з правам на самабытную беднасьць—узводзячы Гомсельмашаўскія карпусы. Будавалі і разам—пускалі завод. Пятнаццаць чалавек былі пачынальнікамі жыцьця Сельмашу. Завод быў у кутку зборачнага корпуса. Была кучка людзей. Людзі рыхтавалі завод, па заводзе—па цэсе—ходзячы па дачасу пакладзеных дошках. Сырасьцю дыхаў цэх. Вільгацю пахла з-пад дошак зямля. Людзі хадзілі па дошках, па падвалінах—каб нарадзіць Сельмаш: з поплавy, з жвіру, з самабытнае беднасьці. І два гады таму назад тут была зялёная пустка—пляц муравы—бывалешні Новікаў гай—рогам у пустку ўпіраўся абшарніцкі сад. Гомель быў Гомель-Гомелем з слаўнымі губэрскімі традыцыямі, з губэрскім патрыётызмам, з паркам князя Паскевіча-Эрыванскага, з апошнім патомкам гэтага гістарычнага роду—з бабулькаю—якая пражывала ў доктара Брука. Але Гомелю стала цесна ў традыцыях. Трэба было ірваць сераднявечную ідылію цішыні—фабрыкамі. заводамі—індустрыйнаю воляю. І Гомель наступіў на паплавы, на пусткі, на жоўтыя драўляныя з шклянымі ганкамі домікі—цяжкімі карпусамі заводаў.

Калі стаць над Сельмашам—стаць на ліцейным цэсе, дзе на цэмантовай пляцоўцы даху выходзяць дымары вагранак—стане завод, як на карце. Тварам—праз вуліцу—завод упіраецца ў лініі чыгункі, у пляцформы. Сьвісткамі, лязгамі, перабіўчатым звонам паравозы манэўруюць па лініях—падаюць, заганяюць вагоны. Чыгунка жыве жыцьцём дарог. Да ліній—праз двор, праз вуліцу, па драўляным насьціле—коньмі, электракарамі завод падае прадукцыю—машыны на сацыялістычныя палі. Ззаду заводу, у чыгунковыя лініі—у скрыжаваньні чыгунковых ліній—пабегла, пры таілася зялёная пустка, тая, у якую рогам упіраўся абшарніцкі сад. На сад налёг цяпер з пусткі завод. Карпусамі налёг на зеляніну, уеўся ў зеляніну—упёрся ў яе. Сад стуліўся ў куток і зьверху, з ліцейнага, здаецца, што ён спужаўся, сьцішыўся і нават зрабіўся маленькім, сьмешным. Нізка да долу прыпала зеляніна і завод націскае на яе новымі карпусамі, урываючыся складамі будаўнічых матар'ялаў, штабелямі дошак, дыляў, жалезнага абсталяваньня—магутным і няўхільным правам на плошчу. І сад пачынае старэць, пачынае падавацца, радзець прагалінамі і, зьверху здаецца—лысець.

Але ён лысее ад старасьці. Ад старасьці пачынае пужацца. І з боку, там, дзе пустка, шырока ўзораная трактарнымі лемяхамі зарасла ў роўнядзь—тонкімі, раскошнымі шарамі молада зазеляніўся сад новы. Плянам. Так, каб завод у будучыні быў зялёным, каб пустка ператварылася ў заводзкі размашысты сад.

Стаць на ліцейным, глядзець з ліцейнага—будзе завод як на карце. Доўгімі паралельнымі квадратамі стаяць карпусы. Шклом карпусы адсьвечваюць неба. Па дварэ—па доле—злучаючы цэхі. для транспарту, для патоку—драўляны насьціл. Гэта здаецца лініямі. Так на завод глядзець з палёту. І тады Сельмаш здаецца нарысованым квадратамі, лініямі на паперы. Плян.

А на сьцяне ў габінэце дырэктара, на блакітнай паперы, вісіць плян. На блакітнай паперы тонкія белыя контуры — лініі, квадраты. Карпусы заводу ў пляне, у будучыні—у закончанай сыстэме. Цэхі пабудованы так, каб з аднаго ў другі быў паток, быў канвэер, сыстэма—як здаровая чалавечая мысьль.

Але Сельмаш вырас нядаўна.

Калі стаць на ліцейным, дык завод урэзаўся ў пустку. Завод

наступіў на яе карпусамі, жалезам, гарам вагранак, тэхнікаю—людзьмі. За пусткаю—сінь. Далёкая сінь палёў, на якую Сельмаш наступіць—наступае—машынамі, каб зрабіць іх сацыялістычнымі. Гогалеўскі Чычыкаў плакаў-бы. Разбурылася ідылія цішыні з рамантыкаю патрыярхальнасьці. На палёх сінь буры. Над Гомелем сіні распылены дым. У сямнаццатым у дыме радзілася рэвалюцыя. У сямнаццатым у дыме гарматнымі струпамі ныла зямля. А гэта—над Гомелем дым індустрыі. Патрыётычны губэрскі Гомель-Гомель стаў Гомелем з мэталёвым гарам, з мэталёвым звонам, з зубцамі фабрычных карпусоў. У сямнаццатым у дыме радзілася рэвалюцыя. Над Гомелем сіньню трымціць індустрыйная смага. Гомель ня хоча быць у традыцыях. І ў рытме індустрыі ў Гомелі, у Беларусі—у Саюзе — родзіцца зноў рэвалюцыя—родзіцца сацыялізм.

г. Менск.
Верасень-люты
1931-1932 г.

КРЫТЫКА

Б. Каваленка

Платон Галавач

У барацьбе супроць вялікадзяржаўнага шавінізму і контррэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму, супроць розных клясава-варожых плыняў, вырастала беларуская пралетарская літаратура, якая высунула шэраг пісьменьнікаў і значных твораў.

Платон Галавач,—адзін з асноўных беларускіх пралетарскіх пісьменьнікаў. Яго прадукцыя, якая рэалізавана ў зборніках „Дробязі жыцьця", „Хочацца жыць" і „Спалох назагонах". мае значэньне ня толькі з пункту погляду аналізу творчага росту самога Платона Галавача, але і як матар'ял, які адлюстроўвае шляхі разьвіцьця беларускай пралетарскай літаратуры наогул, бо творчасьць Платона Галавача для гэтых шляхоў разьвіцьця характэрна.

Шэраг творчых асаблівасьцяй Платона Галавача характэрны і для іншых беларускіх пралетарскіх пісьменьнікаў, для тэй часткі пралетарскай літаратуры, якая па свайму паходжаньню зьвязана з рэвалюцыйным сялянствам.

Калі чытаем творы Галавача, мы наяўна гэтую сувязь адчуваем ня толькі па лініі тэматыкі, але і па лініі сьветапогляду, а таксама і творчых асаблівасьцяй.

П. Галавач шмат увагі аддае пасьлярэвалюцыйнай вёсцы (інады дарэвалюцыйнай), паказваючы працэсы рэвалюцыйнай барацьбы і клясавай дыфэрэнцыяцыі сялянства. У працэсе творчага росту П. Галавач пераходзіць да гарадзкой тэматыкі (часта ідучы ўсьлед за сваімі гэроямі якія прыяджаюць на вучобу ў горад) і, у сувязі з гэтым, у сваіх новых творах імкнецца паказаць ролю рабочае клясы ў справе сацыялістычнае перабудовы вёскі. П. Галавач аднак ня цалкам асэнсоўвае ўсю складанасьць клясавых супярэчнасьцяй і ўзаемаадносін. У першым (ды і ня толькі ў першым) яго зборніку можна знайсьці творы, дзе моманты клясавасьці падкрэсьлены далёка не дастаткова, дзе клясавая барацьба адсоўваецца на другое месца вузка бытавымі ўзаемаадносінамі і іншы раз проста паказваюцца фальшыва.

Можна спаслацца на апавяданьне „Кнак", дзе абмалёўваецца сялянская „цемра" (сварка з-за пасагу) мэтодам эмпірычнага адлюстраваньня з налётам дробнабуржуазнай народніцкай абыякавасьці падыходу спрэс да сялянства.

„Культурная спадчына" дробнабуржуазнай народніцкай літаратуры ўплывоўвае на ранейшыя творы П. Галавача, таксама як і на творчасьць некаторых іншых беларускіх (і ня толькі беларускіх) пісьменьнікаў сялянскага паходжаньня.

Гэты ўплыў выяўляецца ня толькі ў цяжэньні да бытавізму, але і ў перанясеньні крыху папраўленых

схэм народніцкай літаратуры ва ўмовы рэвалюцыйнай рачаіснасьці. Папулярны ў старой літаратуры матыў юрлівага пана, які спакушае вясковых дзяўчат („наймічак"), бярэцца П. Галавачом у аснору апавяданьня „Загубленае жыцьцё", поруч з падменай клясава-акрэсленай ідэалёгічнай трактоўкі тэмы і тыпаў дробнабуржуазным гуманізмам і сэнтымэнтальным маралізатарствам. Панскі сын паказаны не ў яго клясава-варожай функцыі і не з клясавымі рысамі, характарнымі для яго, а як „агульна-чалавечы тып" „здрадлівага каханка" і „спакусіцеля", які да таго-ж, пяшчотна кажучы аб каханьні, прымітыўна выкрывае сябе перад чытачом выказваньнямі ў бок („што, калі-б падслухаў хто з боку, ні за што-б не здагадаўся, што хлушу я").

Такім-жа мэтадам паказваецца наіўная, даверлівая дзяўчына, „яе маладая душа" не адчувала бяды, якая хавалася за прыемнай усьмешкай на твары Лявона, хоць „аднекуль прабавала падкрасьціся думка цёмная, якая шаптала сэрцу; не давярайся яму, дзетка... абманіць, пагубіць".

Налёт ідэалізацыі і абменаванасьці сьветапогляду выяўляецца таксама ў характарным схэматызьме, калі аўтар паказвае рэвалюцыйны бок рачаіснасьці і тыпаў, якія павінны супроцьстаяць „несправядлівасьці" клясавага ворага. Так паказана жонарганізатарша, якая „сядзела над разгорнутай кніжкай, думала аб жаночай долі".

Уплыў народніцтва сказваецца і на элемэнтах спэцыфічнай „просветительской" мовы з яе абстрактна-ідэалістычнай тэрміналёгіяй і вобразнасьцю.

„Больш сьвету трэба ў гэтыя цёмныя вёскі, перарабіць іх трэба па-новаму, унесьці сьвядомасьць, новае лепшае жыцьцё, новыя, нашы камуністычныя погляды на жыцьцё трэба ўнесьці ў маленькія шэрыя хаты".

Неадымнай часткай народніцкіх ўплываў, якія напластаваліся на раньняй творчасьці Галавача, зьяўляецца таксама ідэалізацыя прыроды, якая дапамагае аўтару выявіць свае сантымэнтальныя адносіны да рачаіснасьці і якая спачувае „станоўчым" пэрсонажам і асуджае на ўчынкі „адмоўных".

„Не! не! Я маладая, здаровая вынесу сваю ношку".

„А бярэзіны старыя шумелі, здавалася, сьмяючыся: „Не, ня вынесеш! ня вынесеш! і як бы круцілі сваімі старымі кудластымі галовамі, шкадуючы, што ня вынясе Ніна ношкі жыцьцёвай сваёй".

Лёгка ўпэўніцца ў тым, што ўсе гэтыя асаблівасьці раньняй творчасьці Галавача сьведчаць аб недастатковай выпрацаванасьц сьветапогляду аўтара, як пралетарскага пісьменьніка і абзначных дробнабуржуазных уплывах на яго творчасьць, а гэты факт быў сур"ёзным тормазам у справе творчага разьвіцьця П. Галавача і выпрацоўкі паглыбленага паказу клясавых працэсаў рачаіснасьць. Памылкова-б было судзіць аб раньнім пэрыодзе творчасьці Галавача толькі па найбольш слабым творам, хоць слабыя бакі раньняга пэрыоду давалі сябе адчуць і ў пазьнейшай прадукцыі. Асноўнае якаснае адрозьніваньне П. Галавача, як і іншых пралетарскіх пісьменьнікаў, якія маюць агульныя з ім творчыя асаблівасьці, гэта імкненьне, пры ўсіх паасобных памылках, паказаць клясавы пераплёт на вёсцы з пралетарскага пункту погляду і выявіць рэвалюцыйны бок рачаіснасьці.

Клясавую дыфэрэнцыяцыю сялянства і спробы кулацкай верхавіны самкнуцца з гарадзкой буржуазіяй („выйсьці ў людзі") паказвае П. Галавач у апавяданьні „Сусэдзі" даводзячы біяграфію асноўнага пэрсанажу—кулака да савецкіх часоў. Кулак Халімон варожа настроены ў адносінах да савецкай улады, хоць і крыху палахлівы.

Спадзяючыя ная лепшыя часы, ён зьвязваецца з бандытамі і прымае ўдзел у забойстве вясковага камсамольца.

Яшчэ шырэй паказвае П. Галавач клясавую барацьбу на вёсцы ў апавяданьні „Рубанаўскі вузел".

Гэты „вузел" зьмяшчаецца ў барацьбе супроць кулацкіх тэндэнцый выкарыстаць зямляўпарадкаваньне для арганізацыі атрубной гаспадаркі

Кулакі і падкулачнікі, спэцыялісты-шкоднікі старой закалкі і бюракраты, з аднаго боку, рэвалюцыйнае сялянства і пралетарская інтэлігенцыя пры падтрыманьні раённага цэнтру, з другога боку, вядуць жорсткую барацьбу, у якой кулакі выкарыстоўваюць подкупы, розныя інтрыгі і правакацыі, адчынены тэрор, але ўсё-ж церпяць паражэньне.

Усё-ж такі ў гэтых творах, параўнальна больш кваліфікаваных з пункту погляду паўнаты паказу клясавай барацьбы, мы маем істотныя прамахі, якія ідуць па тэй-жа лініі зьніжэньня ідэалёгічнай выразнасьці ў трактоўцы матэрыялу.

У апавяданьні „Рубанаўскі вузел" П. Галавач да ліку „станоўчых пэрсанажаў" адносіць досыць тыповую прадстаўніцу народніцкай інтэлігенцыі, родзічку папа, якая, настаўнічаючы ў савецкай школе, не парывае з ім бытавой сувязі. Да папа-ж, арганізатара кулацкага супраціўленьня зямлябудаўніцтву, заходзіць савецкі каморнік Шклярскі, які прадстаўляе пралетарскую клясавую лінію.

П. Галавач ў сваіх параўнальна лепшых творах ня можа перамагчы ідэалізацыі і схэматызму ў паказе „станоўчых пэрсанажаў". Гэраіню апавяданьня „Дасужая" „новага чалавека беларускай рэвалюцыйнай вёскі (камсамолка, перадавая бядняцка, якая імкнецца вучыцца, каб з большым посьпехам працаваць над сацыялістычнай перабудовай вёскі) аўтар надзяляе спэцыфічнымі рысамі, характэрнымі для народніцкай інтэлігенцыі ў адлюстраваньні народніцкай-жа літаратуры (абстрактна-ідэалістычныя, дробнабуржуазныя гуманістычныя імкненьні спачуваньне беднаму народу-рамантычная лятуценнасьць і г. д.).

„У гэты момант у Надзі было адно жаданьне, адно імкненьне—пайсьці ў новыя далі, уперад, аб чым калісьці марыла. Вусны ў такт сэрцу шапталі—такія зразумелыя цяпер словы: „Гэй, уперад, покі сэрца б'ецца, рвецца на прастору. Гэй, да сонца, гэй, да зор". І перад вачыма ярка ўсплывалі абшары недалёкага будучага, асьветленыя сонцам навукі цудоўныя далёкія зоркі"

У такім дусе ідэалістычнай абстракцыі вытрыманы і выказваньні Ганкі, прыяцелькі Надзеі па тэхнікуму аб „старым" і „новым".

Гэтыя-ж асаблівасьці характэрны і для гэраіні апавяданьня „Абмылілася", апавяданьня аб інтэлігентцы, якая перабудоўваецца, якая імкнецца „ўліцца ў рэчку новага жыцьця", але канчае тым, што няўдачна зыходзіцца з ужо вядомым „спакусіцелем" апавяданьня „Загубленае жыцьцё", на гэты раз выступаючым у ролі ілжэ-камуніста, які пралез у партыю, былога афіцэра, сына папа.

У раньніх апавяданьнях, прысьвячаных гораду, П. Галавач імкнецца пашырыць кола сваей тэматыкі, але таксама ідзе пераважна па лініі эмпірычнага адлюстраваньня быту (каханьне з клясава-варожымі людзьмі, як аснова апавяданьня „Абмылілася", і выпадкі буржуазнага пераражэньня на глебе каханьня—„Даляры").

Рабочыя, якія спатыкаюцца ў некаторых апавяданьнях П. Галавача на гарадзкія тэмы, паказаны схэматычна і не індывідуалізавана, за выключэньнем некаторых пэрсанажаў (Соня з „Даляроў"), якія аднак ні чым характэрным для рабочага не адрозьніваюцца.

Мы маем у творчасьці П. Галавача гэтага, больш позьняга пэры-

оду і непераможаны цалкам уплыў дробнабуржуазнага аб'ектывізму, паглыбленьне ў індывідуалістычную псыхалёгію, без дастатковага выяўленьня клясавай якасьці пэрсанажаў.

Такі нэпманскі сынок Саламон і ўся яго сям'я „обвалакивающие" работніцу Соню ўвагай і любоўю і паказаныя ў „агульначалавечым" пляне („Даляры"), такі дэзэртыр з апавяданьня „Уцякач". Гэты дэзэртыр нічым дрэнным не адрозьніваецца ад сваіх таварышоў-чырвонаармейцаў і калі ўцякае з фронту, то толькі пад уплывам „жахаў вайны", якіх ня можа вытрымаць яго „тонка арганізаваная" псыхіка. Мы бачым у ім проста чалавека, які пратэстуе супроць бессэнсоўнага зьніштажэньня сваёй асобы, які стыхійна любіць жыцьцё і ўсё жывое (гладзіць рукой травінкі і краска).

Займаючыся тонкасьцямі перажываньняў дэзэртыра аж да моманту яго расстрэлу, аўтар не выкрывае клясава-варожай існасьці дэзэртырства, і таму сам расстрэл па існасьці зьяўляецца проста жорткасьцю, хоць і апраўданай абставінамі.

Уплыў дробнабуржуазнага „аб'ектывізму" асабліва моцна сказаўся на аповсьці П. Галавача „Вінаваты". Асноўная ідэя аповесьці—ці павінен сын пакутваць „за грахі бацькоў", аб якіх (грахах) ён, нават, ня ведаў. Аўтар дае „трагэдыю" партыйца, сацыяльна-чужога паходжаньня, які чэсна хоча працаваць у партыі, але яго вылючаюць за сацыяльнае паходжаньне: бацька яго (як выявілася) да рэвалюцыі, служыў у ахранцы, чаго партыя ня ведала.

„Праблема" не асабліва характэрная, а галоўнае, не асабліва значная для інтарэсаў клясавай барацьбы пралетарыяту.

Аўтар прысьвячае гэтай „праблеме" аповесьць, пры чым даводзіць „абектывізм" трактоўкі пэрсанажаў да асабліва буйных ідэалёгічных правалаў, напрыклад, у паказе бацькі-ахраньніка, па ходу аповесьці прадстаўленага ня дрэнным чалавекам, які толькі дзякуючы сваёй нявопытнасьці „паступіў на службу" ў ахранку.

Аповесьць „Вінаваты" паказвае, куды можа завесьці нават пралетарскага пісьменьніка захапленьне дробнабуржуазным „абектывізмам" ня сумяшчальным з рэвалюцыйнай ідэалёгіяй пралетарыяту.

Апошняя аповесьць П. Галавача „Спалох на загонах" ня толькі сьведчыць аб значным, хоць і далёка не канчатковым, перамаганьні аўтарам шмат якіх раньніх памылак і чужых уплываў, але і аб прыкметным творчым росьце параўнальна з творамі папярэдняга пэрыоду. У гэтай аповесьці П. Галавач бярэ за аснову не наносную ад дробнабуржуазнай літаратуры „праблему," а адзін з вузлавых момантаў клясавай барацьбы на сучасным этапе—працэс калектывізацыі вёскі, ярка паказваючы ня толькі сацыялістычную пераробку эканомікі вёскі, але і ломку старой дробнаўласьніцкай псыхолёгіі, быту і элемэнты новай псыхолёгіі.

Павялічэньне ў параўнаньні з папярэднімі творамі рознастайнасьці тыпаў (беднякі, кулацтва, рабочыя, партыйцы), больш паглыблены паказ гэтага тыпажу ў шчыльнай сувязі з клясавай практыкай, тыпізацыя і абагуленьне матэрыялу па павышанай ідэёвай аснове; усё гэта разам узятае зьмяншае яшчэ захаваўшыяся недахопы раньняга пэрыоду, хоць і не пазбаўляе аповесьць непераможаных да канца элемэнтаў схэматызму, ідэалізму, эмпірызму.

Асабліва важна (калі казаць аб ідэёвым баку аповесьці) тая абставіна, што П. Галавач разглядае барацьбу за калектывізацыю не як ізаляваны кавалак быту, а як частку агульнай палітыкі сацыялістычнага наступу, імкнучыся ўвязаць барацьбу за калектывізацыю з агульнымі задачамі сацыялістычнага на-

ступу і імкнучыся падкрэсьліць вядучую ролю гораду і партыйнага кіраўніцтва ў гэтай барацьбе. Лініі сувязі гораду і вёскі ў аповесьці досыць разнастайны. Кулакі хаваюць хлеб і выкарыстоўваюць хлебныя запасы як адзін з сродкаў эксплёатацыі беднаты, гарадзкая буржуазія і мяшчанства ў горадзе спэкулююць на часовых цяжкасьцях, раздуваюць паніку і павялічваюць „хвасты" за хлебам, правыя апартуністы выкрываюць сябе, як агентуру кулака на вёсцы (адмаўляюцца ехаць на вёску выпраўляць чужыя „перагібы", адрабляюцца на вёсцы, агульнай агітацыяй, ухіляючыся ад канкрэтнай барацьбы і арганізацыі бядняцка--серадняцкіх мас).Гэтыя-ж апартуністы па бытавой і палітычнай лініі („апазыцыйнае незадавальненьне") змыкаюцца з прадстаўнікамі гарадзкой буржуазіі і мяшчанства (прылучаецца да гэтага і момант вялікадзяржаўніцтва).

З другога боку, мацнее і рабочасялянскі фронт у асобе, праўда ўсе яшчэ ідэалізаваных і схэматычных, партыйных работнікаў на вёсцы, якія праводзяць лінію партыі (Панас), у асобе канкрэтнага кіраўніцтва цэнтральных арганізацый (вобраз старога), у асобе рабочых падмацаваньняў, якія робяць вытворчую дапамогу калгасьнікам (Чурыла).

П. Галавач не баіцца паказваць цяжкасьці клясавай барацьбы, упартае супраціўленьне кулацтва, дэмагагічную агітацыю, характэрныя правакацыйныя пытаньні і рэплікі на сходах, тэрарыстычныя выступленіі, хістаньні серадняцкіх і бядняцкіх мас (хаваюць частку маёмасьці, разьбіраюць пад уплывам кулацкай агітацыі абгуленых кароў і г. д.).

Паказвае аўтар і ўпартую барацьбу з цяжкасьцямі, арганізацыю бядняцкіх і серадняцкіх мас для барацьбы супроць кулацтва. Досыць ярка дадзены бядняк Клемс, актывісты —калгасьнік, які перамагае „апазыцыю" жонкі і яе бытавы кансэрватызм—апошняе аднак, не без схэматызму (паляць іконы).

І ўсё-ж пры ўсіх станоўчых бакох аповесьці—шмат яшчэ не даапрацавана, у тым ліку і па лініі ідэвай.

Недастаткова паказаны працэс барацьбы на два фронты. Адсутнічае ў аповесьці паказ „лявацкіх" загібаў у правядзеньні калектывізацыі, недастаткова ўпэўніваюча (надта агульна) агітацыя за калектывізацыю ў адрозьніваньне ад досыць „закавырыстых" і „дзелавых" „аргумантаў" падкулачнікаў і ярчэй выяўленых сур'ёзных сумненьняў радавога сялянства. Ня толькі апартуністы Асьцюк, але і яўна ідэалізаваны (па старой памяці) прадстаўнік партыйнай лініі Панас, галоўным чынам апэлююць, ды і то ў надзвычай агульнай форме, да рэвалюцыйнай сьвядомасьці сялянства і мала г а в а р а ц ь аб канкрэтнай карысьці, якую бядняцка-серадняцкае сялянства атрымае ў выніку калектывізацыі.

Гэту карысьць аўтар часткова дэманструе ў працэсе разьвіцьця дзеі аповесьці, а галоўным чынам спасылаецца на прыклад камуны, якую паказвае з дозай лякіроўкі і не без адценьня спажывецкага падыходу (падкрэсьліваецца, што камунары жывуць сытна і ў выгодзе, але не паказваецца, якую карысьць яны даюць дзяржаве, не паказваюцца цяжкасьці ў рабоце камуны).

Вельмі безнадзейна малюе аўтар „адзінаасобную" вёску. У прымітыўна-алегарычнай форме паказвае ён „сялянскую долю" да рэволюцыі, сымбалізуючы дарэволюцыйнае бядняцкае сялянства ў народніцкім вобразе дзеда-ратая, які сваёй песьняй расчуліў да сьлёз маладога, тады яшчэ, Панаса, у далейшым арганізатара калгасу.

Зьніжае ідэёвы ўзровень аповесьці сымбалічны ўступ на тэму „было", дзе тая-ж „доля" паказваецца на фоне імпэрыялістычнай

вайны і абстрактна ідэалістычна пададзенай рэвалюцыі.

„Яна прышла, неабдым на вялікая сваімі мэтамі і недасяжна высокая ў сваіх імкненьнях, бо ніколі і нідзе яшчэ чалавецтва не дасягала, такіх в ы ш ы н ы. Прышла, поўнае любові і нянавісьці, кары і літасьці, поўная нязьмернай сілы разбураць і будаваць і многае парушала з таго, што складалася вякамі“ і г.д.

Адчуваюцца яшчэ ў аповесьці рэцыдывы бытавізму (паказ масавых сцэн, натуралізм дыялёгу). Як даніну бытавізму трэба разглядаць вбавязковае і досыць наіўнае спалучэньне асноўнага сацыяльнага сюжэту (барацьба за калектывізацыю) з „ідэйным“ каханьнем (Панас і Галіна).

Аповесьць ад недахопаў далека ня вольна. Наогул кажучы матарыял аповесьці можна было-б разгарнуць шырэй і паказаць п а ў н е й, аднак і ў першай рэдакцыі[1]) апошні твор П. Галавача сьведчыць аб творчым росьце аўтара і разам з тым падкрэсьлівае неабходнасьць далейшай барацьбы за аўладаньне марксысцка-ленінскім сьветапоглядам і мэтадам дыялектычнага матэрыялізму.

---

[1]) Зараз П. Галавач друкуе сваю аповесьць „Спалох на загонах“ другім выданьнем. Новае выданьне значна дапрацавана і дапоўнена. *Р э д а к ц ы я .*

Ал. Кучар

Пра п'есу Андрэя Александровіча „Напор"

I

П'еса „Напор"—зьяўляецца выражэньнем якасна новага, вышэйшага этапу, як у творчым росьце поэты Андрэя Александровіча, так і ў разьвіцьці ўсяе беларускае пралетарскае літаратуры.

Асноўнае, што ўзьнімае гэты твор на новую якасна вышэйшую ступень, у параўнаньні з ранейшымі творамі пісьменьніка, гэта тое, што рэчаіснасьць, працэсы нашага сацыялістычнага будаўніцтва ў п'есе асмысьліваюцца значна глыбей, ніж у мінулай творчасьці пісьменьніка.

Калі ў „Поэме імя вызваленьня"—пісьменьнік адлюстроўвае рэчаіснасьць ў контрасных вобразах, вобразах, якія фіксуюць у статыцы рост соцыялістычнага будаўніцтва ў БССР, але якія не адлюстроўваюць рухаючых сіл і супярэчнасьцяй росту, апускаюцца прамежныя і пераходныя ступені ў росьце, калі ў „Поэме імя вызваленьня" з рухаючых сіл нашага будаўніцтва былі выключаны людзі—рабочая кляса ў яе росьце і разьвіцьці, і гэтае замянялася ў значнай меры „тэхніцызаванай" фразай, якая, бяручы зьявы ў статыцы, выхалашчвала сутнасьць процэсу,—дык у п'есе „Напор"—Андрэя Александровіча мы бачым на правільным шляху да станаўленьня мэтаду дыялектычнага матэрыялізму.

Але Александровіч зрабіў толькі першыя крокі на гэтым вялізарным і цяжкім шляху. Вось чаму і п'есу мы павінны расцэньваць, як твор, які робіць першыя крокі, крокі, не пазбаўленыя і значных памылак на шляху да аўладаньня творчым мэтадам марксызму-ленінізму.

У п'есе „Напор" Александровіч правільна зразумеў асноўнае, што:

„Жизнь есть существующее в самых вещах и явлениях беспрестанно пологающее и разрешающее себя противоречие; и когда это противоречие прекращается, прекращается и жизнь, наступает смерть" (Ф. Энгельс).

Да гэтых асноўных супярэчнасьцяй, вядучых тэндэнцый гэтых супярэчнасьцяй да шляхоў разрашэньня супярэчнасьцяй, пісьменьнік у асноўным падыйшоў правільна ў сваёй новай п'есе.

П'еса Александровіча „Напор" прасякнута адзіным ідэёвым цэнтрам—змаганьнем дрэваапрацоўчага беларускага заводу за тысячу стандартных дамоў для рабочых Донбасу. Ідэя моцнай братэрскай сувязі паміж асобнымі нацыянальнымі рэспублікамі Савецкага саюзу—зьяўляецца асноўнай у п'есе, і яна (гэтая ідэя) б'е на нацыяналістычнай самабытніцкай абмежаванасьці.

Рэспубліцы патрэбен вугаль.
І пад зямлёй, ад зор да зор,
За зьменай зьмена, ударным кругам
Шахцёра зьменьвае шахцёр.
Пасьля напружнай цяжкай працы—
кватэра ўдарніка—барак.
. . . . . .

Завод наш мусіць даць Данбасу
Стандартных тысячу дамоў.

Галасы: (як водгульле).

Стандартных... тысячу... дамоў...

Рабочы калектыў заводу, камсамольцы,—ініцыятары сацспаборніцтва і ўдарніцтва, рушылі біцца за рэальную і зусім канкрэтную задачу: за тысячу стандартных дамоў для рабочых Донбасу.

У бой—
грамадой,
штурмавой
бальшавіцкай,

Дадатныя якасьці п'есы Андрэя Александровіча выразна паўстаюць, калі мы аналізуем мэтад паказу рабочага колектыву, таго людзкога матэрыялу, які, зьмяняючы сьвет, зьмяняе, перарабляе і сябе. Ад ігнараваньня людзкога калектыву ў некаторых ранейшых сваіх творах, ад шэрасьці і аднавобразнасьці пры паказе людзей на асобных этапах сваёй ранейшае творчасьці Андрэй Александровіч у п'есе „Напор", у асноўным пасьпяхова перамагаючы элемэнты мэханістычныя у сваёй творчасьці першых этапаў, становіцца тут на шлях шматграннага, больш поўнага і больш шматвобразнага пазнаньня будаўнікоў соцыялізму. Правільнае разуменьне ўзаемаадносін паміж асабовым і калектыўным, паміж асабовым і клясавым робіць калектыў рабочых у п'есе Александровіча жывым, дзейным.

Пры паказе рабочага камсамольскага калектыву ў Александровіча ліквідавана абязьлічанасьць героя. Для яго не як для тых, хто схэматычна спрошчвае працэсы сацбудаўніцтва, ня можа паўстаць пытаньне, хто герой сацбудаўніцтва?

Гэты герой не абязьлічаны. Гэты герой пяцігодкі паказаны ў ягоным росьце, разьвіцьці на многіх канкрэтных мастацкіх вобразах. Рост новага рабочага, які аддае ўсе свае здольнасьці і сілы свайму заводу, сваёй клясе, фармаваньне і рост новых кадраў рабочых з сялянскае, уласьніцкае масы—ва ўмовах найвастрэйшага клясавага змаганьня ў краіне і адлюстраваньне яго на самым заводзе.

Рост новага рабочага пачынаецца там, дзе пачынаецца выразная клясавая дыфэрэнцыяцыя сярод масы сэзоньнікаў, якая спачатку ідзе на павадку ў кулакоў—бракера Зарэмбы, Клыча і Кандраля. Рост, пачатковыя ступені росту адчуваюцца ўжо там, дзе сэзоньнікі споеныя і зманеныя кулацтвам, хочуць пакінуць завод ідзе праз завучаныя і трафарэтна паўтараемыя словы:

—Мы ня буйвалы.
—Ня коні.
—Норма, дзе?
—Мы не валы.

у тае частцы сезоньнікаў, якая прышла на завод ад працоўнага сялянства, чуецца ўжо гул няўпэўненасьці, гул, які вобразна выражае ўнутранае змаганьне дзьвюх душ селяніна: уласьніка і працоўнага. Ужо тут мы маем пачатковую ступень формаваньня новага рабочага, гэта сапраўды працоўны селянін, для якога пачынае станавіцца родным завод. Рост у значна больш выразных формах выяўляецца там, дзе сэзоньнікі пераконваюцца, што кулакі іх абманьвалі, абкрадалі. Тут гэты няпэўны гул перарастае ў яшчэ нясьмелае, няўпэўненае абурэньне супроць кулакоў.

Вось што гаворыць сэзоньнік Міколка:

— Эх, заблытаўся зусім...

А другі сэзоньнік са злосьцю на сваю мінулую сьлепату, са злосьцю, перамешанай з затуманенымі алкаголем мазгамі, кажа:

— Вот... і выпіў—бы сітры...

Вобраз сёзоньніка Міколкі ёсьць першапачатковая ступень, этап у росьце рабочага-ўдарніка. Яго сундучок, з якім ён нават прыходзіць на вечар у клюб, як сымбаль свайго,

уласьніцкага — перамагаецца, калі ён на вечары ў рабочым клюбе, дзе:

„(пачынаецца гульня, шумна, весела. Праз карагод з сваім сундучком прабіраецца Міколка)

І кажа:

Міколка:

Дазвольце заявіць,
Дазвольце сказаць...
(усе спыня юцца. Зьдзіўлена абкружаюць яго).
— Нас... падбухторваў бракерь

Гэтая яго заява была вынікам перамаганьня свайго ўласьніцкага нутра. Вынікам, першай праявай адданасьці заводу.

Так пачынаецца ў паказе Андрэя Александровіча працэс фармаваньня рабочага-ўдарніка.

Гэты рост рабочага ўдарніка ідзе і праз усе асноўныя вобразы п'есы. Работніца Васіліса, культпроп камсамольскага калектыву Базыль Агнёў, камсамолец-вынаходца Чыж—усе яны рабочыя-ўдарнікі, якія стаяць на якасна вышэйшай ступені разьвіцьця, аднак яны, у паказе Александровіча не пазбаўлены перажыткаў старога, якое яны перамагаюць.

Васіліса—будучы добрай работніцай на заводзе—выходзіць замуж за тэхніка Радзецкага і праз гэта пакідае ў часы самае напружнае працы завод. Зразумела, тут сказаўся ўплыў мяшчанскага асяродзьдзя. У паказе Андрэя Александровіча мастацкае разьвіцьцё і рост Васілісы ідуць, менавіта, па лініі перамаганьня гэтых мяшчанскіх уплываў.

Асабліва цікавымі вобразамі, якія выражаюць рэальны працэс росту героя пяцігодкі, героя ўдарніка, зьяўляюцца вобразы вынаходцы Чыжа, сакратара камсамольскага калектыву Стрэльбіна, пэнсіонэркі—героя працы—старой Мір'емы і сакратара партыйнага калектыву Кліма. Кожны з іх мае свае асаблівыя ўласьцівасьці, выразы, рысы, выгляд, якія адрозьніваюць яго ад другіх, але ўсе яны з'яднаны адзінай клясавай ідэяй—вывесьці завод з прарыву, перамагчы. І ўсе яны разам выражаюць розныя ступені рэальнага працэсу—росту рабочага ўдарніка да героя пяцігодкі.

Камсамолец Чыж—фантазёр, марыць пра тое, каб зрабіць знарад—ракету, які-б лётаў:

Цераз горы, цераз мора
У любы на сьвеце горад,
Цераз муры й цераз люкі;
Проста кожнаму ў рукі,
Ці ў Бэрлін, ці ў Будапэшту
Перадам адсюль дэпэшу.
І па сувязі таму
Міравы рэкорд вазьму.

Гэта, зразумела, наіўныя мары, але Чыж сваімі іншымі вынаходкамі даў шмат карыснага заводу, як сьведчыць Клім, сакратар партколектыву і свае „утапічныя" наконт ракеты мары хацеў паставіць на службу сацыялістычнага будаўніцтва. Важна тое, што Чыж шчыра адданы справе будаўніцтва сацыялізму, што ён уваходзіць у калектыў будаўнікоў сацыялізму, як зьвязаны з гэтым калектывам адзінай клясавай ідэяй, але клясавай ідэяй, праломленай выражанай праз індывідуальнае пачуцьцёвае, асабовае. Важна тое, што ён уваходзіць у калектыў тварцоў і будаўнікоў сацыялізму не як чалавек, які толькі падпарадкуецца „шэрай неабходнасьці", а які зьяўляецца вольным тварцом новага сацыялістычнага і свабода якога заснована на „панимании естественной необходимости" і якая дазваляе яму „принимать решения сознанием дела" (Ф. Энгельс).

Мішка Пачын, рэдактар шматтыражкі, выхоўваўся ў баёх на Дальнім сходнім фронце, ён працуе ў складаных абставінах змаганьня з кулацкімі элемэнтамі сярод сэзоньнікаў. Стрэльбін сакратар камсамольскай ячэйкі, камсамолец цалкам адданы справе сацыялістычнага будаўніцтва.

Калі на заводзе камсамольцы прынялі пастанову ўзяць на буксір

сэзоньнікаў і працуюць з запалам і энэргіяй,—дык першым арганізатарам іх—арганізатарам гэтага калектыву камсамольцаў (дарэчы таксама не абязьлічанага), зьяўляецца Стрэльбін. Ягоная шматслоўнасьць вельмі часта пераходзіць меры пастрашаньня—у просьбу.

Стрэльбін:

На бюро. Вымова ўсім...
Хлопцы, братцы, што вы,—
Прынялі-ж мы пастанову,
Што бярэм іх на буксір,
Дык выконваць...

І сярод камсамольцаў узьнімаецца гул энтузыязму:

... —За работу.
— Дружна.
— Гуртам.
— Штурмам.
— Ротай.

Стрэльбін перамагае бюракратычны фармалізм „прафсаюзнай Акуліны", якая ня хоча дапусьціць работу звыштэрмінова.

У пададзеным ніжэй малюнку яскрава відаць, як камсамольскі энтузыязм перарастае „прафсаюзную Акуліну", якая настойвае, каб роўна а пятай гадзіне была спынена работа.

Базыль:

Дала нам партыя заданьне,
Дык выконваць.

Сенька:

З перавыкананьнем.

Мішка:

Шчэ ня больш аднэй хвіліны—
Заракоча і машына.

Галька (просіць дапамагчы):

Акуліна, падтрымай.

Акуліна Карп. (разьвёўшы рукі, ідзе дапамагчы)

Пяць гадзін...

Галасы:

Давай, давай.

Базыль:

Трэ' па-ленінску—на славу.
Да канца давесьці справу.

Стрэльбін (за ім астатнія):

Гэй-жа, разам,
Гэй-жа, разам, і г. д.

„(Пасьля слоў возьмем разам Чыж уключае рубільнік—пайшоў працаваць кран-канвэер. Канцоўка—праца машыны, праца — уручную. Штурм)".

Глыбока мастацкім, праўдзівым і ідэёва насычаным зьяўляецца ў п'есе Александровіча вобраз Мір'емы—старой работніцы. Яна ўся, да апошняе крывінкі адданая справе будаўніцтва сацыялізму. Аднак традыцыі і путы старога сьвету часткова трымаюць яе ў сваіх руках, яна яшчэ ня можа прымірыцца на нашых заводах з мэтадам штурмаў. Вось чаму яна, пэнсыянэрка, якая для ліквідацыі прарываў прышла на завод працаваць, —прапануе:

Мае сынкі,
Каб заказ аддаць у час—
Трэба ўсім, адным заходам
Стаць за працу, за станкі.
Ня дай божа гураганам,
Ён зьнічтожа ўсё—на звод.
І на што, сынок каханы,
Зваць няшчасьце на завод.
Лепш па-мойму, па-старому
Працаваць, як сьвеціць сьвет...

Два вобразы ў Александровіча, якія зьяўляюцца спробай для стварэньня сапраўднага вобразу бальшавіка ў пралетарскай літаратуры — гэта сакратар парткалектыву Клім і дырэктар заводу Кірыла Антонавіч з п'есы „Напор".

Праблема стварэньня вобразу бальшавіка, раскрыць гэты вобраз ва ўсёй яго складанасьці даўно паўстала перад пралетарскай літаратурай і стаіць цяпер як адна з асноўных задач змаганьня за партыйнасьць у літаратуры. Нельга, зразумела, вобраз Кліма з п'есы „Напор" Александровіча лічыць закончаным і поўным мастацкім раскрыцьцём вобраза большавіка ў пралетарскай літаратуры. Аднак, асноўныя контуры гэтага раскрыцьця мы тут у Александровіча, бязумоўна, маем. Як паказ рабочага калектыву ў Александровіча не ізалюецца ад ўсёй складанасьці клясавага змаганьня ў краіне, як адлюстраваньне яго на заводзе так і раскрыць-

цё вобразу Кліма—узята ва ўсёй складанасьці клясавага змаганьня, ва ўсім складаным пераплёце гэтага змаганьня.

Клім пераконвае масу сэзоньнікаў не пакідаць завод, і яны завод не пакідаюць. Прычым ён бярэ асноўнае, раскрывае, агольвае перад сэзоньнікамі кулацкую сут, насьць іхных правадыроў—бракера-Кандраля і Клыча:

Клім:

Паёк вам выдавалі?
Выдавалі.
На арцель?
На арцель.
А мазгі вам бунтавалі?
А пайкі ў вас абкрадалі?
Досыць, кіньце карусэль.

І гэта падзейнічала. Там, дзе кіраўнікі камсамолу пачынаюць гарачыцца і ня могуць справіцца з складанымі абставінамі, зьяўляецца Клім, які мужна і надзвычайна вытрымана перамагае ў бойцы з варожымі сіламі.

У адрозьненьне ад іншых многіх твораў пра ролю камсамола ў працэсах сацыялістычнага будаўніцтва (хоць бы ў адрозьненьне ад „выстрелу" Безыменскага), у Андрэя Александровіча нідзе камсамол не падаецца ў авангардыцкім талкаваньні. Камсамол сапраўды паказаны як ініцыятар, зачыншчык, многа новага як ударная брыгада, але якая неадлучна ад рабочай клясы; працуе пад кіраўніцтвам ленінскай партыі.

Кірыл Антонавіч праяўляе вялізарную мужнасьць і энэргію ў адратаваньні заводу ў часе паводкі, адбіваючы наступы клясавага ворагу, якія дамагаліся затапіць завод.

Дырэктар заводу і, асабліва сакратар парткалектыву, зьяўляюцца героямі пяцігодкі. Таму агульны сход рабочых, выражаны Александровічам у надзвычайна напружаных і палкіх ніжэй паданых радкох, хадайнічае узнагародзіць Кліма ордэнам Леніна.

Стрэльбін:

За нашу перамогу,
За ўдарны наш квартал—
Таварышы, трывога.
Даёш інтэрнацыя...
(адразу спахваціўшыся)
Братцы, хлопцы, хлопчыкі.
Забыліся зусім,—
З лепшых—лепшы ўдарнік
У нас,—таварыш Клім.
Яму ўзнагароду.
Галасы—Пашана
— Гонар.
— Чэсьць.
— Бальшавіку старэйшаму.
— Кіраўніку таварышу.
— Хадайнічаць на славу.
— Ордэн Леніна, ордэн Леніна.
— Качаць... вітаць... ушанаваць...
(Качаюць Кліма і пяюць „віхры враждебные воют над нами)"

Такім чынам мы бачым, што Александровічам чалавечы калектыў заводу раскрываецца глыбока і поўна ў сацыяльнай практыцы, ў складаных абставінах клясавага змаганьня. Праблема асабовага і калектыўнага разрашаецца Александровічам не такім калектывам, дзе ўсё асабовае індывідуальнае закрэсьліваецца і падганяецца пад „калектыўнае", а ў такім калектыве, дзе кожны рабочы лічыць за асабістае шчасьце і радасьць ахвяраваць свае асабістыя здольнасьці і сілы на калектыўную справу. Дзе асабістае зусім сьвядома падпарадкуецца задачам калектыўнага, клясавага. Дзе клясавае, калектыўнае становіцца часткаю асабістага.

Таварыш Лібядзінскі на перадапошнім пленуме РАПП, гаворачы праз паказ герояў пяцігодкі, правільна патрабаваў ад нашых пралетарскіх пісьменьнікаў ня браць рабочага ўдарніка героя пяцігодкі якраз назаўсёды дадзенага і закончанага, а паказаць ступень росту рабочага да ўзроўню героя пяцігодкі.

Рост героя пяцігодкі, уся складанасьць і пасьлядоўнасьць гэтага росту, усе прамежныя зьвеньні гэтага росту і раскрыў нам Александровіч у апошняй сваёй п'есе.

II

Рост героя пяцігодкі, рост героя камсамольца ў паказе Андрэя Александровіча адбываецца ў складаным пераплёце клясавага змаганьня. У гэтым складаным пераплёце клясавага змаганьня Александровіч паказвае нам вобразы герояў-камсамольцаў, хаця-б вобразы і далёка ня поўныя, але паказаны аўтарам з шчырай любасьцю да іх, і на прыкладах ударнай работы якіх (камсамольцаў) ленінскі камсамол зможа выхоўваць маладых камсамольцаў, маладых рабочых і калгасьнікаў. Зразумела, што гэты няпоўны паказ герояў-камсамольцаў ня вычэрпвае ўсёй задачы паказу камсамольцаў герояў пяцігодкі.

У пераплёце клясавага змаганьня Александровіч дае нам контуры сапраўдных бальшавікоў.

Клясавае змаганьне ня зводзіцца Александровічам да просталінейнасьці. Сіла клясавага ворага ў процілежнасьць розным вульгарызатарам клясавага змаганьня ня прыніжаецца. Наадварот, клясавы вораг паказваецца такім, супроць якога трэба змагацца каб разьбіць яго.

Александровіч як кротзрывае маскі з тых мяшчан, „апалітычнасьць“ якіх зьвязана са змаганьнем клясавага ворага супроць дыктатуры пралетарыяту—Александровіч тым самым разьвівае гнілыя лібэральныя адносіны да гэтых людзей.

Клясавы вораг выкарыстоўвае для сваіх мэт усё, што можа. Так выкарыстоўваецца сын бракера Зарэмбы, якому бацька загадаў пралезьці ў камсамол.

Зарэмба, Кандраль і Клыч—гэта вобразы кулакоў, якія пралезьлі на завод і падрываюць яго знутры. Прычым, калі Зарэмба зьяўляецца хітрым і пранырлівым кулаком, які можа знайсьці выхад у любым становішчы, дык Кандраль—чалавек тупы, абмежаваны, які ведае адзіны прынцып:

„От даўней было“, „Бывала да вайны“.

Але гэтая тупасьць яго і абмежаванасьць не памяншае, а павялічвае нянавісьць да савецкае ўлады, да нашага будаўніцтва і актыўнасьць у змаганьні супроць яго.

Асноўны прынцып у дзейнасьці кулакоў—Зарэмба выкладае ў сябе ў хаце ў гаворцы з Кандралём:

Ня трэба змовы, не, ня трэба,
Я сам сабе, а ты сабе...
. . . . . .
Бяруць шахцёра, а кватэру
яму зрабіць павінны мы.
Мы зробім... з гнілак і фанэры,
каб не ўстаяў аднэй зімы.
Раз-хата дрэнь, раз вецер шорыць,
Дык менш вугля дадуць шахцёры.
А менш вугля, дык з кожным годам
Усё больш зачыніцца заводаў
Заводаў зьменшыцца, затое
Пачнецца болей беспрацоўе.
Ці-ж мы ня чулыя з табой?
Пілі сучкі, Кандраль,
Падпільвай прамфінплян.

Кандраль:

А галава ў цябе разумная, што у пана.
Галовы гэткія бывалі да вайны,
Разумна кажаш... сукіны сыны.
Ня дзецца ім нідзе, ня дзецца ад труны.

І тое, што вызначае Зарэмба для дзейнасьці кулацтва, гэта:

А з сьціхам, мірна і з падходцам
Падлівай у сэрца воцту.
Змоў ня трэба, не, ня трэба.
Ты сабе, а я сабе.

Такім чынам мы ў Александровіча маем паказ клясавага ворага ў яго тактыцы. Александровіч не шаржыруе клясавага ворага, а імкнецца ахапіць яго ва ўсёй поўнаце яго няна вісьці да дыктатуры пролетарыяту. І дзейнасьць клясавага ворага неабмяжоўваецца выключна мясцовымі рынкамі, як мы бачым, кулакі добра ўяўляюць сабе, што іхная дзейнасьць зьвязана са змаганьнем усяго капіталістычнага сьвету супроць Савецкага саюзу, што іхная дзейнасьць, выходзячы за мясцовыя рамкі, за рамкі канкрэтнага заводу—накірована на падрыў дыктатуры пролетарыяту ў цэлым.

У гэтым сэнсе можна і трэба гаварыць, што поэт ідзе па шляху найбольшага супраціўленьня. Пачынаецца змаганьне за ўплыў на масу сэзоньнікаў паміж кулацкімі элемэнтамі і рабочым калектывам пад кіраўніцтвам партарганізацыі.

Цікава, што ні пра бракера Зарэмбу, ні пра Клыча, ні пра кандраля—Александровіч нідзе не гаворыць, што яны зьяўляюцца кулацкімі агентамі на заводзе,—аднак іх кулацкая сутнасьць выглядае з кожнага радка п'есы. У гэтых адносінах у Александровіча ў трэцім вязьме мы маем глыбока мастацкія вобразы — дзе сэзоньнікі спынілі работу і пачынаюць закурваць.

2-гі сэзоньнік (бяручы паперу):
Давай—давайце, ліквідуем.

Міколка:

Глядзі, арцельна разьдзяры

Клыч:

Бязьмежку так сказаць,
суем.
На гаспадаркі-хутары.
(Рвуць газэту на роўныя кавалкі, Кандраль дае тытун закурваць„.)

Тут відзен адразу вобраз і твар кулака. Пасьля такога далікатнага намёку, інсцэніраваньня закурваньнем—працэсу ліквідацыі бязьмежкі на гаспадаркі-хутары —ня дзіва, што сэзоньнікі ўжо самі пачынаюць гаварыць пра калгасы:

Тым часам,
А ў нас там плодзяцца колгасы.

І тут ўжо Кандраль навучае:

Дый-не. Ня з гэткіх я.
Мяне калгасам не кране.
Глядзі густы ўсплывае дым
Ўвысь, ўвысь, глядзі ўсплывае.
Але...
— Ўзьнімаецца, затым і асядае.
Вось гэтак і жыцьцё, і край
і наша ўласьць,—
ішла ўгару, цяпер садзіцца ў гразь.

Кулак, які змагаецца за свой уплыў на сэзоньнікаў, выкарыстоўвае ўсе, што можа, і—ён арганізуе цэлую працэсію да сакратара партыйнага калектыву і дырэктара заводу—„нясучы з сабой адданасьць і „скардзячыся" на дрэннае матэрыяльнае забясьпячэньне. Кліч, Кандраль і Зарэмба падбухторваюць сэзоньнікаў пакінуць завод. Тут вобразы клясавага змаганьня Александровічам паказаны в усё страстнасьцю і захаваньнем бальшавіцкае цьвяровасьці. У адкрытым змаганьні адбываецца канчатковая перамога рабочага калектыву над кулакамі. Сэзоньнікі—рашуча пашлі за партыйным калектывам. У паказе Андрэя Александровіча рашаючым момантам у павароце сэзоньнікаў адыграла тое, што яны даведаліся, як абкрадалі іх пайкі Клыч, Кандраль.

Калі рассыпаліся кансэрвы з плеч у Клыча, тады яны зразумелі, што іхныя кіраўнікі-кулакі вялі іх па варожаму шляху і проста абманьвалі іх. Такі паказ мае пад сабой падставы ў тым сэнсе, што ўласьніцкае нутро селяніна патрабуе матэрыяльных, „вещественных" „ощутимых" доказаў, — аднак у такім паказе Александровіч робіць вялікую памылку, зьніжае ідэёвую сутнасьць таго працэсу, які адбываецца сярод сэзоньнікаў. Ставіць гэты працэс выключна у залежнасьць ад спажывецкай забясьпечанасьці.

Калі раней сэзоньнікі і слухаць не хацелі пра тое, каб застацца на заводзе, паўтараючы на словы дырэктара адно:

— Не залівай.
— На цягнік пара.
— Гайдай.
— Сып, ударнічкі, дамоў.

Калі-ж „Кліч зачэпліваецца, з плеч валіцца мех, і пасыпаліся банкі кансэрваў, цукар і інш. Рогат. Сэзоньнікі кінуліся хватаць)". — сэзоньнікі кажуць:

— Капшінармус, сукін сын,
— Абкрадаў?
— Паёк наш зводзіў,

Зарэмба, галоўны арганізатар кулакоў, і тут яшчэ трымаецца надзвычайна мужна і хітра. Ён падыходзіць да тав. Кліма, нібы-та

нічога ня ведаючы: Таварыш Клім, што тут такое? У чым тут справа? От героі?..

Прамова Кліма, дзе ён выкрывае ўсю сутнасьць гэтае кулацкае работы,—робіць канчатковы пералом у асяродзьдзі сэзоньнікаў.

Драматычна надзвычайна насычана і мастацка моцна напісаны ў п'есе „Напор"—зьяўляецца момант змаганьня са стыхіяй, з разводзьдзем хваль ракі. Па сутнасьці гэта ў кампазыцыйным сэнсе ёсьць кульмінацыйны пункт п'есы. Але ў адпаведнасьці з гэтым Александровіч ідэёвае разрашэньне ўсіх супярэчнасьцяй ня зьвёў да гэтага кампазыцыйнага кульмінацыйнага пункту.

Самае каштоўнае, што мы маем тут у паказе Александровіча,—гэта тое, што змаганьне з прыродай, змаганьне са стыхіяй ня ўзята адарваным ад усіх працэсаў,—клясавага змаганьня. Самае каштоўнае ў тым, што Александровіч паказвае нам, як клясавы вораг выкарыстоўвае стыхію для сваіх мэт, як ён (клясавы вораг) тактычна, хітра імкнецца накіраваць масу рабочых супроць партыі.

Александровіч паказвае нам, што рабочы калектыў самаахвярна здольны змагацца за адратаваньне заводу, аднак самога гэтага змаганьня не паказвае.

Шлях кулацтва, клясавых ворагаў у паказе Александровіча разам з ростам сацыялістычнага будаўніцтва, разам з разьвіцьцём калгаснага руху,—гэта ўсё большая і большая азьвярэласьць у сваёй нянавісьці да сацыялістычнага будаўніцтва. Такім шляхам ідуць клясавыя ворагі—Зарэмба, Кандраль.

Так у самы цяжкі для заводу момант, Кандраль ужо не захоўвае свае адкрытае нянавісьці да савецкае ўлады:

Што? Дарогу? Сьмерць рабочым?
Жыць рабочыя ня хочуць?
Шыю зломіш, мой паночак...
Хай змывае, каб і вочы
Завод убачыць не маглі.
Ты ня руш плаціны, чуеш?

Кулацкія агенты на заводзе нават падбухторваюць, вядуць за сабою несьвядомую частку жанок рабочых, якія лемантуюць: „А на што я нараджалася", „А мая галоўка бедная і г. д."

Яны добра разумеюць, па якіх слабых мясцох трэба біць, яны ставяць пытаньне пра тое, што важней: завод, ці чалавек:

Што?.. Плаціну? Небясьпека?
Завод важней за ча-ла-ве-ка.
Тапіць рабочых, іх дзяцей?
Па бальшавіцку гэта.

У малюнку адратаваньня заводу Александровіч канчаткова зрывае маскі з твару клясавага ворага. Паказваючы, як адратоўваецца завод, пісьменьнік сапраўды спалучае бальшавіцкую цьвярозасьць—у мэтазгоднасьці тых ці іншых захадаў для адратаваньня заводу—з шалёнай страснасьцю ў сваёй нянавісьці да клясавага ворага.

У гэтым сэнсе п'еса „Напор" працягвае і разьвівае традыцыі аднаго з лепшых твораў Александровіча „Цені на сонцы".

Рабочыя паднімаюць плаціну, а клясавы вораг гіне ў раздушаных хвалях стыхіі пад плацінай.

У агульным складаным пераплёце клясавага змаганьня,—у п'еес Андрэя Александровіча цікавай зьяўляецца праблема ўзятая для мастацкага вырашэньня, праблема перараджэньня былога шкодніка спэцыялістага.

Праблема, узьнятая Александровічам у вобразе інжынэра надзвычайна важная і цікавая, Але Александровіч „вырашае" яе схэматычна.

* * *

З формальнага боку п'еса Андрэя Александровіча, як і ўся ягоная творчасьць, надзвычайна багатая і рознастайная. Галоўнае тут заключаецца ў тым, што Александровіч для найбольш поўнага і глыбокага выражэньня ідэй свае творчасьці шукае найбольш адпаведнага і поў-

нага рытмічнага выражэньня, паколькі справа ідзе пра вершаваную творчасьць.

Рытм адпаведны вытворчым працэсам амаль адзіны ў беларускай літаратуры, стварыў Александровіч Александровіч ў сваей творчасьці багата выкарыстоўвае з народнае творчасьці, з фольклёру.

Але Александровіч выкарыстоўвае, крытычна засвойвае, бярэ з народнай творчасьці найбольш дэмакратычныя, найбольш прагрэсыўныя сацыялістычныя яе элемэнты, якія ў пралетарскім літаратурным стылі—выяўляюцца не як „прыемны ўспамінак" пра далёкую нацдэмаўскую „старасьветчыну, а як жывыя, дзейныя элемэнты ў агульным кантэксьце пралетарскага твору. Вядомы верш Александровіча „Сасна", які ўключаны ў гэтую п'есу перадае дынаміку працэсаў вытворчасьці. Александровіч не для „лірычнасьці" любуецца сасонкай, для яго сасонка,—мае толькі сэнс у працэсах сацбудаўніцтва:

Эх, сасоньніца—сасна,
дні суровыя.
Бервяно да бервяна—
хата новая...
. . . . . .
Гаратлівасьці былой
час пазбыцца н м.
Забудуем шыр балот-камяніцамі

Выкарыстаныя элемэнты народнай творчасьці тут спалучаюцца з рытмічным выражэньнем адпаведных працэсаў працы:

Гэй—адразу—
Возьмем разам.
Руш, адважна.
Усё для нас.
Дай, наляжам.
Дружна.
··· Раз.

Такім чынам „Сасна" Александровіча—гэта ня любаваньне сасной, такой, якой яна паказвалася ў народных казках, песьнях: сьлязьлівай, убогай, а той сасной, якая зьяўляецца неадлучным элемэнтам нашага будаўніцтва. Адзін з элемэнтаў народнай тврчасьці паўстаў па-новаму ў творы пралетарскага пісьменьніка.

Сапраўды дэмакратычныя, сацыялістычныя элемэнты народнай творчасьці,—у творах Александровіча—б'юць па поглядах вялікадзяржаўных шавіністаў, якія сьцьвярджаюць, што ўся народная творчасьць зьяўляецца рэакцыйнай.

Элемэнты народнай творчасьці ў творах Александровіча б'юць і нацыянал-дэмакратычных тэарэтыкаў, якія „маліліся" на народную творчасьць, бяручы ўсю народную творчасьць разам з яе рэакцыйнымі бакамі, не адцяняючы і не выдзяляючы іх.

У п'есе „Напор" Александровіча мы маем такія малюнкі, дзе ў народныя прымітывы ўкладаецца кулацкая „душа", дзе кулацтва, хаваючыся за гэтыя „народныя" прымітывы, праводзіць, нібы-та і нявінна, свае варожыя погляды, варожыя ідэі.

Гэта найбольш яскрава паказана ў малюнку, дзе Кандраль, Клыч падбухторваюць сэзоньнікаў ісьці скардзіцца да дырэктара:

Кандраль:

Чалом, дырэктару, чалом.

Галасы:

—Мы скардзіцца, дырэктару, ідом.
—Адданасьць мы, дырэктару, нясом.
—Чалом дырэктару... і г. д.

Клыч:

Вітаць арцельлю нашай рады,
Насіцеляў савецкае ўлады.

І пасьля гэтага яны прыступаюць непасрэдна да справы:

Зьвярнуць увагу хочам:
Далі валёнкі нам? Далі.
Забыліся падшыць. А мы іх топчам.
Мы-ж не па небу ходзім, па зямлі.
І працы больш таварышом, рабочым.

За народны прымітывізм хаваецца тут ідэёвы твар кулака-ворага.

На гэтых шматлікіх прыкладах п'есы Александровіча мы бачым, што найбольш рэакцыйныя бакі народнай творчасьці зьяўляюцца зброяй

у руках буржуазіі, кулацтва ў яго змаганьні супроць дыктатуры пралетарыяту, а сапраўды дэмакратычныя, сацыялістычныя, якія ў зародачным стане знаходзяцца ў народнай творчасьці, тыя элемэнты, якія выстраданы народам пад прыгнётам памешчыччага і капіталістычнага грамадзтва,—становяцца зброяй пролетарыяту ў сацыялістычным будаўніцтве і ў змаганьні супроць клясавага ворага.

Рытмічнае вершаванае выражэньне асноўных ідэй у п'есе Александровіча пабудавана на лакальным прынцыпе. Там, дзе Александровіч іранізуе над рамантычнымі ўзьлётамі каханьня Радзецкага і Васілісы—рытмічнае выражэньне ў адпаведнасьці з асноўнай думкай паэты і ў адпаведнасьці з месцам дзеі (катаньне на каньках, рытміка катаньня) перадаецца так:

Радзецкі:

Залацістым лягу лістам,
У сонцатканым дыване.
Васіліса, Васіліса—
Ты адзіная ў мяне.
Будзь-жа чулай, прытуліся,
Сэрцу я твайму пяю.

Мы ўжо гаварылі, што працэсы вытворчасьці--знаходзяць сваё рытмічнае, дынамічнае выражэньне ў вершах, у дзеях, у словах герояў, зьвязаных з вытворчымі працэсамі.

Так, як у Мір'емы рытміка яе гаворкі адпавядае яе думкам, думкам, якія характарызуюць чалавека, што вынес традыцыі старых рабочых, выхаваных пад прыгнётам капіталістычным, яна кажа:

Аднак-жа, няхай я сівею,
Бывала зайдуся ў завод—
Нейкай палёгкай павее
Завод наш цяперача—за-авод.

Выходзячы з лакальнага рытмічнага прынцыпу Александровіч Чыжу, які марыць вынайсьці найхутчэйшы сродак сувязі,—даў надзвычайнай дынамічнасьці словы, якія выражаюць хуткасьць „новай сувязі" сыстэмы Чыжа:

Цераз горы, цераз мора,
У любы на сьвеце горад
Цераз муры і цераз люкі
Проста кожнаму ў рукі і г. д. і г. д.

Напружанасьць моманту змаганьня з паводкай, рокат хваль, які наступае на завод—знайшоў у Александровіча адпаведнае рытмічнае выражэньне ў напружанай нэрвовай рытмічнасьці:

Ход стыхіі. Яго
нельга асіліць. Удар.
Стане завод.

Такі-ж напружаны страстны і трывожны рытм даецца ў п'есе, дзе гаворыцца пра прарыў на заводзе:

За нашу перамогу,
За ўдарны наш квартал—
Таварышы, трывога.

І тут-жа ў Александровіча зроблены пераход на сталую рэвалюцыйную песьню „Вихри враждебные воют над намі", якая выражае змаганьне рабочае клясы пад уціскам капіталістычнай рэакцыі, калі справа ідзе пра ўзнагароду ордэнам Леніна старога бальшавіка Кліма.

Кампазыцыя, рух і разьвіцьцё клясавых супярэчнасьцяй, пастаўленых у п'есе Андрэя Александровіча, фабульнае разгортваньне гэтых супярэчнасьцяй—пабудова на прынцыпе простага і паступова лёгічнага разгортваньня і разрашэньня іх.

З гэтай агульнай схэмы выпадае хіба заключная частка п'есы—канцоўка—„сонцавылазка".

Ужо ў мітынгу дружбы мы маем у пачатковым стане ўсе тыя супярэчнасьці, якія далей фабульна разьвіты ў п'есе.

Фармальнае напаўненьне п'есы Александровіча, утым ліку і кампазыцыйнае ў асноўным адпавядае ідэям, выражаным у творы.

Аднак, не заўсёды. Разгортваньне клясавай ідэі ў п'есе часамі ня мае сабе кампазыцыйна строгага

выражэньня, і ад гэтага да пэўнай ступені зьніжаецца сама ідэёвая глыбіня.

Так, напрыклад, бытавыя ўзаемадносіны паміж Радзецкім і Васілісай ня вырашаны Александровічам, так сама, як і вобраз Ліпы, яны перагружаюць толькі разьвіцьцё супярэчнасьцяй, затрымліваюць гэтае разьвіцьцё. Тое-ж можна сказаць пра шматслоўе камсамольцаў, пра перагружанасьць эмпірычн. матэрыялам п'есы. У змаганьні паміж кулацкімі элемэнтамі і рабочым калектывам пад кіраўніцтвам партыі за масу сэзоньнікаў супярэчнасьці разгорнуты ня досыць поўна. Так, напрыклад, пасьля яшчэ няпэўнага і хістлівага пераходу асноўнае масы сэзоньнікаў на бок рабочага калектыву—мы ня маем далей паказу вобразаў сэзоньнікаў—на новым этапе іх разьвіцьця, ні ў малюнку паводкі, ні ў заключнай дзеі п'есы. І нарэшце пра „сонцавылазку". Дадатныя якасьці яе ў тым, што яна ў асноўным заключае разрашэньне супярэчнасьцяй, пастаўленых у п'есе. Аднак яна ня ставіць новых клясавых супярэчнасьцяй, якія-б хвалявалі чытача, або гледача пасьля спэктаклю. Атрымліваецца ўражаньне, што клясавае змаганьне скончана, вораг сьпіць, завод перамог. Нібы-та новыя супярэчнасьці ня штурхаюць ход разьвіцьця заводу наперад.

III

Якія-ж асноўныя недахопы, зрывы, памылкі Александровіча ў п'есе „Напор".

У п'есе „Напор" гэтай глыбокай ідэёвай організацыі рэчаіснасьці „аж да дэталяй формы и дробязяй сюжэта" бракуе. Александровіч, паказваючы ў п'есе герояў пяцігодкі, часткова пайшоў па плыні рэчаіснасьці, рэгіструючы факты. П'еса „Напор" не організавана вакол аднае філёзофскае глыбока-ідэёвае праблемы нашага часу. Александрова як-бы імкнуўся ў сваёй п'есе захапіць усе асноўныя праблемы якія паўстаюць у працэсе сацыялістычнага будаўніцтва (праблема сувязі і ўзаемадапамога паміж рознымі нацыянальнымі рэспублікамі СССР, праблема формаваньня новых кадраў рабочых, асабістага і калектыўнага, змаганьне са стыхіяй, бытавых адносін і інш.) і гэтае ў многіх мясцох павяло пісьменьніка на натуралістычны шлях, на пасыўнае „отображательство" ўсіх тых працэсаў, якія адбываюцца ў рэчаіснасьці без упарадкаваньня гэтых фактаў і працэсаў бальшавіцкай сьвядомасьці—без падпарадкаваньня гэтых фактаў, эмпірычнага матэрыялу адзінай ідэі.

А паказваць героя пяцігодкі нельга „натуралистическим методом, нельзя показывать, руководствуясь только таким соображением: я хочу описывать действительность, для этого я буду брать факты, которые все сами за себя скажут—это посивистическая установка...

Ю. Лібедзінскі.

У Александровіча рысы элемэнтаў захапленьня багацьцем эмпірычнага матэрыялу без належнага азмысьленьня і падпарадкаваньня яго сьвядомасьці.

Гэтае ў першую чаргу тычыцца малюнку, дзе разгортваецца змаганьне заводзкага калектыву са стыхіяй, з паводкай. Мы ўжо гаварылі, што малюнак змаганьня са стыхіяй па ідэёва-клясавай насычанасьці адзін з самых моцных і па драматычнай сіле самы цікавы ў п'есе. У дзеі паўстае пытаньне пра існаваньне заводу і праблема калектыўнага і асабовага павінна была-б паўстаць, як асноўная праблема. Трэба было з усёй выразнасьцю падкрэсьліць, што асабісты лёс кожнага рабочага, яго асабістыя інтарэсы непарыўна зьвязаны з лёсам існаваньня заводу. Трэба было

з усёй сілай паказаць, што рабочыя наперакор крыкам кулакоў:

Падумаць толькі—што такое?.
Тапіць рабочых, іх дзяцей?
Па-бальшавіцку гэта?

Што наперакор гэтым крыкам рабочыя даводзяць сваю непарыўную сувязь са сваім заводам, даводзяць, што лёс заводу—гэта лёс жыцьця кожнага рабочага асабіста.

І вось Александровіч, замест гэтага, праўда паказваючы, што настрой большасьці рабочых накіраваны супроць кулакоў—усё-ж спрошчана, прасталінейна вырашае пытаньне лёсу існаваньня заводу. Рабочыя згодны затапіць частку пасёлку, каб выратаваць завод. Уключэньнем плаціны вырашаецца гэтае надзвычайна складанае і супярэчлівае пытаньне—пытаньне асабовае і калектыўнае.—Між тым, як тут патрэбна была самаахвярная работа рабочага калектыву, каб выратаваць завод і тым самым давесьці адзінства паміж асабістым і калектыўным, якое мы маем у працэсе станаўленьня новага сацыялістычнага рабочага калектыву.

І тут сказалася якраз у паэты капіраваньне жыцьцёвых фактаў, а не арганізацыя гэтых фактаў бальшавіцкай сьвядомасьцю, падпарадкаваньне эмпірычнага матэрыялу адзінай клясавай ідэі.

Другія моманты, дзе мы маем зрывы аналёгічнага парадку ў Аляксандровіча, датычацца раскрыцьця вобразу бальшавікоў партыйнага калектыву ў п'есе.

Гэтыя вобразы бальшавікоў, партыйны калектыў у клясавай практыцы, раскрыты недастаткова. Бальшавікі на заводзе ў паказе Александровіча не пранізваюць сабою ўсе працэсы вытворчасьці. Нават тав. Клім і дырэктар заводу зьяўляюцца на працэсах вытворчасьці толькі ў выключных момантах. Паказальна, што ў самы цяжкі момант для заводу ў часе паводкі тав. Клім нават і ня ўдзельнічае ў адратаваньні заводу.

Вобраз бальшавіка можа быць поўна раскрыты толькі ў паказе, як гэты бальшавік мужна і геройскі перамагае цяжкасьці. Змагаецца з клясавым ворагам толькі ў складаных супярэчнасьцях нашай рэчаіснасьці. І вось Клім, які надзвычайна мужна і вытрымана змагаецца ў працягу ўсяе п'есы супроць кулакоў, што ўзьнялі сэзоньнікаў, каб пакінуць завод, Клім, які кіруе ўдарніцтвам і спаборніцтвам на заводзе, у адпаведнасьці з лёгікай ўсяе п'есы—паўната раскрыцьця вобразу гэтага бальшавіка павінна была быць у ягонай арганізацыі рабочага калектыву на змаганьне з паводкай, а замест гэтага Александровіч „вывеў яго з строю" далёка перад тым, калі былі вырашаны ўсе супярэчнасьці і пераможаны ўсе цяжкасьці, якія стаялі перад заводам.

Захапленьне эмпірычным, фіксаваньне гэтага эмпірычнага матэрыялу параджае ў Аляксандровічавых герояў шматслоўе. Вобразы рабочых-камсамольцаў паказаны залішне шматслоўнымі, іхная гаворка часта зроблена ў стылі „прыпевак", „прыбаутак". У паказе камсамольцаў ёсьць налёты „люмпэнскага ухарства", анархізм.

Вось чаму п'еса „Напор", як мы казалі ўжо, далёка ня вычэрпвае задачы паказу ў мастацкіх вобразах камсамольца героя пяцігодкі, а прыходзіць толькі да гэтай задачы. Стварыць вобраз камсамольца героя пяцігодкі, на прыкладзе якога, як гаварыў тав. Косараў, маглі-б вучыцца мільёны маладых рабочых і калгасьнікаў, гэта яшчэ задача, якая стаіць і перад усёй пралетарскай беларускай літаратурай і ў прыватнасьці перад Александровічам.

Памылкі Андрэя Александровіча, якія яшчэ моцна адчуваюцца ў п'есе „Напор", зьвязаны з агульнымі рысамі творчага мэтаду мінулых этапаў у творчасьці пісьменьніка, якія пасьпяхова перамагаюцца ў гэтай п'есе.

Яны сказваюцца ня толькі пры паказе камсамольцаў, але і ва ўсім творы. Элемэнты просталінейнага ўспрыняцьця рэчаіснасьці, ігнараваньне складанымі формамі рэчаіснасьці, часамі схэматычнае і павярхоўнае азмысьленьне працэсаў, формалізм (неапраўданая ідэяй рытмічная ігра)—сказваецца і ў гэтай п'есе Александровіча.

Вось некалькі прыкладаў такой просталінейнасьці і „безідэйнай" ігры слоў.

Чыж:

Эх, ідры тваю, качалку.
Сып надбаў давай закалку.
. . . . . .
Супчыкі, соп'чыкі
Сыччы адкідай...

Стрэльбін (злосна): На бюро...
альбо: Вы зрыўшчыкі работ
Братцы, хлопцы, хлоп...
(Клыч яго перабівае...)
Клыч:—чыкі,
Лапці з лыка,
Невялікі
Ты музыка.

Відавочна, што тут для аўтара важны не самы сэнс гэтае „перапалкі", а „ўдальства", якое выражаецца ў гэтай перапалцы, самае гучэньне слоў. У другім месцы такое „самапроизвольное" захапленьне рытмічнасьцю прыводзіць да вульгарнай гіроніі над нашымі клясавымі ворагамі, з якімі трэба сур'ёзна змагацца:

Чыж:

Заганю сваім знарадам
Завярынгу клёпку ззаду.
Пад Бэрлінам—гэта буду я.

Ці Галька:

І дагонім.

Мішка:

Дагнаўшы, перагонім.

Чыж:

А загнаўшы шыю зломім.
Чэрцілю, Амаль-Пашы,
За Пілсудзкім Чай-кай-шы
Макданальду, П'ер-Дзюрэ,
Чэмбэрлену, Пуанкарэ...

Вось такія і падобныя „люмпэнскія" налёты, якія маюць свае карэньні у першых этапах творчасьці пісьменьніка, перамагаюцца, але яшчэ цалкам не пераможаны ў п'есе Андрэя Александровіча „Напор".

Па лініі творчага мэтаду гэтыя элемэнты зьвязаны з мэханістычна-матэрыялістычным падыходам да пазнаньня рэчаіснасьці ў некаторых ранейшых творах паэты, з імкненьнем сьцёрці гострыя куты склададанай рэчаіснасьці, з імкненьнем у некаторых ранейшых творах выразіць працэсы ў выглядзе простай лініі, якая няўхільна часамі прыводзіла Александровіча да ідэалізму.

Аднак усё гэта ня трэба блытаць з тым, пра што мы гаварылі раней, што ў Александровіча мы маем такое фармальнае напаўненьне п'есы, якое надзвычайна ўдала і крытычна засвойвае фольклёрныя элемэнты народнай творчасьці, улаўліваецца рытмічны пульс працэсаў заводзкага жыцьця, працы. Гэтае стаіць у цеснай сувязі і залежнасьці ад асноўнае ідэі твору. Мы-ж гаворым пра тыя адмоўныя элемэнты, якія асталіся спадчынай горшых бакоў мінулай творчасьці Александровіча і выходзяць за рамкі асноўнае клясавае ідэі твору.

Карэньні Александровічавых памылак у дробна-буржуазных уплывах на творчасьць пісьменьніка.

Дробна-буржуазныя ўплывы на творчасьць Александровіча адваротным сваім бокам „анархізму" выразіліся ў тым, што Александровіч ня змог у п'есе разьвязаць супярэчнасьці бытавога характару. У бытавым матэрыяле пісьменьнік загразь. Спрошчана і груба разьвязваюцца сямейныя ўзаемаадносіны паміж Радзецкім і Васілісай. Асабліва няўдалым зьяўляецца момант, калі Васіліса разрывае ісподні, відаць, як сымбаль разрыву з мяшчанскім асяродзьдзем. Пры паказе бытавых адносін Александровіч нельмі часта ў п'есе скатваецца да натуралістычнай грубасьці і спро-

шчанасьці (Ліпа з трусікамі і інш.), або прыпеўкі, якія расьпявае п'яны Клыч і г. д.

Бытавыя ўзаемаадносіны паміж Васілісай і Радзецкім, да якіх Александровіч падышоў груба і спрошчана (тым што Васіліса кідае Радзецкага і варочаецца на завод і яшчэ кантрастнымі Васілісе і Радзецкаму вобразамі Галькі і Мішкі, якія кахаюцца „а завод аснова"), шматлікі эмпірычна зафіксаваны матэрыял у п'есе гаворыць пра тое, што элемэнты груба матэрыялістычныя яшчэ бытуюць і ў гэтай п'есе Александровіча.

Мы бачылі, што Александровіч рабочы калектыў і нават клясавых ворагаў паказвае больш-менш поўна, аднак, элемэнты схэматызацыі людзей, шаржыраваньне клясавага ворага ёсьць і ў гэтай п'есе Александровіча.

Вось напрыклад, як Мішка, герой п'есы расказвае, як яны ў Далёка-Усходняй лавілі „бандыта афіцэра".

Глушылі, эх. А помню, неяк раз,
на ўвесь, ты знаеш, полк была пацеха:
жыўцом злавілі мы бандыта-ахвіцэра
рускага—з пагонамі, з какардай (?!)
Ён пад гармонік шпарыў „яблычка",
а ў перад—сьпяваў романсы нам.
І гэткая пагарда,
Хоць і сьмешна наглядаць было.
Быў гад разюшаны паручык Сакалоў.

З мінулымі этапамі творчасьці паэты зьвязаны і многія другія схэматычныя месцы ў п'есе. Напрыклад,

Васіліса:

Даволі ныць

Базыль:

Мы ідзем наперад.

Галька:

Мы не адны.

Васіліса:

А хныкаць крыўда, верна? і г. д.

Вось тыя асноўныя хібы п'есы „Напор". Гэтыя хібы гавораць нам пра тое, што рысы мэханістычна-матэрыялістычныя ў творчасьці Александровіча, якія перамагаюцца ўсім творчым шляхам паэты (у вялікай ступені пераможаны ў паэме („Цені на сонцы"), і шлях станаўленьня паэта на пазыцыі матэрыялістычна-дыялектычныяў п'есе „Напор" ідзе праз змаганьне са спрошчанасьцю, прасталінейнасьцю, якая была ў некаторых ранейшых творах пісьменьніка.

П'еса Андрэя Александровіча канчаецца „Сонцавылазкай", агульным купаньнем і фізкультфігурамі—„усё гэтае, як сымбал пралетарскае сілы". —У ёй нават нічога ня сказана, ці выканаў завод свае абавязкі, узятыя перад рабочымі Данбасу, Агульны ўздым радаснага, бадзёрага, сьвежага рабочага калектыву, камсамольцаў—не дае нават поваду думаць, што абавязак—даць Данбасу тысячу стандартных дамоў—ня выкананы.

— Яны не маглі не перамагчы.

У гэтым сіла, моц заключнае дзеі п'есы.

Але „Сонцавылазка"—мае і свае слабыя бакі, яна падмяняе фізыалёгічным, прыродным, натуральным—урачыстасьць сацыяльнае перамогі рабочае клясы пад кіраўніцтвам кампартыі ў складаных абставінах клясавага змаганьня.

П'еса „Напор"—пры ўсіх сваіх хібах, зрывах,—ёсьць адна з перамог пралетарскай літаратуры, па шляху стварэньня вялікага бальшавіцкага мастацтва,—мастацтва, насычанага партыйнасьцю „вплоть до деталей формы и мелочей сюжета", чаго аднак у „Напоры" нехапае ў поўнай меры.

Т. Дакутовіч

За дыялектычна-матэрыялістычны нарыс

Нарыс, як пэўны від літаратурнага жанру, у апошні час заваяваў сабе пачэснае месца на старонках нашых газэт і часопісаў. Гэта і зразумела, бо тыя клясавыя зрухі, якія адбыліся ў нашай краіне ў зьвязку з ліквідацыяй кулацтва, як клясы ў раёнах суцэльнай калектывізацыі, рост буйнай прамысловасьці—усё гэта дало новую глебу для разьвіцьця мастацкай літаратуры. Зьяўляюцца новыя жанры, выпрацоўваецца дыялектычна-матэрыялістычны мэтад мастацкай літаратуры, зьяўляюцца новыя творы, якія адлюстроўваюць патас сацыялістычнага будаўніцтва і гераізм будаўнікоў.

Якраз у гэты пэрыод шуканьня, мы бачым буйны росквіт такога мастацкага жанру, як нарыс. Жорсткая клясавая барацьба патрабуе палітычнай завостранасьці мастацкай літаратуры, каб літаратура служыла моцнай зброяй палітычнай барацьбы ў руках рабочае клясы. Але, ня гледзячы на значны рост пралетарскай літаратуры, наглядаецца агульнае адставаньне літаратуры ад задач і тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Пралетарская літаратура, — якая павінна адлюстроўваць у першую чаргу найбольш актуальныя праблемы, з пункту гледжаньня чарговых задач сацыялістычнага будаўніцтва, якая павінна ўплываць на думкі і пачуцьці чытача адпаведна з гэтымі задачамі, гэта літаратура здавальняюча яшчэ сваіх задач ня выконвае У пралетарскай літаратуры мы яшчэ рэдка знаходзім паказ таго напружанага змаганьня, якое адбываецца на нашых прадпрыемствах, яшчэ не знайшлі дастаткова глыбокага адлюстраваньня лепшыя прыклады сацспаборніцтва, ударніцтва, не паказана ў мастацкай форме ўся складанасьць клясавай барацьбы на рашаючых вучастках сацыялістычнага будаўніцтва. Гэта тлумачыцца тым, што нашы пісьменьнікі яшчэ недастаткова аўладалі марксысцка-ленінскай тэорыяй, мэтадам дыялектычнага матэрыялізму, які зьяўляецца мэтадам найбольш глыбокага пазнаньня рачаіснасьці. Яшчэ канчаткова ня зжыты ўплыў буржуазных і дробнабуржуазных тэорый на пралетарскіх пісьменьнікаў.

Недастатковае аўладаньне дыялектычна-матэрыялістычным мэтадам, ды яшчэ значны ўплыў буржуазнай культуры на пралетарскіх пісьменьнікаў—усё гэта зьяўляецца тымі прычынамі, якія абумовілі адставаньне пралетарскай літаратуры ад задач і тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва. Ліквідаваць адставаньне літаратуры ад тэмпаў нашага жыцьця—вось якая задача стаіць перад пралетарскай літаратурай. „Задача перамаганьня адставаньня—гэта ёсьць задача падвышэньня ўзроўню нашага сьветапогляду, рэалізацыя нашага сьветапогляду ў творчым дыялектычна—матэрыялістычным мэтадзе“ (Лузгін).

Вось чаму зусім правільна сакратарыят РАПП у сваёй рэзалюцыі аб выніках вытворчай нарады нарысістых адзначае: „Агульная за-

дача аўладаньня мэтадам дыялектычнага матэрыялізму пралетарскай літаратуры зьяўляецца важнейшай задачай кожнага творчага напрамку, у прыватнасьці і нарысу".

Беларуская літаратура на сёньняшні дзень яшчэ ня мае такога нарысу, які-б цалкам адпавядаў запатрабаваньням пралетарскай грамадзкасьці, яшчэ няма такога нарысу, які быў-бы напісаны дыялектычна-матэрыялістычным мэтадам. Між тым сэкцыя нарысу пры БелАПП'е мала займаецца творчымі пытаньнямі нарысу. Адсюль вынікае неабходнасьць перабудовы сваёй працы такім чынам, каб лёзунг—у бой за дыялектычна-матэрыялістычны нарыс—ператварыўся ў жыцьцё. Неабходна памятаць, што лёзунг—за вялікае бальшавіцкае мастацтва—датычыцца і нарысу, як пэўнага літаратурнага жанру.

* * *

Адставаньне літаратуры ад задач і тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, як мы ўжо казалі, абумоўлена, па-першае—недастатковым узроўнем сьветапогляду, па-другое—уплывам буржуазных і дробнабуржуазных тэорый і тэорыек. Змагаючыся за пралетарскі нарыс, мы павінны даць жорсткую бойку буржуазным тэорыйкам аб нарысе, як малой, нязначнай і нікчэмнай форме, якія (тэорыйкі) прасякаюць у нашу літаратуру і часамі маюць уплыў на менш устойлівых пралетарскіх пісьменьнікаў. У расейскай літаратуры з такімі тэорыйкамі выступаў Эйхэнбаўм, які імкнуўся азначыць нарыс, як пэўную сыстэму фармальных асаблівасьцяй. Выходзячы з гэтага, фармалістыя азначаюць нарыс, як жанр малых пераходных форм з пэўнымі асаблівасьцямі пабудовы (адсутнасьць сюжэту, фатаграфічнасьць і інш). Эйхэнбаўм у сваіх працах так і піша, што нарыс фактычна зьяўляецца пробай пяра маладога пісьменьніка, гэта ягоныя эскізы, ад якіх ён потым пераходзіць да большых формаў—раману, аповесьці. Ён нават проста выкідвае лёзунг: „Праз нарыс—да раману". Ясна, што для фармалістых, тыпу Эйхэнбаўма, жанр пераходзіць у жанр па ўнутраных законах жанру.

Цікава, што гэтыя тэорыйкі ў пераліцованым выглядзе абараняў у свой час Будзінскі, які на II Пленуме БелАПП таксама ня лічыў нарыс за самастойны жанр. Для яго нарыс—гэта чорная работа, пляновыя нататкі для большага мастацкага твору. Такія разважаньні наскрозь прасякнуты імкненьнем зьвесьці нарыс да другараднага гатунку літаратуры.

Мэханістычнасьць і шкоднасьць данай устаноўкі адразу кідаецца ў вочы. Менавіта таму: „Сакратарыят РАПП лічыць, што галоўнай небясьпекай у адносінах нарысу зьяўляюцца: адкрытая апартуністычная тэорыя „другараднасьці" нарысіцкай літаратуры, прыніжэньне малых форм і г. д. і, у асаблівасьці, недаацэнка вялізарнага значэньня нарысаў рабочых ударнікаў. Такія тэорыі зьяўляюцца выражэньнем барскіх адносін да творчасьці рабочых пісьменьнікаў, і з імі павінна быць паведзена самая рашучая барацьба" (З рэзалюцыі сакратарыяту РАПП,—„На литературном посту", № 10, 1931 г.).

Недалёка ад фармалістых па сваёй сутнасьці пайшлі і „левыя" тэндэнцыі ў вырашэньні праблемы нарысу. Былі імкненьні давесьці, што нарыс зьяўляецца адзіна-пралетарскім жанрам у рэканструкцыйны пэрыод. Бо, бачыце, у наш час, час тэмпаў—пісаць вялікія творы г. зн. адставаць ад жыцьця. Даволі фантазіі ў літаратуры. Дайце факты жыцьця. Факты і толькі факты—так крычалі на розныя тоны, з рознымі адценьнямі, як лефаўцы так і літфронтаўцы.

Першыя навучаюць са старонак лефаўскага зборніку „Литература факта", каб пісьменьнік заняўся „біаграфіяй рэчаў (Трэцьякоў), каб

„пісьменьнік станавіўся бліжэй да факту“ (Брык) і інш. Абыходзячы людзей ды іхныя клясавыя ўзаемаадносіны, лефаўцы намагаліся ўбачыць рэчы і іхныя ўзаемаадносіны.

Другія, ня менш ярыя літфронтаўцы, крычалі аб авангардным значэньні нарысу, аб тэмпах, якія вымагаюць ад пісьменьніка хутка рэагаваць на бягучыя падзеі—нарысам.

Прыхільнікі гэтай тэорыі знайшліся і ў беларускай літаратуры. Калі прагледзіць рэцэнзіі Куніцкага аб нарысах, зьмешчаных у часопісі „Маладняк“ за 1931 г.—вы там убачыце тую-ж самую тэорыю авангардызму нарысу. Так, напрыклад, у рэцэнзіі на кніжку нарысаў Сташэўскага „Гаворыць Асінстан“ („Маладняк“ № 1-1931 г.) Куніцкі піша: „У апошні час сярод пралетарскай літаратуры, як жанр, пачаў практыкавацца нарыс. Нарыс зараз заняў шырокае месца як сярод расейскай пралетарскай літаратуры, так і беларускай. І гэта зусім зразумела. Наша жыцьцё так шпарка ідзе наперад, так шпарка расьце сацыялізм у краіне саветаў, што мастацкая літаратура яшчэ ня ў змозе сёньня ахапіць увесь размах працоўных будаўнікоў сацыялізму, і мастацкімі вобразамі прадэманстраваць яго“. Цікава, па думцы Куніцкага, выходзіць, што „пралетарская літаратура ня ў змозе сёньня ахапіць увесь размах працоўных“, а вось нарыс—зможа. Замест сур'ёзнага крытычнага падыходу да рэцэнзуемых кніжок з пункту погляду творчага мэтаду, Куніцкі карыстаецца фармалістычнай крытыкай, якая нічога не дае чытачу. Прыклад: „Нарыс напісан па-майстэрску“ (а чаму?—Д.). Аўтар схапіў з свайго аб'екту ўсе характэрныя рысы, характарызуючыя кавалачкі, з якіх атрымоўваецца цэлы выпуклы малюнак“. Пасьля гэтых заўваг Куніцкі прыводзіць вялічэзныя вытрымкі з кніжкі. Аб тым, як твор служыць нашаму сацыялістычнаму будаўніцтву, як ён арганізуе рабочую масу на выкананьне прамфінпляну—няма ні слова.

Першая вытворчая нарада нарысістых РАПП у сваёй рэзалюцыі адзначае наступнае:

„Левыя“ тэндэнцыі, узросшыя на глебе лефаўскіх і літфронтаўскіх тэорый, пад прыкрыцьцем сказаў аб авангардным значэньні нарысу, вядуць да мастацкага разбраеньня пралетарыяту і ў першую чаргу да ліквідацыі ў адносінах нарысу.

Пралетарская літаратура выкарыстоўвае ўсе віды жанраў, але кожны з іх павінен быць у руках пралетарскага пісьменьніка зброяй ў барацьбе за сапраўднае пралетарскае мастацтва“ („На Литпосту“—№ 10,1931г.)

30 лістапада 1931 г.—адбылася другая вытворчая нарада пісьменьнікаў нарысістых і паэтаў, скліканая рэдакцыяй газэты „Правда“. Адказны сакратар „Правды“ т. Л. Мэхліс, у сваім дакладзе азнаёміў пісьменьнікаў з агульнымі ўстаноўкамі пляну працы рэдакцыі „Правды“ на бліжэйшыя месяцы і з задачамі, якія выцякаюць з гэтага пляну.

Пісьменьнікі-нарысісты павінны дапамагчы партыі ў прапрацоўцы народна-гаспадарчага пляну на 1932 г. Група нарысістых магла-бы, напрыклад, выехаць на пэўны тэрмін у калгасы і дэталёва прапрацаваць вытворчы плян таго ці іншага калгасу на 1932 год. Увага пісьменьніка павінна быць зьвернута і на такую важную праблему, як пэрспэктывы другой пяцігодкі. Усе гэтыя задачы патрэбна глыбока і сур'ёзна ўсьвядоміць, каб зьмест нарысу быў падняты на прынцыпова большую вышыню.

На гэтай нарадзе рэдакцыя ЦО партыі прад'явіла рахунак пісьменьнікам-нарысістым. У гэтых адносінах ня дрэнна было-б павучыцца і рэдакцыі ЦО КП(б)Б „Зьвязда“. На сёньняшні дзень рэдакцыя газэты слаба зьвязана з пісьменьніцкімі арганізацыямі. Ня створаны адпаведныя кадры пісьменьнікаў нары-

сістых пры рэдакцыі. Неабходна, як найхутчэй паставіць гэтае пытаньне ў парадак дню працы рэдакцыі газэты „Зьвязда".

* * *

Літаратура сёньняшняга дню са старонак газэт, часопісяй і нават паасобных кніжок гаворыць аб надзвычайна буйным росквіце нарысу. Так, напрыклад, у часопісі „Чырвоная Беларусь" за 1930 г. з 175 назваў было зьмешчана 75 нарысаў. У 1931 г. нарысы займалі амаль 80 проц. усей зьмяшчаемай мастацкай прадукцыі.

Бяз нарысаў не абыходзяцца і тоўстыя часопісі, як: „Маладняк", „Полымя", „Узвышша". Усё гэта прымушае нас зьвярнуць асаблівую ўвагу на якасьць гэтай шматлікай прадукцыі. І трэба адзначыць, што якасьць нарысу ў нас не на вышыні. Вельмі часта нарысы фабрыкуюцца, што бліны пякуцца, і таму зьяўляюцца часта мастацкай халтурай. Спэкулюючы на актуальных тэмах, нарысы вельмі часта зьяўляюцца замаскаванымі, буржуазна-дзеляцкі прыстасаваньнямі да клясава-буржуазных выступленьняў.

Надзвычай шмат халтурных нарысаў было зьмешчана ў „Чырвонай Беларусі" Беліны-Падгаецкага. Адзін ён пад чатырма псэўданімамі фабрыкаваў нарысы. Па аднаму шаблёну складаў ён схэматычную і не мастацкую пісаніну. Гэта, ужо, так сказаць, клясычны нумар для беларускай літаратуры! Але ёсьць і другія ахвотнікі друкаваць сваю халтуру пад назвай нарысу. Такому прыстасаваньню павінен быць дадзены рашучы адпор. Мы павінны змагацца за мастацкую вышыню палітычна-завойстранага нарысу. Нарыс, як і ўсякі від мастацкай літаратуры, адрасаваны да самай шырокай пралетарскай масы. Менавіта таму на пісьменьніка нарысіста ўскладаюцца вялікія задачы паказаць у невялікіх формах складанасьць і рознастайнасьць клясавай барацьбы ва ўмовах сацыялістычнага будаўніцтва. У гэтым і заключаецца тое галоўнае, што характарызуе нарыс рэканструкцыйнага пэрыоду. Правільна паказаць клясавы працэс, працэс будаваньня сацыялізму мэтадам дыялектычнага матэрыялізму і разам з гэтым эмацыянальна ўзьдзейнічаць на чытача для арганізацыі ягонай волі на новую барацьбу за сацыялізм—вось што павінна ляжаць у аснове пралетарскага нарысу.

Нарыс, перш за ўсё, баявы пралетарскі твор, які арганічна злучае ў сабе мастацкія вобразы і сьветапогляд дыялектыка-матэрыялістага. Пралетарскі пісьменьнік-нарысіст выкарыстоўвае факты акаляючага жыцьця, (не факты дзеля фактаў, як-то рабілі фармалістыя, а такія факты, дзе-б былі ўскрыты ўзаемаадносіны людзей.

У аснове гэтага паказу павінна ляжаць тая асаблівасьць, што сацыялістычнае будаўніцтва аднолькава адкідвае адасобленасьць работніка ад будаўніцтва, гэта значыць, чалавека ад рэчаў (псыхалёгізм нарысу) і падмену аднаго другім (факт дзеля факту—фатаграфічнасьць.) Гэта якраз ставіць праблему паказу чалавека ва ўмовах сацыялістычнага будаўніцтва.

„Будаўніцтва сацыялізму, узятае, як глыбока чалавечая праблема, як працэс пераробкі чалавека—вось асноўная тэматыка нарысу ў рэканструкцыйны пэрыод" (Перцаў-Літгазэта). Але гэта ня значыць яшчэ, што нарыс рэканструкцыйнага пэрыоду абмяжоўваецца адлюстраваньнем толькі сёньнешняга дню. Гэта было-б няправільна.

„Мы за баявы пралетарскі нарыс, які бярэ любы адрэзак канкрэтнай рэчаіснасьці, але мы супроць усякай мэтафізыкі, супроць паўзучага эмпірызму, супроць рацыяналізму, супроць суб'ектывізму, супроць любаваньня, супроць,

апісацельства — супроць такіх творчых асаблівасьцяй мэтаду, сутнасьць якіх зьяўляецца недыялектычны і не матэрыялістычны сьветапогляд, альбо адхіленьне ад яго. Мы супроць скажэньня рачаіснасьці, якое ўзводзіцца ў прынцып на тэй падставе. што гэта, бачыце, нарыс, такі асобны жанр; мы за выяўленьне ў нарысе пралетарскай літаратуры, як і ў любым жанры пралетарскай літаратуры, сутнасьці рачаіснасьці ў яе супярэчнасьці, у яе руху, у сьвеце авангарднага марксысцка-ленінскага сьветапогляду", (Лузгін).

* * *

Нарысы Міхася Гольдбэрга. Міхась Гольдбэрг выпусьціў дзьве кніжкі нарысаў: „Пабягуць слупы" — выд. 1929 г. і „На рыштаваньнях" — выд. 1930 г.

Першая кніжка нарысаў Міхася Гольдбэрга цікава сваёй рознастайнасьцю тэм. Тут у яго і ўспаміны пра мінулае рэвалюцыйнай барацьбы (першыя два нарысы), тут і паказ клясавай барацьбы на вёсцы, тут ёсьць і паказ жыцьця беднаты гарадзкіх акраін. Але трэба адзначыць, што ня з усімі тэмамі ў аднолькавай ступені справіўся аўтар. Узяць бы хаця першыя два нарысы з мінулага рэвалюцыйнай барацьбы. Першы нарыс зборніку — „Прадвесьне дзевяноста восьмага", у якім аўтар імкнуўся паказаць нарастаньне рэвалюцыйнага руху, імкнуўся аднавіць перажываньне дзейнасьці удзельнікаў першага зьезду РСДРП у мастацкім вобразе. Гэта задача аўтарам вырашана ня зусім удала. Замест таго, каб паказаць сувязь рэвалюцыянэраў, удзельнікаў першага зьезду, з рабочай масай ў канкрэтных умовах барацьбы, аўтар проста знаёміць чытача з надворным выглядам сваіх герояў, зазначыўшы, што аднаго з герояў ён ня можа апісаць з прычыны адсутнасьці фатаграфіі гэтага ўдзельніка. Паказаць іх за працай у канкрэтнай абстаноўцы аўтар ня змог. Просты, невялічкі мастацкі малюнак, які не дае эмацыянальнай зарадкі чытачу на далейшую барацьбу, на далейшае змаганьне за справу сацыялізму.

Другі нарыс „Іван Пуліхаў" зусім падобны першаму. У аўтара не знайшлося для характарыстыкі свайго героя іншых слоў, як: „Шляхетны лоб і асаблівая бледнасьць твару". Інтэлігенцкі падыход да сваіх герояў — вось як можна было-б ахарактарызаваць асаблівасьці аўтарскага паказу. Гэты інтэлігенцкі падыход, правільней сказаць, дробнабуржуазны падыход, праўда, спачуваючага, але назіральніка збоку за ходам гістарычнага працэсу адлюстраваўся ва ўсіх нарысах данага зборніку. Так у нарысе „На апошніх загонах", аўтар не паказвае клясавай дыфэрэнцыяцыі на вёсцы. Ён наогул бачыць усё вясковае насельніцтва бедным. Ягоныя героі самі ў сябе пытаюцца: „Чаму бедна жывём?—і адказваюць— „Правадыроў у нас няма" Мяккацелая любоў да ўсіх людзей, да кожнага чалавека — вось якое ўражаньне застаецца ў чытача ад гэтага нарысу. Лепш зроблены, ў параўнаньні з другімі творамі гэтага зборніку, нарыс „Лясны Інтэрнацыянал". Але і ён не дае правільнага малюнку жыцьця. Тут таксама ня ўбачыш клясавай дыфэрэнцыяцыі вёскі. На вёсцы ўсё добра, толькі вось народ ня культурны. Гэта ўсё. Апошні нарыс у зборніку — „Пабягуць слупы"—зьяўляецца адным з лепшых. Здаровая надзея на будучыню, заклік да змаганьня за справу электрыфікацыі краіны, паказ энтузыязму рабочай клясы—вось дадатныя бакі гэтага нарысу. Але й ён не пазбаўлены схэматызму.

Другі зборнік нарысаў Гольдбэрга „На рыштаваньнях" складаецца з двух разьдзелаў: „руйнуем межы" і „энтузыястыя варштатаў". Першы разьдзел—„руйнуем межы" не пазбаўлены тых-жа самых хібаў, што

былі і ў першым зборніку нарысаў „Пабягуць слупы". Схэматызм паказу рэчаіснасьці адчуваецца і тут. Той-жа падыход да апісваемых падзей, падыход пабочнага назіральніка. Але трэба адзначыць, што ў гэтых нарысах аўтар паказвае яскравей сацыяльныя супярэчнасьці на вёсцы, тут мы маем больш удумны паказ будаўніцтва новай вёскі, вёскі калгаснай. Асабліва цікавы ў гэтых адносінах нарыс „Ломка", дзе аўтар дае моцны малюнак наступу новага на вёсцы, сацыялістычнага наступу на прыватна-ўласьніцкія інстынкты сялянства. Ужо ў гэтым наступе адчуваецца перамога. У гэтым найбольш моцным нарысе аўтар забывае і аб сваім „я". Ён пачынае дзейнічаць разам з сваімі героямі. Другі разьдзел кніжкі прысьвечаны паказу энтузыястых варштату. Аўтар паказвае нам героічнае змаганьне рабочых Добрускай фабрыкі „Герой працы" за выкананьне прамфінпляну.

Даволі ўдала паказвае аўтар паход жанчын за якасьць выпрацоўкі ў нарысе „Бабская вайна". Добра паказана і ліквідацыя прарыву на фабрыцы ў нарысе „Прарыў". Усё гэта сьведчыць аб некаторым росьце пісьменьніка ў параўнаньні з першай кніжкай нарысаў.

Нарысы С. Знаёмага. Знаёмы на сёньняшні дзень мае тры кніжкі нарысаў: 1) „Відагоршчы" — выд. 1930 г. 2) „Дом № 31"— выд. 1930 г. 3) „За дамбаю"—выд. 1931 г.

Першая кніжка нарысаў Знаёмага зьяўляецца падарожнымі нататкамі ўдзельніка чырвонаармейскага аграпаходу. Гэтая кніжка напісана вельмі прымітыўна і мастацкі слаба. Але ня гледзячы на гэта, кніжка тым ня менш чытаецца з цікавасьцю. Трэба сказаць, што аўтар вельмі простай мовай расказвае аб надзвычайна важных і цікавых справах. Ён расказвае аб тым, як удзельнічалі чырвонаармейскія часьці Менску ў паходзе, „мэта якога—дапамагчы партыі ды ўладзе ў калектывізацыі вёскі, дапамагчы калгасам у падрыхтоўцы да сапраўднай бальшавіцкай вясны". Чырвонаармейцы, вартавыя межаў СССР, пайшлі ў паход змагацца з сялянскай кансэрватыўнасьцю, руцінай, за новае і лепшае жыцьцё. За невялікі час свайго паходу чырвонаармейцы змаглі арганізаваць некалькі новых калгасаў, замацаваць слабыя. Сваім непасрэдным удзелам, канкрэтнай дапамогай у працы, чырвонаармейцы паказалі сябе сапраўды арміяй вернай рабочай клясе, змагарамі за справу пабудовы сацыялізму. Вось што, па сутнасьці, зьяўляецца зьместам нарысу Знаёмага.

Другая кніжка нарысаў Знаёмага „Дом № 31" зьяўляецца некаторым крокам наперад у параўнаньні з першай кніжкай. Гэта адчуваецца ўжо ў больш глыбокім падыходзе да рэчаіснасьці. Праўда, мастацкі бок і гэтых нарысаў кульгае. Адчуваецца слабасьць, а часамі і бездапаможнасьць у мастацкіх сродках, якімі аўтар карыстаецца. Усё-ж ткі нарысы Знаёмага паказваюць нам новы падыход да рэчаў. Знаёмага цікавяць дробязі жыцьця. Ён паказвае ў нарысе „Дом № 31" барацьбу камсамольца Сьцёпкі за новы быт. Паказана, трэба сказаць прымітыўна, але праўдзіва. Пачаў ён, Сьцёпка, сваю барацьбу з мяшчанствам, з прыватна-ўласьніцкімі тэндэнцыямі жыхароў Дому № 31 праз калектыўнае гадаваньне парсючка, і адгэтуль дайшло да калектыўнай кухні і г. д. У нарысе „Камсамольскі пачатак" паказана барацьба камсамолу за прамфінплян, за ўдарныя тэмпы ў працы.

Тэмамі для данай кніжкі нарысаў служыла наша жыцьцё. Вытворчасьць, быт—вось што ў сьціслых кароценькіх нарысах паказаў нам Знаёмы.

Трэцяя кніжка нарысаў Знаёмага „За дамбаю" — зьявілася новым крокам наперад аўтара ў сваім творчым разьвіцьці. Больш шырэй-

шы ахоп рэчаіснасьці, больш глыбокае ўскрыццё супярэчнасьцяй жыцьця—вось чым можна ахарактарызаваць гэту кніжку нарысаў. Адным з характэрных зьяўляецца нарыс „Каця Астаповіч". Каця Астаповіч—камсамолка, работніца запалкавай фабрыкі, пападае ў мяшчанскае асяродзьдзе разлажыўшыхся камсамольцаў. Адарваўшыся ад грамадзкай працы, Каця сама апушчаецца ў мяшчанскае асяродзьдзе. Не атрымліваючы ніякай дапамогі, яна даходзіць да таго, што на яе кватэры наладжваюцца вечарынкі з выпіўкай. Але ня гэта галоўнае імкнецца паказаць аўтар. Ён паказвае, як на фоне слабасьці кіраўніцтва парткалектыву і непрацаздольнасьці камсамольскага калектыву, на фабрыцы штодзённа адбываецца недавыкананьне прамфінпляну. Нарэшце прарыў. Камісія па праверцы працы на фабрыцы выявіла права-апартуністычную практыку кіраўніцтва. Новае кіраўніцтва камсамольскага калектыву ўцягвае ў працу і Кацю Астаповіч, якая перараджаецца і становіцца ўдарніцай. Адным з недахопаў данага нарысу зьяўляецца тое, што аўтар занадта шмат месца аддае апісаньню перажываньняў паасобных герояў. Гэта стварае пагрозу, што аўтар можа дайсьці да мяшчанскага псыхалёгізму ў сваім творчым мэтадзе.

Цікавы нарыс „Плытагоны", дзе паказана барацьба за выкананьне прамфінпляну сярод лесасплаўшчыкаў.

Усе нарысы зборніку „За дамбаю" сьведчаць аб творчым росьце пісьменьніка. Але ня трэба на гэтым заспакайвацца. Гэтыя дасягненьні яшчэ далёка стаяць ад дыялектычна-матэрыялістычнага мэтаду, якім павінен кіравацца пралетарскі пісьменьнік.

* * *

„У творчасьці ўсіх нацыянальных атрадаў пралетарскай літаратуры СССР зусім недастатковае адлюстраваньне знайшлі посьпехі сацыялістычнай індустрыялізацыі,—зусім недастатковы паказ герояў пяцігодкі" (рэдакцыйны артыкул „Правды" ад 19 красавіка 1931 г.—„За інтэрнацыянальнае адзінства пралетлітаратуры народаў СССР"). Гэта агульнае палажэньне аб „недастатковасьці адлюстраваньня посьпехаў сацыялістычнай індустрыялізацыі" для ўсёй літаратуры „нацыянальных атрадаў пралетарскай літаратуры СССР", як няма лепш можна праілюстраваць на творчасьці пісьменьнікаў-нарысістаў. У беларускай літаратуры на сёньняшні дзень маецца даволі значнае ядро пісьменьнікаў-нарысістых. Між тым, зусім нязначная частка з іх у сваіх нарысах адлюстроўвае посьпехі сацыялістычнай індустрыялізацыі нашае краіны, творчы ўздым працоўных мас, сацспаборніцтва і ўдарніцтва на прадпрыемствах буйнай прамысловасьці.

Лёзунг—краіна павінна ведаць сваіх герояў—пісьменьніцкімі арганізацыямі ў дастатковай ступені яшчэ не рэалізаваны. Мы яшчэ ня маем ніводнай мастацкай кніжкі па паказу герояў пяцігодкі.

Акрамя ўжо разгледжаных намі нарысаў Знаёмага, мы маем дзьве кніжкі нарысаў: „Гаворыць Асінстан"—Сташэўскага і „Турбіны гудуць"—Жука, якія напісаны на тэму аб індустрыялізацыі савецкай Беларусі. Вось і ўсё. Мізэрная колькасьць і, параўнаўча, нявысокая якасьць гэтых кніжок аніяк ня можа задаволіць запатрабаваньне пралетарскага чытача. Нашы нарысісты павінны больш зьвярнуць увагі на адлюстраваньне посьпехаў сацыялістычнага будаўніцтва ў горадзе, на посьпехі будаўніцтва нашай буйнай прамысловасьці, на рост ударніцтва, на супярэчнасьці нашай рэчаіснасьці,—адпаведна ўказаньням рэдакцыйных артыкулаў газэты „Правда".

Нарыс Сташэўскага „Гаворыць Асінстан"—1930 г. досыць выгадна выдзяляецца з раду іншых нарысаў. Напісаны нарыс на тэму

аб будаўніцтве буйнейшай у БССР электрычнай станцыі, аб змаганьні рабочых за выкананьне прамфінпляну будаўніцтва.

Паказаць на фоне будаўніцтва першых волатаў цяжкой індустрыі, на фоне росту нашых вытворчых сродкаў—рост клясавай самасьвядомасьці рабочай масы, самаадданасьць працоўных мас сацыялістычнаму будаўніцтву—задача вельмі складаная для пісьменьніка, асабліва калі ўлічыць той факт, што раней Беларусь была краінай у пераважнасьці сялянскай, краінай дробнатаварных гаспадарак. І вось на гэтым фоне расьце новая Беларусь, Беларусь савецкая, сацыялістычная. Пабудованы волаты цяжкой індустрыі (Гомсельмаш, Бабруйскі камбінат і інш.) і разам з працэсам пераробкі нашай гаспадаркі з дробнатаварнай, сялянскай у індустрыяльна-аграрную пралетарскую, адбываецца працэс пераробкі чалавека, працэс пераробкі дробна-уласьніцкай індывідуалістычнай псыхоідэалёгіі ў калектыўную сацыялістычную ідэалёгію. Вось гэту пераробку людзей і спрабуе паказаць Сташэўскі.

Пачатак нарысу просты: „Быў такі край—Беларусь балотная, мякінная, галотная". Гэтай Беларусі сёньня няма. Аб гэтым „сёньня Асінстан папярэджвае ў апошні раз". І ўжо адыходзяць у нябыт архаічныя дзядкі Ярмалаі, якія пры першым наступе новага хацелі-б уцячы куды-небудзь ад гэтага новага, ім невядомага. „Прыдзецца скарэй высяляцца куды"—думае Ярмалай асінаўскі дзядок. Ён думае пазбавіцца ад таго, што нясе новае здаровае пакаленьне бальшавіцкае эпохі. „Ярмалаяў дала старая, прыгнечаная цемрай вёска, вёска „чыстай і нячыстай" сілы—шаптуноў, лясуноў, дамавікоў. Вякамі стаяла вёска на адных слупох, і раптам — новая эпоха. Узьняліся дзеці, унукі і калоцяць гэтыя слупы". Вось чаму „мы ня злуемся на Ярмалаяў, калі яны, лежачы на сваёй печы, бурчаць на ўнукаў, што заваявалі царкву пад піянэрскі клюб".

Вобраз гэтай аджываючай архаічнасьці, сялянскай кансэрватыўнасьці параўнальна ўдала паказаў аўтар. Сакавітай мовай расказвае аўтар нам і пра ўпартую працу ўдарнікаў, пераможцаў цяжкасьцяй будаўніцтва. Актыўнасьць рабочых, іхны творчы запал, клясавая самасьвядомасьць і самаадданасьць сацыялістычнаму будаўніцтву відаць ужо з таго, што на зьлёце ударнікаў Асінбуду „у прэзыдыум пачалі паступаць заяўкі ад рабочых груп і служачых, што яны прыложаць усе сілы, каб найбольш пасьпяхова, з найбольшай энэргіяй у найкарацейшы час выканаць сваю работу".

Але разам з сваёй працай рабочыя Асінбуду не забываюць і пра сялянства. Калі патрабавалася калгасу дапамога, рабочыя з энтузыязмам пайшлі і дапамаглі скасіць сенажаць.

Нарыс Сташэўскага досыць шырока ахапіў жыцьцё Асінстану. Праца, адпачынак з ягонымі сьпевамі—частушкамі—усё гэта знайшло сваё адлюстраваньне ў нарысе. Але ўсё-ж трэба адзначыць, як значную хібу нарысу тое, што ён недастаткова мастацкі раскрывае вобразы ўдарнікаў-рабочых. Пералічэньне заслуг і ўзнагарод рабочых-ударнікаў, якое робіць аўтар, яшчэ не азначае мастацкага вобраза з усімі яго супярэчнасьцямі. Мастацкі апраўданага вобраза ўдарніка Сташэўскі ня даў. У гэтым і заключаецца галоўная загана нарысу „Гаворыць Асінстан".

На гэтую-ж самую тэму аб будаўніцтве Асінстану маецца кніжка другога аўтара Жука „Турбіны гудуць"—(1931 г.) Цікава параўнаць гэты нарыс з нарысам „Гаворыць Асінстан" Сташэўскага. Калі Сташэўскі апісвае будаўніцтва Асінстану, то перш за ўсё ён бачыць будаўніка. Будаўнік і рыштаваньні будаўніцтва—два вобразы, якія не засланяюць адзін аднаго ў нарысе Сташэўскага. Ня тое мы бачым

у нарысе Жука „Турбіны гудуць". Пасьля невялічкага „лірычнага" ўступу аб прыродзе Беларусі Жук адразу пачынае тлумачыць чытачу, што такое электрычнасьць. Гэтыя тлумачэньні занялі другі і трэці разьдзелы нарысу. Тэхніцызм—вось што адразу кідаецца ў вочы ў нарысе „Турбіны гудуць". Побач з аўтарытэтнымі заўвагамі наконт прыроды электрычнасьці вы ўбачыце шэраг цытат з пастаноў ураду, розных пратаколаў „вялікіх і маленькіх" паседжаньняў. Гэтыя цытаты займаюць амаль палову нарысу. І калі чытач захоча ўсё-ж даведацца дзе-ж такі „гудуць турбіны", дык мабыць гэты „паэтычны гуд" яму прыдзецца шукаць, альбо ў лічбах нарысу, альбо ў аўтарскай галаве.

Паказ герояў будаўніцтва тож зроблены аўтарам надзвычай арыгінальна. Ён, мабыць, думаў, што паказ героя сацыялістычнага будаўніцтва заключаецца ў пералічэньні прозьвішчаў ударнікаў. І вось на старонках 20 і 21 ідзе вялічэзны сьпіс ударнікаў. Ва ўсім нарысе, а нарыс даволі вялікі (на 30 старонках), няма ніводнага мастацкі раскрытага вобразу. Усё гэта гаворыць аб тым, што нарыс зроблены насьпех, што аўтар, відаць, ня хоча лічыцца з сваім чытачом і падае яму схэматычную пісаніну.

Разгледжаныя намі два нарысы ўсё-ж не даюць нам магчымасьці ўявіць, як-жа паказаны герой пяцігодкі—рабочы-ўдарнік? Трэба сказаць, што на сёньняшні дзень ніводнай мастацкай кніжкі аб героях пяцігодкі ў беларускай літаратуры няма. Гэта зьяўляецца яшчэ адным новым паказчыкам таго, што БелАПП, у прыватнасьці сэкцыя нарысу, яшчэ не дастаткова зьвярнула ўвагу на адзін з важнейшых лёзунгаў пралетарскай літаратуры—„краіна павінна ведаць сваіх герояў!" Толькі дзе-ні-дзе ў газэтах і часопісях зьяўляюцца невялічкія нарысы аб героях пяцігодкі. Тут я маю на ўвазе нарысы, зьмешчаныя ў газэце „Зьвязда" за 1931 год: „Людзі высокіх тэмпаў"—Зарэчнага (за 30 чэрвеня), „Гудуць рэйкі"—Зьм. Паваротнага (за 7 лістапада), „Пятро Савіч"—Зарэчнага і Ліхадзіеўскага (за 29 кастрычніка) і інш.

Нарыс „Гудуць рэйкі" Паваротнага паказвае нам ударнікаў Гомельскага вагонабудаўнічага і паравозарамонтнага заводу імя Ланцуцкага. Дырэктар Хімакоў—адзін з ударнікаў заводу, якога „рабочыя хадайнічаюць узнагародзіць ордэнам Леніна". Вось яго характарыстыка, якую дае аўтар у сваім нарысе: „Ён настойлівы і дуж, як кляса яго. Іван Арцёмавіч (Хімакоў) ва ўсім любіць парадак, сыстэму і бальшавіцкая крэпнасьць пранізвае ўсю справу, усе словы дырэктара". Рэвалюцыйны барацьбіт на франтох грамадзянскай вайны—у мінулым, а зараз Хімакоў той-жа рэвалюцыйны барацьбіт—на гаспадарчым фронце.

Другі лепшы ўдарнік—рацыяналізатар і вынаходца Казлоўскі.

Даючы кароценькія характарыстыкі герояў пяцігодкі, герояў сацыялістычнага будаўніцтва, аўтар піша: „маса, рабочы калектыў, высоўваюць сваіх лепшых ударнікаў, сваіх сапраўдных герояў бальшавіцкай барацьбы за пяцігодку да вышэйшай пралетарскай узнагароды".

Трэба сказаць, што з прычыны сваёй надзвычайнай сьцісласьці нарыс носіць схэматычны характар.

Другі нарыс—„Пятро Савіч"—двух аўтараў Зарэчнага і Ліхадзіеўскага надзвычай добра апрацаваны. Ён захапляе чытача, эмацыянальна заражае яго пачуцьці, арганізуе волю на барацьбу за перамогу сацыялізму. Нарыс паказвае нам гераічны ўчынак Пятра Савіча, радавога рабочага электрастанцыі Бабруйскага камбінату.

Наша сацыялістычнае будаўніцтва ня можа спыняцца ні на адну хвіліну. Кожная ўпушчаная хвіліна ёсьць адставаньне. Мы ня маем

права адставаць. Мы навінны расьці. Але аднойчы на дрэваапрацоўчым камбінаце (Бабруйск) у напружанай працы здарыўся перапынак. Трэснула цыркуляцыйная труба і прыпынілася падача вады, той вады, што неабходна заводу. І вось Пятро Савіч, ахвяруючы жыцьцём, палез у трубу, каб знайсьці шчыліну, каб паказаць мейсца рамонту і тым самым скараціць прастой. Шчыліна была ім знойдзена і трубу хутка адрамантавалі. Завод пазьбег вялікага прастою, вялікіх страт, дзякуючы гераічнаму ўчынку Пятра Савіча.

„Камуніст Пятро Савіч сваім гераічным учынкам папярэдзіў прастой, які пагражаў камбінату у выніку аварыі ў цыркуляцыйнай трубе. Пятро Савіч лепшы ўдарнік электрастанцыі, актыўны рабкор зьяўляецца прыкладам бальшавіцкага энтузыязму на франтох сацыялістычнай рэканструкцыі. Рабочыя высока цэняць свайго героя і будуць раўняцца па ім у сваёй штодзённай рабоце і барацьбе".

Да недахопаў гэтага нарысу трэба аднесьці тое, што аўтары слаба паказалі тое асяродзьдзе, у якім выхоўваўся Пятро Савіч, не змаглі паказаць гераічны ўчынак Пятра Савіча, як вынік высокай клясавай самасьвядомасьці.

І нарэшце, нарыс Скрыгана„ Права на энтузыязм" зьмешчаны ў №11 часопісу „Маладняк" за 1931 г. Гэты нарыс зьяўляецца вынікам паўтарамесячнай працы пісьменьніка на Гомсельмашы. За невялікі час свайго прабываньня пісьменьнік вывучыў завод, яго хваравітыя і дадатныя бакі, ягоных энтузыястых—ударнікаў працы ды ілжэўдарнікаў заводу.

Галоўны герой гэтага нарысу—Белабжэцкі. Майстра цэху—энтузыяст сацыялістычнай працы, Белабжэцкі лепшы ўдарнік заводу. Ён увесь час на заводзе, у цаху, вечна поркаецца за працай, пільна сочыць за выкананьнем пляну.

„Яго можна ўявіць у рабочым зашмальцаваным гарнітуры, у скураной тужурцы, у плашчы, ці ў палітоне—але заўсёды гэта будзе высокі, танклявы чалавек з вострымі плячыма, з худым тварам і крыху прыгорблены. І ён заўсёды будзе ў цаху, у людзях, на патоку зборкі сіласарэзак, зьяўляючыся то тут, то там, пільна прыслухоўваючыся да пульсу патокі; вачыма, слыхам, чуцьцём правяраючы цэх". Вось кароценькі малюнак героя. Напружана змагаецца Белабжэцкі з усімі цяжкасьцямі і хібамі ў працы. Ён хварэе душой за завод. Уся ягоная „вялікая ўпартасьць", „вялікая воля і кемкасьць" адданы аднаму—сацыялістычнаму будаўніцтву, выкананьню прамфінпляну свайго заводу. Дзякуючы ягонаму арганізацыйнаму кіраўніцтву, упартай волі цэх пачынае перавыконваць норму.

Барацьба за прамфінплян—чырвонай істужкай праходзіць праз увесь нарыс. Супярэчнасьці, цяжкасьці барацьбы таксама паказаны ў нарысе. Бюракрат Санаторскі—загадчык цэху,—ня хоча цікавіцца працай цэху. У яго заўсёды ёсьць аб'ектыўныя прычыны. Гэта ён енчыць: „я не магу быць у цаху... фізычна не магу". Вось твар апартуністага, які ня хоча ісьці разам з сацыялістычным будаўніцтвам. З такімі бюракратамі, апартуністамі Белабжэцкі вядзе рашучую барацьбу. Парт'ячэйка заводу падтрымоўвае рацыяналізатарскія прапановы Белабжэцкага, у выніку чаго завод атрымоўвае вялікую эканомію.

Нарыс „Права на энтузыязм" зьяўляецца крокам наперад у ідэалёгічным разьвіцьці аўтара. Гэты нарыс паказвае, што хісткая ідэалёгія сераднячка-селяніна першых твораў Скрыгана пачынае перамагацца.

Але трэба адзначыць, што нарыс „Права на энтузыязм" хварэе амаль агульнай хваробай нашых маладых пісьменьнікаў—схэматызмам.

* * *

Разгортваньне працы па закліку рабочых-ударнікаў у літаратуру зьяўляецца вялічэзнай справай, справай ня толькі літаратурнага, але і палітычнага значэньня. Ператварэньне закліку рабочых-ударнікаў у літаратуру ў шырэйшы масавы рух—асноўная задача ўсёй пралетарскай літаратуры, бо „літаратурная справа павінна стаць часткай агульна-пралетарскай справы". (Ленін).

Масавы рух рабочых-ударнікаў у літаратуру, які мы на сёньняшні дзень ужо маем, зьяўляецца паказьнікам таго, што пралетарская літаратура, а разам з тым і пралетарская культура стала на новы вышэйшы этап у сваім разьвіцьці.

Рабочыя-ўдарнікі, перадавікі рабочага калектыву, змагары за выкананьне прамфінпляну, павінны выступіць і на новым надзвычайна важным вучастку ідэалёгічнай барацьбы—літаратурным фронце.

Заклік рабочых-ударнікаў у літаратуру ставіць сабе задачай, па першае—ліквідаваць творчасьцю саміх ударнікаў адставаньне літаратуры ад патрабаваньняў нашай вялікай эпохі, па-другое—рабочы-ўдарнік, прышоўшы ў літаратуру перадае свой творчы энтузыязм, сваю практыку ударніцтва, свае мэтады барацьбы на заводах і фабрыках старэйшым таварышом пісьменьнікам.

Выходзячы з гэтага, мы павінны падыходзіць да ацэнкі тэй мастацкай прадукцыі, якую на сёньняшні дзень ужо далі рабочыя-ўдарнікі, закліканыя ў літаратуру.

Першая кніжка рабочых-ударнікаў Малашэнка і Лейбман „Новы цэх варашылаўцаў" зьяўляецца невялічкім нарысам. Гэты нарыс, як першая спроба, мае шмат хібаў. Ня трэба займацца перахвальваньнем гэтых першых спроб. А такія настроі (у нас усё добра) у беларускай крытычнай літаратуры мы мелі. Успомніць хаця-бы артыкул Кучара „Рабочы ўдарнік ідзе ў літаратуру", зьмешчаны ў газэце „Зьвязда" (№174 за 30 чэрвеня г. г.), дзе Кучар у захапленьні піша, што вось зьявілася першая ластаўка, кніжка рабочых, а як добра напісана (!). Нават такімі словамі, як „рыжы" і інш. карыстаюцца рабочыя-ўдарнікі. А наконт хібаў і памылак Кучар успамінае ў двух радках.

Такая крытыка ня можа дапамагчы рабочаму-ўдарніку. Яна дэзарганізуе яго, выбівае яго з каляіны і дазваляе яму супакойвацца на сваіх далёка ня цьвёрдых творчых пазыцыях. Паказаць памылкі, паказаць, як іх выправіць, дапамагчы іх выпраўленьню—вось чаго патрабуюць ад марксысцка-ленінскай крытыкі рабочыя-ўдарнікі, прышоўшыя ў літаратуру. Менавіта таму ў сваім разглядзе нарысу „Новы цэх варашылаўцаў", мы застановімся на ягоных як дадатных, так і адмоўных бакох.

Малашэнка і Лейбман узялі для свайго нарысу надзвычайна актуальную тэму вытворчага жыцьця: змаганьне за высока-якасную працу ў іх цэхаў прадпрыемства, у тым ліку і сталоўкі. Гэта іх дадатны бок. Але вось як яны разьвязваюць гэтую тэму. Пачынаюць аўтары так: „У разьдзеле пад назвай „Старая сталоўка" мы хочам паказаць становішча нашай сталоўкі да пачатку 1931 г." І вось пачынаецца паказ: „Да гэтага часу сталоўка была паза ўвагаю ўсяе грамадзкасьці заводу. Апроч загадчыка сталоўкі ніхто нават і ня цікавіўся... і г. д.". Гэта, бязумоўна, не паказ, а слабы расказ пра становішча сталоўкі. Толькі ў разьдзеле „Тормаз выкананьня прамфінпляну" даецца некалькі жывых малюнкаў натуралістычнага характару.

Стыхійнасьць, а не барацьбу за новую сталоўку паказалі аўтары. У разьдзеле „Вынікі рэарганізацыі" аўтары даюць слабую зарадку чытачу на барацьбу за якасьць

грамадзкага харчаваньня. Між тым, як раз гэтым разьдзелам нарыс павінен быў так эмацыянальна ўзьдзейнічаць на чытача, каб ён на сваім прадпрыемстве таксама ўключыўся ў бой за падвышэньне якасьці працы сталоўкі, за паляпшэньне якасьці грамадзкага харчаваньня, за культурнае харчаваньне. Акрамя таго аўтары ў паказе сталоўкі свайго заводу не маглі ўзьняцца вышэй гэтага заводу, бо атрымоўваецца ўражаньне цэхаўшчыны, адмежаванасьці і нежаданьня выйсьці з рамак свайго заводу ў паказе слабых бакоў працы сталоўкі.

Гэтых хібаў у значнай ступені можна было-б пазьбегчы, калі-б аўтары больш папрацавалі над сваей тэмай. Напрыклад, замест расказваньня яны маглі-б мастацкі паказаць дрэннае становішча раней-шага харчаваньня на заводзе і тым самым павысіць мастацкую вартасьць свайго нарысу і актыўнае ўзьдзейнічаньне нарысу на чытача. Больш удумныя адносіны да выкарыстоўваньня натуралістычных малюнкаў жыцьця—таксама пазбавілі-б аўтараў ад цэлага шэрагу іншых памылак. Цікава адзначыць і яшчэ адзін момант. У прадмове да нарысу аўтары пішуць: „Задача нашае брашуркі—падзяліцца вопытам барацьбы на фронце грамадзкага харчаваньня якое дапамагае выкананьню прамфінпляну". Трэба адзначыць, што аўтары якраз тут забываюць аб актыўнай ролі сваёй брашуркі—мастацкага нарысу. Сказаць, што „задача нашай брашуркі падзяліцца вопытам"—гэта яшчэ мала. Трэба ня толькі „падзяліцца вопытам". Але свой вопыт перадаваць другім, быць ініцыятарам новага, здаровага, што можа павысіць выкананьне прамфінпляну. Задача брашуркі павінна заключацца ў тым, каб, „падзяляючыся вопытам", арганізоўваць чытача на барацьбу з недахопамі грамадзкага харчаваньня.

Нарыс „Новы цэх варашылаўцаў" з гэтай задачай справіўся слаба.

Задача БелАППУ і ўсіх пісьменнікаў дапамагчы рабочым ударнікам у іхнай вытворчай рабоце.

Другая кніжка рабочых-ударнікаў, пад назвай „Ударнікі," зьяўляецца зборнікам, як розных аўтараў, так і розных мастацкіх жанраў. Вершы, апавяданьні, часткова нарысы—вось тыя жанры, у якіх выступілі аўтары данага зборніку. Трэба адзначыць, што якасьць гэтага зборніку ў асноўным стаіць значна вышэй за першую спробу Малашэнкі і Лейбмана, але разгляд усіх твораў гэтага зборніку не ўваходзіць у задачу данага артыкулу. Трэба адзначыць толькі той рост, які мы маем у галіне нарысу. Так нарысы Шаўцова—„Чырвонасьцяжны", Камянецкага—„Нараджэньне", Гольмана—„Рост" і інш. сьведчаць аб значнай творчай рабоце саміх ударнікаў над сабою. Гэтыя нарысы зьўляюцца паказчыкам росту нашых маладых рабочых ударнікаў, прышоўшых у літаратуру.

* * *

Нарысаў з тэматыкай аб калгасным будаўніцтве, аб сацыялістычнай пераробцы вёскі—у беларускай літаратуры маецца значна больш, чым з тэматыкай аб індустрыялізацыі нашай краіны. Гэтыя нарысы бязумоўна зьяўляюцца часткай той пралетарска-калгаснай літаратуры, якая пачынае разгортвацца ў нас у апошні час.

Разгледзім нарысы Шкадарэвіча, зьмешчаныя ў двух зборніках: „На перадавых пазыцыях"—1931 г. „На абуджаных прасторах"—1931 г.

Нарыс „На перадавых пазыцыях" зьяўляецца даволі разгорнутым паказам жыцьця і быту чырвонасьцяжнай камуны „Праца" Каралінскага раёну. Расказваючы пра жыцьцё і быт калгасу „Праца", аўтар паказвае і жорсткую клясавую барацьбу, якая адбываецца на вёсцы і

якая так абвойстрана зараз у зьвязку з калектывізацыяй.

Супраціўленьне кулацтва калектывізацыі і нават актыўнае выступленьне супроць ужо арганізаваных калгасаў, а часамі падтачваньне калгасу знутры пралезшымі туды падкулачнікамі—вось у якім клясавым пераплёце знаходзіцца будаўніцтва калгасаў. Гэтую жорсткую клясавую барацьбу вёскі і паказвае нам Шкадарэвіч у нарысе „На перадавых пазыцыях".

Але расказваючы пра жорсткую клясавую барацьбу на вёсцы, пра кулацкую эксплёатацыю батрака, аўтар усё-ж ня здолеў паказаць сапраўднага сялянскага пралетарыя-батрака. Батракі—героі ягонага нарысу—на кожнай старонцы успамі наючы мінулае, амаль усе плачуць ад цяжару эксплёатацыі: Так, напрыклад, на стар.12 — 13 Брэгман расказвае: „Часта даводзілася плакаць ад такога жыцьця".

„Пагаруеш, паплачаш разам з сынам, а пасьля, сьціснуўшы сэрца, возьмеш сына за руку і назад да кулака".

Працэсу нарастаньня пратэсту, змаганьня селяніна-батрака супроць сацыяльнай няроўнасьці аўтар не паказвае, што, бязумоўна, зьяўляецца вялікай хібай і памылкай нарысу. Акрамя таго аўтар не пазьбег і другіх буйных памылак у характарыстыцы жыцьця камунараў. Камунары, са слоў аўтара, толькі тым і займаюцца, што самі сабою выхваляюцца. Так, напрыклад, на стар 29: „Здольны ў нас народ камунары", на стар. 33: „Камунары добра ведаюць, што трэба рабіць для падвышэньня ўраджайнасьці", і г. д. Такога бахвальства ў сапраўднай рэчаіснасьці ні ў водным калгасе не пачуеш.

Нарыс занадта перагружаны лічбамі, што якраз не падвышае, а памяншае мастацкую вартасьць яго (гл. стар. 35, 36, 37, 68 і інш.)

Вось тыя хібы і памылкі творчага характару, якія аўтар павінен далей у сваёй творчай працы выправіць.

Другая кніжка нарысаў Шкадарэвіча „На абуджаных прасторах" у значнай ступені паўтарае памылкі першай кніжкі нарысаў. Злоўжываньне лічбамі мы бачым і ў гэтых нарысах. Амаль усе нарысы носяць больш статычны, апісальны характар чым дынамічны, што ідзе якраз у разрэз з нашай рэчаіснасьцю, з тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва, як на вёсцы, так і ў горадзе. Аднак, ня гледзячы на слабое мастацкае афармленьне, нарысы ўсё-ж палітычна завостраныя, ідэёва насычаныя робяць уплыў на чытача, арганізуючы яго волю і думкі на сацыялістычную перабудову вёскі.

Кніжка нарысаў Паскрэбкі „Трактар будзіць раньне" складаецца з двух нарысаў. Першы нарыс „Праўда аб камунах" зьяўляецца выяўленьнем тых уражаньняў і думак, якія ў аўтара склаліся ад назіраньня за працай некалькіх калгасаў. Другі нарыс „Камуна імя Караля Лібкнэхта" зьяўляецца вынікам агляду працы калгасу аўтарам. Так ён піша ў нарысе: „Едзем трое з Мазыршчыны ў Магілёўшчыну. Едзем каб пазнаёміцца з аднэй цікавай камунаю, а потым досьледы сваёй працы перанесьці ў маладыя, у нядаўна арганізаваныя сельскагаспадарчыя арцелі". Напісаная вельмі простай мовай, кніжка нарысаў Паскрэбкі якраз і перадае чытачу „Досьледы працы". Паказваючы адначасова як дадатныя, так і адмоўныя бакі ў працы, гэты нарыс тым самым дапамагае „маладым, нядаўна арганізаваным сельскагаспадарчым арцелям" і калгаснікам разабрацца ў тэй новай калектыўнай гаспадарцы, дзе яны пачынаюць працаваць.

Кніжка нарысаў пад рэдакцыяй Малевіча „Загулі трактары" зьяўляецца зборнікам нарысаў розных аўтараў. Зьмест гэтых нарысаў

адзін:—паказ сацыялістычнай перабудовы вёскі на базе індустрыялізацыі краіны.

Падыход да гэтай тэмы ў кожнага аўтара свой, асабісты. Асабліва цікавыя нарысы гэтага зборніку: Бандарынай і Малевіча. Нарыс Бандарынай простай і прыгожай мовай паказвае нам зьмену сродкаў вытворчасьці сялянскай гаспадаркі і разам з тым зьмену ўзаемаадносін калгасьнікаў, учорашніх аднаасобнікаў.

Нарысы Цім. Зарэчнага, сабраныя ў зборніку „Узбунтаваная зямля", характэрны, з аднаго боку—даволі высокай мастацкай апрацоўкай канкрэтнага матар'ялу нашай рэчаіснасьці, а з другога—слабай палітычнай завостранасьцю. Не адрываючы пытаньняў мастацтва ад пытаньняў палітыкі, трэба сказаць, што мастацкасьць нарысаў Зарэчнага, дзякуючы недастатковай палітычнай завостранасьці, значна зьніжаецца. Лірычныя месцы нарысу часта пераходзяць у сантымэнтальныя разважаньні аб агульначалавечай прыродзе людзей. Вось вам характарыстыка, якую дае Зарэчны ў нарысе „Узбунтаваная зямля" Соскіну—камуністаму, барацьбіту на фронце сацыялістычнай перабудовы вёскі: „Сын гораду, але вёску ведае дасканала—на партыйнай рабоце знаходзіцца каля пяці год. Соскін уладае некалькімі рысамі чалавечага характару, якія амаль што немагчыма перадаць на паперы" (стар. 7). У другім месцы Зарэчны раскрывае, што ён разумее пад чалавечым характарам: „Прастата, находлівасьць і шчырасьць падкупляюць павагу да героя калектывізацыі. Гэтыя рысы дапамагаюць Соскіну арганізоўваць масы і кіраваць імі" (стар. 13). Тут мы яскрава бачым, як клясавая самасьвядомасьць, бальшавіцкае разуменьне канкрэтнай рэчаіснасьці падмяняюцца Зарэчным „прастатой і шчырасьцю", якія падкупляюць павагу да героя калектывізацыі. Ня кожны „просты і шчыры" чалавек бывае героем калектывізацыі.

Акрамя таго, у Зарэчнага не заўсёды бываюць выразныя і акрэсьленыя адносіны да сваіх герояў. Недастатковая клясавая расшыфроўка тых ці іншых учынкаў сялян. Так напрыклад:

„Не пасьпелі зайсьці ў хату да члена сельсавету, як пачалі выходзіцца сяляне.

— У камуну прыехалі зганяць,— чуем мы шэпат.

— Што-ж, няхай шэпчуцца, усюды так" (стар. 8).

„Што-ж, няхай шэпчуцца", нам усё ніпачом. І хто гэта шэпчацца, і чаму няважна, бо гэта „усюды так".

Аўтар бывае часамі сам на месцы гэтых недаверлівых сялян Так, калі Соскін у селяніна-калгасьніка спытаў: „Як жывецца?"

— Жывем, слава богу, добра,— адказаў селянін".

Тут аўтар сам адзначае—„прызнацца, я не чакаў такога адказу" (стар.17). Што-ж, нічога ня зробіш калі не чакаў, але вось рабочая кляса, партыя чакала гэтага адказу, яна яго пачула і ўбачыла.

Цікавы па свайму замыслу нарыс „Маркава трагікамэдыя". Гэты нарыс вельмі ўдала перадае кансэрватызм, руціну, якая зьяўляецца тормазам сацыялістычнай перабудовы вёскі.

Нарыс „Узьнятая цаліна" значна вышэй па сваёй палітычнай завостранасьці. У гэтым нарысе даволі ўдала паказаны цяжкасьці першых крокаў камуны і пераможнае будаўніцтва.

Зборнік нарысаў Цім. Зарэчнага „Узбунтаваная зямля" цалкам усё-ж каштоўны, ня гледзячы на цэлы шэраг памылак творчага характару.

І нарэшце, зборнік нарысаў „Шугае сонца" Скрыгана — (1930 г.). Аб гэтым зборніку ўжо шмат пісалася ў нашых часопісях. Не паўтараючы ўжо сказанага і напісанага аб гэтым зборніку нарысаў, мы толькі параўнаем гэтыя нарысы з на-

рысамі Зарэчнага „Узбунтаваная зямля“. Трэба адзначыць, што гэты зборнік Скрыгана стаіць значна ніжэй. Перш ад усяго галоўнымі аб'ектамі для твораў данага зборніку зьяўляецца ў пераважнасьці серадняк, з яго дваістасьцю, з яго душой уласьніка і працоўнага. І зборнік амаль ва ўсіх нарысах адлюстроўвае настроі серадняка-селяніна. Характарным у гэтых адносінах зьяўляецца нарыс „На дарозе“. Нарыс носіць аўтабіяграфічны характар. Тым цікавей. Гераіню—сваю сястру, пісьменьнік так характарызуе: „Яна зусім дваістая. Яна зусім на раздарожжы“. І калі перад ёй паўстала пытаньне: ісьці ў калгас ці не—яна не дае цьвёрдага, станоўчага адказу. Няма гэтага цьвёрдага адказу і ў пісьменьніка. Усе нарысы гэтага зборніку сьведчаць аб тым, што аўтар сам у сваім разьвіцьці яшчэ не перамог псыхалёгіі селяніна-серадняка з ягонымі хістаньнямі, з ягонай дваістасьцю, ня стаў цалкам на рэйкі пралетарскага асмысьленьня рэчаіснасьці.

* * *

Разгледжаныя нарысы ня вычэрпваюць усёй мастацкай прадукцыі, якая маецца на сёньняшні дзень. Гэты разгляд нарысаў зьяўляецца спробай агледзець пройдзены шлях, прагледзець тыя хібы і памылкі, якія ў далейшым неабходна выправіць тым, хто хоча ісьці ў ногу з тэмпамі нашае вялікае сацыялістычнае эпохі. Гэтага вымагае ад нас лёзунг—за вялікае бальшавіцкае мастацтва.

ТЭАТР

В. Вольскі

Асноўныя этапы разьвіцьця дзяржаўных тэатраў БССР[1])

За 11 год існаваньня Савецкай Беларусі рабочая кляса БССР дасягнула пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі вялізных посьпехаў у справе будаўніцтва беларускай культуры, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай паводле зьместу. Адным з канкрэтных прыкладаў гэтых дасягненьняў зьяўляецца буйнае пашырэньне тэатральнага будаўніцтва, бязупынны мастацка-палітычны рост і творчае ўдасканаленьне існуючых дзяржаўных тэатраў.

Трэба падкрэсьліць, што беларускі тэатр, як самастойная культурна-палітычная зьява, ёсьць непасрэдны вынік Кастрычніцкай рэвалюцыі, якой ён абавязаны сваім існаваньнем. Да Кастрычніцкай рэволюцыі беларускага тэатру ня было. Русіфікатарская палітыка царскага рэжыму, гвалтоўна ўціскаючы ўсё самастойныя праявы культур іншых нацыянальнасьцяй, не давала магчымасьці існаваць і беларускаму тэатру. Нельга лічыць беларускім тэатрам асобныя спробы дробнабуржуазных груп нацыяналістычнай інтэлігенцыі ствараць драматычныя гурткі аматараў, якія ўзьнікалі час ад часу на тэрыторыі Беларусі, у правінцыяльных гарадох і мястэчках і ставілі ў напоўлегальных умовах мяшчанскія паказы на беларускай мове. Толькі Кастрычніцкая рэвалюцыя, якая стварыла наогул выключна спрыяючыя ўмовы для неабмежаванага росту і буйнага росквіту нацыянальных культур прыгнечаных раней народаў, выклікала да жыцьця і беларускі тэатр, які зьяўляецца, такім чынам, сапраўдным дзіцём Кастрычніка.

У 1920 г., адразу пасьля вызваленьня Беларусі ад белапольскай акупацыі, савецкім урадам быў створаны ў Менску першы беларускі дзяржаўны тэатр. Праз год пасьля гэтага—у 1921 г., улічваючы неабходнасьць падрыхтоўкі маладых тэхнічна-кваліфікаваных кадраў для беларускай сцэны, а таксама ў зьвязку з неабходнасьцю стварыць дзяржаўны яўрэйскі тэатр, замест дробнабуржуазнага мяшчанскага, які да таго часу існаваў на Беларусі ў выглядзе прыватных халтурна--вандроўных груп, Наркамасьветы БССР стварыў у Маскве—у мэтах выкарыстоўваньня культурнай спадчыны старых расійскіх тэатраў—Беларускі Дзяржаўны Інстытут сцэнічнага мастацтва

[1]) Выпраўленая для друку стэнаграма дакладу на 1-ай Ўсебеларускай нарадзе па мастацтву пры ЦК КП(б)Б, 9 сьнежня 1931 г.

з 2 студыямі—беларускай і яўрэйскай. Інстытут гэты існаваў да 1926 г., працуючы пад пераважным кіраўніцтвам рэжысэраў МХАТ'у.

У 1926 г., пасьля пяцігадовай падрыхтоўкі акторскага складу, студыі інстытуту былі разгорнуты ў самастойныя тэатры, беларуская—у Беларускі другі дзяржаўны тэатр (БДТ 2), а яўрэйская—ў Яўрэйскі дзяржаўны тэатр(БДЯТ).

За астатнія гады, акрамя гэтых 3 асноўных тэатраў—БДТ1, БДТ2 і ЯДТ, мы маем яшчэ і БДТ3, ператвораны нядаўна з Беларускага дзяржаўнага вандроўнага тэатру, яўрэйскі і польскі вандроўныя тэатры, рабочы тэатр ЦСПСБ, дзяржаўную студыю опэры і балета, ТРАМ"ы на беларускай і яўрэйскай мовах.

Зусім зразумела, што стварэньне і разьвіцьцё гэтых тэатраў, конкрэтны вынік ажыцьцяўленьня ленінскай нацыянальнай палітыкі, разгортвалася далёка ня ціха, мірна, лёгка і павольна. Наадварот, посьпехі тэатральнага будаўніцтва дасягнуты пралетарыятам БССР у бязьлітаснай клясавай барацьбе, у штодзённым перамаганьні ўсіх праяў супраціўленьня клясавага ворага—расійскага вялікадзяржаўнага шавінізму, беларускага контррэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму і іншых шавінізмаў розных колераў і адцэньняў.

Першая рэальная небясьпека, якую сустрэў малады беларускі дзяржаўны тэатр у першы пэрыод свайго існаваньня, быў расійскі вялікадзяржаўны шавінізм. Стварэньне і разьвіцьцё беларускіх дзяржаўных тэатраў у першую чаргу ішло па лініі перамаганьня вялікадзяржаўнага шавінізму, які праяўляў сябе ў недаацэнцы нацыянальна-культурнага будаўніцтва наогул і ў адмаўленьні магчымасьцяй творчага існаваньня беларускага тэатру ў прыватнасьці. Акрамя гэтага, першы пэрыод існаваньня нашых тэатраў, які, прыблізна, акрэсьліваецца для БДТІ тэрмінам з 1920 па 1927 г., а для БДТ2 з 1921 па 1928 г.—характэрны мацнейшымі ідэялёгічнымі ўплывамі на тэатры з боку беларускіх нацыяналдэмакратаў. У сваёй шкодніцкай дзейнасьці, накіраванай на захоп у свае рукі манаполіі на культурнае будаўніцтва, у мэтах накіраваньня яго на шлях стварэньня беларускай буржуазнай культуры—у процівагу пралетарскай, нацдэмам удалося на пэўны час захапіць пад свае ўплывы і беларускія дзяржаўныя тэатры.

Нацдэмы імкнуліся адарваць беларускі тэатр ад агульных працэсаў культурнага будаўніцтва Савецкага саюзу. Яны спрабавалі захаваць яго ад рэвалюцыйнага ўплыву інш. братніх савецкіх рэспублік. Яны імкнуліся зрабіць з яго плацдарм для арганізаванага прасоўваньня сасцэны буржуазных, кулацкіх, нацыяналістычных уплываў на гледача, арыентуючы беларускі тэатр у пытаньнях творча-мастацкага разьвіцьця на буржуазны Захад. Адным з асноўных лёзунгаў нацдэмаў у галіне тэатру, быў лёзунг „самабытнасьці"—адмаўленьня ролі Кастрычніцкай рэволюцыі ў справе стварэньня беларускага тэатру. Нацдэмы даводзілі, што беларускі тэатр—самабытная і самастойная культурнагістарычная зьява, цалкам незалежная ад рэвалюцыйных падзей і працэсаў, што карэньні беларускага тэатру хаваюцца ў сівой мінуўшчыне, у сярэднявеччы, што беларускі тэатр нічым ня зьвязаны з культурным будаўніцтвам усяго Савецкага саюзу.

Паводле нацдэмаўскіх тэорыій, сучасныя нашы беларускія дзяржаўныя тэатры абавязаны сваім ростам ня творчаму і культурнаму ўздыму беларускіх працоўных мас ва ўмовах савецкага ладу, а саматужным спробам асобных прадстаўнікоў нацдэмакратызму, у прыватнасьці Фр. Алехновіча, Ждановіча і інш. „адрадзіць" беларускі тэатр, які нібыта існуе незалежна ад Кастрычніцкай рэвалюцыі і зьяўляецца

пераможным вынікам культурнай дзейнасьці беларускіх нацдэмаў яшчэ ў дарэвалюцыйныя часы.

Пасьлядоўнае сьцьвярджэньне гэтай „тэорыі“ можна прасачыць на канкрэтных прыкладах.

Вось вытрымка з артыкулу аднаго з найбольш характэрных зубраў бэларускага нацдэмакратызму ў тэатры, былога дырэктара БДТ2—Красінскага. Ён у свой час у газэце „Заря Запада (№ 268, за 1926 г.) пісаў у зьвязку з адчыненьнем БДТ2 наступнае: „1-ы беларускі паказ ў Вільні(люты 1910г.),адчыненьне другога беларускага тэатру ў Віцебску (лістапад 1926 г.)—вось шлях адраджэньня і разьвіцьця беларускага тэатру А паміж гэтых дат: драматычная грамада Ігната Буйніцкага, беларускія спэктаклі ў Ленінградзе пад кіраўніцтвам Чэслава Радзевіча... „Беларуская хатка“ у Менску, „Першае Т-ва Камэдыі і драмы“, арганізатары Беларускага тэатру пасьля Буйніцкага-Флёрыян Ждановіч і Францышак Алехновіч, самадзейны драмгурток у Горадні, беларускія спэктаклі вучняў Віленскай і Радашкоўскай гімназій, драматычнае таварыства ў Дзьвінску і Люцыне, выступленьне беларускага хору ў дзяржаўным тэатры ў Рызе, і „Беларуская драматычная майстроўня“ у Вільні, і ў рэшце росквіт першага тэатру...“

Як бачыце—адзіны суцэльны ланцуг, ад першага паказу нейкіх драматычных аматарскіх гурткоў у Вільні ў 1910 г. і да першага паказу БДТ2 у 1926 г. у Віцебску. А пра Кастрычніцкую рэвалюцыю, пра значэньне Савецкай улады ў справе стварэньня беларускага тэатру ніводнага гуку. Гэта надзвычайна характэрна для нацдэмаў. Выступленьне нейкага прыватнага беларускага хору ў Рызе, сталіцы буржуазнай Латвіі, нейкія вучнёўскія паказы гімназістаў у Вільні і стварэньне савецкага дзяржаўнага беларускага тэатру БДТ2—гэта паводле нацдэмаў аднолькавыя здарэньні роўнацэннага парадку і гатунку, пасьлядоўныя зьвеньні аднаго суцэльнага ланцугу.

Трохі далей той самы Красінскі заяўляе: „..Толькі [1]) сялянскія гушчы заўсёды віталі свой родны тэатр на зразумелай для іх мове, і гэта надавала піянэрам беларускага тэатру і надае цяперашнім яго будаўніком няўтомную энэргію і бадзёрасьць.Шаснаццаць год, толькі шаснаццаць год—адна хвіліна, а сёньня адчыняем Беларускі другі дзяржаўны тэатр“. („Заря Запада“, №268, 21. XI·1926 г.).

У гэтым адрыўку мы маем простае адмаўленьне ролі гораду, рашучае прадастаўленьне манаполіі на беларускую культуру выключна сялянству.

Тут зноў энэргічна падкрэсьлена думка нацдэмаў аб тым, што сапраўднымі арганізатарамі і будаўнікамі беларускага тэатру зьяўляліся і зьяўляюцца, як у дарэвалюцыйны час, гэтак і цяпер толькі яны (нац-дэмакраты), што стварэньне беларускага дзяржаўнага тэатру нэпасрэдны працяг і пасьпяховае завяршэньне іх дарэвалюцыйнай нацыянальна-культурнай работы.

Тэорыя пераемнасьці паміж савецкім беларускім тэатрам і дарэвалюцыйнай культурніцкай дзейнасьцю нацыянал-дэмакратаў яскрава выяўлена і ў артыкуле Радзевіча „Памяці Буйніцкага“, таксама зьмешчаным у газэце „Заря Запада“ і прысьвечаным адчыненьню БДТ2:

„...Сёньня, калі мы ўрачыстасьвяткуем адчыненьне Бел. 2 дзярж. тэатру, нельга прайсьці міма, ня ўспомніўшы таго, хто сваім энтузыязмам стварыў першую беларускую драматычную грамаду—сапраўднага бацькі беларускага тэатру—Ігната Буйніцкага“...

Такім чынам, паводле Радзевіча, сапраўдным бацькам беларускага тэатру зьяўляецца не савецкая ўлада

---

[2]) Падкрэсьлена тут, таксама як і далей, мною. В. В.

а Ігнат Буйніцкі, віленскі шляхціч, аб якім вядома толькі тое, што ён у часе 1910—1912 г. стварыў вандроўную эстрадную трупу, якая выконвала па беларускай правінцыі народныя скокі. Далей Радзевіч у гэтым артыкуле раіць сучаснаму беларускаму тэатру браць заўсёды прыклад з Буйніцкага.

Некаторыя ішлі яшчэ далей. Я хочу прывесьці вам адну вытрымку, якая на сёньняшні дзень гучыць. як анэкдот, але гэты анэкдот меў пэўную палітычную афарбоўку і быў для свайго часу вельмі характэрны. Гэта верш Грамыкі, прысьвячаны адчыненьню БДТ2 у Віцебску. У гэтым вершы Грамыка імкнецца ўстанавіць непасрэдную сувязь паміж БДТ2 і... сьвятой Эуфросіньней Полацкай.

„...І ты такі тэатр-юнак з Наддзьвіньня,
Юнак, ахрышчаны пад гімны барыкад,
Памеркнуў звон княгіні Эўфрасіньні,
ён не зьбярэ, Дзьвіна, у наш час тваіх дзяўчат.
У тэатр сьпяшаюцца сыны твае і дзевы,
каб слова роднае і новае пачуць,
адчуць жыцьця свабодныя павевы,
у вочы юныя, бадзёрыя зірнуць...“

Нац-дэмакраты імкнуліся зьнізіць вартасьць культурнага будаўніцтва БССР. Нават, адчыненьне маладога беларускага дзяржаўнага тэатру, створанага Кастрычнікам, павінна было быць імі ахрышчана, ці асьвянцона імем Эўфрасіньні Полацкай, якую нацдэмы, ці вярней напыянал-рэакцыянэры, узмоцнена прасоўвалі на ганаровы пост беларускай нацыянальнай сьвятой і, у прыватнасьці, патранэсы культурнага будаўніцтва БССР.

Гэта вельмі характэрнае зьявішча... Для таго, каб зрабіць БДТ2 сваім тэатрам, каб надаць яму пэўную марку, адчыненьне яго зьвязваецца з імем Эўфрасіньні Полацкай, тым больш, што тагочасны дырэктар БДТ2 Красінскі, недарма ў свой час выяўлены Александровічам у „Ценях на сонцы“ пад назвай „архімандрыта“, быў якраз адным з прыхільнікаў тэарытычнага абгрунтаваньня і папулярызацыі ў масах культу гэтай сьвятой.

Такім чынам у пытаньнях тэатру мы можам прасачыць агульнасьць ідэялёгічнай канцэпцыі нацыянал-дэмакратаў у адносінах да ўсяго культурнага будаўніцтва БССР. для якой характэрны, напрыклад, спробы давесьці, што створаны савецкай уладай у Менску БДУ—зьяўляецца непасрэдным насьледнікам „слаўных“ традыцый сярэднявечнай езуіцкай калегіі ў Вільні, а беларуская пралетарская літаратура вядзе свой пачатак праз Скарыну ад старадаўніх архірэяў Клімэнта Смаляціча і Міколы Тураўскага.

Калі мы прасочым дзейнасьць беларускіх нацыянал-дэмакратаў па кожнаму з нашых тэатраў паасобку, дык мы ўбачым, што нацдэмаўскія ўплывы паклалі моцны адбітак як на зьмесьце, так і на форме сцэнічнай прадукцыі тэатраў. Возьмем спачатку БДТІ, створаны ў 1920 г. У гэтым тэатры поруч з пастаноўкай больш менш прыймальных для нас у сэнсе мастацка-выхаваўчай работы над акторам п'ес клясычнага рэпэртуару (Мольер) пад уплывам нацыянал-дэмакратаў быў пастаўлены на працягу першага пэрыоду разьвіцьця тэатру, цэлы шэраг шкодных мяшчанскіх п,ес, як беларускіх („Манька“, „Адам і Ева“, „Чорт і баба“, „Птушка шчасьця“—Фр. Алехновіча), так і перакладных („Рысь“ і „Хам“ Ожэшко, „Гусар Саладуха“, „Дамы і гусары“ і інш.), ня маючых ніякай ні мастацкай, ні ідэялёгічнай вартасьці.

На гэтых п'есах ня варта спыняцца. Адна назва, хаця-б, напрыклад, „Дамы і гусары“, сьведчыць аб зьмесьце гэтага правінцыяльна-халтурнага рэпэртуару. Затое трэба спыніцца падрабязьней на п'есах, створаных нацдэмаўскім кіраўніцтвам БДТ1 з пэўнай палітычнай мэтай, на п'есах з яскрава акрэсьленым ідэолёгічным зьместам, на

п'есах, якія сьцьвярджалі на сцэне БДТ1 нацыянал-дэмакратычныя імкненьні.

Возьмем для прыкладу адзін з найбольш папулярных паказаў БДТ1—„Кастусь Каліноўскі" Міровіча — (пастаноўка 1924 г.). Гэта—гістарычная драма з часоў польскага паўстаньня 1863 г. Асноўная мэта пастаноўкі—сьвядомае скажэньне гістарычнай пэрспэктывы шляхам ідэялізацыі дробна-буржуазнага рэвалюцыянэра Кастуся Каліноўскага, шляхам штучнага ўзьвядзеньня яго на п'едэстал усенароднага, агульнанацыянальнага героя.

Яскравым прыкладам нацдэмаўскай дзейнасьці ў БДТ1 зьяўляецца таксама „Над Нёмнам"-п'еса Грамыкі. Пастаноўка яе, прысьвячаная адлюстраваньню жыцьця Заходняй Беларусі, адносіцца да 1927 г. Для гэтай пастаноўкі характэрна нацыянал-дэмакратычная трактоўка сацыяльна- палітычных суадносін у Заходняй Беларусі ва ўмовах польскай акупацыі. Згодна зьместу гэтай пастаноўкі, перадавымі змагарамі за вызваленьне Заходняй Беларусі з-пад нацыянальнага і сацыяльнага ўціску зьяўляюцца прадстаўнікі беларускага заможнага сялянства пад ідэйным і палітычным кіраўніцтвам нацдэмаўскай ідтэлігенцыі.

У п'есе „Вір" (пастаноўка 1926 г.), гістарычнай драме Рамановіча з часоў XIII стагодзьдзя, БДТ1 ідэалізаваў сярэднявечны фэодалізм, шукаючы глебу для сучасных нацыяналістычных настрояў у „слаўным" мінулым „герoічных" продкаў, у гэтым паказе мы мэлі справу са спрбамі сьвядомай, у пэўных палітычных мэтах, фальсіфікацыі гісторыі бо ўсё гістарычнае, што мелася ўгэтай пастаноўцы, былоштучна падроблена, альбо дадзена ў антымаркісысцкім, дэкарацыйна-раманцтычным асьвятленьні.

На прыкладзе гэтых пастановак мы бачым, як беларускі театрпад уплывам нацдэмаў сьцьвярджаў нацыянал-дэмакратычную ідэялёгію, карыстаючыся самым рознастайным матэрыялам: і падзеямі 1863 г. і XIII стагодзьдзем, часамі фэодалізму, і сучаснымі падзеямі ў Заходняй Беларусі. Усе гэтыя тэматычна-рознастайныя пастаноўкі былі накіраваны толькі да аднэй мэты—да прапаганды нацыянал-дэмакратычнага сьветапогляду.

Нарэшце, найбольшя скравым выяўленьнем нацыянал - дэмакратычных ідэй у першым тэатры зьяўляецца пастаноўка п'есы „Тутэйшыя" Янкі Купалы (у 1926 г.). Узяўшы для пастаноўкі п'есу, напісаную аўтарам ў першыя гады рэволюцыі і зусім не характэрную для яго далейшай творчасьці, нацдэмы у БДТ1 выкарысталі яе для стварэньня на сцэне вострага палітычнага пасквілю, накіраванага супроць савецкай улады. Увесь паказ быў наскрозь прасякнуты ваяўнічай ідэялёгіяй беларускага нацыянал-дэмократызму. Беларусь для беларусаў!—вось асноўная ідэя гэтай пастаноўкі адлюстраваўшай у сцэнічных вобразах праграму нацдэмаў.

Усё мастацкае афармленьне паказу было накіравана на тое, каб яскрава выявіць такі прыблізна ідэйны зьмест п'есы: бальшавікі такія самыя ворагі беларусоў, як і палякі; што вы ад нас хочаце. Дайце нам, нацыянал-дэмакратам, рабіць на нашай бацькаўшчыне тое, што мы лічым неабходным; толькі мы, беларуская нацдэмократычная інтэлігенцыя, зьяўляемся ў нашай зямліцы гаспадарамі; для нас і для нашай бацькаўшчыны і вы, бальшавікі, і палякі—аднолькавыя ворагі.

Не магу ўстрымацца, каб ня прывесьці адну сцэну з гэтай пастаноўкі, сцэну, якая на мяне зрабіла асабліва моцнае ўражаньне, і якую я добра памятаю.

Уявіце сабе наступны малюнак: уваход Чырвонай арміі ў Менск. У Менскім гарадзкім скверы, на

лаўцы сядзіць асноўны герой гэтай пастаноўкі—нац. дэмократ—настаўнік Янка Здольнік. Каля яго дэманстрацыя ідзе сустракаць Чырвоную армію. Каго-ж тэатр паказаў у гэтай дэманстрацыі? З каго складалася гэта дэманстрацыя? Наперадзе ідзе вялікарасійскі купчына з Ахотнага раду—чорны картуз, паддзёўка, чырвоная кашуля, смазныя боты, „окладистая борода". За ім ідуць з чырвонымі сьцягамі некалькі анэкдатычных яўрэяў з пэйсамі, у лапсардаках, гандляркі з базару; нарэшце басяк, які ў сцэне перад гэтым украў з кішэні героя кашалёк. „Дэманстрацыя" з гэтых асоб праходзіць міма. Герой застаецца адзін. Абапёрся галавой на рукі. Сум. Ціха падаюць зьверху асеньнія жоўтыя лісьці.

Яшчэ адна сцэнка—захоп у палон чырвонаармейца. Жалкага недарэчнага ёлупа, які ня ўмее трымаць вінтоўку, хутка і лёгка абязбройваюць поп, дама, чыноўнікі і прастытутка, пры маўклівым спачуваньні з боку героя.

Былі і такія пастаноўкі, як „Каваль Ваявода", „На купальле" — прыклады нацыянальна-дэкаратыўнай экзотыкі. Перакладныя пастаноўкі падбіраліся ў той час у БДТІ таксама з ліку мала прыймальных для савецкага тэатру п'ес. Напр., „Эльга", адзін з найбольш няўдалых і раньніх твораў Гауптмана, у трактоўцы з упорам на містыку.

Што датычыцца БДТ2, дык ён апынуўся ў крыху інакшым і прытым больш складаным становішчы. БДТІ 2 таксама падпаў пад моцныя уплывы нацдэмаў, якія здолелі захапіць арганізацыйнае кіраўніцтва студыяй, а потым і тэатрам.

Але, у той-жа час мастацкае кіраўніцтва студыяй і тэатрам знаходзілася ў руках вялікадзяржаўнікаў у асобе рэакцыйных кансэрватыйных колаў МХАТ'у (Смышляеў, Афонін і інш.), якім нацдэмы даверылі мастацкае выхаваньне студыйцаў.

На прыкладзе БДТ 2 можна прасачыць цікавае зьявішча: чулае і братняе яднаньне паміж беларускімі нацдэмамі і расійскімі вялікадзяржаўнікамі, якое ішло па лініі выхаваньня кадраў у ідэялістычным напрамку.

Студыйцам убіваліся ў галаву перакананьні ў тым, што яны прызваны служыць „чыстаму, узвышанаму, надклясаваму" мастацтву, што „палітыка і грамадзкая дзейнасьць не сумяшчальны з мастацтвам", што „камуніст ня можа быць мастаком", што „мастак павінен быць вольным ад палітычных штампаў" (Смышляеў).

На прыкладзе БДТ2 мы бачым, што нацыянал-дэмакраты зусім ня думалі змагацца з вялікадзяржаўнымі шавіністамі. Наадварот—паміж імі наглядалася самая братэрская сувязь.

Нацдэмы, якія ўвесь час так рашуча змагаліся супроць рэвалюцыйных уплываў Масквы пралетарскай, з вялікім задавальненьнем адзначалі і з ахвотай падтрымлівалі сувязі з ідэйнымі рэшткамі вялікадзяржаўнай культуры старой дваранска-купецкай Масквы. Яны нават ганарыліся гэтай сувязьзю, лічачы яе ўплывы зусім карыснымі для маладой беларускай культуры.

Тут пад нацыянальнымі момантамі захоўваюцца моманты клясавыя: нацдэмы бачылі ў вялікадзяржаўніках сваіх клясавых сяброў.

У адпаведнасьці з гэтым рэпэртуар студыі, а потым і БДТ2, складаўся з найбольш няпрыймальных твораў агульна-эўрапейскай драматургіі, распрацаваных буржуазным мэтадам, з ухілам у бок ідэалізму, містыкі і сымболікі, альбо з арыгінальных п'ес з яскрава выяўленай нацдэмаўскай ідэялёгіяй.

Возьмем, напрыкад, пастаноўку „Эрос і Псыха" (пераклад з польскай мовы). Тэма запазычана з стара-

грэцкай міталёгіі. Мастацкая распрацоўка яе прасякнута ваяўнічым ідэялізмам, нават тэізмам. Асноўная ідэя пастаноўкі—даказаць, што ўсё зямное вядзе да зманы, да гібелі, што толькі душа, вызваленая ад усяго зямнога, можа выратаваць увесь сьвет.

Тое самае мы наглядаем і ў „Бакханках"—пастаноўцы таксама ўзятай з стара-грэцкай міталёгіі. Мэта паказу давесьці немагчымасьць барацьбы чалавека супроць бога, супроць лёсу, вызначанага богам.

Фонам для гэтай п'есы быў узят бакхічны культ старой Грэцыі, афармлены тэатрам у разрэзе утончанай эротыкі.

Нарэшце яшчэ адна п'еса, „Апраметная", у аснову якой пакладзены варыянт народнай казкі, выкарыстанай для разгортваньня ваяўнічай нацдэмаўскай ідэялёгіі.

Сонная красуня, зачараваная ведзьмаком, упадабляецца Беларусі Волаты—нацдэмы, верныя сыны беларускага народу, руйнуюць цёмнае царства, вызваляюць Беларусь—Аленку, абуджаюць яе ад вечнага сну. Беларускія дзеці, якія прымушаны былі ў цёмным царстве „брахаць па сабаччу", ізноў пачынаюць гаварыць чалавечай мовай—беларускай

Вось асноўны зьмест, асноўная характарыстыка гэтага паказу—чарговай вылазкі нацдэмаў супроць савецкай улады.

Нават і такі ўдзячны матэрыял, як пляцоўнае народнае відовішча—„Цар Максіміліан", які сваімі карэньнямі ідзе ў народную гушчу, у здаровы сэнс працоўнага народу, які фактычна паводле зьместу зьяўляецца вострым гротэскам супроць ідэй самалаўдзтва, нават і такі паказ у трактоўцы БДТ2 стаў для нас зусім няпрыймальным. Упор быў зроблен не на сатырычнае выкрыцьцё самаўладзтва, а на сьцьвярджэньне ідэй служэньня адзінаму богу, барацьбы супроць паганства.

З ператварэньнем студыі ў тэатр і з прыездам БДТ2 у Менск, ён ня здолеў даць ніводнай новай пастаноўкі, акрамя нацдэмаўскай „Каля тэрасы", карыстаючыся выключна старым студыйным рэпэртуарам.

Тагочасны гэрб тэатру—шчыт з „Цара Максіміліана" васількі з „Апраметнай" і літары ў скарынінскім стылі—таксама адчынена выяўляў мэтаімкненьне нацдэмаў у самым тэатры.

Аб трактоўцы гэтага шчыта, які, між іншым, быў зацьверджаны ў свой час калегіяй НКАсьветы, мы чытаем у хроніцы аднэй з газэт за 1926 г. наступнае:

„... Наркамасьветы зацьвердзіў ухвалены праз мастацкую раду БДТ2 знак тэатру. Знак мае на мэце падкрэсьліць наступныя тры бакі працы тэатру: што тэатр прайшоў спэцыяльную студыйную падрыхтоўку, што ён ёсьць тэатр нацыянальны і што гэта—тэатр дзяржаўны. Для выяўленьня першае асаблівасьці ўзялі шчыт з п'есы „Цар Максіміліан"—першае студыйнае працы тэатру. Каб падкрэсьліць другую асаблівасьць тэатру—яго нацыянальнасьць—узялі ідэю васількa—гэтае сапраўднае беларускае краскі. Апроч таго стылізацыя васількa ўжыта і ў першай беларускай пастаноўцы тэатру („Апраметная"). Дзяржаўнасьць выяўлена праз серп і молат"...

Як бачыце нацдэмы надавалі прынцыповае значэньне пастаноўцы „Цар Максіміліан" і „Апраметнай", інакш яны-б не ўвялі ў гэрб ні шчыта, ні васількa. Серп і молат былі зьмешчаны недзе ззаду ў куточку, мусіць для азначэньня таго факту, што тэатр працуе ўсё-ж такі на савецкай тэрыторыі.

Тэорыі нацдэмаўскай самабытнасьці былі падпарадкаваны і іншыя

знадворныя аксэсуары тэатру. Аб гэтым чытаем з газэтнай хронікі наступнае:

„... Сьцены тэатру размалёўваюцца паводле рысункаў Бел. дзярж. мастацкага тэхнікуму. За асноўны матыў гэтых рысункаў узяты арнамэнт Слуцкіх паясоў (існаваньне вядомае фабрыкі ў Слуцку, дзе ткалі паясы, адносіцца да XVIII стагодзьдзя)...“

Як мага далей пагрузіць тэатр у глыбіню вякоў, у глыбіню мінулага, адарваць гледача ад сучаснасьці—вось мэта гэтага знадворнага аздабленьня.

„... Колер заслоны — сьветлашэры, які пераходзіць у колер васілька; гэты, так званы нэйтральны, колер абраны таму, каб вока гледача не дражнілі яркія колеры. У тон заслоны ідзе і размалёўка сьцен тэатру“...

Чырвоны колер дразьніць камуні-каму вочы і вось у аздабленьні тэатру ўжываюцца васількі, каб не дразьніць гэтыя цнотныя вочы.

Чытаем далей... „Мастацкая рада ўхваліла проект уніформы—адзінай формы вопраткі для ўсіх працаўнікоў тэатру... Вопратка будзе складацца з стылізаванае сялянскае кашулі і сьвіткі“...

Гэта анэкдатычная ідэя праводзілася на справе ў жыцьцё. Была заказана адзіная форма для работнікаў тэатру. Для гэтай формы былі зроблены эскізы і мастацкая рада зацьвердзіла іх, здаецца, зацьвердзіў і НКА (паказвае эскізы).

Вось вам прыгожы хлопец і вось няменш прыгожая дзяўчынка. Абодвы ў форме: цынамонавая сьвітка, сярэбраныя разводы, паясы, пагончыкі з гэрбам. Сапраўднае сярэднявечча, у якое нацдэмы імкнуліся ўсунуць тэатр. У гэтыя эскізы трэба асабліва ўважліва ўглядацца шмат каму з таварышоў, якія блытаюцца ў пытаньнях разуменьня нацыянальнай формы, не адрозьніваючы яе ад нацдэмаўскай штучнастылізаванай самабытнасьці.

Спынімся цяпер на яўрэйскім тэатры. Для разьвіцьця яўрэйскага дзяржаўнага тэатру ў першы пэрыод яго існаваньня характэрны, з аднаго боку, пэўны ўплыў МХАТ'у, а з другога боку, моцныя фармалістычныя ўплывы Маскоўскага ГОСЕТ'а. Першы пэрыод існаваньня ЯДТ характарызуецца нацыянальнай абмежаванасьцю і захапленьнем „бясклясавым, сусьветным“ мастацтвам, пры ігнараваньні задач сацыялістычнага будаўніцтва. Уключыўшы ў свой рэпэртуар творы яўрэйскіх клясыкаў (Пэрэц, Шолам Алэйхэм) і неяўрэйскіх (Шэксьпір, Мольер) студыя ў адпаведнасьці з гэтым стварыла, ня здолеўшы іх крытычна перамагчы, рэпэртуар нацыялістычны, характэрны замілаваньнем да яўрэйскай нацыянальнай рамантыкі і экзотыкі, прасякнуты містыкай („На ланцугу пакуты“) і ідэалізацыяй яўрэйскага местачковага быта, выяўленага ў сьвятле дробнабуржуазнага, „сузіральнаго“ гумару („Сьвята ў Касрылаўцы“), а таксама і рэпэртуар з фармалістычным эстэтызмам („Скапэн“) і ідэялёгічнай чуждасьцю „Шэйлок“.) Асобна стаіць пастаноўка „Хэйдэр“, якую можна разглядаць, як станоўчую зьяву, як палітычную сатыру на яўрэйскі клерыкалізм. Але ня гледзячы на свае значныя хібы і памылкі, наш ЯДТ быў тэатрам больш рэвалюцыйным, чым напр., ГОСЕТ маскоўскі.

Калі параўнаць, напрыклад, пастаноўку „На ланцугу пакуты“ з аналёгічнай пастаноўкай „Ноч на старым рынку“ у Маскоўскім яўрэйскім тэатры, дык параўнаньне будзе для нашага ЯДТ бязумоўна дадатным. Абодвы тэатры ўзялі ў працу творы яўрэйскага клясыка Пэрэца. Але, у той час, як у „Ночы на старым рынку“ уласьцівая Пэрэцу сінагагальная містыка цалкам пануе над паказам, у спектаклі „На ланцугу

пакуты", поруч са шкоднай містычнай і сымболічнай трактоўкай усяго матэрыялу, мы наглядаем і першыя спробы сацыяльнай дыфэрэнцыяцыі — супроцьстаўленьне клерыкальных багатыроў—беднаце, бунтарскія выступленьні рамесьнікаў і г. д. Скрозь пыл, бруд і цьвіль сінагогі, ешыбота і яўрэйскіх могілак, скрозь формалістычна-эстэцкае замілаваньне знадворнымі эфэктамі, у першых пастаноўках яўрэйскага тэатру БССР, ня выключаючы і „На ланцугу пакуты" праглядаюць ужо асобныя адзнакі элемэнтаў яго далейшага ідэялёгічнага і творчага росту, якія потым яскрава выявіліся ў пастаноўках „Ботвін" „Лекерт" і інш.

Канец адбудоўчага пэрыоду выклікаў з 1927—28 г. агульны тэматычны пералом у дзяржаўных тэатрах БССР.

З гэтым пэрыодам зьвязана і разгорнутая ідэялёгічная барацьба з нацдэмамі за далейшыя шляхі разьвіцьця беларускіх тэатраў.

Нацдэмаўшчына ў тэатры падпадае пад крытыку друку. Пад уплывам гэтай крытыкі пачынаецца тэатральная дыскусія, выкліканая спробамі крытычнага аналізу пастановак „Апраметная" і „Каля тэрасы" (БДТ2) на старонках „Рабочего" і Зьвязды". Гэтыя спробы выклікалі супраціўленьне з боку нацдэмаў і іх прыхвасьняў і як вынік гэтага супраціўленьня ў газ. „Савецкая Беларусь" быў зьмешчан ліст „7", які разглядаў крытыку гэтых пастановак як спробу „уничтожения" беларускага тэатру наогул.

На абарону контррэвалюцыйнага накірунку нацдэмаў у тэатры, выступілі прадстаўнікі самых рознастайных плыняў нацдэмакратызму і нацапартунізму. Мы бачылі пад гэтым лістом подпісы і Алеся Адамовіча—гэтай закончанай фашысцкай фігуры, і Цьвікевіча—былога міністра БНР, і Дудара, і Ластоўскага, таксама былога міністра, Зарэцкага, Вольнага і інш.

Гэтае, па сутнасьці, контррэвалюцыйнае выступленьне ня сустрэла тады ў 1927 г. належнага адпору. Наадварот, тав. Васілевіч у сваім артыкуле „Аб тэатры" („Сав. Беларусь", № 295) папераджаў, што трэба даць па руках тым, хто не разумее самабытнасьці беларускага тэатру. Прычыны зрываў і хібаў ў працы тэатру ён бачыць у рознароднасьці нацыянальнага складу гарадского гледача:

„Ня толькі сацыяльны склад гледача вельмі рознародны, ня больш „аднародны" і нацыянальны склад. А гэтая акалічнасьць іншы раз „сякое-такое" значэньне мае для ацэнкі"...

У гэтай вытрымцы т. Васілевіч салідарызуецца з вылазкай пацдэмаў, ён салідарызуецца і з Красінскім якігаварыў, што гарадзкі глядач ня можа разумець беларускага тэатру, што асноўная база тэатру—сялянства.

...„Не ў рэакцыйнасьці актораў і кіраўнікоў тут справа".. тлумачыць далей т. Васілевіч, бяручы пад ахову нацдэмаўскае кіраўніцтва ў БДТ2 і сурова папярэджвае, што „нельга выкарыстоўваць тэатральную крытыку для іншых палітычных і нацыянальных мэтаў, за гэта трэба біць па руках"...

Гэтых вытрымак з артыкулу Васілевіча дастаткова для таго, каб зразумець, што такія выступленьні стваралі спрыяючую глебу для твораў, накшталт лісту „7". Сваім палітычным аўтарытэтам Васілевіч аб'ектыўна падтрымаў нацдэмаў, замацоўваючы фактычна іх пазыцыі ў пытаньнях тэатру.

Ня гледзячы на тое, што ў1927 г. дыскусія вакол БДТ2 ня была дастаткова разгорнута, яна ўсё-ж дала станоўчыя вынікі—нацдэмаўскае кіраўніцтва тэатрам было зьнята.

У ідэёлагічным напрамку тэатраў пачаўся пэўны зрух. Пастаноўкамі

„Мяцеж“ і „Бронецягнік“, а потым „Мост“ у БДТ1, „Разлом“ і „Рэйкі гудуць“ у БДТ2, „Ботвін“ і „Лекерт“ у ЯДТ, тэатры робяць першую спробу пераключыцца на рэволюцыйную тэматыку.

З новай сілай дыскусія разгарнулася ў наступным годзе. Яна пачалася артыкулам пад назвай „Даволі анэкдотаў“—Т. Глыбоцкага (ён жа Дудар), у якім ён выступіў супроць пастаноўкі на беларускай сцэне перакладных п'ес рэвалюцыйнага рэпертуару, называючы іх „аб'едкамі расійскай сцэны“ і раючы тэатрам арыентавацца на Захад, на буржуазную Эўропу.

Ня буду застанаўлівацца на пытаньнях гэтай дыскусіі. Яны былі досыць падрабязна асьветлены ў друку. Партыя дала рашучы адпор гэтым спробам перашкодзіць тэатрам на шляху набліжэньня іх да рабочае клясы.

З пераездам яўрэйскай студыі ў БССР, у сувязі з рэарганізацыяй яе ў Дзяржаўны тэатр пачаўся пад нацiскам партыйнай і пралетарскай грамадзкасьці таксама пераход на савецкую тэматыку. У рэпэртуар ЯДТ увайшлі такія пастаноўкі, як „Ботвін“, „Лекерт“ і інш. У прыватнасьці пастаноўку „Авеч'я крыніца“ трэба вылучыць, як цікавы прыклад крытычнага падыходу тэатру да клясычнай спадчыны. Гэты клясычны твор тэатр здолеў падаць у такім сацыяльным разрэзе, які зрабіў яго для нас карысным.

З пераходам да працы над савецкай драматургіяй вызначыўся ў ЯДТ і пералом у творчым мэтадзе, які выявіўся ў набліжэньні да мастацкага рэалізму. У сэнсе рэпэртуару ЯДТ зьявіўся першым з яўрэйскіх тэатраў, які ўстанавіў сувязь з пралетарскай літаратурай. У той-жа час ён здолеў высунуць і групу маладых рэжысэраў, што зьяўляецца пэўным дасягненьнем у галіне выхаваньня кадраў.

Трэці пэрыод разьвіцьця нашых тэатраў, які пачынаецца прыблізна з 1930 г., характэрны крытычным пераглядам творчых шляхоў. Тэатры ўключаюцца ў сацыялістычнае будаўніцтва. У творчы быт тэатру ўваходзіць спаборніцтва і ўдарніцтва—сац. мэтады работы.

Калі другі пэрыод быў характэрны тэматычным паваротам, дык трэці пэрыод зьвязаны з пачаткам арганічнай перабудовы, рэканструкцыі нашых тэатраў. Таксама гэты пэрыод характэрны тым, што ўпяршыню на беларускай сцэне зьяўляюцца творы пралетарскіх драматургаў. Мы бачым на сцэне БДТ1 „Гуту“, „Справу гонару“, а ў БДТ2 „Першую конную“, „Качагары“ і „Напор“.

У БДМ1 пастаноўка „Гуты“—першага твору беларускай пралетарскай драматургіі, акрамя яе тэматычнай актуальнасьці і палітычнага значэньня, зьяўляецца ў сэнсе творчага мэтаду найбольш выпраўляючай лінію тэатру, ня гледзячы на натуралістычныя перагібы, характэрныя для ўсяго паказу. Пастаноўка „Гуты“ зьявілася фактарам выключнага палітычнага значэньня, як перамога ў тэатры пралетарскай драматургіі.

У наступных пастаноўках; „Лінія агню“ і „Камяні на дарозе“ тэатр ня здолеў утрымацца на пазыцыях, замацаваных „Гутай“.

Апошняя пастаноўка БДТ1 — „Справа гонару“, зьяўляецца першай спробай афармленьня твору ўкраінскага пралетарскага драматурга і ў гэтым сэнсе павінна разглядацца як дадатная зьява. Яна сьведчыць таксама і аб пэўным зруху ў тэатры супроць панаваўшага ў ім раней натуралізму і провінцыялізму. Але ў той-жа час у пастаноўцы наглядаюцца значныя перагібы ў бок схэматызму, абстракцыі, фармалізму, не гаворачы ўжо аб палітычных памылках, якія маюцца ў гэтым паказе.

Для БДТ2 апошні пэрыод характэрны паказам „Першай Коннай“ і „Качагараў“, якія далі рашучы зрух“ у грамадзка-палітычным жыцьці тэатру. У рабоце над гэтымі паказамі тэатр палітычна актывізаваўся, устанавіўшы шчыльную сувязь з рабочым гледачом, прыцягнуўшы яго да непасрэднага ўдзелу ў мастацкавытворчай працы тэатру.

„Першая Конная“ афармлялася пры непасрэдным удзеле Чырвонай Арміі, а „Качагары“ афармляліся пры актыўным удзеле добраахвотных рабочых брыгад.

Трэба падкрэсьліць вялікае палітычнае значэньне пастаноўкі „Качагары“ для гэтага тэатру, як былога фарпосту нацдэмакратаў, бо ў пяршыню тэатр зрабіў спробу выкрыць сацыяльную і палітычную сутнасьць нацыянал-дэмакратызму ў форме вострага палітычнага памфлету.

У гэтым паказе быў дапушчаны рад памылак, напр. недастатковае выяўленьне ролі партыі ў барацьбе з нацдэмамі, недастатковае выяўленьне кіраўніцтва партыяй прадпрыемствам і інш.

Гэтыя паасобныя памылкі былі сваячасова правільна адзначаны газэтай „Зьвязда“ і былі ў значнай меры выпраўлены тэатрам.

Але, адзначаючы гэтыя памылкі пастаноўку трэба разглядаць, як пэўны палітычны пералом для БДТ2. Сапраўды у працэсе сваёй перабудовы тэатр знайшоў у сабе дастаткова сілы і мастацкай востраснці, каб „прыгвазьдзіць“ нацдэмаў, пад моцным уплывам якіх БДТ2 раней знаходзіўся, вострым палітычным памфлетам. Гэтая пастаноўка была таксама зьвязана ў БДТ2 з пэўным праяўленьнем клясавай барацьбы ў тэатры, і гэта мела значны ўплыў на палітычнае перавыхаваньне акторскага калектыву.

Пастаноўка „Першай Коннай“, паказаўшая здольнасьці БДТ2 у агітацыйна-прапагандысцкай працы вакол паказу, зьяўляецца рэалістычным спэктаклем, не пазбаўленым элемэнту пасыўнага адлюстроўчага натуралізму і залішняй псыхолёгічнасьці, у той час, як пастаноўка „Качагары“ сьведчыць аб адваротным—аб элемэнтах плякатнага схэматызму і мэханістычнасьці.

У ЯДТ—у зьвязку з абвастрэньнем клясавай барацьбы ў умовах разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва, наглядаюцца ў апошні пэрыод і зноў некаторыя рэцэдывы ў бок нацыяналізму і фармалізму, аб чым сьведчаць пастаноўкі „Глухі“ і „Джым Купэркоп“

У паказе „Глухі“ маюцца элемэнты нацыяльната самалюбаваньня, а ў „Джым Купэркоп“ элемэнты фармалістычна-эстэцкага парадку.

Як станоўчы момант у рабоце ЯДТ трэба адзначыць уключэньне ў рэпэртуар тэатру твораў пралетарскай драматургіі іншых нацыянальнасьцяй—„Стрэл“, „Штурм“, „Поэма аб сякеры“ і г. д.

Трэці пэрыод зьявіўся пэрыодам рашучага пералому і для Беларускага Дзяржаўнага вандроўнага тэатру, вядомага пад назвай тэатру Галубка. Гэта вельмі цікавы тэатр. За 10 год свайго існаваньня ён абслужыў самыя цёмныя і глухія вёскі і куткі Савецкай Беларусі. Гэта-масавы народны тэатр, карэньні якога, як пэўнага гісторычнакультурнага зьявішча, ляжаць вельмі глыбока. Гэты тэатр носіць ў сабе элемэнты народнага пляцоўнага відовішча, народнага балагану. Ён карыстаецца надзвычайнай папулярнасьцю сярод сялянскіх мас. У той-жа час гэта тэатр прымітыўных мастацкіх форм, бяз пэўных творчых задач. Яго сцэнічныя творы складаліся з мяшчанскіх п'ес, з грубых бытавых камэдый і сьлязлівых мэлёдрам.

Папулярнасьць гэтага тэатру ў масах аж да 1930 г. ня была ў нас скарыстана, як сродак палітыкі партыі на вёсцы. Мы не скарыстоў-

валі гэтую вялікую папулярнасьць тэатру. Толькі за апошні час—з 1929-30 г. у тэатры наглядаецца пэўны пералом. На сцэне гэтага тэатру былі пастаўлены: „Ярасьць", „Ворагі", „Віхор" і г. д., якія сьведчаць аб пераходзе тэатру да новай тэматыкі, зьвязанай з сацыялістычным будаўніцтвам. Таксама гэтыя пастаноўкі сьведчаць аб пэўным паляпшэньні яго мастацкіх форм.

Арганізаваныя ў 1928-29 г. польскі і яўрэйскі вандроўныя тэатры знаходзяцца яшчэ на ня высокім мастацкім узроўні, але, уключыўшы ў свой рэпэртуар сучасныя рэвалюцыйныя п'есы, пасьпяхова абслугоўваюць мястэчкі, калгасы і саўгасы.

Аднэй з асноўных небясьпек, якая і на сёньняшні дзень стаіць на шляху будаўніцтва нацыянальнага пралетарскага тэатру, на шляху далейшага ідэолёгічна-мастацкага ўдасканаленьня існуючых у нас тэатраў, зьяўляецца вялікадзяржаўны расейскі шавінізм. У апошні час вялікадзяржаўны шавінізм ухіляецца звычайна ад яскравай фармулёўкі сваіх поглядаў, ён імкнецца дзейнічаць цішком, няпрыкметна, кпінамі ў адносінах да нацыянальнай палітыкі. У пытаньнях тэатру ён праяўляе сябе ў розных выглядах і ў першую чаргу ў нежаданьні прыняць ўдзел у арганізацыі калектыўных паходаў у тэатр, мэтавых паказаў, у асобных выпадках недаацэнкі значэньня нацыянальных тэатраў, а часам і проста ў выглядзе адкрытых варожых выпадаў супроць іхняй дзейнасьці. Аб канкрэтных праявах актывізацыі вялікадзяржаўнага шавінізму сьведчаць апошнія факты недаацэнкі яўрэйскага дзяржаўнага тэатру, выкрытыя ў Віцебску. Аб гэтым сьведчаць і некаторыя выпадкі ў сувязі з працай БДТ2 у Гомелі, якія нельга інакш кваліфікаваць, як праявы вялікадзяржаўнага шавінізму на практыцы. На нарадзе культпрацаўнікоў прадпрыемстваў, скліканай Гомельскім гарпрафсаветам па пытаньнях працы тэатру, высьветлілася, што значная частка культпрацаўнікоў ня ўлічвае палітычнага значэньня беларускага тэатру, як часткі культурнага будаўніцтва і нацыянальнай палітыкі. Наладжваньне арганізаваных паказаў, мабілізацыя ўвагі працоўных вакол працы тэатру імі цалкам ігнаруецца.

У гэтым сэнсе надзвычайна характэрны наступныя разважаньні культпрацаўніка фабрыкі „Праца"-

„Не мая справа вазіцца з білетамі. Хто з рабочых захоча, дык сам можа пайсьці ў тэатр і купіць у касе".

Між тым, на гэтай фабрыцы сярод рабочых распаўсюджаны гутаркі аб тым, што „уся работа БДТ2 праводзіцца выключна на беларускай мове, а яна для нас незразумелая. Калі-б былі пастаноўкі на рускай мове, дык мы самі пашлі-б і без культсэктару".

Ясна, што тут так сама, як і ў ва ўсіх аналёгічных выпадках ,мы маем справу ня толькі з вузка-дзяляцкім падыходам да працы нашых тэатраў, але і з канкрэтнай праявай вялікадзяржаўнага шавінізму.

Адпаведныя зьявы наглядаліся і ў Бабруйску. Там былі выпадкі, калі БДТ2 прымушаны быў у часе сваіх гастроляй зварочвацца за дапамогай да друку, для выкрыцьця цэлага шэрагу канкрэтных праяў вялікадзяржаўнага шавінізму, якія мелі месца вакол работы тэатру.

Я прывяду вам некалькі такіх канкрэтных прыкладаў, узятых з газэты „Камуніст" (№ 65 за 1930 г.) У Бабруйску, калі там працаваў БДТ2, была разгорнута работа па абслугоўваньню працоўнага гледача арганізаванымі паказамі. На гэтай глебе мы мелі цэлы шэраг праяў, якія інакш як праявамі вялікадзяржаўнага шавінізму характарызаваць нельга.

„Калі кіраўніцтва тэатру зьвярнулася да культработніка швэйнай ф-кі Фішмана з прапановай аб распаўсюджваньні білетаў, то той зьдзівіўся. „Што вы? Усякія вылічэньні з пэнсіі на розныя таварыствы ЎсеЦСПС забараніла. Як я рабочым навязваць білеты буду?“ Як бачыце, яшчэ маюцца погляды на беларускі тэатр, як на нейкую дабрачынную установу, якую трэба з пункту погляду філянтропіі падтрымліваць.

Доўга тлумачылі Фішману, што беларускі тэатр—гэта не дабрачынтнае прадпрыемства, што Фішман толькі пасрэднік між рабочым гледачом і тэатрам. „Усё роўна ў вашым тэатры нічога не разумеюць,-спрачаўся Фішман,—вось прыедзе руская опэрэта, дык мы самі за білетамі прыдзем“.

Культработнік камбінату гаворыць: „Няма калі вазіцца нам з вамі, у нас ёсьць справа больш важная, чым беларускі тэатр“.

„Культработнік электрастанцыі зрабіў проста: заплаціў 200 руб. за пастаноўку, а білеты рабочым не раздаў, усёроўна накладныя выдаткі, абы толькі адчапіцца-„італьянская забастоўка“.

„Артысты ў парадку грамадзкай нагрузкі робяць на прадпрыемствы культвылазкі, дзе праводзіцца невялічкі даклад, адбываецца концэрт, паказ паасобных момантаў з п“ес. Такія вылазкі ўдала прайшлі па цагельні №2 і 3, на пабудове тэатру. Прапанавалі правесьці вылазку саюзу будаўнікоў:—Што нашым рабочым ваш беларускі тэатр. Восьбы па кілішку гарэлкі далі, ну і пашлі-б... закатывалі вочы ў захапленьні „кіраўнікі мас“.

І ўсё гэта робіцца ў той час, як рабочы праз галаву сваіх культработнікаў стаіць у чарзе ў касе, дабіваецца білетаў, глядзіць і здавальняецца пастаноўкай“.

Вось цэлы шэраг такіх момантаў, якія поруч з дзяляцкімі адносінамі з боку культработнікаў гарадоў нашай пэрыфэрыі, сьведчаць аб праявах вялікадзяржаўнага шавінізму, аб імкненьні супрацівіць рускі тэатр тэатру беларускаму.

Наглядаюцца праявы вялікадзяржаўнага шавінізму і ў саміх тэатрах. Да іх трэба аднесьці такія факты, як напр. няведаньне беларускай мовы сярод работнікаў яўрэйскага тэатру, адсутнасьць азнаямленьня з беларускай літаратурай і беларускай культурай наогул. Гэта такія факты, якія яўрэйскаму тэатру трэба выправіць.

Вялікадзяржаўныя ўплывы можна прасачыць таксама і ў такіх, напрыклад, настроях, што закончанаму майстру—актору беларускага тэатру трэба пераходзіць на расейскую сцэну, бо яму далейшы рост у беларускім тэатры не забясьпечаны. Тут ізноў мы маем справу з недацэнкай магчымасьцяй дальнейшага мастацкага і творчага росту нашых тэатраў. З гэтым таксама трэба змагацца. Такім чынам на шэрагу прыкладаў мы прасачылі актывізацыю за апошнія часы расейскага вялікадзяржаўнага шавінізму, як навокал, так і ўнутры тэатраў, на што нам трэба ў штодзённай сваёй рабоце зварочваць самую пільную ўвагу.

Тут мы падыходзім і да пытаньня неабходнасьці пашырэньня сувязі паміж нашымі тэатрамі. На сёньняшні дзень гэтая сувязь яшчэ не дастатковая. Яе трэба ўзьняць шляхам сацыялістычнага спаборніцтва паміж нашымі асноўнымі тэатрамі. Вялікую справу ў гэтых адносінах адыграла-б Усебеларуская алімпіяда, якую трэба зрабіць паміж нашымі тэатрамі ў самым недалёкім будучым.

У зьвязку з неабходнасьцю ўзмацненьня міжнацыянальных сувязяй трэба таксама, каб НКА улічыў патрэбнасьць пэрыодычных плянавых выездаў нашых тэатраў у са-

юзныя рэспублікі, бо да гэтага часу яны ідуць саматужным парадкам.

Нашы тэатры пад кіраўніцтвам партыі з посьпехам перамагаюць усе перашкоды, якія ня могуць затрымаць іх няўхільны рост і пасьпяховае разьвіцьцё. Ня гледзячы на перашкоды, дзяржаўныя тэатры БССР замацоўваюць свае ідэялёгічна-творчыя пазыцыі і пасьпяхова пасоўваюцца наперад па шляху стварэньня беларускага пралетарскага мастацтва.

Сучаснае становішча нашых тэатраў характэрна пашырэньнем сувязі з рабочым гледачом па лініі абслугоўваньня яго арганізаванымі паказамі, работай над пастаноўкамі разам з рабочымі брыгадамі, масавымі рэцэнзіямі, культвылазкамі на фабрыкі і прадпрыемствы. У паасобных тэатрах ствараюцца агітгрупы, прымацаваныя да пэўных фабрык і заводаў, якія працуюць на мясцовым матэрыяле.

Тэатры пачынаюць весьці грамадзкую працу навокал паказаў, напр. тэматычныя выстаўкі, лёзунгі, плякаты, звароты да гледача. Наглядаецца ўзмацненьне сувязі тэатру з Чырвонай арміяй. Разгортваюцца дыскусіі па творчаму мэтаду, па пытаньнях мастацкай формы.

У выніку ўзмацненьня сувязі з рабочым гледачом пашыраюцца ў тэатрах сацыялістычныя мэтады работы. Пашыраецца папулярызацыя беларускага культурнага будаўніцтва за межамі БССР. Варта ўспомніць удзел БДТІ і яўрэйскага тэатру на ўсесаюзнай алімпіядзе, гастролі БДТІ і ЯДТ на Украіне, БДТ2—у Маскве і Ленінградзе.

Узмацняецца таксама сувязь тэатраў з пралетарскай драматургіяй. Творчы рост тэатраў выклікае далейшае вылучэньне рэжысэрскага маладняка.

У сэнсе выхаваньня кадраў мы на сёньняшні дзень маем таксама пэўныя дасягненьні, якія выражаюцца ў абслугоўваньні вандроўных тэатраў і трамаў маладымі рэжысэрамі нашых асноўных тэатраў. Расьце колькасна і якасна акторскі склад тэатраў. Арганізаваны ў Менску тэатэхнікум. Пры БДТ2 арганізавана студыя фабзавучнага тыпу, якая падрыхтоўвае новыя кадры на глебе сталай вытворчай практыкі.

У тэатрах значна павялічылася партыйная і камсамольская праслойка.

Адначасна мы бачым значнае павялічэньне камуністычнай праслойкі і ў кіраўніцтве тэатрамі.

Нараўне з актывізацыяй пралетарскай грамадзкасьці вакол тэатраў, што выяўляецца ў канфэрэнцыях гледачоў,у мастацка-палітычных саветах, у масавых рэцэнзіях, у агульным павышэньні зацікаўленасьці рабочага гледача працай тэатру і (у асобных выпадках) непасрэдным удзелам яго ў ей, мы павінны адзначыць нявыстарчальнае становішча тэакрытыкі, яе адставаньне ад росту тэатраў, ад росту мастацкіх запатрабаваньняў рабочых мас. Раней мы бачылі, як, часткова, нашу крытыку скарыстоўвалі нацдэмы ў мэтах барацьбы супроць лініі партыі ў тэатры. На сёньняшні дзень мы бачым адставаньне тэакрытыкі. На сёньняшні дзень тэакрытыка недастаткова дапамагае нашым тэатрам у барацьбе за марксысцка-ленінскі творчы мэтад. Нельга лічыць сур'ёзнай крытыкай выпадковыя кавалерыйскія наскокі на тэатр, якія час ад часу ўжываюцца некаторымі таварышамі, без малейшай спробы сур'ёзнага марксысцкага,дыялектычнага аналізу пастаноўкі, бяз уліку канкрэтных абставін, і нікому карысьці ня прыносяць.

Удумліва сур'ёзны разбор тэй ці іншай работы тэатру замяняецца інады аглядам-наскокам: галопам па Эўропе ці з вышыні птушынага лёту. Гэтыя наскокі, бязумоўна, ня могуць дапамагчы тэатру ў яго

барацьбе за марксысцка-ленінскі творчы мэтад—наадварот, яны толькі дэзарганізуюць работу нашых тэатраў.

У зьвязку з гэтым я хачу падрабязьней застанавіцца на некаторых канкрэтных фактах, маючых дачыненьне да крытыкі, якія зьвязаны з пастаноўкай „Качагараў" у БДТ2. Я адзначыў ужо раней, што гэтая пастаноўка мела значную колькасьць істотных недахопаў і памылак, правільна выяўленых у свой час на старонках „Зьвязды".

Ня варта губляць час на іх пералічэньне—яны ўсім вядомы. У сэнсе мастацкай формы гэта пастаноўка—графічны, плякатны паказ. Тэатр ставіў сваей мэтай даць гротэск, памфлет на нацдэмаў і ў сувязі з гэтым завастрыў гэтых пэрсанажаў, даў іх у гротэскнай, сатырычнай трактоўцы, што выклікала схэматычнасьць, плякатнасьць.

Ніхто не сьцьвярджаў, што творчы мэтад гэтай пастаноўкі—правільны мэтад. Сам тэатр не настойвае на прынцыпах гэтага мэтаду. Гэты мэтад быў у пераважнай ступені абумоўлены характарам драматургічнага матэрыялу.

Але, ня глядзячы на шэраг хібаў, гэты паказ зьявіўся для тэатру фактам поўнага палітычнага значэньня. Ён сьведчыць аб тым, што калектыў, які на працягу значнага часу знаходзіўся пад моцным уплывам нацдэмаў, у працэсе сваей ідэялёгічнай і творчай перабудовы здолеў у форме вострай палітычнай сатыры ўскрыць на беларускай сцэне сацыяльны і палітычны твар сваіх былых ідэйных натхніцеляў. Між тым наглядаецца, што некаторыя таварышы, пры крытычным падыходзе да гэтай пастаноўкі, ня ўлічваюць яе палітычнага значэньня для тэатру.

Галоўнае, на чым разгортваецца гэтае неразуменьне—гэта пытаньне адносна нацыянальнай формы. Асобныя таварышы паставілі пытаньне аб тым, што тэатр, ускрываючы на сцэне шкодныя тэндэнцыі нацдэмаў, у той самы час аддае ім на „зьядзеньне" беларускую нацыянальную форму.

Чаму гэта тэатр апрануў нацдэмаў у беларускую кашулю, беларускія паясы, чаму яны скачуць лявоніху і г. д. Вось асноўны момант, які высоўваецца гэтымі таварышамі. Мне здаецца, што тэатр да знадворнага афармленьня вобразаў нацдэмаў падышоў правільна. У аснову іх знадворнага афармленьня былі пакладзены два характэрныя элемэнты нацдэмаўскай сутнасьці—захаді самабытнасьць. Стаўка на самабытнасьць пры арыентацыі наЗахад. Нацдэмы на сцэне апрануты ў беларускія кашулі з васількамі і каласкамі, а не ў злучэньні з эўропейскім гарнітурам. Яны ўжываюць лявоніху, а не гармонізаваную пад факстрот. Правільна гэта, ці не? Мне здаецца правільна. Я даў вышэй цэлы шэраг прыкладаў таго, як разумелі нацыянальную форму нацдэмы, як яны імкнуліся штучна аднавіць старыя архаічныя элемэнты нацыянальнай формы пэрыоду натуральнай гаспадаркі, высоўвалі гэтыя элемэнты, як нейкую непарушную зьяву і г. д. Мы ведаем, што крыецца пад такім разуменьнем нацыянальнай формы, мы ведаем сутнасьць яе. На гэтым я спыняцца ня буду. Мне здаецца, што тэатр якраз правільна падышоў да перадачы гэтых характэрных асаблівасьцяй нацдэмаў.

Высоўвалася такое абвінавачваньне—чаму нацдэмам далі элемэнты нацформы, а рабочую масу пазбавілі яе. Гэтае абвінавачваньне нацягнутае. Мы бачым на сцэне тэатру ў гэтай пастаноўцы ня толькі нацдэмаў, але і рабочага на вытворчасьці. Ён апрануты ў спэцвопратку. Хто можа даказаць, што беларускі рабочы працуе на вытворчасьці не ў сцэцвопратцы, але ў якім-небудзь спэцыяльна-нацыянальным гарнітуры? Гэтага няма на вытворчасьці.

На заводзе рабочы працуе ў спэцвопратцы і такім ён паказаны на сцэне. Ясна, што гэта не пазбаўляе яго пэўнай нацыянальнай формы, але нацыянальная форма рабочага вызначаецца не якім-небудзь спэцыяльным гарнітурам пэрыоду натуральнай гаспадаркі, а выяўляецца ў іншых момантах—у мове, у гэсьце, пластыцы, рытміцы, у агульным малюнку і рысах беларускага рабочага ў умовах адпаведных галін вытворчасьці.

Галоўная блытаніна ў разуменьні нацыянальнай формы памянёных таварышоў у тым, што яны разглядаюць яе, як нейкую статычную зьяву, у той час, як нацыянальная форма залежыць ад пэўных сацыяльна-эканамічных зьяў і абставін, ад пэўнай і канкрэтнай гістарычнай абстаноўкі.

Нацыянальная форма мяняецца, а яны імкнуцца разглядаць яе, як нейкую непарушную зьяву, бяручы за аснову яе як архаічныя элемэнты нацыянальнай формы, характэрныя для беларускіх сялян у ўмовах натуральнай гаспадаркі.

Гэтая блытаніна зьвязана з „тэорыяй" аб тым, што ў нас нібыта ў пытаньнях нацыянальнай формы няма асаблівых разыходжаньняў з нацдэмамі.

Гэтыя погляды памылковыя. У нас і ў пытаньнях нац. формы нічога агульнага з нацыянал-дэмакратамі няма. Разуменьне нацыянальнай формы ў нас роьзніцца цалкам і карэнным чынам ад разуменьня нацыянальнай формы нацдэмамі. У нас нацыянальная форма мае зусім іншы зьмест, а пад уплывам гэтага зьместу і нацыянальная форма таксама мяняецца. Трэба памятаваць, што форма і зьмест заўсёды знаходзяцца паміж сабой у дыялектычным адзінстве і ўзаемадзейнасьці. Са зьменай зьместу мяняецца і форма і наадварот—форма найбольш поўна выяўляе зьмест, абумоўліваючы адпаведнае успрыйманьне яго.

Таму, напр., у зьвязку са зьменамі ў соцыяльна-эканамічнай структуры грамады мяняецца ня толькі зьмест якой-небудзь сацыяльнай зьявы, але і форма.

Штучна захоўваць гэтую форму ў ранейшым выглядзе немагчыма і непатрэбна.

Калі ісьці лёгічна ў гэтым напрамку, дык трэба будаваць вакзал у стылі старой беларускай царкоўнай архітэктуры, а Акадэмію навук—як замак Рагнеды. Ужываць на шыльдах, як раней гэта ў нас і рабілася—елачкі і васількі з каўняроў сялянскай кашулі. Я памятаю такую шыльду на аднэй з нашых устаноў па Савецкай вуліцы—чорная, дзелавога выгляду, з залатымі літарамі і з арнаментамі каўнера сялянскай кашулі. Нельга зьмешваць нашага разуменьня нацыянальнай формы са штучнай стылізацыяй нацдэмаўскай самабытнасьці.

Цяпер пару слоў аб матар'яльным забесьпячэньні. Я думаю, што нам трэба абавязкова зьвярнуць увагу на неабходнасьць плянавага забесьпячэньня нашых тэатраў вытворчымі матэрыяламі. Да гэтага часу ў нас плянавага забесьпячэньня няма. Ніхто гэтым не займаецца. Пастаноўку трэба афармляць з канкрэтных матэрыялаў, для яе патрэбны цьвікі, фанэра і г. д. Ніхто гэтага тэатрам не дае. НКА не забясьпечвае тэатраў фондамі, а ім такія фонды патрэбны. Калі мы тэатральнае мастацтва лічым аднэй з частак сацыялістычнага будаўніцтва, дык павінны ўлічваць і вытворчыя запатрабаваньні тэатраў.

Яшчэ адна заўвага наконт плянаваньня. Зараз, калі мы паглядзелі пляны НКА па далейшаму разгортваньню тэатральнага мастацтва, дык у нас паўстае небясьпека, ці ня хоча Галоўмастацтва зрабіць з БССР

краіну суцэльнай тэатралізацыі. Гэта ня дрэнна, але я хачу зьвярнуць увагу на тое, што ў гэтых плянах недастаткова ўлічваецца значэньне для тэатраў матэрыяльна- эканамічнай базы. Калі мы праэктуем такое высокае разьвіцьцё тэатру, дык павінны таксама паклапаціцца і адносна будынкаў, і адносна матэрыяльна-эканамічнай базы і адносна плянавага забесьпячэньня вытворчымі матэрыяламі, інакш гэта ўсё застанецца голай лірыкай, лятуценьнямі.

Далейшае пасьпяховае разьвіцьцё і творчы рост нашых кадраў тэатраў, далейшае іх прасоўваньне наперад — па шляху пралетарызацыі і актыўнага ўдзелу ў сацыялістычным будаўніцтве, ставіць перад тэатрамі шэраг новых, адказных і складаных задач. Перад усімі нашымі тэатрамі з асаблівай вострасьцю паўстае, у першую чаргу, задача аўладаньня дыялектыка-матэрыялістычным творчым мэтадам—на базе ўзбраеньня сваіх мастацкіх кадраў марксысцка-ленінскай тэорыяй, выхаваньняў іх пралетарскага сьветапогляду. Пры станоўчым вырашэньні гэтай асноўнай задачы, у ўмовах яшчэ больш шчыльнай сувязі з рабочым гледачом і актыўнага ўдзелу ў практыцы соцыялістычнага будаўніцтва, дзяржаўныя тэатры БССР створаць сапраўды вялікае мастацтва, вартае эпохі пабудовы сацыялізму.

БІБЛІОГРАФІЯ

Кузьма Чорны—„Брыгадзіравы апавяданьні" ДзВБ, ЛМ 1932 г.

„ ...Пархвененка цяпер ужо нічога не гаварыў: ўсіх не перапрэш. Ён адно пляваў, раз по разу даставаў з кішэні папяросы, і пацягнуўшы разы са два, кідаў і даставаў новую. Губы дрыжэлі і зубы поўзалі па іх. Пасьля як не хапіла папярос, ён пачаў ўсё даставаць з кішэні насатку і смаркацца: чмыхне—ізноў схавае насатку, пасьля раптам дастане—і зноў чмыхне".

Так паказвае працэс пераражэньня прагульшчыка Пархвененкі К. Чорны ў першым апавяданьні кнігі „Брыгадзіравыап вяданьні". Апісанае адбываецца па ьля таго, як два-тры рабочыя таго-ж прадпрыемства зрабілі Пархвененку пару гіранічных заўваг аб цеснаце нагавіц і аб „эўрапэйскім дзядзьку". На гэтым аўтар палічыў неабходным паставіць кропку і апавяданьне скончыць тым, як „Пархвененка стаяў крукам на рабоце", нават па дзьве зьмены на працягу некалькі дзён, а пасьля ўсяго гэтага атрымаў прэмію.

Чытач запытае, ці выканаў аўтар апавяданьня пастаўленую перад сабой задачу, паказу працэсу перавыхаваньня, пераробкі чалавека, паказу зьмен у псыхіцы чалавека праз сацыялістычныя формы працы, праз адносіны людзей адзін да другога і да акаляючага сьвету? Дадатна адказаць на гэтае пытаньне нельга. Па першае таму, што К. Чорны не разгортвае перад чытачом, ў дадзеным выпадку, шырокага паказу сацыялістычных форм працы на прадпрыемстве. Па другое,—аўтар апавяданьня ня ўгледзеў як рабочыя на прадпрыемстве, на аснове сацыялістычных форм і мэтаду працы вядуць барацьбу „супроць навыкаў і звычак, якімі заразілі іх вякі мяшчанскага гнёту" (М. Горкі). Інакш гаворачы,—Чорны не паказаў, як рабочыя ў сацыялістычнай пераробцы сьвету сацыялістычна перавыхоўваюць сябе.

Абмінуты ў паказе працэсу перавыхваньня прагульшчыка Пархвененкі і такія асноўныя асяродкі арганізацыі работы на прадпрыемстве, як партыйная і камсамольская арганізацыі. Нам няма патрэбы даказваць ролі гэтых арганізацый ў перавыхаваньні рабочых, але ў апавяданьні „Мадэльшчык Пархвененка" гэтая роля не знайшла свайго мастацкага абагульненьня, што, бясспрэчна, зьняўляецца вялізарным прарывам, памылкай аўтара.

Кузьма Чорны пашырае сваю задачу, ва ўсю велічь ставіць праблему выканаьня і перавыканаьня пляну на прадпрыемстве. Аўтар ў самых характэрных дэталях разгортвае высока-мастацкі паказ творчай працы, змаганьня за выкананьне плянавых заданьняў, і на гэтым фоне вырашае праблемы, спэцыфічныя для камсамолу і рабочай моладзі (гл. напр., апавяданьні—„Броня Казакевіч", „Рамонтная брыгада", „Браты").

Людзі ў працэсе вытворчасьці выяўляюць сваю адданасьць справе ўсяго калектыву рабочых. Іх перажытае—паказана аўтарам, як шлях барацьбы за справу пралетарыяту.

В бразы старых рабочых, цяперашніх перадавых ударнікаў: Весялоўскага, са зборачнага цэху, Гімпалевіча, з такарнага цэху, Явіча - франтавіка грамадзянскай вайны,— гэта ня схэмы, гэта вобразы сапраўдных змагароў, паданых аўтарам ў працэсе ўсяго іх разьвіцьця.

Весялоўскі—баец на франтох грамадзянскай вайны. „Ён-жа сам, можна сказаць, на сваіх плячох выносіў яе, тую вайну. А пасьля ваяваў з польскімі панскімі акупантамі". На фронце грамадзянскай вайны Весялоўскі сустрэўся з Гімпалевічам, Вінгелем: былі ў бойках, у барацьбе пражылі гады змаганьня з нямецкімі, белапольскімі акупантамі і бандытызмам. Іх загартоўвала суровая школа барацьбы, але не аднолькава. Ня ўсе з іх аднолькава разумелі сутнасьць бойкі, якую організоўваў царызм. У прыватнасьці, як гэтую сутнасьць разумее Вінгель?

„—Вы ведаеце, браткі, от як усё—адно ўжо няма чаго больш чакаць. Хоць ня думай ні пра што, хоць на сьвеце ня жыві! Цяпер куды іду? Можа чорту лысаму ў лапы! Можа на зьдзекі! Можа дзяцей дзе ўжо разарвала з гарматы, можа адны косьці дзе асталіся. Можа галодныя сядзяць! А што я ім прынясу? І на што я сам іду? Нічога я за сабой не пакінуў, нічога і не знайду там, куды іду. Па вошта іду? Па шчасьце? Куды мяне гналі? Што і каму адваёўваць я быў павінен? І за плячыма, і перад вачыма ўсё адно. Як на сьвеце й прытулку нашаму брату няма! З малку быў як госьць на сьвеце, гэтак і ўсё далей. Нехта за нешта ваюе, нехта нешта мае і мець будзе..." (Падкрэсьлена мною-П. Б.). Так гаварыў Вінгель аб вайне, на якую царскі ўрад кідаў лепшых сыноў пралетарыяту і працоўных ў мэтах свае нажывы.

Мы знарок падалі поўнасьцю разважаньні Вінгеля аб вайне для таго, каб давесьці,

што ў гэтага чалавека ня было пэўнага пункту погляду на вайну, нават і тады, калі вайна была ў разгары. У зразуменьні сутнасьці імпэрыялістычнай вайны Вінгель далёка адстаў ад сваіх таварышоў—Весялоўскага, Гімпалевіча і інш. Дробна-буржуазная ідэолёгія брала перавагу. І гэта таму, што Вінгель ня меў вопыту рэвалюцыйнай барацьбы, быў з невялікім стажам працы на заводзе, яшчэ моцна стаяў на пазыцыях селяніна—серадняка. Але, калі Вінгель трапіў ў кола рэвалюцыйнай барацьбы за дыктатуру пралетарыяту, а пасьля ў актыўнае адбудаваньне заводу, у яго жыцьцё і працу — Вінгель робіцца барацьбітом за бальшавіцкія мэтады і формы працы. І тут аўтар ў паказе працэсу перавыхаваньня гэтага чалавека праявіў надзвычайную пасьлядоўнасьць і уменьне разабрацца ў супярэчнасьцях.

Весялоўскія, Гімпалевічы і Жывічы ўсьвядомілі сутнасьць рэакцыі (1907-1914 г. г.), ўсю гніласьць, гнюснасьць, увесь цынізм і распусту царызму і намеры белапольскіх акупантаў. Таму яны былі сьвядомымі барацьбітамі за кроўную справу рабочых, аддана змагаліся на франтох. Такімі-ж адданымі яны засталіся і на фронце вык наньня пяцігадовага пляну.

Зараз Вінгель—каля варштату. Ён упарта бароніць парадак і бальшавіцкія тэмпы ў цэху. „Я гавору, таварышы, што я цяпер павінен стаяць за тое, што трымаю ў руках?" Ён прапануе: „першае—заступаць зьмене пасьля зьмены адразу, ня спыняючы варштату, каб работа йшла кругла цэлы дзень. Другое—увесь цэх, скажам, разьбіць хутчэй на ўдарныя брыгады і кожная брыгада, каб мела, скажам, сваю перадатчную брыгаду зьверху, а гэтак сама і зьнізу. От скажам брыгада токарнага цэха—мае сваю папярэднюю брыгаду ў ліцьцёвым, а пасьля ў зборачным"... Вінгель ў цэху арганізоўвае вытворчыя манэўры, становіцца на чале іх.

Весялоўскі сумесна з брыгадамі моладзі, праз насьценгазэту і ішныя віды масавай работы, арганізоўвае паходы супроць безгаспадарчасьці на прадпрыемстве, супроць старых адносін да працы, перадае свой шматгадовы вопыт і спрактыкаванасьць моладзі. Ён—ініцыятар сацспаборніцтва ў цэху, прыклад для ўсяго калектыву заводу, неадлучны таварыш маладых рабочых.

Праблема мастацкага паказу моладзі, як адна з актуальнейшых праблем, займае вялізарнае мейсца ў творчым пляне кнігі „Брыгадзіравы апавяданьні". Трэба сказаць, што Кузьма Чорны зрабіў значны крок уперад ў паказе жыцьця, пр цы моладзі на прадпрыемстве і выразьненьні спэцыфічнаманадзёжных праблем.

Моладзь К. Чорнага—гэта ня тая моладзь, якой уласьціва пасыўнае сузіраньне сацыялістычнай рэчаіснасьці, матывы сацыяльнай няўстойлівасьці, ваганьняў з боку ў бок, хваляваньняў, якія пераходзяць ў адчай. Гэта— моладзь, інтарэсы якой выцякаюць задач, якія паставіла партыя.

Вось вобраз Броні Казакевіча, цэнтральнай фігуры двох апавяданьняў: „Броня Казакевіч" і „Рамонтная брыгада". У мінулым—гэта сын селяніна бедняка абрабаванага белапольскімі акупантамі, Броня Казакевіч зараз—малады рабочы чыгуна-ліцьцёвага заводу. Ён усьвядоміў свае клясавыя задачы, і стаўшы на шлях актыўнага ўдзелу ў сацбудаўніцтве—непахісны. Яго імкненьне—аўладаць тэхнікай вытворчасьці, змагацца за якасьць прадукцыі. Ён ініцыятар арганізацыі брыгады для дапамогі прымежнаму калгасу ў падрыхтоўцы сельска-гаспадарчага інвэнтару. Ён дабіваецца паездкі ў калгас, а з ім два кавалі яго таварышы: Косьця Сыманутовіч і Гірка Ерынгроз. Брыгада працуе чатыры дні. „А пяты і апошні дзень працы скончыўся вельмі позна, але за тое калгасаўскае прыладзьдзе, якое льга была паправіць ў кузьні, было гатовае, хоць ты яго цяпер-жа пускай ў работу. Брыгада на заўтра паехала. І ў той-жа дзень дзесяць гаспадароў запісаліся ў калгас".

Аўтар без адцягненых разважаньняў уводзіць чытача ў кола барацьбы Казакевіча за аўладаньне тэхнікай, дае мастацкі малюнак ўсёй сыстэмы зьмен ў яго псыхіцы. На вобразе Казакевіча Чорны разгортвае паказ таго, як чалавек перарабляючы асяродзьдзе, перарабляе і самога сябе.

Далей, К. Чорны, без павярхоўнага фатаграфаваньня і беглых сюжэтных нататак, а на аснове дыялектычнага асэнсіваньня паўнаты працэсу, паказвае барацьбу моладзі з безгаспадарчасьцю, з небясьпекай прарыву. Малады ўдарнік Рома Даўгінскі, на аснове сваей практыкі зразумеў рэнтабэльнасьць растаноўкі рабочае сілы, мэханізмаў і часткова прычыны, якія прыводзіць прадпрыемства да прарыву. Небясьпеку прарыву ён імкнецца прадбачыць і папярэджвае таварышоў:

„—Раз прарыў зьнішчылі, дык ужо і забыцца на яго трэба!.. А ў нас што робіцца? Робіцца тое, што раз толькі ганьба прарыву над каркам ня вісіць, раз яна вочы ня муляе, дык і пачынаецца, дык і пачалося адразу калупаньне! Нікому і ня ў галаву, што калі гэтак будзе, дык зноў прарыў будзе і зноў як гара плечы прыдавіць. Калупаньне ў нас пачалося, таварышы: Калупацца пачалі, а не рабіць".

Аднак, укладаючы ў вусны Даўгінскага перасьцярогу прарываў, Чорны на працягу ўсіх апавяданьняў ня выкрыў карэньняў, ня паказаў ўсей сыстэмы прычын прарыву. У гэтым выпадку Чорны ня вызваліўся ад мэханічнага падыходу да складанага працэсу.

„Рабілі сабе на заводзе, рабілі; хто рабіў, а хто калупаўся; але на другі год пяцігодкі раптам дайшло да вушэй як з грому: прарыў! І пашло рваць страшнае слова. Нават, не прарыў ўжо гаварылі, а правал".

Вось гэтае „раптоўнае" зьяўленьне прарыву застаецца не раскрытым ў сувязі, нават з галоўнейшымі недахопамі заводу.

Такія недахопы ў рабоце прадпрыемстваў, як недастатковае ўнядрэньне дзяржразьліку, нездавальняючая пастаноўка праверкі выкананьня, адарванасьць кіруючых органаў ад прадпрыемства, недахопы ва ўнутры завадзкім цлянаваньні, існаваньне абязьлічкі і іншае, не знайшлі свайго мастацкага выкрыцьця ў кнізе „Брыгадзіравы апавяданьні". У гэтым адзін з асноўных недахопаў ў паказе аўтарам прарыву на заводзе.

З другога боку, быт рабочай моладзі па-за заводам атрымаў схэматычнае адбіцьцё (гл. апав. „Браты" і інш.). Шматграннасьць быту, здавалася, павінна была атрымаць сваё вырашэньне ў творчым пляне апавяданьня „Браты". У сапраўднасьці-ж апавяданьне канцэнтруе ўвагу на паводзінах герояў апавяданьня на прадпрыемстве, у цэху, брыгадзе, і спрошчана закранае пытаньні работы і быту завадзкой моладзі па-за заводам. І Хана, і Гурык і Казя паказаны аўтарам актыўнымі працаўнікамі на заводзе. Яны ўключаны ў агульны струмень завадзкога жыцьця, і ўпэўнены, што ўсё старое, закасьцянелае змыецца неўзабаве, разам з ўсёй іншаю нарасьцю, якую змывае рэвалюцыя, і якая нарасла на нас за доўгія вякі... Але ўсё-ж гэтыя маладыя рабочыя адарваны аўтарам ад той канкрэтнай грамадзкай работы, якую праводзіць заводзкі камсамол і рабочая моладзь па-за заводам.

Вось галоўныя недахопы „Брыгадзіравых апавяданьняў" Кузьмы Чорнага. Аднак, пры ўсіх недахопах зборнік апавяданьняў К. Чорнага у асноўным правільна паказвае жыцьцё і працу рабочых, работу нашай моладзі на вытворчасьці. Адначасна гэтая кніга—факт вялізарнага росту самога аўтара, факт яго перабудовы. Трэба сказаць, што перабудова Кузьмы Чорнага, набліжэньне яго да пазыцый пралетарскай літаратуры ідзе не па шляху нейменшага супраціўленьня, а па шляху ўпартага вызваленьня ад уплываў ідэалістычнага мэханіцызму, дробна-буржуазнай романтыкі, нацдэмакратызму, у бок аўладаньня дыялектыка - матэрыялістычным мэтадам.

П. СКОКАЎ.

ХРОНІКА

БССР

● У лютым м-цы ў Менскай асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў распачалася творчая дыскусія. Дыскусія распачалася дакладам адказнага сэкратара БелАПП т. Лынькова пра ліст т. Сталіна і задачы беларускай пралетарскай літаратуры.

У сваім дакладзе тав. Лынькоў завастрыў асаблівую ўвагу на пытаньнях барацьбы з варожымі тэорыямі на літаратурным фронце. „Ліст т. Сталіна патрабуе самай рашучай барацьбы з тэорыяй контррэвалюцыйнага трацкізму на літаратурным фронце, патрабуе пільнай, няпрымірымай барацьбы за чыстату лініі кампартыі ў мастацкай літаратуры. Мы павінны змагацца за правільны паказ у мастацкай літаратуры вобраза бальшавіка, за паказ у мастацкай літаратуры рабочага-ўдарніка сацыялістычнага будаўніцтва, за правільны паказ вобраза камсамольца".

Спрэчкі па дакладу т. Лынькова працягваліся тры вечары. Выступаючыя т.т. у спрэчках, галоўным чынам, спыняліся на паасобных мастацкіх творах, на конкрэтных варожых праявах (антысэмітызм у нарысе „Каця Астаповіч" С. Знаёмага, фальсыфікацыя рэчаіснасьці „Вялікае нараджэньне". А. Ляснога і інш.).

У спрэчках па дакладу падкрэсьлівалася, побач з вялікім ростам пралетарскай літаратуры, адставаньне літаратуры ад тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, недастатковы тэорэтычны узровень нашых пісьменьнікаў, недастатковы паказ у мастацкіх творах пралетарскай літаратуры вобраза бальшавіка, ударніка і калгасьніка.

Наступныя вечары творчай дыскусіі былі прысьвячаны разгляду творчага мэтаду П. Галавача і мастацкай прадукцыі „Маладняка" за 1931 год.

Дыскусія разгортваецца самым шырокім чынам. Творчыя пытаньні ўздымаюцца на прынцыповую вышыню, што сьведчыць пра ідэёва-творчы рост нашых пралетарскіх пісьменьнікаў, пра ідэёва-творчы рост БелАПП у цэлым.

Дыскусія дапамо́жа нашым пісьменьнікам аўладаць творчым мэтадам дыялектычнага матэрыялізму, аўладаць тэорыяй марксызму-ленінізму.

● У БелАПП адбываецца творчае разьмяжаваньне паміж пісьменьнікамі. Ужо стварыліся дзьве творчыя групы. У першую групу ўваходзяць М. Аляхновіч, С. Знаёмы, В. Каваль, О. Канакоцін, Р. Кобец, Я. Лімаоўскі, Р. Мурашка, А. Салагуб і Стэльмах.

Работа групы будзе ісьці па лініі тэорытычнай вучобы і творчай работы. На бліжэйшы час група займаецца грунтоўнай распрацоўкай ленінскай спадчыны па пытаньнях мастацтва і літаратуры і разглядам літаратуразнаўчых работ Плеханава ў сьвеце марксысцка-ленінскага этапу літаратуразнаўства. Адначасна група займецца распрацоўкай творчасьці Р. Мурашкі, А. Салагуба і Стэльмаха, з мэтай калектыўнай ацэнкі і дапамогі гэтым т.т. у іх далейшай працы. Другая творчая група складаецца з т.т. П. Броўкі, С. Баранавых, А. Кучара, К. Чорнага, Я. Скрыгана, Ю. Таўбіна, А. Куляшова, Н. Галавача, Камянецкага і Бацюшкава (рабочыя-ударнікі).

Афармляецца трэцяя камсамольская творчая групоўка, куды ўваходзяць С. Ліхадзіеўскі, Б. Мікуліч, Шнэйдэль і інш.

● Галоўмастацтва НКА БССР, ЦСПСБ ДВБ і Драмтаварыства абвясьцілі конкурс спаборніцтва паміж пісьменьнікам, драматургамі і кампазітарамі на стварэньне твораў розных жанраў, прысьвячаных XV гадавіне Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Конкурс-спаборніцтва абвешчаны па наступных відах мастацтва: раманы, аповесьці, апавяданьні, вершы, драмы, опэра (лібрэта), сымфонія, квартэт, масавыя песьні, маршы і інш.

Тэрмін прадстаўленьня твораў на конкурс-спаборніцтва наступны:

для драматычных твораў прафэсыйнага тэатру не пазьней 1 ліпеня 1932 г., самадзейнага тэатру—да 1 жніўня 1932 г., для астатніх твораў не пазьней 15 ліпеня 1932 г.

Для лепшых твораў па кожнаму разьдзелу ўстаноўлены прэміі.

Для лепшых мастацкіх твораў 5 прэмій у памеры 1500 р., 1000 р., 750 р., 500 р. і 250 р.

Для п'ес прафэсыйнага тэатру 4 прэміі ў памеры—1500 р., 1000 р., 750 р. і 500 р.

Для опэрных твораў 2 прэміі—1500 руб. і 1000 р.

Для п'ес самадзейнага тэатру 4 прэміі—1500 р., 1000 р., 750 р. і 500 р.

Буйныя музычныя творы—1000 р.

Для масавых сьпеваў—3 прэміі ў памеры 500 р., 300 р. і 200 р.

Акрамя прэмій аўтары захоўваюць усе правы на атрыманьня аўтарскага ганарару

за друкаванае выданьне і публічнае выкананьне свайго твору.

Творы на конкурс-спаборніцтва павінны пасылацца па пошце бяз паказаньня, чый твор: Менск. Галоўмастацтва НКА БССР, у камісію па конкурсу-спаборніцтву да XV гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Для ацэнкі матар'ялаў складзена камісія.

● 22 сакавіка споўнілася сто год са дня сьмерці вялікага нямецкага паэта і вучонага, аўтара „Фаўста" В. Гётэ. У гэты дзень адбылося ўрачыстае пасяджэньне ў Доме пісьменьніка Інстытуту літаратуры і мастацтва БАН разам з пісьменьнікамі г. Менску. На пасяджэньні праф. Барычэўскі прачытаў даклад аб жыцьці і дзейнасьці В. Гётэ.

● Вечар сустрэчы паэтаў і кампазытараў адбыўся ў Доме пісьменьніка 6 сакавіка. На вечары т. П. Броўка зрабіў даклад аб становішчы сучаснай беларускай песьні.

● У дзяржаўным тэатры ў Менску 8 сакавіка адбыўся вялікі вечар пралетарскай літаратуры. З уступнай прамовай на вечары выступіў т. Бэндэ. На вечары чыталі новыя творы А. Александровіч, П. Броўка, В. Каваль, М. Хведаровіч, І. Харык і М. Лынькоў.

● На апошнім пасяджэньні бюро МенАПП у члены Менскай асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў прыняты чатыры рабочыя-ударнікі, закліканыя ў літаратуру: Эстаркін, Камянецкі (зав. імя Варашылава), Гурвіч, Атлас (друкарня імя Сталіна).

● МенАПП скора здае ў друк другі зборнік творчасьці рабочых ударнікаў г. Менску. Складаньне зборніка праходзіць пад знакам актыўнага ўдзелу ў сацбудаўніцтве і падрыхтоўкі да XV гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі. Лепшыя творы зборніка будуць прэміраваца.

● Пры МенАПП арганізавалася сэкцыя расейскіх пісьменьнікаў. Кіраўніком расейскай сэкцыі зацьверджаны т. Шапавалаў. Адначасова т. Шапавалаў кааптаваны ў члены бюро МенАПП.

● Да першага чэрвеня 1932 г. БелАППам выдаецца зборнік твораў рабочых-ударнікаў, закліканых у літаратуру. Зборнік павінен будзе ахапіць у асноўным усю творчасьць літаратурна-выяўленых ударнікаў БССР.

● Літаратурнае згуртаваньне „Узвышша" ліквідавалася. Часопіс „Узвышша" з 1932 г. выходзіць ня будзе.

● У лютым м-цы г.г. літаратурная брыгада БелАПП, у складзе І. Барашкі, Б. Мікуліча, М. Лужаніна і Аксельрода выяжджала ў Сьвіслач, Крычаў (цэмэнтны завод) і г. Магілёў. Брыгадай праведзена ў гэтых пунктах вялікая літаратурна-масавая праца. Таксама праведзена вялікая падрыхтоўчая работа па закліку рабочых-ударнікаў у літаратуру.

● МенАПП пастанавіў арганізаваць двухмесячныя курсы па падрыхтоўцы кіраўнікоў рабочых літгурткоў. Курсы пачнуць працаваць з першага мая г.г.

● Вандроўны тэатр пад кіраўніцтвам народнага артыста рэспублікі т. Галубка перайменаваны ў Трэцьці Беларускі Дзяржаўны тэатр (БДТ-3).

● Першы беларускі дзяржаўны тэатр падрыхтоўвае да пастаноўкі п'есу Ірчана (украінскага пісьменьніка) „Пляцдарм" на тэму аб клясавым змаганьні ва ўмовах капіталістычнай Польшчы.

● Другі беларускі дзяржаўны тэатр падрыхтоўвае да пастаноўкі п'есу М. Ільлінскага „Вясна". Тэма п'есы—праблема серадняка ў калгасе. Першую пастаноўку п'есы мяркуецца прыстасаваць да вясень яй пасеўнай кампаніі.

Акрамя гэтага другі дтяржтэатр рыхтуе да пастаноўкі п'есу Якуба Коласа „Вайна да пабеднага канца" на тэму—ператварэньне імпэрыялістычнай вайны ў вайну грамадзянскую і В. Сташэўскага „Амэрыка", прысьвячаную адлюстраваньню змаганьня клясаў у Амэрыцы на фоне эканамічнага крызісу капіталізму.

● Шэрагам пісьменьнікаў і драматургаў напісаны новыя п'есы: А. Міровічам—„Байцы ідуць" на тэму—навука на дапамогу сельскай гаспадарцы, Даўгапольскім—„Песьня перамогі" на тэму—змаганьне рабочых Добрускай ф-кі за прамфінплян, К. Чорным—„Лета" на тэму — калгаснае будаўніцтва, В. Шашалевічам—„Рой" на тэму—прышчэпаўшчына і арганізацыя калгасаў, І. Барашкам—„Романы Зоря" на тэму—ўдзел цыганоў ў сацыялістычным будаўніцтве.

● Складзены часовы сэкратарыят БелЛАЧАФ, куды ўваходзяць Калента, Крапіва, Шапавалаў, Самахвалаў, Шапіра, Лынькоў, Бэндэ, Каваль, Орса.

● У другой палове красавіка м-ца г. г. склікаецца канфэрэнцыя БелЛАЧАФ.

● Падрыхтаваны да друку другі зборнік БелЛАЧАФ.

● Пісьменьнікі Кобзц, Сташэўскі і Курдзін мабілізаваліся для вывучэньня жыцьця Чырвонай арміі з мэтай напісаньня новых п'ес.

● Пры НКА адбылася нарада мастакоў па цытаньню падрыхтоўкі да 5-й Усебеларускай мастацкай выстаўкі.

● Таварыства „Мастак" арганізоўвае майстэрні скульптуры і дзіцячых забаў каб прасоўваць у масы мастацкія творы для афармленьня рабочага і калгаснага быту.

● П'еса Гурскага „Новы горад" для пастаноўкі перададзена ТРАМ'у.

● У сакавіку м-цы адбылася першая канфэрэнцыя Віцебскай асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў. Ад БелАПП на канфэрэнцыю езьдзілі т.т. Лынькоў, Александровіч, Хведаровіч і Барашка. Канфэрэнцыя падагуліла творчую работу асацыяцыі за мінулы час і намеціла шэраг мерапрыемстваў для далейшай работы. Асноўную масу дэлегатаў канфэрэнцыі складалі рабочыя-ўдарнікі, закліканыя ў літаратуру.

● 12 сакавіка адбыўся юбілей 100-га паказу пастаноўкі п'есы „Першая конная".

Дырэкцыя другога беларускага тэатру вынесла падзяку акторам: Ільінскаму, Бялінскаму, Сяргейчыку, Зьвездачотаву, Матусэвічу, Катовічу, Вялікаму і Скальскаму, якія бязупынна прымалі актыўны ўдзел у пастаноўках „Першай конпай".

Яўрэйская сэкцыя БелАПП выдала два зборнікі творчасьці рабочых-ударнікаў, закліканых у літаратуру. Адзін зборнік „Ударныя крокі" выданы літгуртком імя Горкага пры друкарні імя Сталіна, другі зборнік—агульнагарадзкі—пад назвай „Ударнікі".

Яўрэйская сэкцыя БелЛАЧАФ здала ў друк першы альманах, які прысьвячаны Чырвонай арміі. У альманаху ўдзельнічаюць т.т. Аксельрод, Талалай, Вайнгауз, Харык, Доўгапольскі, Юдэльсон, Верамыкін, Элі Каган, А. Каган і інш. Памер альманаху—6-7 друкаваных аркушоў.

Беларуская Акадэмія навук у канцы красавіка м-ца будзе праводзіць дэкадніку беларускай пралетарскай культуры і навукі ў буйнейшых прамысловых цэнтрах БССР—Гомелі, Віцебску, Магілеве і інш. гарадох. У час дэкадніку будзе навуковымі сіламі Акадэміі прачытаны шэраг дакладаў па розных галінах навукі.

Міхась Чарот заключыў з ДВБ умову на выданьне поўнага збору сваіх твораў. Першы том ужо здадзены ў друк.

Андрэй Александровіч здаў у друк другі том свайго збору твораў. У кнігу ўваходзіць п'еса „Напор" і „Нараджэньне чалавека".

Платон Галавач здаў у друк сваю пераапрацаваную аповесьць „Спалох на загонах". Зараз П. Галавач працуе над новай вялікай аповесьцю „Торф".

Рыгор Кобец заключыў з Белдзяржкіно ўмову на здымку свайго гукавога сцэнарыя „Двойчы народжаны".

Сымон Баранавых здаў у друк асобнай кніжкай сваю новую аповесьць „Два канцы". Зараз С. Баранавых працуе над раманам Да XV гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі на тэму з грамадзянскай вайны. У рамане будзе паказана жыцьцё Чырвонай арміі, акупацыя Беларусі і змаганьне сялянскай беднаты ў часы адступленьня белапалякаў. Раман будзе падагульняць пройдзены шлях сацыялістычнага будаўніцтва.

Пятрусь Броўка здаў у друк кнігу поэзіі. У кнігу поэзіі ўваходзяць выбраныя яго вершы і паэмы, якія друкаваліся раней. Зараз П. Броўка працуе над вялікай поэмой пра камсамол.

Вышлі з друку другім выданьнем кніжкі Міхася Лынькова—„Апошні зьвярыядавец" (аповесьць) і „Андрэй Лятун" (апавяданьне). Зараз М. Лынькоў працуе над вялікай аповесьцю. Ідэя аповесьці—інтэрнацыянальнае адзінства працоўных.

Скора выйдзе асобнай кніжкай аповесьць Барыса Мыкуліча „Наша сонца". Зараз Б. Мікуліч працуе над п'есай „Рот фронт", якая прысьвячаецца тэме інтэрнацыянальнай еднасьці, адзінаму фронту камсамолу ўсіх краін у барацьбе за сусьветны Кастрычнік. Б. Мікуліч здаў у друк новую аповесьць „Украіна".

Мікола Хведаровіч піша п'есу „Уласнасьць", якую мяркуе скончыць да XV гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Крапіва зараз працуе над вялікім раманам. Раман будзе складацца з двух кніг. У першай кнізе будзе паказана, як ачуньвала вёска пасьля вайны і акупацыі, як нарасталі ў ёй супярэчнасьці, як нараджаўся і рос у ёй той актыў, які будуе сёньня сацыялістычную вёску. Асноўнай тэмай другой кнігі будзе арганізацыя і гаспадарчае замацаваньне калгасаў.

Ц. Даўгапольскі піша раман на матэрыяле Магілеўскай шоўкавай фабрыкі. У друку знаходзіцца яго кніга фэльетонаў.

А. Юдэльсон працуе над паэмай з жыцьця камсамольскай брыгады доменнага цэху. Ім падрыхтаваны да друку зборнік нарысаў—вынік паездкі з інтэрнацыянальнай пісьменіцкай брыгадай.

Элі Каган канчае п'есу з жыцьця сельска-гаспадарчай камуны. На днях вышла з друку кніга яго апавяданьняў Ён перакладае для яўрэйскага вандроўнага тэатру п'есу Мікітэнкі „Справа гонару".

М. Кульбак працуе над паэмай з замежнага жыцьця пад назвай „Чайльд Гарольд з Дысканы" і піша другую частку рамана „Зэльменяны".

Мотэль Гарцман напісаў цыкль вершаў пра падзеі на Далёкім Усходзе. Неўзабаве выходзіць яго кніга вершаў „Мы—сыны".

М. Ліўшыц піша паэму з жыцьця дзіцячага дому. Выходзіць яго другая кніга вершаў.

З. Аксельрод закончыў цыкль вершаў з жыцьця Чырвонай арміі. Перакладае на яўрэйскую мову для дзярж. яўрэйскага тэатру п'есу А. Александровіча „Напор". Гэтымі днямі выходзіць яго кніга вершаў

РСФСР

24 лютага 1932 г. памёр вядомы расійскі крытык В. Палонскі.

Восеньню г.г. споўніцца 40-гадовы юбілей літаратурнай дзейнасьці Максіма Горкага. Літаратурны музэй пры Публічнай бібліятэцы СССР імя Леніна рыхтуе выстаўку творчасьці М. Горкага, якая зьявіцца пачаткам стварэньня музэю Горкага. Выстаўка пакажа творчы шлях Горкага на фоне палітычнай гісторыі эпохі. Першая частка выстаўкі пакажа ролю Горкага ў грамадзка-рэвалюцыйным руху. У органічнай сувязі з гэтым матар'ялам будзе дадзена літаратурная эпоха, клясавая расстаноўка літаратррных сіл (Горкі, Чэхаў, Талстой, сымбалісты і г. д.). На фоне корыфеяў буржуазнай літаратуры будуць паказаны вытокі літаратуры пралетарыята, нарастаньне яе сіл. У наступных

разьдзелах выстаўкі будуць тэмы: Горкі і нацыянальныя літаратуры, Горкі і тэатр, Горкі і Захад, якая павінна будзе паказаць адыход ад буржуазіі лепшых прадстаўнікоў інтэлігэнцыі Захаду Ромэн Ролана, Б. Шоў, Драйзера і інш. Вялікая ўвага на выстаўцы будзе аддадзена пытаньням: Горкі і пачынаючы пісьменьнік, Горкі—арганізатар савецкага друку („Гісторыя заводаў", „Гісторыя грамадзянскай вайны", „Гісторыя маладога чалавека XIX стагодзьдзя), Горкі ў масы, распаўсюджваньне твораў Горкага раней і цяпер і крытыка аб Горкім.

● Дырэкцыя Вялікага тэатру Саюзу ССР і рэд. „Комсомольская правда" абвясьцілі конкурс-спаборніцтва на стварэньне лібрэта і музыкі опэры, балето і сымфоніі ў адзнаку XV годзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі.

● Маскоўскі гарком пісьменьнікаў мабізаваў 20 пісьменьнікаў для работы па правядзеньні сталінскай эстафэты і 14 пісьменьнікаў для работы ва ўдарных брыгадах па загатоўках веснавой пушніны.

● Дырэкцыя „Саюзкіно" разам з групай АРРК паставіла пытаньне аб неабходнасьці арганізаванага вылучэньня літаратурных кадраў для іх спэцыялізацыі ў кіно.

● Ва Усекадраме арганізавана творчая група „Труд", якая складаецца галоўным чынам з ударнікаў, закліканых у драматургію У групе 33 чалавекі.

● Па ініцыятыве Рэвваенсавету СССР, пры актыўным удзеле ЦК саюзу працаўнікоў мастацтва і рада мастацкіх і літаратурных арганізацый, распачата падрыхтоўка выстаўкі выяўленчага мастацтва да XV гадавіны РСЧА. На арганізацыю гэтай выстаўкі Рэвваенсавет адпусьціў адзін мільён рублёў. У арганізацыі выстаўкі прымуць удзел звыш 300 мастакоў і звыш ста скульптараў.

● У красавіку м-цы г.г. склікаецца ўсесаюзная выгворчая нарада пралетарскіх паэтаў з наступнай абвесткай дню; творчасьць ударнікаў, праца паэтаў на прадпрыёмствах, справаздача творчай групы „Ленінград, творчыя справаздачы; Лугаўскога, Гідаша-Сьвятлова, Ісакоўскага, Чэркаскага, пра абаронную паэзію (ЛАЧАФ), пра крытыку паэзіі.

● Вытворчы плян усесаюзнага трэста хронікі і масавых фільм намячае да выпуску ў 1932 г. 100 умоўных вытворчых адзінак. З іх 500 №№ нямых часопісаў, 36 гукавых і 45 поўнамэтражных агітмасавых фільм. Асноўная палітычная ўстаноўка пляна: чацьверты завяршаючы год пяцігодкі і пятнаццацігодзьдзе Кастрычнікавай рэвалюцыі.

● Цэнтральная рэдакцыя Саюзкінохронікі будзе выпускаць пэрыодычныя і непэрыодычныя выданьні ўсесаюзнага значэньня, г. зн. агітмасавыя культфільмы і часопісы: „Саюзкіночасопіс" „За сацыялістычную вёску", „Навука і тэхніка", „На варце СССР" і часопіс „Піонэрыя".

● У лютым м-цы г.г. у Маскве адбыўся другі пашыраны пленум Ц. С. ЛАЧАФ. Пленум падвёў вынікі работы аб'яднаньня і намеціў рад канкрэтных мерапрыемстваў і новых задач пад кутом погляду пастаноў XVII партыйнай канфэрэнцыі.

ЗА МЯЖОЙ

Нямеччына

Нямецкія пралетарскія выдавецтвы праводзяць „месячнік пралетарскай кнігі". Саюз рэвалюцыйных і пралетарскіх пісьменьнікаў Нямеччыны стварыў шэраг ударных пісьменьніцкіх брыгад, якія будуць дапамагаць правядзеньню гэтай кампаніі на мясцох.

Брыгады ставяць перад сабой наступныя мэты: заснаваньне новых мясцовых груп саюзу рэвалюцыйных і пралетарскіх пісьменьнікаў Нямеччыны і іх арганізацыйнае афармленьне, ущягненьне новых членаў ва ўжо існуючыя мясцовыя групы, вярбоўка новых падпісчыкаў у часопіс саюзу „Лінкскурвэ", стопроцантнае прыцягненьне членаў саюзу да работы па прапагандзе пралетарскай кнігі, даклады пра „месячнік пралетарскай кнігі" на рабочых сходах і г. д.

Такім чынам работа па пашырэньню і ўмацаваньню саюзу будзе спалучацца з масавай работай па кнігараспаўсюджваньні. Лепшы брыгадзір будзе прэм'яваны паездкай у СССР.

● Нямецкі пісьменьнік-камуніст Фрыдрых Вольф, які нядаўна зьвярнуўся ў Нямеччыну з СССР, праводзіць вялікую працу па папулярызацыі дасягненьняў сацыялістычнага будаўніцтва ў Савецкім саюзе. Ён выступіў з дакладам пра СССР ва Франкфурце, Кельне, Дюссельдорфе і іншых гарадох Нямеччыны. Посьпехі выступленьняў Вольфа вымушаны прызнаць нават буржуазны друк.

Францыя

● № 1 французскага выданьня „Літаратуры сусьветнай рэвалюцыі" канфіскаваны ў Францыі пасьля таго, як ён на працягу амаль двух месяцаў распаўсюджваўся зусім свабодна, і ўвесь тыраж яго амаль разышоўся.

Паліцыі ўдалося захапіць 350 экз. у кнігарні „Юманітэ" у Парыжы. Прычынай для канфіскацыі паслужыла надрукаваная ў гэтым нумары паэма Арагона „Чырвоны фронт".

● Цэнтральны орган КПФ газэта „Юманітэ" перадрукавала нядаўна рэзалюцыю па пытаньнях пралетарскай літаратуры ў Францыі, якая была надрукавана ў спэцыяльным нумары французскага выданьня часопісу „Літаратура сусьветнай рэвалюцыі", прысьвячаным Харкаўскай канфэрэнцыі. ЦО КПФ адзначае, што рэзалюцыя правільна ацэньвае становішча на літаратурным фронце Францыі, упамінаючы не бяз гумару, што некаторыя з буржуазных пісьменьнікаў „пакрыўдзіліся" на канфэрэнцыю за тую ацэнку, якую яна дала ім у сваёй рэзалюцыі.

● Цэнтральны орган КПФ адводзіць значнае месца пытаньням пралетарскай літа-

ратуры. Стаўшы ў гэтым пытаньні цалкам на літаратурна-палітычную пляцформу, якая выпрацавана Харкаўскай канфэрэнцыяй, „Юманітэ“ ўзяло ў свае рукі ініцыятыву стварэньня ў Францыі Саюза рэвалюцыйных пісьменьнікаў (французкай сэкцыі МАРП-а).

● Ромэн Ролан даслаў рэдактару „ЛМР“ т. Бруно Ясенскаму ліст, у якім дае водгук на дасланыя яму нумары французскага выданьня часопісу „Літаратура сусьветнай рэвалюцыі“.

„Часопіс зрабіў на мяне вялікае ўражаньне,—піша Ромэн Ролан,—Прашу лічыць мяне яго падпісчыкам“.

Гішпанія

● Некалькі месяцаў таму назад у Гішпаніі арганізаваўся Саюз рэвалюцыйных і пралетарскіх пісьменьнікаў, які прыняў сваёй праграмай пляцформу Харкаўскай канфэрэнцыі. У момант яе арганізацыі ў Саюз увашло звыш сарака левых пісьменьнікаў Гішпаніі і Лацінскай Амэрыкі.

Саюз паставіў перад сабой наступныя задачы: аб'яднаньне ўсіх сапраўда рэвалюцыйных пісьменьнікаў, устанаўленьне цеснай сувязі з рэвалюцыйнымі пісьменьніцкімі арганізацыямі другіх краін, якія ўваходзяць у склад МАРП, уключэньне ібэра-амэрыканскіх рэвалюцыйных пісьменьнікаў у рэвалюцыйны рух гішпанскага і лаціна-амэрыканскага пралетарыяту і мабілізацыі іх для рашучай барацьбы з пагрозай імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі і на абароцу СССР.

Польшча

● Польская фашыстоўская ўлада, якая разграміла ня так даўно групу польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў, забараніўшы орган гэтай групы часопіс „Літаратурны штомесячнік“ і кінуўшы ў турму найбольш выдатных яе прадстаўнікоў: т.т. В. Бронеўскага, А. Вата, Я. Гемпеля, А. Ставера,—у выніку шырокай кампаніі пратэсту, у якім у ліку іншых прынялі ўдзел Ромэн Ролац, Анры Барбюс, Эрнст Глезер, Эрнст Толер, Людвіг Рэнн, Бехэр і шэраг другіх вядомых рэвалюцыйных і левабуржуазных пісьменьнікаў, выпусьціла з турмы двух арыштаваных. Тав. Я. Гэмпэль выпушчаны ў выніку катастрафічнага становішча здароўя. Уладыслаў Вранеўскі выпушчаны за грошы на парукі. Два другіх—Аляксандр Ват і Андрэй Ставар знаходзяцца да сёньняшняга дню ў турме. Уся група пісьменьнікаў была арыштавана за тое, што асьмелілася пратэставаць супроць катаржнага турэмнага ўціску, які пануе ў фашыстаўскай Польшчы, у адносінах да палітзьняволеных.

Чэха-Славакія

● У Празе наладжана выстаўка пралетарскай кнігі. Выстаўка наладжана „Левым фронтам“ — культурна-палітычным аб'яднаньнем чэшскай радыкальнай інтэлігенцыі, якая салідарызуецца з пралетарыятам. Акрамя непасрэднага паказу кнігі, на выстаўцы намячаецца яшчэ рад лекцый літаратурна-тэорэтычнага характару, якія павінны даць уяўленьне аб пралетарскай літаратуры ў яе гістарычным разьвіцьці.

Літва

● У апошні час крывавы фашызм у Літве ўжо не здавальняецца ўціскам, разгонам кампартыі і рэвалюцыйных рабочых арганізацый, вынясеньнем новых сьмяротных прыгавораў камуністым (т. Касьпірайтысу). Фашызм душыць усе літаратурныя і культурныя арганізацыі, якія не зьяўляюцца агентурай фашыстых. Аднэй з такіх арганізацый зьяўляецца група маладых радыкальна настроеных пісьменьнікаў „Трэці фронт“, якая выпушчае сваю часопісь пад гэтай жа назвай. Да апошніх месяцаў гэта часопіс стаяла на сацыял-фашыстаўскіх пазыцыях, яе ўдзельнікі былі аднасасова і супрацоўнікамі сацыял-фашысцкага друку, які іх расхвальваў, адзываючыся аб „Трэцім фронце“, як аб прадстаўніку „літоўскай пралетарскай літаратуры“. Але як толькі больш радыкальная частка „Трэцяга фронту“ пад уплывам паглыбляючагася крызісу буржуазнай эканомікі, пачала больш крытычна адносіцца да сацыял-фашызму, як толькі „Трэці фронт“ зрабіў спробу самага нязначнага павароту „налева“ і выказаў інтарэс да рэвалюцыйнай і пралетарскай літаратуры іншых краін, у прыватнасьці да літартурнага і культурнага жыцьця СССР, зараз жа той самы фашыстоўскі друк падняў шалёную кампанію супроць „Трэцяга фронту“.

Латвія

● „Незалежны“ пісьменьнік Андрэй Упіт у кастрычніку м-цы 1931 г. напярэдадні выбараў у латвійскі сойм, калі паліцэйскі тэрор супроць рэвалюцыйных рабочых быў вельмі жорсткі,—выступіў у сацыял-дэмакратычным „рабочым“ тэатры Рыгі з новай п'есай „Павук“, якая накіравана супроць рэвалюцыйнага пралетарыяту.

● У часопісі „Трыбуна“, за гэты-ж месяц, зьмешчаны артыкул Л. Лайцана, які ўскрывае сутнасьць сацыял-фашыстаўскай п'есы А. Упіта.

● Газэта „Паматшкіра“, якая выдавалася былым сацыял-фашыстаўскім паэтам П. Кікутам, забаронена, і сам выдавец-рэдактар арыштаваны. Забарона і арышт утвораны па настойліваасьці сацыял-фашыстаўскіх лідэраў, таму, што „Паматшкіра“ пачала выступаць з матар'ялямі супроць фашызму.

Адначасова з арыштам П. Кікута лёсу поэты, які вядзе актыўную барацьбу супроць сацыял-дэмакратычнай партыі,—падпарадкаваліся маладыя паэты Брэнгуліс і Шмідрыс. Яны таксама нядаўна пакінулі

літаратурную групу „Яўно траўксмэ“ і спынілі супрацоўнічаньне ў сацыял-фашысцкім друку.

Канфіскацыямі і арыштамі латвійская буржуазія спадзяецца спыніць працэс дыфэрэнцыяцыі сярод маладых дробнабуржуазных пісьменьнікаў і папярэдзіць іх ад барацьбы супроць сацыял-фашыстаў.

Баўгарыя

Ня гледзячы на жорсткі тэрор, пралетарыят не аслабявае ў сваёй барацьбе супроць фашыстаўскай дыктатуры. Баўгарская буржуазія ад страху перад камуністычнай партыяй і рэвалюцыйным напорам мас, ня толькі паставіла па-за законам камуністычныя і рэвалюцыйныя прафэсыйныя арганізацыі, але, нават, стварыла спэцыяльны закон, які накіраваны супроць камуністых—закон аб абароне дзяржавы. Аднэй з галоўных задач гэтага закону зьяўляецца сыстэматычнае зьнішчэньне рабочага друку. Бязупыннае канфіскацыя рабочых газэт і часопісаў стала звычайным зьявішчам. Сьвежым прыкладам служыць нядаўная канфіскацыя чатырох нумараў „РЛФ“ упадрад, з-за чаго газэта на некаторы час спынілася, таму што была эканамічна падарвана. Тым ня менш сыстэма канфіскацыі і тэрору ў адносінах да рабочага друку ня ў сілах спыніць зьяўленьне ўсё новых і новых выданьняў.

Японія

Левая тэатральная арганізацыя „Дайні Бунсэн дато домэй энгэкубу“ надрукавала дэкляpацыю, у якой заяўляе, што ў сувязі з канчатковым выкрыцьцем сацыял-фашыстаўскай сутнасьці групы „Бунсэн“ яна усьведамляе неабходнасьць згуртавацца для барацьбы з „Бунсэн“ навакол адзінай у Японіі сапраўднай рэвалюцыйнай арганізацыі—НАПФ. З гэтай прычыны яна пастанавіла ліквідавацца, як самастойная арганізацыя, і ўліцца ў тэатральную сэкцыю НАПФ.

Дыскусыя, якая разгарнулася на пленуме РАПП па творчаму мэтаду падрабязна асьвятляецца ў „Напф“. Прамовы перакладаюцца сэкцыяй мастацтва і літаратуры Інстытуту пралетарскай навукі і з нумары ў нумар друкуюцца на старонках гэтай часопісі. Адлюстраваньнем дыскусіі таксама зьяўляюцца арыгінальныя артыкулы, якія асьвятляюць асноўныя яе палажэньні.

Асацыяцыя японскіх пралетарскіх пісьменьнікаў прыступіла да выданьня „Літаратурнай газэты“. Гэта першая літаратурная газэта ў Японіі. Асацыяцыя японскіх пралетарскіх драматургаў („Протт“), якая ня мела да апошняга часу свайго органу, пачынае выдаваць тэатральную газэту.

Асацыяцыя японскіх пралетарскіх пісьменьнікаў арганізавала ў Токіо першую „Пралетарскую бібліотэку“, якая ставіць сваёй мэтай прасоўваньне рабочай літаратуры ў рабочыя масы.

Японская асацыяцыя пралетарскіх музыкантаў за апошні год вырасла колькасна і актывізавала сваю работу. Увага асацыяцыі зьвернута на прапаганду рэвалюцыйнай музыкі і сьпеваў.

Пралетарскія пісьменьнікі Японіі ўсё больш заваёўваюць старонкі левага буржуазнага друку. За гэты год ня было ніводнага нумару часопісаў „Кайдсо“ і „Тюо-корон“, у якіх ня было-б твораў пралетарскіх пісьменьнікаў.

„Напф“ выдае „Антыімпэрыялістычны зборнік“, які ставіць сваёй мэтай у мастацкай форме паказаць жорсткую эксплёатацыю калёній і паўкалёній і іх барацьбу за незалежнасьць. У зборніку будуць надрукаваны апавяданьні як кваліфікаваных пісьменьнікаў, так і пачынаючых рабочых аўтараў.

„Напф“ у 1931 г. выпусьціў дзьве вялікіх сэрыі. Першая — „Пралетарская энцыклёпэдыя“ у дванаццаці томах. Яна прысьвячана пытаньням палітыка-эканамічнага характару, а менавіта: 1. Гісторыя сусьветнага рабочага руху; 2. Палітычная эканомія; 3. Палітычная тэорыя марксызму; 4. Што такое трэці пэрыод; 5. Будаўніцтва Савецкага Саюзу; 6. Сучаснае становішча капіталістычных краін; 7. Разьвіцьцё гістарычнага матэрыялізму; 8. Аналіз імпэрыялістычнай Японіі; 9. Сучасны японскі рабочы рух; 10. Аграрнае пытаньне і сялянскі рух; 11. Калёніяльнае пытаньне; 12. Вялікая кітайская рэвалюцыя. Другая сэрыя—„Энцыклёпэдыя пралетарскага мастацтва“ пад рэдакцыяй Акіта Удзяку і Эгути Кан, ахапляе ўсе галіны мастацтва. Абедзьве сэрыі разьлічаны на масавага чытача.

Японскае аб'яднаньне прыяцеляў Савецкага саюзу пачало выдаваць сваю штомесячную часопісь „Прыяцель СССР“.

Кітай

Бачачы рост пралетарскага рэвалюцыйнага руху і яго ўплыў на масы, гамінданаўскі ўрад арганізаваў у Нанкіне так званы „Літаратурны рух трох прынцыпаў Сун Ят Сена“ і траціць шмат грошай на подкупы люмпэнінтэлігенцыі і літаратурнай багэмы, каб зрабіць з іх прапагандыстых „нацыянальнай“ літаратуры. Усе пісьменьнікі, якія кіруюць гэтым рухам, шпіёны шанхайскага генэральнага штабу або члены ЦК Гоміндану. Ворагі скарыстоўваюць усё, каб напалохаць рэвалюцыйных пісьменьнікаў і розным чынам імкнуцца разагнаць левых пісьменьнікаў у Кітаі. З аднаго боку, яны абманваюць масы нацыянал-фашыстаўскай прапагандай, з другога—па іх загаду паліцыя зачыняе кнігарні і выдавецтвы пралетарскіх пісьменьнікаў. Яны выдаюць штомесячную і штотыднёвую часопісы, абедзьве пад назвай „Цан-фунь“ („Авангард“.) Гэтыя органы нацыяналістычнай літаратуры вельмі бедныя па зьместу.

ЦАНА 50 КАП.

B0000002049641